Традыцыйны лад жыцця



А. М. Ненадавец, Я. А. Ненадавец

# Залацістыя саломкі снапкі



ТРАДЫЦЫЙНЫ
ЛАД ЖЫЦЦЯ



ТРАДЫЦЫЙНЫ
ЛАД ЖЫЦЦЯ

**А. М. Ненадавец, Я. А. Ненадавец**

# ЗАЛАЦІСТЫЯ САЛОМКІ СНАПКІ



Мінск
«Беларуская навука»
2021

УДК 39(=161.3)
ББК 63.5(4Беи)
Н51

*Серыя заснавана ў 2014 годзе*

Р э ц э н з е н т ы:

доктар мастацтвазнаўства, прафесар В. І. Жук,
кандыдат гістарычных навук В. М. Бялявіна

Ф о т а з д ы м к і
А. М. Ненадаўца

**Ненадавец, А. М.**

Н51 Залацістыя саломкі снапкі / А. М. Ненадавец, Я. А. Ненадавец. – Мінск : Беларуская навука, 2021. – 261 с. : іл. – (Традыцыйны лад жыцця).

ISBN 978-985-08-2765-4.

У кнізе разглядаецца ўжыванне самай звычайнай саломы ў гаспадарчым працэсе старажытных людзей. Аналізуецца, як змяняліся адносіны вяскоўцаў да гэтага найпрасцейшага дахавага і будаўнічага матэрыялу, традыцыйнага дадатковага корму для хатняй жывёлы, ацяпляльнага рэчыва, выгоднага сродку для пляцення разнастайных гаспадарчых прылад і прадметаў. Часта з-пад умелых рук сялянскіх майстроў з'яўляліся сапраўдныя ўзоры промыслу. Прыводзяцца шматлікія сведчанні этнографаў і фалькларыстаў, літаратараў і вяскоўцаў, звязаныя з працэсам сяўбы, жніва і малацьбы.

Прызначаецца ўсім, хто цікавіцца таямніцамі духоўнай і матэрыяльнай спадчыны беларускага народа, аматарам даўніны, якія заўсёды рады сустрэцца з новымі сведчаннямі з гісторыі сваіх продкаў, іх самабытнага жыццёвага працэсу.

**УДК 39(=161.3)**
**ББК 63.5(4Беи)**

**ISBN 978-985-08-2765-4**

© Ненадавец А. М., Ненадавец Я. А., 2021
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2021

# ДА ЧЫТАЧА

Салома, саломінка, саламяны... Цікава, калі ўпершыню гэтыя словы ці, дакладней, іхнія выявы запалі ў маю памяць? Ясная справа, што з дзяцінства. Усе мы ў ім сустракаемся з тым непаўторным, своеасаблівым, арыгінальна-незгасальным, што праносім з сабою праз усё жыццё. Дастаткова толькі прыжмурыць вочы, уявіць, што ты недзе там, у далёкім-далёкім дзяцінстве, і ўсё наплывае, ажывае, паўстае, шуміць, квітнее, пахне, гаворыць на той мове, якая заўсёды зразумелая толькі людзям удзячным, чуйным, здольным пачуць, адчуць і ўбачыць нават тое, што іншым ніколі не будзе даступным. Гэта адметны дарунак лёсу: умець вяртацца да мілых вобразаў, да постацей мінуўшчыны, улівацца (хоць, мабыць, лепей – ужывацца!) у старажытную эпоху, жыць аднолькавымі думкамі і настроямі, памкненнямі і перажываннямі з тагачаснымі людзьмі, не быць ад іх адрозным.

Такое сыходзіць (можна напісаць, што і ўдаецца) асабліва ўдала тады, калі пастаянна працуеш па нейкай канкрэтнай тэме, ужываешся

ў яе настолькі, што цябе проста акружаюць персанажы, побыт, мова і звычаі таго перыяду (той эпохі). Менавіта тады ўсё пачынае «дыхаць» старажытнымі ўстоямі, парадкамі і законамі. Намнога бліжэй адчуваеш подых прыроды, бо ўсё ацэньваеш, аналізуеш і характарызуеш, зыходзячы з пункта гледжання чалавека мінуўшчыны. Ён уяўляецца не забітым і палахлівым, а здольным да шырокага разумення падзей, якія адбываліся вакол яго, якія захаплялі і яго, упляталі ў свой адвечны кругаварот. Але ці не дзякуючы такому своеасабліваму кругавароту продак і сам паступова станавіўся арганічнай часткай прыроды, гісторыі сусвету? Сусвет у яго заўсёды асацыіраваўся з Зямлёю, але яно так і павінна было здарыцца, бо продак быў адвечным земляробам: сеяў, жаў, малаціў. І ў гэтым цыклічным працэсе чалавек не толькі зацята працаваў, але і адначасова асэнсоўваў, а потым адкладваў у памяці, у сваім найбагацейшым практычным вопыце ўсё тое, што яго найбольш уразіла, нечаму навучыла. Гэта можна назваць суровай школай жыцця, бо ў ёй былі не толькі поспехі і багатыя ўраджаі, але адначасова і неўраджаі, і голад, і прамашкі. Таму вучыла ўсё: і станоўчае, і ... адмоўнае. І тое, і другое не варта забываць, бо ў ім, якраз-такі, і хавалася мудрасць, жыватворнасць, непарыўнасць жыцця.

Мне такое адметнае вяртанне ў памяці ўдаецца даволі часта, асабліва, калі пішу пра міфалогію і звычаі, вусна-паэтычную творчасць і абрады, самабытны народны каляндар і ўсемагутныя замовы маіх продкаў. Калі толькі добра ўдумацца, то вынікае бясспрэчнае: на ўсім гэтым многае і трымалася. На першы погляд яно можа падацца нечым неістотным, другарадным, затое пазней, перадумаўшы па-іншаму (ці перажыўшы па-новаму), становіцца ясна, што ў гэтым мінулым няма другараднасці. Там усё было знітавана, там не было ніякіх выпадковасцей, а ўсё было, аказваецца, падпарадкавана загадзя прадуманаму ці прадугледжанаму, а то і падказанаму мудрым вопытам папярэдніх пакаленняў, шматлікімі, вядомымі і ўвогуле невядомымі продкамі. Мала таго, што яны пастаянна падказваюць, накіроўваюць па вузенькай сцяжынцы ў бязмежным моры фальклорнага матэрыялу, дык яшчэ і перасцерагаюць, прытрымліваюць, не даюць празмерна разгулячца маім думкам. Асабліва там, дзе гэта тычыцца варажбы і праклёнаў, магічных абрадавых дзеянняў, якія ў далёкім мінулым не дапускалі нейкіх змен ці ўласнага спрашчэння. Там усё павінна захоўвацца такім, якім яно прыйшло (ці дайшло), мінуючы шматлікія перашкоды: рэлігійныя, сацыяльныя, палітычныя. Нешта зменіш, не падумаўшы, а потым, здаецца, пачынаюць асуджальна і дакорліва глядзець на цябе ўсёбачачыя ўжо вочы далёкіх продкаў, якія пільна сочаць за намі, зноў-жа, паводле на-

родных вераванняў, з-за завоблачных вышыняў. Ад іх нікуды не схаваешся: ні сам, ні твае дзеянні. Неяк так ужо атрымліваецца, што ім і ўмешвацца няма неабходнасці, бо яны выдатна разумеюць адвечную плынь жыцця. Яны спакойныя, бо іхні вопыт, іхняе пакланенне і шанаванне сваіх продкаў і сучаснікаў далі ім здольнасць маўкліва кіраваць самымі складанымі зрухамі ў прыродзе і грамадстве. Там, дзе яны бяссільныя, разгубленыя (яны ж таксама не проста так усё гэта прапусцілі міма сваіх вушэй), яны навучыліся прыстасоўвацца. Рабілі гэта з адзінай толькі мэтай: каб выжыць, даць далейшы працяг свайму роду, каб заўсёды квітнела самае галоўнае – Жыццё!

А вось ужо сам жыццёвы працэс станавіўся заўсёды ў продкаў надзвычай разнастайным, шматбаковым і шматвектарным. Яны даўным-даўно зразумелі, што нішто проста так не здараецца, а яно вынік нейкага папярэдняга працэсу, дзеяння, падзеі. Нешта бывае і надта складаным, яго цяжка было пераасэнсаваць з першага разу, зразумець, бо не хапала вопыту, практычных ведаў, а, магчыма, і кемлівасці. Нічога дзіўнага, яны ўмелі прызнаваць і паражэнні, але агаворваліся, маўляў, каб толькі такія прамашкі станавіліся не рэгулярнымі, а разавымі. Такая з'ява хутка мінаецца, над ёю асабліва і не засяроджваюцца, нават часта не задумваюцца, бо яна – нязначная, ад яе нямногае залежала ў сялянскім жыцці. Яны, продкі, нейкім своеасаблівым нюхам адрознівалі галоўнае ад другаснага. Толькі вось яно – цікавае назіранне: часта і тое самае – другаснае – станавілася надзвычай важным, неабходным. Без яго, быццам бы, і не памрэш, і не захірэеш, але разам з тым без ягонага ўліку жыццё стане некамфортным. Вядома, што і разуменне жыццёвага камфорту ва ўсе часы было розным. Чамусьці менавіта так атрымалася і з уменнем выкарыстоўваць салому ў гаспадарчым працэсе і ўжыванні.

Перад тым, як пачынаць новую тэму, я заўсёды старанна надумваюся, падбіраю літаратуру, выстройваю план работы, а потым нібы прыпыняюся на кароткі час. Каб паспець спакойна ўсё асэнсаваць, супаставіць, нешта перамяніць (хоць падчас працы многае, вядома ж, змяняецца), а гэта, звычайна, ідзе на карысць. І вось тады, начамі, у снах, глыбокіх і не надта, з'яўляюцца мае продкі, мае дзяды-прадзеды. Вось тады я і вяду з імі свае размовы-кансультацыі. Іх у мяне многа такіх кансультантаў, і не толькі родных, не толькі знаёмых, некалі ўбачаных ці сустрэтых, але і такіх, якіх я ніколі ў сваім жыцці не спаткаў, не размаўляў, не звяртаўся. Яны ўзнікаюць, як дадатковая і надзвычай удзячная сіла. Удзячная за тое, што я не забываюся пра іх, не адмаўляю (і ніколі не думаў нават пра такое) іхняй духоўнай і матэрыяльнай спад-

чыны. Яна застанецца заўсёды, бо акумулюе ў сабе памяць шматлікіх пакаленняў нашых продкаў, іхнія знаходкі, іхні найбагацейшы практычны вопыт. Многае з той памяці, на вялікі жаль, можна ўзнавіць толькі шляхам супастаўлення, параўнання з матэрыяламі іншых народаў, бо нашых, уласных, не захавалася. Разбэрсалі няўдзячныя нашчадкі сабранае і ўзгадаванае продкамі, не звярнулі своечасова пільную ўвагу, таму і маем такі незайздросны вынік. Так і парывае ўсклікнуць: чаму, чаму мы такія няўважлівыя, абыякавыя і забыўчывыя? Адмоўны ўклад, безумоўна, унесла яшчэ і тое, што ўся іхняя духоўная спадчына патрапіла пад азначэнне «прымхлівасці і забабоннасці, прымхаў і забабонаў, шкодных перажыткаў жыцця, з якімі выпадала не толькі змагацца, але і выкарчоўваць іх дазвання з роду беларусаў». Тыя, хто сам ні ў чым не разбіраўся і нічога не разумеў, а, магчыма, што і не імкнуўся ніколі асэнсаваць ды адчуць усю прыгажосць мінуўшчыны, сівой даўніны, адно – «накіроўваў». Пярэчанні, агаворкі, спробы неяк знайсці бясстратнае выйсце не прымаліся і не дапускаліся. Сказаў я, значыцца маё «я» значна пераўзыходзіць ваша «мы».

А там любы вобраз, любая драбніца каштавала вельмі многага. Так і з залацістай саломай атрымалася. Што гэта такое, мы ўяўляем і сустракаемся з ёю, асабліва вясковыя жыхары, пры кожным зручным выпадку, але вось чаму звычайная салома мела такое шырокае выкарыстанне ў нашых продкаў, адназначна не адкажам. Тут яшчэ можна звярнуць увагу на адзін аспект: пераважная большасць людзей ніколі не задумваліся над такім пытаннем. Ды і не задумаюцца. Няма ім да саломы справы. Навошта забіваць, атрымліваецца, галаву лішнімі клопатамі. Тут і так усялякага хапае. А тое, што вялікая колькасць людзей нашай краіны ўвогуле не ўяўляе, як расце збожжа, хлеб, колькі працы пры гэтым трацішча, якая яна фізічна цяжкая і выжыльваючая, можна аднесці да ... сораму сучаснага грамадства. Толькі тыя, хто гэтага не ведае, ніколі не прызнаюцца ў сваім паражэнні, няведанні. Усё тут звядзецца да звычайнага – навошта мне гэта ведаць, калі мне яно не трэба, калі яно не спатрэбіцца ў жыцці. Ды і тое, што было некалі, даўным-даўно, мяне мала цікавіць, а то і зусім не займае.

Мне чамусьці падумалася, што я ўпершыню зразумеў, што такое салома, адчуў яе нейкую гаспадарчую значнасць, калі пачуў з матуліных вуснаў казку, як яна сама гаварыла, пра «Вяршкі і карашкі» (у фальклорным, класічным, азначэнні гэта «Мужык і мядзведзь»). Хвацка там кемлівы чалавек дзяліў з праставатым зверам летні ўраджай, забіраючы сабе лепшае, а мядзведзю пакідаючы горшае. Матуля тады запроста, як рабіла гэта мільёны разоў, магла растлумачыць, што такое

салома і нават прынесці і паказаць колькі сцяблінак. У любога гаспадара ў хляве ці на панадворку салома абавязкова была: ці ў прыстаронку, ці ў стозе, а то і проста ў невялікай капе. І гэтыя сцэны ранняга дзяцінства пачалі наплываць, апаноўваць маю свядомасць, пераконваць, што так яно і адбылося на самой справе ў жыцці. А самое жыццё яно ж з многага складаецца. У любога чалавека так атрымліваецца. І далёка не заўсёды з нечага самага галоўнага, надзвычай значнага. Хапае ў ім і менш важнага. Толькі вось у чым адметнасць: мінеш, пройдзеш міма такой дробязі (драбніцы), а потым толькі дойдзе, што нешта згубіў, страціў назаўсёды. Акінешся, вернешся назад, а там нічога няма. Там усё па-іншаму, бо ўсё цячэ – усё змяняецца. І, на жаль, змяняецца вельмі хутка. Берагі памяці застаюцца, яны то больш-менш трывалыя, а вось тое, што між імі, што сплывае, таго не здагоніш. Магчыма, гэта адбываецца ад таго, што далёка не ўсё ў жыцці паўтараецца, мільгаціць пастаянна перад вачыма; нешта абавязкова здараецца толькі адзін раз. Усяго адзін. Ды і момант той бывае хуткаплынным. Яго трэба навучыцца выдзяляць, фіксаваць, запамінаць, каб пазней, ужо ў памяці, звярнуцца да тае сцэны, да таго самага эпізоду, калі ты гэта ўбачыў, адчуў, прыяднаўся да чарговага факта ўласнага ўзбагачэння. І гэта ўвогуле не азначае, што толькі духоўнага і практычнага – таксама.

Колькі разоў дзякую пану Богу, удзячны за тое, што ён мяне падвучыў, накіраваў па гэтай сцяжынцы ўмелай ацэнкі мінуўшчыны. Дарма, што можна пачуць пярэчанні, маўляў, сам чалавек (кожны з нас) выбірае свой шлях і ніхто болей у гэтым працэсе не прымае ўдзелу. Няпраўда ўсё гэта. Няпраўда, бо на выбар жыццёвага шляху, якраз-такі, уплываюць шматлікія абставіны і вялікая колькасць людзей. Проста трэба ўмець прааналізаваць, як жа ўсё гэта адбывалася, як усё складвалася і станавілася, хто сказаў тое ці іншае слова, а хто паказаў правільнасць кірунку. Гэта ўсё было, а чалавек не здолеў ацаніць падказак іншых, а значыць, ён тым самым здрадзіў іхняй памяці. Падказкі ж неабавязкова адбываюцца мэтанакіравана, а то і прымусова. Чаму мы адкідваем тыя з іх, якія старэйшымі людзьмі рабіліся неяк непрыкметна, нібыта ў выглядзе дзіцячай гульні, а потым, калі звярталіся да падрослых, то ў выглядзе займальнай размовы, са шматлікімі загадкамі, хуткагаворкамі, прыказкамі і прымаўкамі. А яны ж таксама прамаўляліся не проста так, іх ужывалі менавіта з павучальнымі мэтамі. Трэба было навучыцца вылаўліваць гэтыя «залацінкі мудрасці чалавечага жыцця».

А вось у выпадку са мною ўсё адбылося па той даўняй завядзёнцы, якая адвеку існавала ў продкаў, калі ўсё перадавалася ад старэйшых

да маладзейшых, ад дарослых – да малых. Мабыць, не толькі спрацавалі тыя падказкі, але і самому карцела болей даведацца пра мінулае, апынуцца ў ім, падыхаць паветрам тых часоў. Толькі памяць, тая магічная памяць-сувязь з продкамі, з мілай матуляй, усё расставіла па сваіх месцах і ў дадзеным выпадку. Тады ты пачынаеш, міжволі, уключацца ў размовы продкаў, якія нібыта адбываюцца пры табе, потым пачынаеш сніць жыццёвыя сцэны, якія ніколі не здзяйсняліся ў тваім жыцці, узнаўляць хранікалагічны ход падзей. І на дзіва ўсё гэта адбываецца даволі проста і натуральна. У выніку – ты гатовы пісаць, разважаць, ацэньваць і стройна адбудоўваць сюжэт сваёй навуковай ці навукова-папулярнай працы. Без такога ўзнаўлення, імкнення да яго выстройвання нічога станоўчага (у нашым народзе гавораць «путнага») не атрымаецца. А тады ж яшчэ многае захавалі сярод мясцовага насельніцтва страшэнныя войны (Першая і Другая сусветныя, савецка-польская), якія вогненным валам пракаціліся па нашым палескім краі, вынішчаючы ўсё дазвання, забіраючы назаўсёды “з гэтага свету на той” дзясяткі тысяч людзей. Мы гуляліся ў “вайну”, у “казакі-разбойнікі”, цягалі з сабою і на сабе рэшткі былой армейскай амуніцыі, вайсковага прычындалля, хаваліся па вясковых пунях і гумнах, хлявах і хатах, не забываліся пра сцірты, стагі і копы. І ўсюды на нас патыхала не толькі “саламянай”, але і сапраўднай гісторыяй. Старэйшыя гаманілі пра тое, што тут адбывалася, пра сутычкі і баі, пра страты і раненні многіх людзей, а мы ўсё гэта ўважліва ўбіралі, каб потым, значна перабольшваючы ўсё, пераказваць тым, каму не пашчасціла паслухаць з першых вуснаў. Неаднаразова гучала, што тады пра нейкую там салому ці саломай накрытыя будынкі ніхто мо і не думаў. Галоўнае бачылі ў іншым: каб выжыць, ацалець, а саламяная справа нікуды не дзенецца, яна зноў адродзіцца, як ні ў чым не бывала. Дастаткова будзе пасеяць (восенню ці вясною) і па-ранейшаму зарунеюць палі, зашапацяць пад ветрыкам гаваркія каласы.

Так і тут. Мне праснілася матуля. Яна разагнулася, і ўся спацелая і разапрэлая, хораша на мяне глядзела. Толькі ў позірку яе быў усё ж нейкі няўцямны спачатку дакор. Вочы нібы гаварылі, што ж ты, чалавеча, няўжо не памятаеш?.. Я ад гэтага пытання і прахапіўся. Прахапіўся, бо ўспомніў сваю першую сустрэчу з той самай саломай, яе пах, здавалася, выразна заказытаў у носе, вярнуў у першы год майго жыцця. Менавіта ў першы, бо тады летам мяне не было на каго пакінуць і мама брала свайго сынка з сабою на жніво. Несла калыску, чатыры кіі, на якія яна чапляла ў полі палатняны полаг. Там мы і «працавалі». Жнейка папрацуе, папрацуе, прыскочыць да калыскі, праверыць, ці ўсё ў парадку, глыне вадзіцы і зноў на сваё месца.  Нават і пастаяць хвілінку-

другую не выпадала. Не было ў яе ніадкуль дапамогі, таму спадзявалася толькі на самую сябе, на свае працавітыя рукі, на тое, што «Бог дапаможа, не акіне і не пакіне яе адну на жытнёвым полі».

Калі вельмі надумаюся, то здаецца, што нават выразна бачу матулю ў тыя самыя моманты: засмяглыя ад спёкі губы, узапрэлы і чырвоным-чырвоны твар. Гэта ж колькі патрабавалася здароўя, фізічнай вынослівасці, каб на працягу цэлага дня, з невялічкім перапынкам на поўдзень, нібы нейкі адухоўлены механічны механізм, разгінацца і згінацца, выпроствацца і зноў нахіляцца да самае зямлі. А жаць жа даводзілася не адзін дзень, а тыдзень, а то і два, тры. У каго колькі было ў гаспадарцы поля. Гаварылі, успамінаючы ды ўздрыгваючы ад тых сцэн мінуўшчыны, старыя жанчыны, што «на сябе жаць было намнога лягчэй, бо гэта на сябе... Там, калі ты працавала шчыра і чысцютка, то ніхто ні голасу не ўзвышаў, ні чым не палохаў... А вось у калгасе, то там даводзілася рознага наслухацца і нагледзецца... Калгаснае, сумеснае вядзенне гаспадаркі і калектыўная праца прывучвалі не толькі да адказнасці і старання, але і да ляноты – таксама. Разумелі людзі, што як ты не ірвіся, як ты не шчыруй, як ты не працуй, а ўсё роўна плата і падзяка будзе адна і тая ж самая. Нарэзаць нівы ці якога надзелу – гэта кіраўнікі маглі запроста, толькі ірвіся, а вось перакінуць лішнюю капейку, дапісаць зверху які яшчэ працадзень – пра такое і чуць не даводзілася. У гэтым яны паказвалі і праяўлялі партыйную “прынцыповасць”. Парушальнікаў працоўнай дысцыпліны, як ім здавалася, і каралі, і публічна высмейвалі, і пазбаўлялі ўсялякіх “правоў”».

Але чамусьці здаецца, што запомнілася нават з такога ранняга ўзросту не нейкая канкрэтная сцэна, не нейкі вобраз ці голас. Запомніўся непаўторны пах. Пах, які ўжо сыходзіў ад апалавелага жыта, ад жытніх каласоў, снапоў, дзясяткаў, якія матуля акуратна пакідала пасля сябе на ніве. Ці не таму для мяне і застаўся самым смачным жытнёвы хлеб (“жытні”, як гаварылі мае землякі). А са збажынай, жнівом, уборкай ураджаю ў мяне назаўсёды засталіся цікавыя ўспаміны: і пра тое, як жалі жанчыны (а нярэдка і мужчыны!) сярпамі, і потым, калі чатыры гады працаваў памочнікам камбайнера ў летнія канікулы, і калі дапамагаў сваім родным жаць збожжа ў полі, дзе не маглі прайсці машыны і таму жалі па-ранейшаму – уручную. Гэта адтуль ажно засталася бабуліна прыпеўка, якую яна спявала маёй матулі, калі тая шчыра дзякавала яе за дапамогу і саджала за стол: «Маня ногі пакалола, // Мішка тыдзень галасіў! // Ой, дзякую камбайнёру, // Што высока пакасіў!». Бабуля ўмела працаваць, але любілі і пасядзець за сталом, пагаманіць з бяседай, а то і паскакаць «пад добрую музыку ды цераз ногу...».

Здаецца, адтуль таксама выплываюць адныя з самых ранніх маіх успамінаў: я яшчэ надта слаба стаяў на ўласных нагах, таму хадзіў толькі па роўнай паверхні, а вось па пожні мне хадзіць не ўдавалася, бо чапляўся і пастаянна падаў. Яно то было не балюча і ад плачу, мабыць, не заходзіўся, але бацькі баяліся іншага: каб не ўпаў і тварам не напароўся на жытнёвае ржышча. Гэта была вялікая небяспека для дзіцяці. Мог запроста застацца без вока, а то і без вачэй. У тагачасным вясковым жыцці і такія здарэнні былі нярэдкімі. Таму мама прыдумвала мне ўсялякія забаўкі, рабіла «імгненныя» цацкі-лялькі і я гуляўся з імі. Яна прыскоквала на пару імгненняў, каб зірнуць, чым я там займаюся, і зноў бегла да свае нівы. Жала яна вельмі хутка. Хутка і надзвычай зацята, бо ў гэтым прыспешвала яе, як сёння мне падаецца, дурная прывычка: ніколі не быць ззаду, ніколі не адставаць. Ого, адстаць ад іншых, каб тыя потым пачыналі сумнявацца ў яе ўменні жаць! Не памятаю, каб такое некалі здарылася. Нават калі мама была ўжо ў гадах, усё роўна «натура выбівалася на паверхню». Я, шкадуючы яе, адганяў з палетка, не даваў у чарговы раз дарывацца да працы, бо «і так ужо вочы ажно белыя ад стомы сталі, зяхаеш, іртом паветра хапаючы, нібы выкінутая на пясок рыбіна». Не паддавалася матуля. Да апошняга не жадала прызнаваць свайго бяссілля, свядома адцягвала і адцягвала той момант, калі апусціць рукі і ледзьве чутна прамовіць: «Я ўжо, дзеці, вам не памочніца... Даруйце, што такая стала... цяпер, працягвайце ўжо без мяне...». Але гэта яна прамовіла мне і майму сыну, калі ў апошні свой зямны раз капала бульбу ў агародзе...

Аднойчы я гуляўся з рэшткамі сапсаванага трафейнага нямецкага фотаапарата, які мне, як адмысловую цацку, уручыў татаў сябрук Грыша. Ён паказаў, як трэба глядзець у таямнічае вочка і як шчоўкаць, навёўшы фотаапарат на патрэбны прадмет. З аднаго боку ад мяне рос здаравенны лазовы куст, які прыкрываў ад ветру і, адначасова, не даваў сонцу надта прыпякаць. Я сцішыўся і сам сабе нешта «вукаў» пад нос. Потым падалося, што нехта на мяне вельмі ўважліва глядзіць. Як толькі не круціўся, але нікога іншага не заўважыў. Так бы і заснуў, каб выпадкова погляд мой не спыніўся на купцы зеленаватага збожжа, якое матуля пакінула, каб зжаць пазней, бо тут была нейкая нізінка і жыта яшчэ не саспела. Мабыць, пазней узышло ці ўвогуле павымакала і потым узялося толькі тое, якое ацалела, а ўся астатняя мясцінка шамацела высокай травою.

Галоўнае было не ў гэтым, а ў тым, што на высокія сцяблiны жыта, неяк жа ўмудрыўшыся і ўладкаваўшыся, забраўся здаравенны чорны вуж. Пазней даведаўся, што гэта за істота і як яе завуць, а тады гэта

было нешта незвычайнае. Ён выцягнуўся на ўсю даўжыню свайго цела і спакойненька гэтак ляжаў сабе пад гарачымі сонечнымі прамянямі. Вецер пакалыхваў ягоную ляжанку, і вуж адпачываў. Мне захацелася яго «шчоўкнуць», я спакойненька навёў аб'ектыў, пару разоў «шчоўкнуў» і пачаў уладкоўвацца спаць сам. Прачнуўся ад таго, што матуля злёгку катурхала мяне і ласкава прыгаворвала: »Уставай, сыночак... Прахапіся, то мы з табою зараз перакусім, а то ж мне зноў жаць трэба будзе... У жніво, сыночак, нават сляпыя і бязногія працуюць... Зімою спаць будзем, а зараз жаць трэба, каб не адставаць ад іншых... Адстаць то лёгка, а дагнаць потым надта цяжка... Перакусім, і сілкі нам дадасцца... Ты станеш далей гуляцца, а я пайду жаць наш загон... Добра, што жыта здалося, а тое, што яго яшчэ многа застаецца, – не так і страшна... Гэта толькі нашыя вочы баяцца, а рукі зробяць... Адпачнеш потым якіх пару дзён і забудзецца гэтая страшэнная стома, не стане даймаць здзервянелае цела...».

Я сеў побач з мамай за імправізаваны стол, а потым крутнуўся і торкнуў убок свайго новага знаёмага: «Во...». Калі мама ўбачыла і разабралася, што да чаго, то закрычала такім дзікім голасам, што ажно ўсё задрыжэла. Здаецца, раней такіх крыкаў ад яе чуць не даводзілася. Значна пазней даведаўся, што матуля надзвычай баялася вужоў, гадзюк, яшчарак, сліменяў, адным словам, усіх паўзучых гадаў. Калі недзе выпадкова напорвалася на скручанае ў колца цела ці бачыла адпаўзаючага гада, то потым доўга не магла супакоіцца, так яе гэта ўсё займала і дазвання калаціла. Той вуж таксама, мабыць, злякаўся такога страшнага крыку і імгненна, нягледзячы на сваю таўшчыню, саслізнуў уніз і зашыўся ў нейкае сховішча.

Дажынаў той кавалачак поля дзед Уладак, якому выпала магчымасць лішні раз даказаць і дачцэ, і ўнуку, што «ён нічога ў свеце не баіцца, а нейкі там вуж...». Вечарам стары доўга ўспамінаў пра ўсялякія вужыныя гісторыі і здарэнні, пра тое, як часта даводзілася яму з імі сустракацца на палескіх азёрах, рэчках і балотах. І што няма чаго іх баяцца, нават самых вялікіх і страшных, бо яны ўвогуле неядавітыя і ніякай шкоды, акрамя карысці, людзям не прыносяць. Адно што гідкія ды і баяцца іх, бо так здаўна прывучыліся.

Але ў гэтай кнізе хочацца распавесці проста пра прыгожую жытнёвую салому, пра тое, колькі сілы і працы трацілі, каб яе апрацаваць, здабыць збожжа новага ўраджаю мае продкі, і пра тое, як яна знаходзіла ўжытак у вясковых гаспадарках. Пра дэкаратыўна-прыкладное саломапляценне няхай скажуць іншыя: тыя, хто ім займаецца, ці тыя, хто добра ведае гісторыю саломапляцення і яе значэнне ў жыцці гра-

мадства. Мы ж згадаем пра яго, калі раскажам пра пляценне царскіх царкоўных варот, бо нам іх давялося назіраць у суседняй вёсцы Дабраслаўка, ды яшчэ пра славутыя палескія капелюшы (“брылі”), якія гэтак хвацка, на любы памер, выплятаў тата. У такім «упрыгажэнні» і мне самому давялося разоў колькі «таптаць сцежкі па гнілых палескіх балотах, косячы ды зграбаючы сена, не знаходзячы ратунку ад усюдыіснага гнюсу».

ТРАДЫЦЫЙНЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ

# ЗАСТАЛОСЯ Ў ПАМЯЦІ

Салома даволі доўга ўядалася не толькі ў свядомасць, але і ў цела. Асабліва, калі скірдавалі ячную, а яна едкая, вострая, усюдыпранікаючая, ад яе не было выратавання. Забівалася і ў рот, і ў нос, і ў вочы, і пад вопратку. Кусалася, часалася, смылела, а спыняцца, абсыхаць і мыцца не было магчымасці. Падганялі грозныя крыкі брыгадзіра, ягоных памочнікаў ды і старэйшых, на той час больш жылістых і вынослівых калгаснікаў. А яшчэ сонца – смалістае, спапяляючае, якое, здавалася, пастаянна стаяла ў зеніце і не давала магчымасці нават ветрыку асвяжыць стомленых скірдаўшчыкоў. Сярод тых высачэзных і велізарных ворахаў саломы і ветру, здавалася, не знаходзілася месца. Самае вялікае жаданне было дарвацца да вялізнага бітона з вадою, які заўсёды брыгада брала з сабою ў поле. Калі стаяла надзвычай моцная спёка, то тады налівалі два, а то і тры бітоны. Праўда, старэйшыя, больш спрактыкаваныя і ўмудроныя жыццём вяскоўцы, не дапускалі нас, разгарачаных і ўзапрэлых, да вады, перасцерагалі, што папрастуджваемся,

зляжам у гарачцы. Мы ажно рагаталі з такіх слоў: як гэта ў такую спёку ды можна прастудзіцца? Нешта не тое гародзяць гэтыя дзяды. Ім вечна падавай нас палохаць ды страшыць. Потым, праз многія гады, усё ж прыйшлі, нікуды не адступілі, удзячнасць, цёплыя словы спагады і падзякі людзям, якія ўмудраліся ў любых сітуацыях думаць не толькі пра сябе.

Часта даводзілася працаваць не толькі на скірдах, але і на валакушах, якімі гусенічнымі, а то і калёснымі трактарамі, сцягвалі салому са значнай часткі палетка ў адно месца, каб потым там узнялася велічэзная скірда. Гэта была страшэнна цяжкая і небяспечная праца. Тады, у падлеткавыя гады, не разумеў, многае не даходзіла, што крок-другі, што драбнейшы промах і ты ці інвалід, ці... Ва ўсім бачылася нейкая весялосць, радасць, неўтаймаваная прага даказаць, што ты лепшы, спрытнейшы і што цябе ў чарговы раз пахваляць. Шкада, што пахвальба гэтая даставалася дарагою цаною: крывавымі мазалямі, сцёртымі нагамі, збітымі пальцамі, ды мала яшчэ якія траўмы здараліся ў такіх сітуацыях. Па шчырасці, то сёння, калі пішуцца гэтыя радкі, няма-няма ды і закрадзецца здрадлівая думка: а нашто ўжо было так рвацца, навошта было так цяжка працаваць з самага ранняга дзяцінства? Ніхто і нідзе, акрамя мяне самога, не згадаў пра тую працу, пра тыя мучэнні, якія па начах, міжволі, прарываліся з грудзей крыкамі-стогнамі збалелага, змучанага цела. Але гэта толькі зрэдчас, калі прыгадваецца нешта крыўдлівае, жорсткае, часам і бязлітаснае; калі памяць вяртае ў тыя моманты, дзе жыццю пагражала рэальная смяротная небяспека і ўсё абышлося толькі нейкім цудам, толькі выпадкова. Пра гэтакае дарослым, вядома ж, калі яны не былі сведкамі, ніколі не распавядалася, бо наступствы маглі быць самымі што ні на ёсць непрадказальнымі. Іншая справа, што такое ніколі не забываецца самому, а ўсё астатняе... мінулася. Мінулася, як аказалася, назаўсёды, беззваротна, з'яўляючыся толькі ў снах ці тады, калі працуеш над нейкай канкрэтнаю сцэнай, якая так ці інакш закранае тыя далёкія ўжо будні.

І ў той працы была своеасаблівая "градацыя", уведзеная ў залежнасці ад працы: па ўзросце, па сіле, па ўменню. Таму, з'яўляючыся школьнікамі, недзе ўжо ці не з пятага класа беглі з віламі і торбачкамі пасля паўдня да калгаснай ("брыгадзірскай") хаціны (наймацца на дарослую працу, за якую потым і грошы яшчэ будуць плаціць, праўда, атрымліваць іх будуць матулі, ды яшчэ і пахвальвацца паміж сабою: «Ото ж, мой за месяц на дваццаць рублёў набегаў!»), дзе брыгадзір адбіраў людзей на скірдоўку. Божа! Як умільна мы на яго глядзелі, як імкнуліся зазірнуць у ягоныя вочы з адной толькі мэтай-просьбай, каб не сказаў ісці дамоў,

“не завярнуў дахаты, бо ты яшчэ замалы, а ў мяне і дарослых ставіць няма куды”. Калі гучалі такія словы, то многія не вытрымлівалі і пачыналі адразу ж уголас выказваць сваё незадавальненне, плакалі, вылі, не саромеючыся ні прысутных, ні таго, што хвіліну назад даводзілі ўсім пра сваю “дарослаcць”. Здаралася, што брыгадзір мог і перамяніць рашэнне, асабліва калі падаваў у абарону малых голас нехта са старэйшых: «Няхай, можа, ідуць... Няхай, таго, вучацца каля нас... Мы ж таксама не вечныя, а з кожным годам усё меней і меней людзей у калгас прэцца... Уцякаюць на лягчэйшы хлеб, з’язджаюць па гарадах. Назад асабліва ніхто не цягнецца. Няхай вучацца ля нас... А што сілы ў іх малавата, то не паспеем азірнуцца, як уздужэюць, стануць на сваё мужчынскае крыло».

Толькі розныя былі і дарослыя. Сустракаліся, найболей, людзі спагадлівыя, шчырыя, якія дапамагалі, навучалі, падтрымлівалі і стрымлівалі ад празмернага запалу, а былі і такія, якія, параготваючы, пры ўсіх, нікога і нічога не саромеючыся, у адкрытую заяўлялі: «Дай яго, брыгадзір, мне ў памочнікі, то заўтра ён прасіцца на працу больш не будзе. Я яго за дзень супакою і адвучу». На вялікі жаль, гэта была не пустая пахвальба. Такі пустадомак так і паступаў, заганяў няшчаснае дзіця да такой ступені, што такі “працаўнік” на наступны дзень ні за што на свеце больш не пагаджаўся ісці на калгасную працу разам з дарослымі. Як яго хатнія ні прасілі, як ні пагражалі, чым толькі не прываблівалі. Усё, “ахвота” была адбіта назаўсёды. Тады дамаўляліся, што малы падасцца «на начную працу ў калгасныя зернясховішчы... Там не надта цяжка, там адно з зернем (ці ў зерні) нагуляешся».

Самая лёгкая праца была на падборцы рэшткаў саломы пасля таго, як яе сцягвалі валакушамі. Яе трэба было падбіраць віламі, скідваць у трактарны прычэп і вазіць да будучай сцірты. На такой працы былі занятыя жанчыны, а ўжо ля іх – мы – хлапчукі. А вось самая адказная... Гэта нават не сцягванне валакушамі абмалочаных жытнёвых “капніцеляў”, а вяршэнне сцірты. Менавіта на гэтую працу на ўсё лета быў прызначаны пастаянны склад (“састаў”), да іх ужо штодзень дадавалі аднаго-двух памочнікаў. Я меў гонар, будучы шасцікласнікам, узначаліць такую брыгаду.

Усё здарылася неяк нечакана: аднаго разу, недзе адразу пасля паўдня, з-за блізкага лесу пачала пагрозліва паказвацца вялізная, грувасткая хмара, ужо ў паветры адчувалася навальніца. Само паветра адразу пасвяжэла, нібы набрыняла будучай вільгаццю. А ў нас атрымалася неспадзеўка: наша сцірта не была завершана. Тая брыгада сціртаўшчыкоў працавала так, як мокрае гарыць. І што самае непрыемнае:

сціpта не была завершана з вільчыку, з таго верху, адкуль усё і зацякае, і гноіць потым сціpту дазвання. Аднекуль прыскочыў усхваляваны брыгадзір і пачаў, на прамілы Бог, прасіць у жанчын, каб яны кінуліся і выручылі, але... Але, як часта ў жыцці здараецца, у адказ пачуў, што “то тая вышыні баіцца, у той дык усё цела дрыжыць, а тая, прахадзіўшы гэтулькі гадоў на сціpтоўку, увогуле не ведае, як гэта вяршыць сціpту; усё гэта выдавалася рэзка, на розныя галасы”. Там, атрымліваецца, і прыспела мая часіна: зрабіў пару крокаў наперад і стаў ля брыгадзіра. Трактарыст падняў нас механічным “капніцелем” на сціpту і мы пачалі на ёй завіхацца ўдваіх. Знізу, задраўшы галовы, цікавалі жанчыны. Іх на чым свет стаіць лаяў трактарыст (ён не меў магчымасці да нас залезці, бо яму трэба было падаваць нам салому сваімі хваткімі жалезнымі “віламі”), а мы шчыравалі. Усё б нічога, толькі брыгадзір быў інвалідам першай групы! Так азвалася на ім страшэнная вайна. Правая рука ў яго ўвогуле не дзейнічала і ён падбіваў салому адной левай. Заўважыўшы, як лоўка я закрываю вільчык, хвіліна ад хвіліны яшчэ нават і ўскокваючы на самы верх і “прагульваючыся” – утоптваючы яго, ён прахрыпеў, што будзе ў мяне на “дапамозе”. На самой справе брыгадзір падаваў мне пад ногі салому, а я імгненна яе прыбіваў і ўладкоўваў. Не ведаю, як мы з ім вытрымалі, бо працаваць давялося ўсяго недзе хвілін дзесяць (пятнаццаць – сама болей), а прыкрылі верх сціpты метраў на трыццаць. На самым краі нас заспеў дождж. Але мы ўніз так і не спусkaліся: зашыліся ў салому і сцішыліся. Здавалася, выразна чуваць было, як б'юцца нашы сэрцы. Ужо калі перадыхнулі, то толькі тады дзядзька Валодзя запытаўся, дзе я гэтаму навучыўся? Давялося адказаць дзедавым выслоўем: «Дай, Божа, усё ўмець ды не ўсё рабіць! Прыглядваўся, як старыя працуюць. Ды і дома мяне то дзед, то тата стог вяршыць ставяць. Так ужо атрымліваецца, што больш дарослага за мяне памочніка ў іх няма. Тут жа галоўнае – зразумець і старацца акуратна і старанна выкладваць “сцяну” і верх і ўвесь час таптаць і таптаць сярэдзіну, каб яна потым, калі што якое, не зацякла і не прабілася да самага нізу».

Наступны “развод” ля калгаснай хаткі пачаўся з запытання брыгадзіра: «Бачылі, што ўчора рабілася?». Жанчыны весела загаманілі ў адказ. Мужчыны няўцямна круцілі галовамі, маўляў, нам не давялося бачыць, бо падкошвалі жытнёвую далінку: «Цяпер Алёшка будзе вяршыць сціpту, а вы, – торкнуў пальцам на дзядоў Пятра і Сцяпана, – будзеце яму дапамагаць па краях. Хлапчынка працуе шчыра. Калі недзе не ведае, то падкажыце. Гэтага трэба навучаць, з гэтага толк будзе. Яшчэ вам дам у падмогу дваіх чалавек, якія стануць падаваць салому».

Вось так я і стаў “саламяным” начальнікам. Дзяды, светлая ім памяць і мая вечная падзяка, вельмі дапамагалі: і словам, і недзе фізічна. Але менавіта тады я навучыўся, як правільна ў любой сітуацыі трымаць вілы, як імі ўколваць, каб браць патрэбную масу саломы, як яе пераварочваць, каб яна клалася з першага разу, і многае іншае. Мы з імі і з працы заўсёды ішлі разам. Нас і звалі ўжо “сціртнікамі”. Я потым і на пахаванні сваіх старэйшых сяброў хадзіў, каб правесці іх у апошні зямны шлях. Добрае яно ўсё роўна не забываецца. Яно выплыве з тваёй памяці, нагадвае пра сябе.

У тое лета мне давялося ўбачыць і іншую “саламяную навуку”. Нам у дапамогу дзядзька Валодзя даў двух хлопцаў. Дарослыя ўжо дзецюкі. Ім выпадала восенню ісці ў войска. Адзін з іх то працаваў так сабе. Можна было трываць ягоную неахайнасць і ляноту. А вось другі... Другі ўвогуле не хацеў нічога рабіць. Сядзеў сабе сярод саломы і ўсё на тым. Ці абапіраўся на вілы і пачынаў драмаць. Мог, стаяўшы, і заснуць. Я нічога не мог яму ўчыніць, бо быў намнога слабейшы, але затое нехта з дзядоў сказаў брыгадзіру, што нам такі “памочнік” не трэба. Тое, што зроблена за дзень, дзеліцца на ўсіх, а ён жа, атрымліваецца, нічога не робіць. Лайдакоў то ўсюды хапае, але ў такі спякотлівы ды адказны час хацелася б, каб поруч з намі быў нехта больш увішлівы: на якога ні глядзець з дакорам не трэба было б, ні словам падганяць. Той хлопец, дарэчы, прыходзіўся нашаму брыгадзіру родным пляменнікам. Ён і дома нікога слухаць не жадаў, нічым не дапамагаў, то і ў калгасе на надта рваўся. Вось ягоная маці і звярнулася да дзядзькі Валодзі, каб той паспрыяў і яе сына ўзялі на сціртоўку, а ён ужо там “хоць сабе на вечар праводзінаў у войска заробіць...”. “Зарабіў”, бэйбас, не толькі на праводзіны, але адначасова займеў яшчэ і добрую навуку, як яно можа ў жыцці здарацца. Каб і наперад запомніў: сабе ў памяці адклаў і іншым нагадваць таксама не забываўся.

Недзе пасля паўдня брыгадзіраў вазок спыніўся непадалёку ад сцірты. Але дзядзька Валодзя не злазіў з яго, а сядзеў і пільна назіраў, як “працуе” прыгаданы лайдак. Потым паклікаў свайго памочніка і нешта ціхенька таму прамовіў. Праз пару хвілін магутны голас паклікаў нашага “адстаючага” на зямлю. Той весела саслізнуў па саломе ўніз. А яшчэ праз пару хвілін на ўсё поле загучаў дзікі голас-верашчанне. Дзяды, унурыўшыся ў працу, ці то не чулі, ці то не звярталі ўвагі. Я перайшоў на другі бок сцірты і ўбачыў выключную сцэну калгаснага “выхавання”. Выключную, але затое, як потым аказалася, надзвычай эфектыўную! Наш “памочнік” ляжаў прама на ржышчы і адсвечваў голым азадкам. На ягоных плячах сядзеў памочнік брыгадзіра, а сам

дзядзька Валодзя хвацка "рэзаў" сваёю леваю рукою лазовым дубцом (відаць, прыпасеным зараней) у тое месца, адкуль ва ўсіх ногі растуць. Я паклікаў дзядоў, каб і яны дух перавялі. Тыя стаялі моўчкі, толькі галовамі ўхвальна пакручвалі ды потым адзін з іх прамовіў: "Але ж і ўжраўся!". Калі "ўрок" закончыўся, то брыгадзір толькі рукою паказаў і ягоны "вучань" быў ужо ля нас на сцірце. Здаецца, што і штаны ўжо на версе нацягваў. Затое да канца таго летняга сезона ён адпрацаваў ужо без нейкіх там заўваг і без дадатковага "фізічнага выхавання".

Толькі ўсё тут зразумела, бо грунтаваліся гэтыя ўспаміны на ўласным вопыце, на практычных здабытках маіх продкаў, якія яшчэ тады актыўна працавалі побач са мною. А вось як тая самая салома пачала прыходзіцца чалавеку неабходнай падмогай, адназначна адказаць цяжка. Калі гэта звязваць з тым, што салома доўгі час выкарыстоўвалася ў якасці своеасаблівага (таннага і празмерна даступнага) матэрыялу, то тут можна ўявіць сабе, што тысячагоддзі назад, заспеты недзе непагаддзю, здагадаўся ж нехта ўскінуць над галавою (ці і на галаву) жменю ці ўжо і тады сноп зжатых злакаў. Так і заўважыў, што пры пэўным размяшчэнні (пад нахілам) салома не надта "ахвотна" прапускае вільгаць і што ёю лёгка замяніць галіны ды якое зелле, сабранае і пакладзенае на часовае (няхай бы сабе і так!) жытло. Яна ж і лягчэйшая намнога, і зручнейшая пры ўкладцы (асабліва калі гэта робяць умелыя рукі). Незамянімай яна стала тады, калі лясы пачалі адступаць перад



*Палеская хата з саламянай страхой*

знішчальнаю сякераю чалавека. Гэта быў не аднадзённы, а надзвычай працяглы перыяд практычнага накаплення вопыту, які паступова перарастаў у навыкі, якімі карысталіся пры выкананні розных гаспадарчых прац і промыслаў.

А на заранку чалавецтва салому спачатку не ўмелі выкарыстоўваць, не знайшлі для яе належнага ўжытку. Нават у беларускай народнай легендзе пра гэта згадваецца, праўда, даволі своеасабліва, бо вынікала, што нават жыта з'явілася на зямлі не па маленнях людзей, а па просьбе ... сабак: «Больш усяго галадалі сабакі. Таму яны, узняўшы свае морды ўверх, страшна завылі, просячы ў Бога хлеба. Бог пачуў іх просьбу і кінуў ім з неба адзін жытні колас. Але сабак было вельмі многа, дык адзін колас не мог накарміць іх усіх, таму яны сталі яго адбіраць адзін ад аднаго і рваць у розныя бакі, пакуль нарэшце не разарвалі яго на шматкі і не патапталі нагамі» ("Адкуль жыта") [11, с. 74]. У іншай легендзе звяртаецца ўвага на тое, што сам Усявышні займаўся першым севам жыта на зямлі: «Як Бог першы раз сваёю рукою пасеяў жыта, то такое было харашо! Зярняты, як боб, каласы – то так, як сейрукі ў гаросе, ад самага нашня ўверх раслі, а расло на салому высокае, аж у трубу вілося...» [11, с. 75]. Як бачым, зыходзячы са згаданых прыкладаў, нашы продкі не саромеліся ўказваць на тое, што і іхнія дзяды-прадзеды таксама доўга не разумелі, "не маглі дацяміць", як там ды што да чаго будзе прыходзіцца.

Не выключана, што з самага пачатку салому проста спальвалі на палетках і попел служыў угнаеннем. Тым болей, што салому тады палілі не адну, а куды больш старанна расчышчаючы сваё новае ляда, разам з суччам ды з каранямі, якія ці не згарэлі ці не былі выкарчаваны (прапушчаны) з першага разу. Таксама прадумана: і прыбіраць нічога лішні раз не выпадала, і мышам асаблівага раздолля не было, і з'яўлялася нейкая, няхай сабе самая кволая, надзея на тое, што будучы ўраджай на такім шляхам угноенай ніве будзе крыху спарнейшы, чым леташні. Прыручанай, свойскай жывёлы ў продкаў яшчэ не існавала, таму на гной ніякіх спадзяванняў не было. Ды і тое, што арганічныя адходы жывёл і звяроў прыдатныя для ўгнаенняў, не адразу ўбілася ў галаву.

Тое, што салома лёгка гарэла (сухая ўспыхвала імгненна і агонь пажыраў яе так сквапна і так хутка, што не паспявалі азірнуцца, як на месцы заставалася толькі гурбачка попелу), добра ведалі, таму здаўна лічылі, што салому тушыць лепей не трэба. Усё роўна справа гэта безнадзейная. Лепей глядзець, каб полымя не перакінулася і не шухнула потым на якім іншым гаспадарчым будынку, а ў час небывалай засухі, то і на палеткі і на лес, і на «ўсё тое, што ўвогуле можа гарэць...». Таму

невядома, колькі хацін згарэла, а цяпер ужо такую статыстыку ніхто ўвогуле не здолее даць, бо салома як дахавы матэрыял болей не выкарыстоўваецца. Нават у музейных комплексах яе замянілі больш трывалымі і вогнеахоўнымі матэрыяламі. А ў даўнія стагоддзі «не паспела хмара выйсці, а ўжо крычыцца (нават не галосіцца, бо справа была надта ж будзённая), што нечыя хата гарыць. Значыцца, ужо ляснула маланка. Страху, значыцца, салому, і сам будынак не вельмі ўжо шкадавалі. Найбольш убіваліся над нажытай маёмасцю. Нейкае ж дабро ўсё роўна збіралася ў хаце, было паказчыкам заможнасці канкрэтнай сям'і. Гавораць, што даўней нават вопратку ды жанчынамі прадзенае не хавалі. А вывешвалі на шастках, каб было бачна, што і ў гэтай хаціне жывуць не самыя бедныя. Потым ужо папрыдумвалі ўсялякія «бодні» ды «куфры».

Галоўнае заключалася заўсёды ў тым, каб захаваць чалавечыя жыцці, зберагчы людзей. А ўжо астатняе... Ніколі не забудуся, як гарэлі спякотным днём дзве вялізныя сцірты (здагадаліся ж іх паставіць яшчэ амаль упрытык!) у суседняй брыгадзе. Навальніцы не было. Маланка жахнуць не магла. Падумалася, што нехта няўдала закурыў. Але на самой справе атрымалася яшчэ куды празаічней: з выхлапной трубы праязджаючага з валакушай гусенічнага трактара вылецела ўсяго толькі невялічкая іскрынка. Наш брыгадзір не сваім голасам крычаў, каб адводзілі тэхніку і людзей! Людзей! На салому ніхто і ўвагі асаблівай не звяртаў. Гэтага дабра яшчэ насціртуем! Мне чамусьці тады падавалася, што гэта ж згарэла значная сума грошай. Толькі калі даведаўся, што па калгасных расцэнках тона саломы каштуе ... дванаццаць капеек, то быў яшчэ больш загнаны ў кут, бо не мог зразумець: а чаму ж гэтак танна?

Маланка – маланкай, а неасцярожнае абыходжанне з агнём? Аднаму пану Богу вядома, колькі разоў з-за разяватых гаспадароў (хапала і жанчын, не саступалі і мужчыны!) гарэлі хаціны, падворкі, выгаралі цэлыя вёскі. Добра, калі абыходзілася без чалавечых ахвяр, то такая падзея гадоў праз колькі, калі ўжо па-новаму адбудоўваліся, прыгадвалася як цікава-займальная гісторыя. А хіба не даводзілася некаму з нас чуць, як пакрыўджаны ці зняслаўлены некім чалавек пагражаў, ужо нават не асцерагаючыся і не хаваючыся, што «я яму яшчэ чырвонага пеўня пад страху абавязкова пушчу, нікуды ён ад мяне не дзенецца!». Такім чынам не толькі пастаянна палохалі, але і здзяйснялі. Потым цягнулася адвечная варагнеча, сваркі, спрэчкі, зрэдчас здараліся і забойствы. Усё з-за доўгіх языкоў ды з-за злых намераў. Ні тая языкатасць, ні прага помсты ніколі не прыціхалі.

А дурных і дурноты хапала ўсюды і заўсёды на беларускіх абшарах. У вёсцы Новы Двор, што на Піншчыне, да гэтага часу параготваюць з мясцовых жыхароў. Дакладней, з таго, як падпітыя мужчыны (а можа, яны і ўвогуле не ўжывалі спіртнога, а дурноты і так хапіла!) у нядзельку, седзячы на прызбе адной з мясцовых хацін і пра ўсё, што ўжо можна было, перагаварыўшы, заўважылі нечыю сучку, якая сноўдалася непадалёку ад іх. Спачатку не звярнулі асаблівай увагі. Вось якая яшчэ навіна: сучка па вуліцы шнырыць. Ды такога і ў дзень, і ўночы нагледзішся. У сабак ніколі работы пільнай няма. Яны і пабегаць могуць. А потым некаму ўсё ж прыйшла ў галаву адмысловая думка і ён падзяліўся ёю з іншымі:

«– А што ж гэта мы сядзім ды сумуем? Ведаеце што, давайце чынім? Вунь на плоце вісіць жаночая спадніца. То давайце сучцы жаночую спадніцу апранем. Яна будзе бегаць, а ўсе чыста стануць рагатаць. Такога ж яшчэ раней не бачылі, каб сучка і ў спадніцы. Толькі ж падумайце, колькі народу гэта ўсё ўбачыць: сёння ж свята, ніхто не працуе, усе на прызбах сядзяць ды языкамі мянташаць. Пра гэтакі “цуд” доўга гаманіць стануць...».

Дурань прапанаваў, не больш разумныя злавілі сучку і апранулі на яе спадніцу. Сучка і не надта супраціўлялася. Мабыць, і ёй спадабалася новая апранаха. Адпусцілі яе, рагатнулі і ўсё на тым, бо сучка па вуліцы не пабегла, а ўлеглася спаць непадалёку ад іх, прама на гарачым сонцы. Мужчыны па-ранейшаму засумавалі і лянотна пераводзілі позіркі адзін на аднаго, але іхні завадатар не супакойваўся. Ён і тут не даў доўга так сядзець, праявіў невычэрпны “інтэлект” і надалей:

«– А давайце зараз мы ёй пад спадніцу саломы напіхаем і падпалім... Пабачыце, што цяпер намнога весялей будзе... Яна ж папрэ ў возера, каб патушыць агонь, а ўсе, хто ўбачыць, з рогату будуць падаць... Давайце... Чаго, чаго, а саломы ў любога з нас хапае...».

Яно то і так, аказалася, што саломы ў іх сапраўды хапала: і ў гаспадарках, і ў галовах. Настояў пустадомак на сваім, пераканаў і тут людзей. Усё зрабілі, як мае быць. Толькі зноў атрымалася неспадзеўка, бо сучка паджгала не да возера, а па вуліцы. Ды не проста ляцела так сабе, па праезджай частцы, а ад болю і страху кідаючыся з падворка ў падворак. Назіраючым вяскоўцам было весела да таго часу, пакуль з аднаго з двароў не пачулася адчайдушнае, прарэзліва-гартаннае:

«– Людцы!!! Гарым!!! Гарым!!! Ой, Божачка, ой, ясны, гарым!!!».

Мужчыны паперлі на голас... Прыбегчы то яны прыбеглі і даволі хутка, але не ведалі, што рабіць... Стаялі, нібы здранцвелыя... Адно што разгублена лыпалі вачыма, бо гарэла ... уся чыста вуліца. Ды і надвор’е

тады спрыяла: стаяла такая гарачыня, што ажно торф на балоце болей чым на метр у глыбіню патрэскаўся і вады ў калодзежах амаль не было.

Адным словам, згарэла тады больш за дваццаць вясковых хацін і больш за трыццаць хлявоў ды свірнаў. Калі прыехалі з Пінска следчыя, то ажно прысвіснулі, бо такое і ў часы вайны рэдка калі ўбачыш. Калі дакапаліся, з чаго ўсё пачалося, то акрамя вялікіх штрафаў мясцовым весельчакам і жартаўнікам павыпісвалі і па пяцьдзесят лозаў у "сёдлы". Тут ужо было не да жартаў, бо нават калі падалі паперы, каб пацярпеўшым выплацілі страхоўку, дык аказалася, што пацярпеўшыя – гэта адзін-два вяскоўцы, а астатнія самі ж сябе (праўда, пры дапамозе няшчаснай сучкі) папалілі. Так і грошай не атрымалі і без хацін засталіся.

Менавіта з тае падзеі і суправаджае навадворцаў па жыцці славутае:

«– Го, сучка гозыро запалыла!» (Яны калі прамаўляюць, то "гокаюць").

Часта прыгадвалі, што такія пажары былі своеасаблівым "прыкрыццём" больш цяжкіх і жудасных злачынстваў: забойстваў, рабаванняў з забойствамі і г. д. Лічылі, што «салома, як шалясцела, то так і будзе шалясцець, – нічога не скажа, а агонь то і салому зглыне, і ўсё, што магло супраць іх саміх сведчыць, як карова языком зліжа...». Тут нельга абысціся і без згадванняў разнастайных бітваў-сечаў, вайсковых канфліктаў, войнаў, калі любы з заваёўнікаў (недалёкі ён быў ці з замежных краін) выпальваў мясцовыя паселішчы дазвання. Салома ў такіх дзеян-



*Палеская хата на ўскрайку возера*

нях адно толькі спрыяла. Падсунуў пад страху паходню ці якую галавешку і праз хвіліну ўсё ўжо трашчала ў сквапным агні. У час такіх калатэчаў ніхто пра наступствы не думаў і ніхто нікому іншаму асабліва не спачуваў.

Паступова чалавек выдатна асвоіў прыёмы найскладанейшага саломапляцення. Як жа яшчэ яго можна назваць, калі пад майстравітымі рукамі салома ператваралася не проста ў гаспадарчыя прадметы, а ў высокамастацкія творы. Так, мы не агаварыліся. Нездарма ж навукоўцы слушна адзначаюць: «Такія пляцёнкі з 4 (зубатка) і 4,7, 11 саломінак (елачка) сшывалі льнянымі ніткамі або конскім воласам. Аб'ёмнымі пляцёнкамі выплятаалі пераважна дэкаратыўныя прадметы. У канцы XVIII – пачатку XIX ст. гэтай тэхнікай саломапляцення рабілі саламянае аздабленне царкоўных іканастасаў – да нашых дзён дайшлі ўнікальныя ўзоры саламяных царскіх варот з цэркваў в. Демяшэвічы Пінскага, Вакулічы Драгічынскага р-наў і Гродзенскага Барысаглебскага манастыра. Такой жа тэхнікай аб'ёмнага пляцення ў выглядзе ромбаў і вітага жгута з 4-5 саломак карысталіся для вырабу шкатулак» [26, с. 446].

У іншым навуковым выданні адзначаецца наступнае: «З саламяных жгутоў, перавітых лазой, выраблялі разнастайны посуд для збожжа, мукі, адзення, каштоўных рэчаў (шыяны, карабы, сявенькі, гарцы і інш.), а таксама пчаліныя вуллі (саламянікі). Іх мастацкае аблічча стваралася выразнымі формамі, своеасаблівым дыяганальным дэкорам, утвораным кантрасным спалучэннем карычневых дубцоў з залацістымі жгутамі саломы. Унікальная з'ява ў сусветным мастацтве – выкарыстанне саломы ў вырашэнні музыкальна-дэкаратыўных задач, для аздаблення інтэр'ераў палескіх цэркваў, галоўным чынам іканастасаў. Захаваліся іх фрагменты – царскія брамы канца XVIII – пачатку XIX ст. з цэркваў Піншчыны, усе арнаментальныя элементы якіх цалкам сплецены з саломы і замацаваны на драўляных каркасах. Аснова іх дэкору – звітыя гранёныя пляцёнкі і чатырохгранныя ўстаўкі» [16, с. 335].

Пра тое, што саламяныя царскія вароты былі ў царкве XVII ст. у суседняй вёсцы Дабраслаўка, я ўпершыню пачуў ад знаёмага дзядзькі Мікалая Мохара, які ўсё сваё доўгае жыццё пражыў у тым самым паселішчы. Здарылася гэта ў другой палове 70-х гадоў мінулага стагоддзя, падчас маёй першай самастойнай вылазкі па запісу фальклору ў суседнюю вёску. Раней запісваў толькі ад сваіх аднавяскоўцаў, а тут падаўся і да дабраслаўцаў. Праўда, тады найбольш запісваў пра гадаў (вужоў, гадзюк, слізнякоў), актыўна назапашваў матэрыял для будучых прац па вусна-паэтычнай творчасці. На тых шматлікіх запісах пазней базіраваліся асновы маёй доктарскай дысертацыі.

На “салому” выйшлі выпадкова. Так заўсёды здараецца, калі побач з асноўнымі пытаннямі задаеш і “наводзячыя” ці дадатковыя. Я распытваў пра славутага мясцовага знахара, які ўдала залечваў любыя змяіныя ўкусы (пераконваў дзядзька, “што нават вужыныя”, якія амаль ніхто лекаваць не браўся, бо не хапала сілы і здольнасці, каб перамагчы той чорны вужыны яд). А гэты толькі пашэпча, паглядзіць, потым скажа, каб яшчэ пару разоў да яго прывялі ці прывезлі ўкушанага і ўсё на тым. Ён шаптаў і “завочна” – на адлегласці, калі хворы заставаўся дома. Слава пра яго кацілася па ўсім чыста Палессі. Павінен агаварыцца, сярод беларусаў існавала цвёрдая ўпэўненасць, што вужыны ўкус намнога мацнейшы за гадзючы і ніякія мае спробы даказаць, што вуж – істота ўвогуле няшкодная і неядавітая, ніякага поспеху не мелі. Палешукі цвёрда стаялі на сваім (на пазіцыях сваіх продкаў, атрымліваецца).

Мікола Мохар і заікнуўся было, што той знахар меў яшчэ адну надзвычай выдатную здольнасць. Адпаведна ляснік, а працаваў дзядзька ў мясцовым лясніцтве, і напрасіўся на чарговае пытанне: «А што ж гэта за здольнасць такая ў такога чалавека была? Хапіла б яму і аднаго знахарства». Але Мохар адказваў сур’ёзна, звяртаючы на гэта і маю ўвагу: «Чалавек быў, мабыць, Алеська, Богам пацалаваны тры разы пры нараджэнні. Ён жа ні чытаць, ні пісаць не ўмеў, а ў любым механізме разбіраўся. Зробіць так, што і вучоныя майстры дзіву даваліся. Сваё знахарства то ён, па ягоных жа словах, я сам (Мохар. – *А. Н., Я. Н.*) таго дзеда застаў ужо ў глыбокай старасці, пераняў ад уласнага дзеда. Атрымліваецца, спадчынны ў іх гэта быў занятак – знахарства. А яшчэ стары той з саломы мог выплесці любую штуку. Так і гаварыў: “Вы толькі пакажыце ці раскажыце мне так, каб я мог сабе ўявіць, а астатняе, то гэта ўжо не ваша справа. Гэта я ўжо сам дадумаю”. Яго і паважалі, і баяліся адначасова. Гаварылі, што любую хваробу запроста мог на чалавека напусціць. Вось нехта ўчыніць нешта непрыстойнае, непрывабнае, то потым і адплочвае за гэта сваім здароўем. Не, да самае смерці нікога, казалі, не давёў. Людзей шкадаваў, караў толькі вінаватых...».

Мне карцела даведацца пра іншае: «Дзядзька Мікола, а з саломы што ўжо ён такое вырабляў, што вы яго з такім захапленнем прыгадваеце? Не звычайныя ж брылі ды каробкі. Нешта ж такое адштукаваў чалавек, што застаўся так надоўга ў памяці людской?». Ляснік усміхнуўся: «Ды ўжо ж... Ты ўнука таго самага чалавека ведаеш... Таго самага, што жыве ля нашага вазярца... Ты ж ад яго многа запісваў, а пра гэта запытацца не здагадаўся. Бачыш, як бывае ў жыцці. Ягоны дзед, калі адмянілі для сялян прыгон, то вырашыў зрабіць вяскоўцам і царкве мясцовай у гонар такой важнай падзеі своеасаблівы падарунак. Неяк

наш бацюшка, той, які тады ў царкве правіў, пачаў гаварыць, што за Пінскам жывуць надзвычай майстравітыя людзі. У іх дайшло да таго, што царскія вароты ў сваім храме з саломы сплялі. Ды так хораша, вачэй не адарваць ад іх, глядзяцца. Аказалася, што бацюшка сам быў родам з тае мясцовасці і расказваў пра тое, што бачыў на ўласныя вочы».

Вяскоўцы папрыціхлі і ўважліва слухаюць. Некаму і не надта верыцца, што царскія вароты ды можна са звычайнай саломы выплесці. Так бы і разважалі, калі б не адзін шустры селянін, які спакойна прамовіў: «Майстравітыя, кажаце, то і мы ж не горшыя... Пакажыце толькі, якія гэта вароты ў царкву вы з саломы мець хочаце? Растлумачце, то і ў нас такі цуд з'явіцца. Каб нідзе не думалі, што ў нас вяскоўцы ў нечым саступаюць. Зробім і мы такое, што вохнуць ды здзівяцца тыя, хто будзе прыходзіць паглядзець. Толькі мне трэба будзе ў памочнікі добры цясляр, бо з саломы ўсё не атрымаецца. Яна ж самастойна трымацца не стане, ёй апора абавязкова трэба».

Чалавек і далей гаварыў, нешта патлумачваў, але далёка не ўсім прысутным былі зразумелыя ягоныя словы. Ясная справа, не ўсе гаспадары, атрымлівалася, былі такія ўвішныя ды ўмелыя. Бацюшка аднёсся да прапановы даволі стрымана: магчыма, быў ужо жыццём навучаны і ведаў, што сказаць – гэта адно, а зрабіць – зусім іншае. За лепшае будзе пачакаць, каб ужо напрыканцы ацаніць адштукаванае.

З таго дня і засеў вясковец за сваю працу. Спачатку хадзілі з суседам, які ўзяўся яму дапамагаць, і ўсё нешта ў царкве вымяралі, а потым ужо шчыравалі кожны ў сваім падворку. Ім трэба было ўсё прыкінуць, каб зразумець, як яны стануць працаваць далей. Сказаць, што занятак гэты быў складаны і важны – нічога не сказаць. Колькі разоў, злуючыся ды заходзячыся, здавалася б, ад бяссілля, дабраславец нешта сам сабе гаварыў, крычаў, пляваўся, але імкнуўся не выказваць благіх слоў, бо ж рабіў "святую" рэч і яна ж будзе потым знаходзіцца ў царкве. Не дапускаў да сябе асабліва цікаўных, бо быў перакананы, што ёсць вочы і ліхія, таму яны могуць напсаваць пры выкананні. Некалькі разоў прыходзіў бацюшка, старанна ацэньваў зробленае, нешта падказваў. Магчыма, што і майстру неабходна была такая парада, бо выпадала размясціць правільна на варотах узоры з біблейскіх матываў і тэкстаў, а хто ж, як не царкоўны служка, мог пра гэта лепей за астатніх ведаць.

Вяскоўцы, дык тыя па-свойму дапамагалі майстру: яны вызвалілі селяніна ад усіх гаспадарчых спраў, узялі добраахвотна іхняе выкананне на сябе. Маўляў, ты працуй над варотамі, а мы ўсё ў полі ды на па-

надворку табе станем падтрымліваць у належным парадку. Жонка, і тая, якая звычайна касавурылася ды трымала мужа "ў чорным целе", ганарылася, што яе чалавеку ўдзяляецца гэтакая павага і ўвага. Але ж і вясковец стараўся. Ягонай задачай было зрабіць выдатны ўзор саламянага мастацтва, каб не знясламіцца перад тымі, хто чуў абяцаючыя словы, але асабліва карцела зрабіць так, каб даказаць, што і дабраслаўцы, ні ў якім разе, не саступаюць у сваіх талентах іншым. Мала што там гаворыцца, калі ацэняць наша, то і пра нас слова-другое недзе ж абавязкова скажуць.

Амаль год у майстра пайшло на тое, каб усё зрабіць ды давесці да ладу. З суседам вечарам занеслі свой выраб у царкву і там прыступілі да зборкі і ўстаноўкі. Тут ужо без бацюшкі ніяк нельга абысціся: ён круціўся пад рукамі, ажно свяціўся ад задавальнення і ўсё дзякаваў і пана Бога за тое, што "наставіў вяскоўцаў на шлях ісцінны", што "пастаянна сачыў за майстрамі, што не даў магчымасці ў нечым схібіць, што яны давялі да завяршэння спланаванае і зараз справа знаходзіцца ў стадыі лагічнага завяршэння". Майстры яго не супакойвалі і не спынялі, бо ім гэтыя словы і самім надзвычай прыемна было чуць.

Прыхаджане ўпершыню ўбачылі той рукатворны цуд, выкананы іхнімі вяскоўцамі, праз пару дзён. Тады якраз выпала свята Сёмухі, якое ў нас па-вясковаму называецца Тройца. Мала гэтага, бацюшка паспеў запрасіць на такую своеасаблівую ўрачыстасць і сваіх калег з іншых, бліжэйшых, прыходаў. Свята атрымалася выдатнае: і боскае, і чалавечае, і майстэрскае. Нават спецыяльную службу адслужылі ў гонар тых майстроў-дабраслаўцаў.

Запытаўся, вядома ж, у дзядзькі Мікалая: а чаму сёння няма тых царскіх варот, чаму яны не радуюць у нашыя дні людскія вочы, не саграваюць сваёй "боска-саламянай" цеплынёй душы прыхаджан? Ляснік спахмурнеў: «Ай, сакаліку, гэта ж вайна, як ведаеш, была... Яна ў нашай вёсцы многа шкоды ўчыніла... Недзе тады і саламяныя царскія вароты спалілі... Шкада, што такая вялікая праца марна прапала... Самае складанае, што цяпер і майстроў у Дабраслаўцы няма, якія б маглі паўтарыць такое выкананне саломапляцення...». Падумаў, паразважаў і, нібы самога сябе супакойваючы, прамовіў: «А з іншага боку, то яны б і не дабылі да нашага дня тыя саламяныя царскія вароты... Салома ж яна не такая ўжо і даўгавечная... Усё роўна б сатлела, рассыпалася... Як бы там ні было, але шкада... Так бы хоць напамін пра нашых майстроў быў...».

Хораша разважаў чалавек, з вялікай павагай да продкаў, да людзей, якіх ён сам не ведаў і ніколі не бачыў, але талент якіх перажыў іх саміх.

Недзе гадоў праз дзесяць, калі я навучаўся ўжо ў дактарантуры пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, мне закарцела зайсці ў Музей старажытнабеларускай культуры, які і да сённяшняга дня існуе пры гэтай навукова-даследчай установе. Паволі пераходзячы ад аднаго стэнда да другога, углядаючыся ў экспанаты, запісваючы ў свой блакнот найбольш цікавае, я нібыта натыркнуўся на нешта непераадольнае: прама перада мною адсвечвалі, амаль што не страціўшы адметны бляск і непаўторнасць, саламяныя царскія вароты з ... Дабраслаўскай царквы. Аказалася, што яны не згарэлі падчас войнаў, іх ніхто не спаліў, не выкідваў на падворак, а іх акуратна знялі і перавезлі ў Мінск навукоўцы інстытута, якія, карыстаючыся сумнавядомай барацьбой з "царкоўным цемрашальствам", стараліся вывезці найбольш каштоўныя і рэдкія прадметы рэлігійнага культу з разбураемых, зачыняемых, перакваліфікуемых храмаў і цэркваў.

І ўсё ж, гучыць даволі арыгінальна: салома, саломка і высокае мастацтва. Інакш і не назавеш пляценне такіх царскіх царкоўных варот. Праўда, нам падаецца, што куды правільней было б пазначаць гэта больш дакладна і канкрэтна: аклады для царскіх варот. Цяпер жа стала вядома і тое, што народныя майстры выпляталі і аклады для паасобных царкоўных абразоў.

А хто з беларусаў не чуў пра легендарнага Міколу Гузікава, адмысловага віртуоза-выканаўцу на саламяных цымбалках, які паходзіў родам са старадаўняга Шклова. Потым яго вазілі па ўсёй Еўропе, каб ён там здолеў прадэманстраваць уласнае выканаўчае майстэрства перад найвышэйшымі прадстаўнікамі тагачасных каралеўскіх двароў. Славуты польскі скрыпач Ліпіньскі, які неаднаразова іграў "на пярэйгрыш" з самім Паганіні, папулярызаваў талент беларускага самавука і не пераставаў паўтараць, што нават народным інструментам, такім, як вось гэтыя саламяныя цымбалкі, падуладная высокая музыка, калі яе бярэцца выконваць надзвычай адораны чалавек. Міколу Гузікава ён называў геніем! Чалавек, які гэта паўтараў і стараўся ўвесці шклоўскага музыку ў самыя розныя арыстакратычныя салоны, каб там здолелі пераканацца, што гэта не выдумка, не пахвальба, а што гэта сапраўдны самародак! Самае галоўнае, што малады чалавек іграў на слых, бо не ведаў ніякай музычнай граматы. Сцвярджалі, што дастаткова яму было адзін раз усяго пачуць, няхай сабе, і найскладанейшы класічны твор таго часу, то ўсё роўна, ён яго адразу ж паўтараў. Уторыў з першага разу. А пра народныя мелодыі, знаёмыя яму з дзяцінства, якія ён увабраў у сваю чуйную натуру разам з малаком матулі, з павевамі-поды-

хамі акаляючай прыроды, роднага люду, то і гаварыць не даводзілася. Публіка, якой давялося пазнаёміцца з тонкім выкананнем майстра, была ў захапленні! Шкада, што тое падарожжа па Еўропе, па еўрапейскіх вяльможных дварах, сталася першым і апошнім для маладога выканаўцы: Мікола Гузікаў прастудзіўся і памёр. Было яму ўсяго 37 гадоў. Гэтак рана закончыўся жыццёвы шлях нашага земляка, які ўсё ж паспеў здзейсніць ашаламляльны па сваёй паспяховасць "тур" па многіх краінах, прадстаўляючы на высокі суд гледачоў непаўторную музычную спадчыну беларускага народа. Дэманстраваў яе музыка, паўторымся, пры дапамозе звычайных саламяных цымбалкаў, якія да гэтага асацыіраваліся нават сярод нашых вяскоўцаў з найпрасцейшым сярод музычных інструментам, які і рабіўся з саломы, і разлічаны быў на тое, што на ім выконваў бы свае простыя мелодыі "люд паспаліты". А тут, аказалася, што гэта не так, што сам маэстра Ліпіньскі быў у захапленні і зрабіў так, каб пераканаць у геніяльнасці гэтага музыкі еўрапейскіх слухачоў.

Можна распавесці і пра тое, як у даўнейшыя часы салома "выратоўвала" вясковых аматараў танцаў. Асабліва гэта датычылася моладзі. Загадзя збіраючыся на вячоркі ў чыю-небудзь хату (у дамоўленую за плату ці ў будыніну каго з удзельнікаў), каб было весялей бавіць час, скінуўшыся паміж сабою, звычайна рабілі "скідку" толькі хлопцы, а дзяўчат вызвалялі ад такой "павіннасці" і тыя, каб ужо "не вісець на чужой шыі", прыносілі гарбузікі, сушаныя яблыкі, грушы, а то і бутэльку-другую гарэлкі, наймалі музыку. Той пагаджаўся прыйсці за любую плату:



*Чухаўскае вяселле*

як грашовую, так і натуральную (яйкамі, бульбай, якім гарнцам жыта, а то і кулямі абмалочанай саломы, якую ў нас называлі “акалотамі”, ці “акалоткамі”). Тады, на змярканні, можна было назіраць даволі цікавае відовішча: з усіх канцоў вуліцы (а калі невялікая, то і вёскі) да адной з хацін цягнулася моладзь. Добра апранутыя хлопцы неслі пад пахамі па снапу, а то і па два. Як ужо атрымлівалася ў іх залучыць добрага музыку (скрыпача ці гарманіста).

Часта наймалі ў нашай вёсцы гарманіста Кірылу. Той іграў так сабе, але ніколі не адмаўляўся, а пагаджаўся на самыя выгодныя для “вячорнікаў” умовы. Даводзілася чуць, як пасмейваліся былыя “танцоры” з таго, што ім лёгка ўдавалася абдурыць сляпога музыку. І той, атрымліваецца, “рэзаў” амаль увесь вечар, ажно да другіх пеўняў, лічыце, задарма. Выходзіла, што ў такой няхітрай справе ім актыўна “дапамагаў” пляменнік Кірылы – двухметровы Уладак. Яму прыносілі бутэльку гарэлкі. Ён выпіваў яе з кірылавай жонкай, а ўжо прыйшоўшых “абілечваў” проста так. Аднаго разу гарманіст папрасіў пляменніка вынесці яму і даць патрымаць у руках хоць пару зробленых “акалоткаў”. Уладак так і зрабіў, выносіў з прыстаронка два вялізныя снапы саломы, самім ім звязаныя, і даваў у рукі дзядзькі. Той быў задаволены, што не падманулі яго маладыя гіцлі. А пляменнік некалькі разоў паўтараў гэтакі прыём.

Праўда, аднойчы пляменнік усё ж абмішурыўся са сваім падманам. Кірыла неяк здагадаўся, мабыць, што той яго падманвае і вырашыў праверыць па-свойму. Падабраў момант і, калі нікога ў хаце не было, пацíху падаўся да свайго гуменца. Нічога, што быў сляпы, але падворак уласны мог і без павадыра абысці. Прыцёгся да дзвярэй, адчыніў іх і, правільна прымеркаваўшы, што калі будынінка поўная акалоткаў, то снапы будуць складзеныя паўсюль, а раз так, то можна смела проста кінуцца цераз парог і нічога страшнага не здарыцца: не заб’ешся, бо ж пад нізам будзе салома. Гігікнуўшы па-дзіцячы, Кірыла гопнуўся цераз парог і праз імгненне ўзвыў ад болю. Ніякай саломы пад нагамі не было. Пачаў шнырыць па завуголлі і аказалася, што акалоткаў было ўсяго штук з пяць і два з іх – тыя самыя тоўстыя і вялікія, якія яму і дэманстраваў ягоны хітры пляменнік. Пасля такога здарэння, калі музыку запрашалі іграць на вячорках, то, увайшоўшы ў чужую хату, ён адразу ж пытаўся, ці тут ягоны Уладак. Калі тут, то іграць не стане ні за якія грошы. Як бачым, у вясковым жыцці многае здаралася, было, сярод іншага, і шмат вясёлага, адметнага. І гэта не азначала, што жадалі злосна паздзекавацца з чалавека. Не, маладзейшыя заўсёды пакеплівалі са старэйшых.

У звычайным жыцці, зразумела, усё было інакш. Нічога не зробіш, яно і сапраўды так. Маіх продкаў называлі не толькі "лапцюжнікамі", але і "саламянікамі" таксама. Толькі я ўсё роўна паспрабую выкруціць на іхнюю карысць гэтыя даволі зняважлівыя словы. Як бы іх ні прыніжалі, як бы імі ні грэбавалі, а яны выжылі, вытрывалі, выпакутавалі, даказалі сваё адвечнае права "людзьмі звацца", сталі ўпоравень з іншымі. А што "саламянікі", то ж мае продкі навучыліся выкарыстоўваць салому ва ўсялякіх гаспадарчых справах! Знайшлі ёй такое прызначэнне, што іншыя толькі ад здзіўлення ды зайздрасці адно галовамі хісталі ды анямела пазіралі! Значыцца, усё ж было з чаго! У саміх клёку не хапіла, то на іншых глядзіце ды навучайцеся. Адзін з надзвычай простых і адвечных законаў сялянскага жыцця. Пасмяяцца заўсёды зможаш, знойдзеш хвіліну. Ты, лепей, пра сур'ёзнае прызадумайся, пасядзі, пахадзі, памяркуй.

"Саламянікі", і адразу ж успыхнула асацыяцыя з іншым словам – "сяннікі" (так у нас гаварылі, але сустракаецца і "сеннікі"). Сёння ўжо, магчыма, далёка не ўсе і ведаюць, што ж гэта такое. А даўней гэта быў здаравенны, сшыты з суровага сукна, мех, які набівалі саломай і потым працяглы час (сама меней з паўгода, так у нас вялося) ён быў матрацам. Спачатку нават баяўся на яго залазіць, каб незнарок не скаціцца і ўвогуле не ўпасці з ложка, але потым асвоіўся і ўжо добра ведаў, што да чаго. Усё пазнаецца менавіта праз практычны вопыт і не толькі праз той, які прыйшоў ад продкаў, але і праз асабісты таксама – з самых малых гадоў пачынаючы, з таго маленства, калі пачаў нешта ўжо канкрэтна ўсведамляць, каб значна пазней асэнсавана пераказаць.

Дзед, які ведаў ці не ўсё (і пра ўсё) на свеце, пастаянна сцвярджаў, што салома і саграваe, і дае «палёгку стомленаму целу, яна спрыяе таму, што чалавек, які ўлёгся на такі "сяннік", нібы правальваўся адразу ж у сон, бо ж салома ад жыта, а жыта – святое, бо яно – хлеб!». Сапраўды, ёмістае і шматзначнае тлумачэнне. Хто яшчэ на такое быў здольны. Праўда, сам дзед толькі нас падвучваў, а сам, як звычайна, хітраваў, бо спаў на пухавіку («пірначу») – вялізным, здаравенным, у які ўлезла пер'е ці не са ўсіх тых качак, якіх ён застрэліў за сваё паляўнічае жыццё.

А жыта яно і на самой справе сугучнае словам жыць, жыццё. Чалавек, заснуўшы на такім ложку, усё роўна і ў сне нават працягваў суісначаць поруч з самым родным і самым блізкім, неабходным і патрэбным. Наяўнасць, дастатковая, з запасам, таго жыта давала магчымасць яму спакойна спаць, сям'я не будзе пухнуць з голаду. І гэта ж не толькі ў той славутай генетычнай памяці, да якой я часта з задавальненнем звяртаюся, але і ў паху саломы, якая паспела, выспяваючы і выстойваючы

на палетку, увабраць у сябе і энергію сонца, і павевы ветрыку, і нават нябесную вільгаць, якая ніколі не мінала жытнёвыя палі. Водар усяго гэтага адразу апаноўваў таго, хто быў блізка знаёмы з сялянскай працай, якая пастаянна працякала на ўлонні роднай прыроды, а часам ствараласся такое ўражанне, што і ў самой прыродзе, і таму непаўторны пах мінулага, няхай сабе і цяжкага (цяжкага ад выжыльваючай, здавалася б, што ў многім ужо і неадольнай працы, але ўсё ж завершанай, выкананай да канца) лета.

Чалавек расслабляўся на саламяным "сянніку" таму яшчэ, што гэта асацыіравалася ў яго з лагічным і паспяховым завяршэннем чарговага працоўнага года. Прыйшло жніво. Сыйшло жніво. Яно мінула. Пракацілася ў чарговы раз, пакінуўшы пасля сябе не толькі балючыя ўспаміны пра мазалі, салёны пот, агнём палаючыя спіну і плечы, ногі і рукі, але і адвечную радасць селяніна-земляроба: жніво завершана, ураджай сабраны і чакае свайго далейшага лёсу. У гэтым і цяжкае наканаванне ўласнага лёсу, і тое, што засталося ў спадчыну ад працалюбівых продкаў. Таму і раскашавалі гаспадары, лежачы ды прыгадваючы сцэны з недалёкай яшчэ часіны, калі лішні раз дух перавесці і то было цяжка, не тое, каб адпачыць якую лішнюю гадзінку-другую. Маладзейшыя любілі бавіцца на "сянніках". А старэйшыя – на печы, "каб прамоклыя ды застуджаныя косці добра разагрэць-упарыць, каб сілка божая вярнулася ў цела, бо не паспееш азірнуцца, а там зноў вясна, а за ёю – лета, а раз лета, то абавязкова, значыцца, і чарговае жніво". Усё міналася і паўтаралася, паўтаралася і наступала зноў.

Ды і само выслоўе "ўтапталі салому" мела некалькі надзвычай "гаворачых" значэнняў. Па-першае, тое, што нават салому прыбралі і звезлі з палеткаў і з гэтым было звязана завяршэнне летняга цыкла сялянскай працы; па-другое, "утаптаць" магло патлумачыцца, што надта працяглая і галодная ў нечым зіма (маецца на ўвазе для свойскай жывёлы) забрала ўсе чыста запасы, зробленыя гаспадаром; па-трэцяе, прыбралі ўраджай, цяпер ён дагледжаны, далей станем малаціць ды веяць, а гэта азначае тое, што ў чарговы раз даказалі ўласную людскую жыццесцвярджальнасць і непахіснасць. Таму і выслоўе "гнецца, як салома пад ветрам" падыходзіла пад многія жыццёвыя сітуацыі. Счарнее салома пад дажджамі ці навальніцамі, пад замаразкамі-прымаразкамі і адразу ж счарнее твар вяскоўца, бо ён выдатна зразумее, што на добры ўраджай у гэтым годзе спадзявацца не прыходзіцца. І нават "сяннік" не будуць набіваць новай саломай, бо «яна паху летняга не мае... Яна счарнелая і набрынялая дажджамі... Яна ўвабрала ў сябе лішнюю вільгаць і ад гэтага пагніла, яшчэ нават на карані стаяўшы...». Такую

салому калі і выкарыстоўвалі, то толькі на падсціл жывёле (“на настюл”). Толькі даводзілася чуць, што яе ўсё роўна пускалі на корм усё той жа жывёле. Незайздросны, але корм, бо не было іншага выйсця, не ставала магчымасці, нават у самых увішных людзей, накасіць сена, высушыць яго і прывезці на падворак. Калі ўбівалася працяглая непагадзь, то яна настолькі ўядалася ў людскую памяць, што пра такое лета (пра такі год) потым пастаянна ўспаміналі, нагадвалі лішні раз, што неабходна заўсёды памятаць пра тое, «што можа стаяць за плячыма і чакаць сваёй злой чаргі, каб убіцца ды вывесці, вынішчыць усё дазвання».

Даводзілася чуць і чытаць пра тое, што ў некаторых мясцінах Беларусі, напрыклад, на Гродзеншчыне, “сяннікі” набівалі ў купальскую ноч. Прыносілі іх з сабою да вогнішчаў і там спальвалі старую салому, якая ўжо нагадвала звычайную труху. На другі дзень напіхвалі “сяннікі” новай саломай. А ўжытую спальвалі. Лічылася, што разам з гэтай трухою на купальскім агні пагараць і ўсе мінулыя чалавечыя хваробы ды болькі і што ніякая пошасць не здолее потым “аджыць у будучым жыцці”. Працоўная магія, імкненне да захавання ўласнага здароўя, здароўя членаў сваёй сям’і выразна прасочваецца. Праўда, як падаецца, то недзе ўсё ж, за смугою стагоддзяў ды за няўважлівасцю продкаў, згубілася некалькі звёнаў таго свяшчэннага ланцуга павер’яў, таму і тлумачыць даводзіцца самому, не спасылаючыся на ранейшых этнографаў. Нешта тут прысутнічала яшчэ з нерасшыфраваных старажытных абрадаў, калі спальвалі стары абутак, непатрэбныя рэчы (але толькі драўляныя, металічныя вырабы і не гарэлі, вядома ж, і былі занадта дарагія для вяскоўцаў, таму іх нікуды не выкідвалі, не знішчалі, а імкнуліся знайсці ім новы ўжытак).

У нас усё рабілася значна празаічней. Зімою, напярэдадні Каляд, мама звычайна прасіла мяне, каб дапамог ёй у няхітрай, але не надта ёмістай для аднаго чалавека працы – перамяніць салому ў “сянніках”. Адзін раз пры гэтым прысутнічаў дзед. І, як заўсёды, пачаў курыць нават у прыстаронку, дзе ляжала зладаваная жытняя салома. Зразумела, што ён быў “урачыста” выправаджаны з ліку памочнікаў (“Ідзі, бацька, а то ці свіран нам спаліш, ці заснеш дзе-небудзь у “сянніку”. Ведаем, які ты сон маеш!”). Старую пацяруху мы высыпалі ў свінушнік, дзе здаравенныя свінні адразу ж накінуліся на тую горку, уздымаючы пры гэтым нейкі надзвычай едкі пыл. Мама заўсміхалася, маўляў, няхай і на іх каляднае здароўе сыходзіць. Салому гаспадыня старалася запіхваць “уздоўж сцябла”, так, як яна была звязана ў снапах і потым засталася пасля абмалоту. Гэтак было зручней і можна было паболей набіць саломы ў “сяннікі”. Тыя мяхі, а было іх ажно тры, па колькасці ложкаў у на-

шай хацінцы, станавіліся падобнымі на нейкія вялізныя, выцягнутыя ў даўжыню агуркі.

Прынёсшы ў хаціну, ледзьве прапіхнуліся праз уваходныя дзверы з гэтакай сваёй ношкай. Потым я трымаў “сяннік”, а мама зашывала распушчаную адтуліну. Заслаўшы ложкі, задаволена працягвала, што цяпер сон ва ўсіх будзе царскі. Дзед, то той падзуджваў, маўляў, будзеш, унучак, ставіць драбінку, каб забрацца на сваё месца для адпачынку. Ад яго ж тады, відаць, і пачуў чарговае, што на саломе, ды яшчэ перад Калядамі, людзі заўсёды ўсміхаюцца ў сне, бо сняць Сына Божага, якога ж таксама знайшлі некалі на саломе сярод свойскай жывёлы. Ужо не памятаю, калі мне даводзілася адпачываць на “сянніку” ў апошні раз, але, здаецца, што сапраўды бачыў на тварах у сне мілыя ўсмешкі. А хіба можна не ўсміхнуцца, прыгадаўшы, як запытаўся ў мамы, ужо будучы студэнтам Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта, чаму гэта называецца “сяннік”, а набіваюць яго саломаю? Матуля разгубілася, нешта прамямліла, а потым ускіпела, маўляў, вывучыла на сваю галаву! Так яна часта любіла паўтараць, калі нешта ў хаце ці па гаспадарцы я рабіў не так, як ёй хацелася. Недзе, ці не наступны дзень, усё ж адумалася і, падлавіўшы зручны момант, сказала, што калі набіваць сенам, то ніякага паху не будзе і, да таго ж, сена вельмі хутка збіваецца. Гэтаксама, як і аўсяная салома, якой практычныя палешукі ніколі свае “сяннікі” не набівалі, бо «яна амаль што адразу збівалася, лямцавалася і ператваралася ў простую труху-ператрусіцу».

Здаралася, што тлумачылі такую прыдатнасць толькі жытнёвай саломы тым, што на ёй было сама мала («а то і ўвогуле ніколі не трымаліся, ні блохі, ні блашчыцы...») усялякіх кузурак, якія потым пачыналі раскашаваць па сялянскіх ложках. Паступова, пагнаўшыся за празмернай зручнасцю і ці не за модай, “сяннікі” пачалі выкідваць з хацін, а на іхняе месца ўспіралі купленыя ў крамах і прывезеныя з горада матрацы. Яны ж амаль што “панскія”, бо на спружынах. Чамусьці ўсё ў сялянскай гаспадарцы ды хаціне вельмі часта і пастаянна параўноўвалася з убачанай некалі ў памешчыцкіх пакоях ды маёнтках мэбляй, яе пасобнымі прадметамі. Па шчырасці, то пераважная большасць вяскоўцаў ніколі ў тых сядзібах і блізка не былі, але ж “гнулі” сваю лінію, бо ці ім людзі расказвалі, ці яны недзе чыталі, а то і ўвогуле – прыхлушвалі ў пэўнай ступені.

Тата неяк загарэўся і вырашыў сплесці сапраўдныя матрацы, каб паказаць іншым, што і мы не горшыя за ўсялякіх рацыяналізатараў-распрацоўшчыкаў. Толькі выштукаваць іх ён вырашыў, зноў-жа, з саломы. Праўда, тут яму патрэбна была дапамога, і не толькі такая, якая

заключалася ў падачы саломы, шпагатных вяровачках, але і ў сцісканні даволі тоўстых жгутоў (недзе сантыметраў па 15–20). Дапамагалі ўсе: дзед Уладак, мама і я, вядома ж, як жа было ім абысціся без мяне. Спачатку зрабілі недзе каля сарака саламяных валікаў дыўжынёю 180 сантыметраў, як памятаю да гэтага часу. Чаму менавіта такая шырыня матраца? Усё тлумачылася даволі проста: каб можна было яго паслаць на двухмесны ложак. Пасля гэтага, нібы ў які своеасаблівы мосцік, моцна папрывязвалі адзін да аднаго тыя валікі, і калі іх расцягнулі на падлозе ўдаўжкі, то гэта стала нагадваць сапраўдны матрац. Толькі тата не даў па ім скакаць і лазіць, папярэдзіў: «Яшчэ паспееш... Мама сшые на яго наматрацнік, мы насунем на верх, а там пакладзем на ложак, зверху гаспадыня накрые яго чысценькім прасцірадлам і заснеш ты на ім, сынок, як святы».

Сапраўды, той матрац верай і праўдай служыў нам недзе ажно гадоў дваццаць. Самае галоўнае, што з ім было проста абыходзіцца: не выпадала распускаць і мяняць салому ды набіваць новай, а дастаткова было вынесці матрац на падворак, добра выбіць венікам ці якім голлем, павесіць на плот, («каб пражарыўся на сонцы») і зноў сабе на ложак. Як паўтаралі старэйшыя: «Салома, нават старая, ужо ўжытая, працярушаная і вынесеная на сонца, усё роўна, па-ранейшаму, набывае сонечную сілу». Значыцца, яны заўважылі адвечную сувязь саломы з нябесным свяцілам, з тым, як тая аднаўлялася і станавілася прыдатнай для далейшага ўжытку. Галоўнае было правільна навучыцца ўсім карыстацца і ўсё ўжываць.

Сусед, у якога ўласныя рукі не маглі такога зрабіць, зайздросна зіраючы і імкнучыся не паказваць нават выгляду, што і яму самому хацелася б мець такі матрац у сваёй хаце, грэбліва плявузгаў пры магчымасці вяскоўцам: «Якое там новае, нічога новага... Той жа “сеннік”, толькі што з вяроўкамі...». Яго, не даслухаўшы, нецярпліва перапынялі: «Лепей ідзі адсюль, а не хочаш, то пастой і памаўчы, бо тваё пустамельства ўжо ва ўсіх у вушах сядзіць. Ты і сам з халоднымі і ... раменнымі вушамі... Нічога не ўмееш, нават калі нешта простае даручаць, дык ты і тое сапсуеш, а як каго абплёўваць, дык не саромеешся...».

Распавядалі, што калі ехалі некуды ў млын, то бралі з сабою не толькі сена каню, мяхі са збожжам, але і абавязкова пару снапоў саломы, каб потым у вялізнай прымлынавай стадоле рассыпаць сабе пад бок. Рэдка калі такая праца для вяскоўцаў заканчвалася ў адзін дзень – чэргі ля млыноў заўсёды былі вялікія. Звычайна салому ад млына назад не забіралі, падкрэсліўшы тым самым, што думаюць пра людзей, якія прыедуць пасля іх. Нехта ж ды абавязкова забудзецца, што на нечым

выпадзе праляжаць ноч, а то і болей. Калі ж хто забіраў выкарыстаныя ўжо саламяныя снапы з сабою, то потым з яго "ашчаднасці" доўга перамаўляліся суседзі: «Гэта ж трэба, да чаго дайшоў... Салому з млына і тую назад прывёз... А можа, дык яшчэ і чужой прыхапіў... Усяго яму мала... Ніяк не наесцца, то ж саломай сыты не будзеш... Ён і ў наступны раз з гэтымі ж самымі снапамі ў млын паедзе... Яму ад такога вочы не заказыча і сумленне дазволіць не змяняць рашэнні... Водзяцца ж, на вялікі жаль, і такія людзі сярод нас...».

Дзед распавядаў, што ў іхняй рыбацкай хатцы, на беразе Выганаўскага возера, уздоўж сцяны былі пароблены своеасаблівыя драўляныя палаці, а на іх густым слоем насыпалі салому. Мне падаецца, што ён крыху хітраваў, бо дзе яны ў балоцістай мясцовасці маглі набраць саломы. Тым болей, што да бліжэйшай вёскі было каля сямі кіламетраў. Выкарыстоўвалі рыбакі чарот, якога тут было ўволю. Вось яго нажыналі снапоў з дзясятак, старанна высушвалі, а то маглі насыпаць роўненька і напаўсырога, а зверху прыкрывалі якімі "трантамі". Рыбакі ленаваліся часта мяняць падсцілку, і яна ператваралася ў чыстую пацяруху, з-пад якой пачыналі выглядваць голыя дошкі. Тады ўжо прымушалі маладзейшых: «Хлопцы, зрабіце вялікую для ўсіх справу – нажніце чароту, аеру... А то ўжо на фронце і то людзі за сабою болей глядзелі, чым мы з вамі...». Мала гэтага, то ў падсцілцы яшчэ заводзіліся... вужы: «От, ляжыш, ляжыш, а ён паўзе да цябе пад бок... Там жа яму цяплей... Скруціцца і ляжыць ціхенька... Мы да іх прызвычайваліся, то яны нам былі і не страшныя, і не гідлівыя... Здаралася, што нават жартавалі, хто з большымі пераначаваў...». Ага, не баяўся вужоў, бачыў на ўласныя вочы, як бабуля, узброіўшыся здаравенным кіем, "ганяла" вужоў з хлява, а дзед са страху забраўся на бліжэйшы стог. Залез нават без цыгаркі, з якой, здавалася, ніколі не разлучаўся. Вось табе і смяльчак! Адно толькі, каб пахваліцца перад іншымі! Маўляў, ведай нашых! Мы ж і тут не адступілі, а, наадварот, толькі вышэй узняліся!

Не раз і не два чуў, а таксама на ўласныя вочы назіраў, як муляры, калі завяршалі печку ці грубку ў чыёй-небудзь хаціне, прасілі гаспадароў, каб тыя прынеслі «невялічкі снапок жытняй саломкі... Тут нам усё і пакажа: добра складзена печка ці недзе закраўся нейкі хіб... Свежую грубку (печ) нельга адразу моцна награваць – патрэскаецца, а салома ж моцнага цяпла не дае... Ат, падсушыць крышачку гліну і ўсё на тым... Так трэба пару-тройку разоў пратапіць, каб потым ужо з дроў пачынаць... Не паслухаецеся, то патрэскаецца, паразыходзіцца гліна, і ў тыя шчыліны пав'ецца чадны дымок – вельмі небяспечны для чалавека. Мае той дымок такую здольнасць бязлітасную: забівае нячутна ў сне...

Не паспееце і прахапіцца... Той чадны газ прымушае потым людскія галовы моцна балець... Ад такіх наступстваў з вялікай цяжкасцю пазбаўляюцца... Таму глядзіце зараз старанна... Заўважайце, дзе ды што якое пакажацца вам падазроным, падказвайце. Цяпер то лёгка ўсё выправіць: і майстра на месцы, і ўсё прычындалле пад рукамі...».

Саломка, пакладзеная і падпаленая, гарэла зырка і весела, але ведаючага чалавека цікавіла зусім іншае: ці не пасунецца недзе збоку, у непатрэбным месцы, здрадлівая пасмачка дыму. Часта гаварылі і пра тое, што вось, здавалася б, салома, а пазірніце, як хутка падсушвае гліну. Бачыце, як па баках цягнецца лёгенькі парок. Здавалася, асабліва малому, як жа тут адрозніш, дзе віецца дымок, а дзе парок, але спрактыкаваныя сялянскія вочы і нос адразу адчувалі прымесь чаднага газу. Першыя спаленыя жмені саломы паказвалі, што да чаго, і калі ўсё было, як мае быць, то дазвалялі і малым, папярэдзіўшы перад гэтым, каб былі асцярожнымі (“з любым агнём жарты дрэнныя”), пакідаць саломку ў адчыненае вусце, што было для дзяцей найвышэйшай асалодай у іхнім жыцці, “а як жа, дапамагалі дарослым, ды яшчэ і рабілі гэтаксама, як і яны...”.



*Сялянскія цапы...*

Старыя людзі, калі прыходзілася пастухаваць, асабліва ў пранізлівыя і дажджлівыя восеньскія дні, калі, здавалася, не знаходзілася ўтульнага месца ад пранізлівага ветру ды ад прабіваючага навылёт дажджу, навучалі, як правільна паліць ... салому. Таксама сабе навука! Так і сцвярджалі-папярэджвалі: «Не спяшайцеся ўсю гурбу адразу падпальваць, бо яна згарыць за якіх пару хвілін і ўсё на тым. Не сагрэецеся і нават не адчуеце таго цяпла. А калі ўсё рабіць умела, то і саломка можа і сагрэць, і высушыць. Ва ўсім трэба разуменне. Спачатку распаліць неабходна вогнішча, каб яно ўсхапілася, а потым ужо, стаўшы за ветрам, падкідваць патроху. Калі салома сырая, то на самы верх выпадае падкладваць вільготную. Яна прасушыцца, прадыміцца, а потым ўсё ж весела затрашчыць. Так здаўна вялося. Калі агонь невялікі, то і саломы надоўга хопіць, і вопратку крыху прасушыць, і рукі ды ногі азяблыя таксама сагрэе. Ва ўсім трэба ўменне, без яго нідзе не пражывеш. А так, зараз навучышся, то некалі ды абавязкова прыдасцца...».

...Калі сам быў у войску, то ў перадгор'ях Капет-Дагаў так вучыў паліць нейкую салому (як мы жартавалі: "нявызначанай нацыянальнасці") маладых байцоў, бо там таксама холад і студзёны вецер вельмі нам надакучалі падчас марш-кідкоў, асабліва ў зімовы перыяд ("і снегу няма, і мароз не трашчыць, а няма дзе прыхінуцца, наскрозь прабірае..."). Некалі і дзед пераказваў, што саломай і яны саграваліся, калі прыпіралі пранізлівыя вятры ды дажджы-залевы, ад якіх не было ніякага выратавання нават пад страхою ў рыбацкай хатцы. Кожнаму ставілі задачу: прынесці па некалькі акалоткаў, калі была такая магчымасць, а не, то і пару снапоў сухога чароту, які ці ламалі, ці секлі, а па-іншаму дык яго і не зваліш. Такі агонь асаблівага цяпла не даваў, але, калі распальвалі вялікую печ, то выпадала ўмела сачыць за тым, як гарыць полымя і не кідаць адразу многа саломы (чароту), а «то і хату дазвання спаліш, тады ўжо, атрымаецца, што ўвогуле пад кустамі трэба будзе начаваць...».

У вясеннія ці ў раннія восеньскія дні з нечаканымі прымаразкамі старыя людзі пакрэктвалі ды прымаўлялі, што няблага было б гаспадыні і ў печы "хоць саломкай пратапіць...". Некаторыя ўвогуле ўсё цягнулі ў хату і спальвалі. Гэта была не скапнасць, а, відаць, нейкая "хранічная" беражлівасць. Чаго будзе валяцца ды разносіцца ветрам, калі можна спаліць, і "паветра ў хаце зменіш, і падворак ачысціш". Але ж былі і лянотныя гаспадары, у якіх ніколі не было дроў на лютыя маразы. А раней маразы сапраўды былі лютыя і даволі працяглыя, з вятрамі-завірухамі. Ды з такімі, што дарослых людзей з ног валіла. Тады такія вяскоўцы і вуглы ў будынках сваіх на паліва абразалі, і салому ды

бадылле якое валаклі, і са стрэхаў салому, парудзелую ды счарнелую, выдзіралі ды пёрлі ўсё ў печ ці ў грубку. Тады ўжо зноў неслася пагудка па вёсцы: »Вось Пятрок печ напаліў! Цэлы абярэмак саломы ўкінуў! Ды такі вялікі, што ледзьве яму пад руку ўлез!». А лайдакі пасля такога "працэсу" ў кажухах і валёнках, толькі і ведалі, што "саграваліся" на печы, ад цаглін якой цягнула ... ледзяным холадам.

А хіба некалі забудзешся пра тое, як смалілі забітых свіней у вёсцы? Заможныя сем'і здзяйснялі такі старадаўні працэс па два разы на год. Здаралася, што і часцей, але гэта ўжо залежала ад колькасці едакоў у хаце, ад таго, якія ўраджаі здымалі-збіралі яны са сваіх палеткаў. А пераважная колькасць усё ж забівала па аднаму кабанчыку ў год. Рабілася гэта зімою, перад Калядамі, перад тым святам, да якога ўсё было пароблена, калі можна было смела святкаваць, а раз так, то і смачна паесці, уволю адляжацца-адпачыць, адчуць сябе сапраўдным гаспадаром, хоць бы і на ўтульнай печы. Адразу прыходзяць на памяць коласавы радкі:

Адзнакі блізкіх зімніх святак –
Гарыць салома каля хатак.
Пажар вясёлы ў час світання!
– А што там свеціцца, нябожа?
Няўжо гарыць хто, не дай божа?
– Не, не пажар: то – сцяг калядны,
Япрук там смаліцца дзесь ладны,
Свой крок апошні замыкае:
Япручча доля ўжо такая.
І кожны дворык, кожна хата,
Хоць і жыве не так багата,
Але калядаў у адзнаку
Заколе хоць бы падсвінаку
І дворык свой ці прыгумень
Асвеціць раніцай ці ўдзень [7, с. 168].

Спрадвеку свіней смалілі саломкай. Як у нас гаварылі – "акалоткамі". Яшчэ пры малацьбе, а малацілі ж уручную, цапамі, гаспадар, а калі людзей было болей, то ўсё роўна нехта адзін, але адбіралі вымалачаную салому, здаралася, што нават злёгку зноў звязвалі ў снапы. Толькі ўжо вялізныя, таўшчэразныя, бо салома на той момант была лёгкая і іх не ўяўляла вялікай цяжкасці ўзняць, і адкладвалі ў бок: у сціртачку ці проста так стаўлялі для большага парадку ў зацішным месцы. Гэта азначала, што ў гэтай саломы будзе значна падоўжаны яе звычайны тэрмін існавання: у якога дзясятка снапоў да таго самага моманту, калі

стануць смаліць кабана, а ў астатняй яшчэ намнога даўжэй, бо яе выкарыстаюць як дахавы матэрыял. Такая салома ўжо дакладна згніе даванння на страсе, будзе ляжаць да таго дня, калі гаспадар не надумаецца па-новаму перакрыць сваю будыніну. Бо нават перакрыць будыніну трэба было адпаведнае майстэрства, а яшчэ – час, якога ўвішліваму гаспадару пастаянна не хапала.

З першага разу свінню толькі "прыпальвалі" – праходзілі саломай туды-сюды і такім чынам вынішчалі шчэць, каб потым ужо ўзяцца смаліць па-сапраўднаму. Звычайна працавалі два чалавекі (сама меней), каб было зручней і спарней. Але часта гаспадары імкнуліся ўправіцца і самастойна, каб ніхто не бачыў, якога "япрука" яны выгадавалі, каб ніхто лішні раз не пазайздросціў, ды каб ні з кім потым не давялося дзяліцца лішнім кавалачкам свежаніны. Ад гаспадыні дапамога зыходзіла ўжо толькі потым, калі неабходна была гарачая вада ды адносіць разрэзаныя, рассечаныя кавалкі свініны. Потым яшчэ выпадала карпатліва чысціць-прамываць свіны страўнік, кішкі, якія таксама ішлі ў справу. Продкі навучыліся нічога не выкідваць, "усё чыста прыбіраць, старанна даглядаць, каб не сапсавалася заранёў, каб чарвякі не стачылі...".

Мне, маломy, заўсёды даводзілася круціцца пад нагамі, але старэйшыя не злаваліся, не крычалі, адно толькі прыгаворвалі: «Глядзі, ды вучыся! Не будзеш умець сам, то давядзецца і на свайго кабанчыка, каб яго закалоць, асмаліць ды прыбраць, чужога чалавека наймаць!». Часта пры такой працы ўзнікалі спрэчкі. Прычына была адна: нехта ды нешта зрабіў не так. Праўда, галасы адразу ж неяк прыціхалі, мякчэлі і зноў вяскоўцы працягвалі працаваць спорна і весела. Яшчэ спяшаліся вызначыць, якой таўшчыні будзе сала, колькі зацягнуў бы на вагу такі ўкормлены "экземпляр", распавядаліся ўсялякія выпадкі, здарэнні. І гэта ўсё паспявалі рабіць дарослыя, не адрываючыся ад асноўнага занятку – смалення кабанчыка.

Калі быў малы, то не разумеў: як жа гэта саломай, звычайнай жытнёвай саломай можна так чысценька асмаліць здаравенную тушу кабана? І агонь той падтрымліваўся не надта вялікі, каб не "прасмаліць" скуру і, разам з тым, вопытныя гаспадары ўжо толькі на першы погляд ведалі, дзе яшчэ трэба прыпекчы, каб потым тая ж самая скурка была пахкай і мяккай. А яны смалілі: спачатку – удвух, а потым ужо – нехта адзін, бо другі вострым нажом счышчаў нагарэлае і паказваў, дзе яшчэ трэба было прайсціся дадаткова. Перад тым, як старанна мыць ("зачышчаць") кабана, яго палівалі гарачай вадой і зверху хуценька ўкрывалі пластом саломы – «каб упарыўся, каб скурка зусім дайшла,

ды потым дымам цягнула...». Найвышэйшай пахвальбою гаспадара было тое, як ён сам ацэньваў працэс смалення: «Дзесяць снапоў саломы разышлося... Не паспелі азірнуцца, бо ж і там, і там прыпаліць выпадала... Затое цяпер, калі дастанеш адрэзаць лусту ад куска сала, то так дымком і пацягвае. Вось што значыцца: саломай смаленае...».

У гэтай пахвальбе адчувалася не толькі тое, што вясковец ганарліва сведчыў пра тое, якога кабанчыка яму ўдалося выгадаваць, але яшчэ і пра тое, што "смалілі саломкай". А гэта азначала, што не парывалі адвечнай традыцыі ў працэсе смалення свіней. Яшчэ звернем увагу на тое, абавязкова падкрэслім, што вопытныя сяляне імкнуліся смаліць кабана ў зацішным месцы, "каб полымя не скакала і не тухла пад парывамі ветру, ды і для гаспадарчых будынкаў таксама лішняя перасцярога не будзе небяспечнай".

Тое, "дымам цягнула" ды "саломай смаленае", часта ў вяскоўцаў асацыіравалася са смешнымі, а то і амаль што анекдатычнымі здарэннямі. Пра некаторых казалі, што яны сваіх свіней дровамі смаляць, бо саломай не атрымліваецца. З іншых кпілі, што свінню не абсмалілі, бо салома скончылася. Здараліся і куды больш вясёлыя сітуацыі. Сведкай адной з іх мне давялося быць самому. Нават, калі дакладней, то дзед узяў мяне за памочніка. Я ж адзначаў, што працаваць лягчэй і зручней было ўдваіх. Дырэктар нашай школы, накіраваны вяскоўцамі, прыйшоў да дзеда з просьбай забіць, абсмаліць і разабраць ягонага кабанчыка. Суседзі ведалі, што дзед робіць гэта і хутка, і якасна. Пагаманілі яны пару хвілін і стары сказаў, што за свае паслугі бярэ ён з гаспадара пяць рублёў. Грошы, скажу я вам, і не малыя на той час. Але ж і праца, асабліва калі некаму яе даводзілася рабіць, не надта лёгкая. Калі глядзіш, а не робіш, то – ясная справа, а калі сам горбішся, то адваротны бок "свінога" медаля падасцца доўгім і замыленым, надакучыць тая аднастайная праца, "ды пастаянна сагнуўшыся, не разгінаючыся", дазвання.

Так і тут атрымалася. Пад дзедавай швайкай кабан нават і не піскнуў. Мы пачалі смаліць. Дырэктар школы аціраўся ля нас, не адыходзіў, дзед працадзіў: «Баіцца, што вушы кабанчыку пааб'ядаем...». Справа ў нас рухалася хутка і тут гаспадар здзівіў: «Ведаеце што, а пяць рублёў будзе задорага, то я вам тры дам... Вы ж тут усяго нейкую гадзіну часу забавіце і пойдзеце... Я вам і свежаніны даваць з сабою не буду, бо ж вы свайго кабана на днях паклалі... Думалася, што тут праца такая важная. А тут... Толькі туды-сюды і пяць рублёў з кішэні... Мнагавата будзе... Не, дам тры рублі... Дастаткова будзе і гэтага... Мне ж таксама сваіх грошай шкада... Іх жа кожны гаспадар ашчаджае...».

Дзед са злосці ўжо мыляў губамі, але не ўзрываўся, трываў да апошняга. Калі мы збіраліся мыць кабана, то стары загадаў дырэктару, каб той прынёс яшчэ з хаты чыстых анучак, бо трэба ж будзе кроў выціраць. Гаспадар ірвануў у памяшканне. Не паспелі за ім яшчэ і дзверы ляснуць, а дзед ужо прашаптаў мне, каб я адвярнуўся. За спіною пачулася выразнае цурчанне. Калі я акінуўся назад, то дзед ужо задаволена вадзіў па мокрай спіне чарговай жменяй палаючай саломкі. Стары яшчэ і шаптаў не заціхаючы: «Цяпер ты мяне надоўга запомніш, злыдзень. Гэта ж такое ўчыніць: мужчынскае слова парушыць!.. Мне такога ў жыцці сустракаць не даводзілася!.. Ах ты, жмінда!».

Завяршыўшы сваю справу і адмовіўшыся дапамагаць насіць дырэктару парэзаныя кавалкі, «бо нам выпадала вельмі спяшацца па нейкай неадкладнай справе», дзед забраў грошы і мы паджгалі дамоў. Стары не мог супакоіцца: «Ды ён у мяне да вечара будзе! Прыбяжыць пытацца, чаго ў яго падсмажанае сала, такое прыгожае і чысценькае на выгляд, сікунамі смярдзіць!?».

На наступны дзень уся вёска гудзела пра тое, як была пакарана сквапнасць "вераломнага" дырэктара. Веселуны яшчэ і параготвалі: "Гэта ў яго кабанчык са страху абмішурыўся... Салома тут ні пры чым... Невінавата яна...". Не вельмі любілі ў вёсцы такіх злыдняў, іх і асуджалі, і навучалі па-свойму, як у згаданым выпадку. Потым да самай смерці былому ўжо дырэктару школы, калі ён пачынаў некага "празмерна" навучаць, яму прама ў вочы рэзалі: «Ты нават кабану перад смерцю да ветру схадзіць не даў, а нас бярэшся стрымліваць ды накіроўваць! Прыгадвай, лепей, сваё!».

Адкуль стары толькі ведаў пра ўсе гэтакія падрабязнасці і акалічнасці – аднаму пану Богу вядома. Нават сталыя вяскоўцы і тыя адно рукамі разводзілі і задаволена пасміхваліся, маўляў, з гэтым чалавекам не надта пажартуеш. Лепей пагаджацца на ягоныя ўмовы, а то "і ў самога ці кабан абсікаецца, ці свіння абмішурыцца... Ён свайго не ўпусціць, але ж калі была дасягнута дамова, то яе абавязкова неабходна выконваць. Слова, нават мужычае, – яно многага было варта. Ніякіх папер, амаль што, нашы продкі не падпісвалі, адно што, у прысутнасці сведкаў, давалі слова. Гэта было сведчанне заключэння нейкай гаспадарчай справы, ці апошняе слова чалавека, вялікай розніцы не праводзілася. Тут варта будзе прыгадаць, што «слова – не верабей, сказаў, дык трымайся яго!".

Нашаму суседу білі кабана. У яго было шмат братоў і жывыя яшчэ бацькі, таму ён, лайдакаваты і самаўпэўнены ад нараджэння, не надта любіў працаваць сам. Заўсёды звяртаўся да сваякоў, а ўжо тым толькі

налівай, то яны табе і ўласную хату спаляць! Так і тады ў іх усё атрымалася. Закалолі кабанчыка, прыцягнулі да калодзежа, каб вада пад бокам была і не трэба было яе далекавата насіць. Нават узяліся былі смаліць: прайшліся саломай з аднаго боку. Тут гаспадару, відаць, закарцела выпіць самому, бо запрапанаваў: "Хлопцы, нам, такой грамадзе, тут працы на гадзіну. Чаго ўжо так ірвацца? Хадзем, ды прымочым крыху. Я ж самагон спецыяльна для гэтакай нагоды выціснуў. Праверым, які ён у мяне атрымаўся. А працы тут на паўгадзіны засталося...". Самы языкаты з братоў ляпнуў: "Мы табе яго з'ямо палову за такі час...".

Пайшлі ў хату і там добра "прыселі". Ужо ім і на вуліцу выходзіць не хочацца, не тое, што нейкага кабана там смаліць ды потым разбіраць. Гамоніць родная бяседа, вось-вось і песнямі сыпане! Ды ў самы непадыходзячы момант рыўком адчыніліся дзверы і на парозе паўстаў гаспадароў бацька, які спецыяльна прыйшоў, каб пракантраляваць ход справы, бо, як пазней, параготваючы з дурнаватых і самаўпэўненых сыноў, гаварыў вяскоўцам, што ягоныя бэйбусы ніводнай працы палюдску не зробяць. Што-небудзь ды абавязкова выкінуць. Вось і тут. Яшчэ крокаў за чатырыста, прама на вуліцы, крочыўшы да старэйшага сына, заўважыў натоўп, які, нешта абступіўшы, віраваў усялякімі галасамі. Аказалася, што людзі ніяк не маглі дацяміць, як гэта так магло адбыцца, што свіння, напалову абсмаленая, прыбегла аднекуль сюды і тут ужо сканала. Стары адно хмыкнуў і, што было сілы, прыпусціў далей.

У хаце яму было пра што запытаць і пра што сказаць. У выразах стары не стрымліваўся: "Што, ужо дарваліся?! Ужо панажыраліся, як жабы глею?! Хутка самі, як свінні, поўзаць будзеце! А ты, гаспадар, дзе твой кабан?! Што, дасмаліць яго за адзін раз саломы ў цябе не хапіла?! Што, як сава, вылупіўся на мяне?! Дзе твой кабан, пытаюся?! Вы тут сядзіце, а суседскія сабакі свінню па вёсцы валочаць!".

Гаспадар, пахістваючыся, устаў і пачаў было даводзіць, што кабан, як і мае быць, заколаты і яго пачалі смаліць... Толькі вось хлопцы захацелі перакусіць, то ён і паклікаў іх за стол. А то потым будуць усім плявузгаць, што старэйшы брат пашкадаваў есці. Ды яны толькі і прыселі.

Ад пачутага ў апраўданне стары ўзвіўся яшчэ болей: "Браты яму выказваць стануць, што іх не накарміў?! Ой, людцы, паглядзіце на гэтага барана кашлатага! З вас цяпер не толькі вёска смяяцца будзе, а ўсё наваколле на гады вам будзе прыгадваць, як вы свінню смалілі! У вас жа свіння, пакуль вы тут балюеце, з двара ўцекла! Вы хоць бы здагадаліся, зады свае па чарзе ад зэдіка адрываць ды за дзверы выглядваць, каб пераканацца, што ўсё ў вас на месцы! Божачка, за што ты

ўзнагародзіў мяне гэтакімі дурнямі?! Ды ўсе, як адзін. Ад старэйшага і да самага малодшага!".

Пачуўшы пра прапажу, браты рванулі ў двор. Сапраўды, кабана на месцы не было! Крутнуліся туды-сюды, выляцелі за вароты, а ніхто не здагадаўся па снезе дарожку свіных слядоў прасачыць, ажно пакуль бацька зноў не раўнуў, ужо не саромеючыся і не хаваючыся, бо да гэтага моманту палова вялізнай вёскі ведала, як у гэтым падворку кабана смалілі: "Што круціцеся?! На горку бяжыце! Туды, дзе людзі стаяць! Там ваш смех, а мой сорам ляжыць!".

От ужо давялося братам выслухаць ад вяскоўцаў усялякіх кпінаў і кепікаў! Мне запомнілася, як дзед Пятрок раіў ім: "Вы болей свінню без пашпарта не выпускайце, а то ж людзі і ведаць не будуць, у каго яна жыла!". Самае цікавае, што кабанчыка адтуль яны прыперлі на руках, не выкарыстаўшы нават саначак, хоць да гэтага, пахваляючы гаспадара, «"ацэньвалі" свіную вагу на дзвесце пяцьдзесят, а то і на ўсе трыста кілаграмаў!». Перлі так хвацка, што і патрэбны ім двор, спачатку, мінулі ды пранесліся метраў за сто лішніх.

Увечары ў нашай хацінцы бабуля Хрысця, якая жыла ў сям'і нашага суседа, пасмейваючыся, гаварыла: "Навесялілі мае ўнукі ўсю вёску... Пра іх і так нідзе добра не згадвалі, а тут... Гэта, няйнакш, як нечыя вочы так жывяць... Не чула і не бачыла за ўсё сваё доўгае жыццё, каб нежывая свіння ды па вёсцы бегала... Вось ужо праславіліся, дык праславіліся...".

Салому кемлівыя палешукі навучыліся выкарыстоўваць і ў якасці своеасаблівых уцяпляльных матэрыялаў. Часта доўгімі зімовымі вечарамі мой тата, прысунуўшы ў хату адразу некалькі снапоў саломы, браўся выплятаць з іх саламяныя маты. Так ён мне адказваў на мае шматлікія пытанні. Спачатку ўсё роўна не разумелася, што гэта такое, але калі першы раз убачыў, як гэтыя вырабы чапляюцца знадворку паверх вокнаў і дзвярэй, а потым яшчэ старанна мацуюцца ліштвачкамі-рэйкамі, тады і дайшло, што салома, сціснутая і спрасаваная, добра прыкрывае гэтыя праёмы ад марозу і ўсюдыпранікальнага сівернага ветру, ад якога, здавалася, не было ратунку ў нашай маленькай і дазвання струхлелай хацінцы. Таму і ратаваліся, як маглі. Такія ж маты гаспадар выплеў і павесіў на шырокія вароты ў хляве, каб каровам і свінням было цяплей, бо "ў іх у тыя маразы і вушы абмярзалі...".

Мама потым гаварыла, што, здавалася б, простая салома, а так выдатна трымае цяпло. У хляве, калі раніцай ішла даіць кароў, было так цёпла, "як на печы, у першыя хвіліны то з-за пару і не відно было нічога, колькі часу трэба было пастаяць, каб вочы прызвычаіліся. Мала гэтага,

і вецер не свістаў, не дзьмуў так, што, седзячы на зэдліку над даёнкай, пастаянна баялася застудзіць спіну. Малайчына, тата, што даўмеўся (а з вышыні сённяшніх гадоў, то мне яшчэ абавязкова хочацца дадаць: і не паленаваўся, не палічыў за лепшае прабавіць доўгія вечары дзе-небудзь у мужчынскай кампаніі, гуляючы ў карты)".

Саламяныя маты выручалі ў тыя маразы. Памятаю аднойчы тата прынёс з панадворка трох замерзлых снігіроў. Няшчасныя птушачкі не знайшлі сабе цёплай схованкі і ледзьве не паплаціліся за гэта ўласнымі жыццямі. Не натрапіў бы на іх гаспадар і ўсё. Пакладзеныя на чарэнь, яны прыйшлі ў сябе і неўзабаве спачатку нясмела, а потым усё больш упэўнена пачалі высвістваць нейкія свае песенькі.

Зімы тады былі надзвычай снежныя, завірушныя і марозныя. Нездарма ж гаварылі, што "калі мароз прыцісне, то і сырое дрэва стрэльне". Страляла, вымярзалі сады, асабліва маладыя. Мы з татам абгортвалі кволыя яшчэ ствалікі саломай. Ухутвалі іх і абкручвалі вяровачкай, каб неяк перазімавалі дрэўцы. На верх яшчэ прымацоўвалі і яловы лапнік, бо надта ж вынішчалі саджанцы зайцы. Пакідалі пасля сябе адно нейкія цурбалкі, якія вясною самотна і сіратліва выглядвалі з-пад растала снегу. Звяркоў з лесу гнаў голад бліжэй да людскога жылля, там яны знаходзілі сабе пэўны паратунак, але саджанцаў мне, малому, было асабліва шкада.

Вяскоўцы і сабе знаходзілі ў зіму паратунак, асабліва ў ваенныя гады ды і ў першыя пасляваенныя таксама. На свой недарэчны абутак (у асноўным лапці ці гумовыя "рэзгіны", як у нас называлі нешта падобнае на абутак, бо быў ён выразаны з аўтамабільных шын і неяк мацаваўся да ног, а то і на валёнкі) зверху выпляталі яшчэ і саламяныя "чуні-саламяны". Калі ўпершыню знайшоў іх на дзедавым гарышчы, то доўга не мог зразумець, што перада мною. Круціў і так, і гэтак, а ўсё роўна не кеміў. Выручыла бабуля, якая здзівілася спачатку: навошта мне гэтае "смецце". Бойка адрэзаў ёй, што панясу ў школьны музей, але там жа настаўніку (дарэчы, гарадскому нараджэнцу) трэба будзе патлумачыць, што я такое прывалок, бо ён ужо ад нас і гэтак пра многае неверагоднае пачуў.

Аказваецца, гэтыя "чуні-саламяны" прадбачлівыя гаспадары рыхтавалі з восені, а то і з лета, калі вырывалася вольная хвілінка. Плялі іх па агульным узоры, паўтараючы форму нагі і абутку, толькі што большага (значна большага) памеру. Рабілася так, бо разлічвалі, што імі стане карыстацца не адзін чалавек, а ўся чыста сям'я, у прыватнасці – дарослыя, калі выпадзе, напрыклад, ехаць па сена на балота. Тады ўсунуў ногі ў лапцях у "саламяны" і падаўся на працу. Ужо потым дзед па-

цвердзіў, што калі ішлі то лютыя маразы, то адліга і ўтвараліся паўсюдна па балоце лужыны-азярцы, дык наўмысна бралі і зверху тыя "чуні" аблівалі вадою. На марозе яны хутка скоўваліся лядком і тады ўжо ніякая вада іх не прапітвала, ніякі скразняк не прабіраў. Хадзіць хутка ў іх было не надта зручна, а вось працаваць, калі трэба было грузіць сена ці дровы ў лесе, то тут асаблівай нязручнасці не паўставала. Адзінае, што склізгацелі па снезе, калі ён быў ужо да гэтага ўтаптаны. Атрымалася, што ў той жа час адкрылася перада мною цэлая самабытная навука! Так бы і не ведаў нічога пра "саламяны", каб не шчырае жаданне прынесці настаўніку гісторыі нешта старое ды парадаваць ягоную шчырую краязнаўчую душу.

Спачатку прыцягнуў парэшткі "чуняў" (з праедзенымі, відаць, мышамі ступакамі, а, магчыма, што і сцертымі падчас карыстання) і ўзяўся іх выбіваць на падворку, ад чаго мае "экспанаты" амаль зусім разляцеліся. У стане ціхага адчаю мяне і заспеў тата. Убачыўшы, чым я займаюся і які ў мяне выгляд, гаспадар і без слоў усё чыста зразумеў. Як заўсёды, спакойна ўсміхнуўся і, абняўшы сына за плечы, пакіравалі мы з ім у прыстаронак. Там выбраў гаспадар два снапы саломы (у яго ва ўсім быў узорны парадак, асабліва ў тым, чым ён займаўся, ці што было падрыхтавана для нейкіх рамёстваў), якая была акуратненька "сціртавана" ўздоўж сцяны, і пакіраваў з імі ў хату. За татам папёрся і я. Першае, што ён зрабіў – падкінуў рэшткі маіх знаходак да грубкі, што азначала: іх вечарам спалім. Мне нічога іншага, як чакаць, не заставалася. Пасля вячэры, прысеўшы насупраць печы, тата ўзяўся за працу. Ад сына патрабавалася адно: падбіраць і ачышчаць да бляску салому. Гэты працэс мне быў выдатна знаёмы, бо не раз і не два мы з татам за такім заняткам бавілі доўгія восеньскія ды зімовыя вечары. Недзе праз паўгадзіны ўжо быў гатовы першы "ступак" (падэшва для "чуняў"), а потым і другі. Бацька нешта мурлыкаў сабе пад нос, я таксама быў заспакоены, бо ён не адчэпіцца ад распачатай справы. Такая ўжо ў яго была натура.

За гэты час я паспеў выслухаць цэлую адметную гісторыю пра тое, як раней плялі "саламяны". Іх асабліва не адштукоўвалі, «ат, каб толькі паверх абутку ўсперці і ўсё на тым... Якая ўжо там прыгажосць ды стараннасць?.. Адно, што хутчэй трэба закончыць і ўсё... Здаралася, што нават новыя "чуні" адразу ж і распаўзаліся, бо гэтак ужо недарэчна іх сплёў "майстра"... Асаблівага смеху гэта не выклікала ў людзей... Толькі тае бяды: за вечар-другі яшчэ пару зробім... Саломы на гэта хопіць... А табе, сынок, я спляту надзейныя "чуні"... Зраблю пад твой абутак... Ніхто болей іх не насуне... Ды і не карыстаюцца ўжо нашы вяскоўцы

болей імі... Скажы свайму настаўніку, жартуючы, што гэта “чахол” для сякеры, то ён і паверыць... Во ўжо смеху будзе, калі яму потым праўду давядуць... Няхай ведае, што такое і нашыя “гэрцы”... Не ўсё ж гарадскім з нас насміхацца... На самой справе: заляпі яму на поўным сур’ёзе...”.

За вечар тата выплеў адзін “чунь” і “ступак” для другога. Ясная справа, што мне карцела, каб ён ужо завяршыў усю справу, бо не цярпелася назаўтра занесці ў школу гатовыя “саламяны”. Але гаспадар папярэдзіў, што ўсё давядзе да ладу ранкам, а зараз нам выпадае ісці і класціся спаць. Так яно і атрымалася: калі я прахапіўся раніцою, каб збірацца ў школу, то ля грубкі стаяла пара “чуняў-саламянаў”. Яны былі такія прыгожыя, акуратненькія, здавалася, што нават саломка пахла летнім палеткам, рамонкамі ды валошкай.

Падчас перапынку настаўнік гісторыі памчаўся ў настаўніцкую з “саламянамі“ і там усіх агарошыў, што вось якія палешукі былі ашчадныя і ўмелыя, што нават для сваіх сякерак рабілі спецыяльныя саламяныя “чахлы”. Для маладзенькіх настаўніц ды і для сталых таксама гэтакае арыгінальнае паведамленне прайшло б “за мілую душу”, але якраз у настаўніцкай быў дырэктар школы, які перад гэтым “выхоўваў” настаўніка фізкультуры за ўчарашні “грэх”, звязаны з моцнай выпіўкай апошняга. Пачуўшы такую навіну, бывалы дырэктар узяў у рукі “чуні”, крутнуў іх, ледзьве прыкметна ўсміхнуўся і коратка адрэзаў: «Ага! Чахлы! Адзін для такога ёлупня, як ты! А другі – вось для гэтага “знішчальніка”!».

Доўга потым настаўнік гісторыі стараўся не глядзець у мой бок. Але хутка палепшаў, бо чакалася міністэрская камісія і на ягоны ўрок павінен быў завітаць старшыня прыехаўшых, а мне, адпаведна, трэба будзе адказваць на пытанне. Так мы з ім і разабраліся.

Добра засвоіўшы навыкі гэтага віду народнага промыслу, вопытныя майстры маглі запроста сплесці з саломы рэч любой канфігурацыі. Адзін дзед пахваляўся: “Ды з саломы я што хочаш зраблю... Хоць табе нябеснае воблака адштукую... Ты толькі саломкі мне добрай нарыхтуй ды навазі. Каб яна не перастаялая, не перабітая была, а доўгая, тады ў ёй і своеасаблівае, гнуткае, валакно застаецца. Зробіш так, то астатняе ўжо будзе маёй задачай... Зраблю любы тавар на замову. У лепшым выглядзе, чалавеча, табе прадстаўлю. Вачэй потым не адарвеш. Іншым паказваць і пераказваць пра маё ўменне станеш...”.

Нездарма ж усёведаючыя палешукі нават пчаліныя вуллі (праўда, масава вырабляць сталі пазнавата, больш трымаючыся традыцыйных: борцяў ды калод, недзе ажно ў другой палове XIX ст.) плялі сабе з сало-

мы. Рабілі гэта, вядома ж, не ўсе. А тыя, хто славіўся ўменнем працаваць з саломай. Яны то і выконвалі на замову такія вырабы. Самае характэрнае, што надавалі ім розныя формы. Тут ужо адчувалася фантазія самога майстра. Мне даводзілася чуць, як саламяны пчальнік быў спалены захопнікамі ў 1944 годзе. На Століншчыне жыў адзін пчаляраматар, які славіўся сваімі пчальнікамі і добра дагледжанымі раямі. У яго нават былі шматлікія ўзнагароды ад польскіх улад (медалі, дыпломы, граматы), прывезеныя гаспадаром з розных пчалярскіх выстаў. Да слыннага гаспадара прыязджалі і прыходзілі шматлікія пчаляры з іншых мясцін: за парадамі, за тлумачэннямі, за падказкамі, за тым, каб прыдбаць у яго маладыя раі і г. д. Нікому чалавек не адмаўляў у шчырай дапамозе, бо лічыў па даўняй традыцыі, што пчала – божы дарунак і яе набыткам проста неабходна дзяліцца з іншымі. Таму і табе будзе спрыянне ў промысле.

Гаварылі, што ў яго была вялікая сям'я, але адныя дочкі, а вось сыночка не было. Ён жа вельмі спадзяваўся на працягвальніка роду па мужчынскай лініі. Неяк жонцы так і заявіў, што калі тая прынясе яму сына, то ён выштукае цэлы пчальнік (сцвярджалі, што, быццам бы, ажно пяцьдзесят вулляў) з саломы. І хаткі тыя пабудуе па ўзоры біблейскіх матываў, што ніводная не будзе паўтараць папярэднюю. Так і атрымалася: жонка ашчаслівіла яго нашчадкам, а гаспадар узяўся за выкананне свайго абяцання. Недзе да 1938 года ўсё і паспеў зрабіць. Такая пагудка пайшла сярод людзей, што за многія дзясяткі кіламетраў дабіраліся да палешука, каб зірнуць на той цуд, створаны майстравітымі рукамі. Пчаляры, асабліва знаёмыя з тым чалавекам, пачалі станавіцца ў чаргу, каб і ім парабіў такія самабытныя вуллі. Гаспадар толькі ўсміхаўся і гаманіў: "Людцы мае даражэнькія, ды ў мяне ж жыцця майго не хопіць, каб усё гэта выканаць... У мяне ж толькі дзве рукі і гаспадарка свая вялікая... На ёй жа трэба працаваць, жонцы і дочкам дапамагаць... На любы вулей, нават на такі вось, саламяны, недзе з тыдзень, адрываючыся ад асноўнай працы, трэба затраціць... Давайце, я лепей вам пакажу, як усё робіцца і вы самі станеце гэтым займацца...". Не пагаджаліся прыйшоўшыя і прасіўшыя, маўляў, у іх так хораша не атрымаецца, не здольныя яны да гэтага. Паказвалі на маленечкага сына і, пасмейваючыся, падкрэслівалі: "Яго вучы, няхай і табе, і нам дапамагае. Няхай расце ён у цябе здаровым ды шчаслівым...". Дзякаваў пчаляр на добрым слове.

Падкрэслівалі, што наладзіў у сваёй гасподзе нешта падобнае на пчалярскую школку і ў яе пастаянна наведваліся дапытлівыя вяскоўцы. Як выплятаць саламяныя вуллі, паказваў таксама, ды толькі потым пе-

раканаўся, што за лепшае навучаць іх вырабляць пчаліныя хаткі простых формаў, не такіх мудрагелістых. Тады і зразумела людзям стане, і атрымліваецца лепей будзе. Гэта былі "стаякі" і "лежакі". Адрозніваліся ад драўляных, як разумееце, не формай, а матэрыялам. Добрую справу, сапраўды "боскую" здзяйсняў гэты чалавек. Карыстаўся вялікай павагай і аўтарытэтам і ва ўлад, і сярод мясцовага насельніцтва. Таму, калі нават прыйшла ўжо савецкая ўлада, то ягоны пчальнік не чэпілі, а ўзялі і апісалі колькасць вулляў і раёў ды наклалі на гэта ... вялізны падатак. Ясная справа, што імкнуліся любым чынам урваць, нешта прысабечыць, але ж не дадумаліся да вынішчэння ці да абагулення.

І ў час вайны ўсё ішло адвечным шляхам: пчолы насілі мёд, пчаляр іх даглядаў, а паласавацца мёдам прыходзілі і днямі, і па начах! Каго сярод іх толькі не было! Але рабаваць ці разбураць, паліць ці вынішчаць ні ў кога рука не паднялася. Бяда прыйшла перад самым вызваленнем, калі ўжо і па начах спаць нельга было з-за пастаяннай недалёкай кананады. Карнікі, а, магчыма, што і проста злыдні з гітлераўскіх войскаў, сталі паліць паселішчы, нічога не разбіраючы і нікога не шкадуючы. Мясцовыя жыхары вымушаны былі ратавацца ў тутэйшых, непралазных для чужынцаў, балотах, каб ацалець. Ні пра будынкі, ні пра нейкую маёмасць ніхто і не думаў. Жыцці ставіліся вышэй за ўсё астатняе. Пчаляр прасіў і маліў Усявышняга, каб ягоны пчальнік гэтая навала абышла бокам. Не атрымалася. Аднойчы каля паўдня задыміла з таго самага боку, дзе стаялі ягоныя саламяныя вуллі. У адчаі чалавек рваў на галаве валасы, паўтараў, што ён усё жыццё ўкладваў у пчолак, а тут... Вяскоўцы, якія былі тады побач, як маглі, супакойвалі гаспадара: «Не ўбівайся ты так... Гэта ж нелюдзі... Яны ж людзей жывымі паляць, а ты хацеў, каб тваіх пчол пашкадавалі... Не ўбівайся так, малі пана Бога, каб пчол ўратаваў, хоць якіх пару сем'яў, то ты развядзеш... Ты ж умееш гэта, як ніхто іншы... А пра вуллі, то ўвогуле не думай... Як іх плесці – ты ніколі не забудзеш, а саломы мы табе заўсёды панапрыносім... Ты ж нам дапамагаў, ніколі ад нас не адварочваўся... Галоўнае, каб мы самі ацалелі...».

Саламяныя вуллі плялі з зеленаватай саломы, бо яна найбольш моцная і гнуткая, перавязвалі салому неашкуранымі і расколатымі ўздоўж лазовымі галінкамі ("дубцамі"), якія спецыяльна пчаляры нарыхтоўвалі ў зімовую пару. Тады лаза найбольш трывалая і не трэскаецца. Потым гатовы ўжо вулей старанна абмазвалі зверху глінай, у якую дадавалі ў пэўнай прапорцыі гной, ячную мякіну, вапну, цёртую цэглу, травяны попел. Лічылася, што рабілі гэта не толькі для ўмацавання і ўцяплення, але і для запаўнення пустых мясцін, а таксама для таго, каб пчолы

таксама маглі запроста вызначыць свой новы вулей па ... адметным паху. Для гэтай мэты хітрыя пчаляры маглі яшчэ прывязваць і невялічкія, кідкія на колер анучкі ("каснычкі"), галінкі ці кветкі. Пасля абмазвання глінай саламянікі яшчэ і старанна паліравалі. Рабілі гэта пры дапамозе вадкага рачнога глею. Такая паліроўка вельмі дапамагала ад празмернай сырасці і вільгаці. Пры старанным доглядзе і акуратным абыходжанні вулей-саламянік мог запроста служыць свайму гаспадару некалькі дзесяцігоддзяў. Найбольш часта іх "з'ядалі" не час і не вільгаць, а ўсюдыісныя ... мышы, якія і ў вуллях заўсёды знаходзілі сабе, чым пажывіцца. З-за такой навалы, асабліва ў галодныя гады, пчаляры не паспявалі рамантаваць ("падплятаць") свае вуллі. І на халодны перыяд года такія саламяныя пчаліныя хаткі выпадала абавязкова пераносіць у памяшканні ("амшанніке"), якія яшчэ даводзілася і ацяпляць, асабліва ў надта лютыя маразы.

І ўсё ж выраб саламяных вуллёў быў запатрабаваны. Тлумачылася гэта, з аднаго боку, тым, што матэрыял для вырабу быў танны, пастаянна знаходзіўся пад рукамі, а з другога – пошукамі рацыянальнага тыпу вулея, скіраванага на павелічэнне медазбору. Да таго ж, цеплаізалюючыя і цеплаправодзячыя ўласцівасці саломы забяспечвалі пастаянны тэмпературны рэжым, на стварэнне якога ў вулеі пчолы заўсёды трацяць шмат энергіі [19, с. 126–127].

Старыя вяскоўцы некалі распавядалі мне, што ў нашым паселішчы, на хутары ў Дзмітрыка (так па-мясцоваму звалі таго чалавека) быў свой невялікі пчальнік. Дык яму пляла вуллі ягоная жонка. Сам гаспадар, пасмейваючыся, даводзіў сялянам: «Я так не ўмею, прызнаюся вам. Яна неяк сядзе, пасядзіць, пакалышацца, а потым толькі прыступае да працы. Можа яна нейкую замову ці малітву на поспех тым часам шэпча. Колькі разоў пытаўся, дык адмахвалася рукамі, што, маўляў, няма чаго дурнотай займацца. Не лезь лепей, то я за гэты час колькі сценкі паспею вывесці...». Людзі зайздросцілі, што Дзмітрык такую майстравітую жонку мае.

Хваліў гаспадар жончыны вуллі. Па магчымасці вадзіў сваіх гасцей, асабліва любіў гэта рабіць на мядовы Спас, калі да яго з'язджаліся родныя, блізкія, знаёмыя, сябры, якія ведалі, што гэты дзень Дзмітрык абавязкова ўсіх чыста пасадзіць за святочны стол. Добра пачастуе, а потым яшчэ павядзе на свой пчальнік. Надта блізка, праўда, не падводзіў, бо пчолы не пераносяць паху спіртнога і лепей было не рызыкаваць, каб потым не апраўдвацца перад людзьмі. Паказваў на паасобныя вуллі і казаў, што і той, і той саламяныя, і што іх выпляла ягоная гаспадыня. Некаторыя не верылі, то іх Дзмітрык прасіў падысці бліжэй і лепей раз-

глядзець. Праўда, пры гэтым агаворваўся: «Калі не баіцеся быць моцна пакусанымі». Гаспадыню распытвалі, але яна, звычайна, адмахвалася: «Ат, слухайце, што падпіты чалавек наплесці можа... Лепей я з жанкамі пагаманю, бо не часта нам вось так даводзіцца сустракацца: пасядзець, нагаварыцца, наспявацца, навіны пачуць. Гэта ж, як у мінулым годзе з'язджаліся. Так болей і не атрымалася. Праца ўсялякая, клопаты, каб на іх ліхаманка якая».

Тая жанчына, калі ў яе нарадзілася трэцяя праўнучка, то паднесла ёй своеасаблівы падаруначак: адштукаваную саламяную калысачку ("зыбку"), якую чаплялі на вяровачкі і вешалі ў хаце на кручок, які, звычайна, быў прымацаваны да бэлькі. Матуля ўсміхалася пастаянна, дакранаючыся да яе, ці то ад таго, што ад гэтай залацістай саломкі патыхала водарам жытнёвага палетку, ці то ад таго, што ў ёй заўсёды гэтак хораша і соладка спіць яшчэ адна яе будучая памочніца, ці то ад замілаванасці, што свякроўка, нават у такім сталым узросце, змагла яшчэ прынесці радасць у іхнюю хаціну. Ды не абы якую калыску сплялала, а такую, што ўсе людзі зайздросцілі. Яе запроста можна было браць і на поле, не замяняючы палатнянай. Колькі ж там тае вагі. Узяў пад руку і пайшоў. Але сам факт гэтакай увагі да нявесткі выклікаў заўсёды нечуваную замілаванасць.

Раз ужо пачалася гаворка пра пляценне з саломы, то неабходна прыгадаць пра тое, што кемлівыя палешукі вельмі ўмела прыстасоўвалі салому для розных гаспадарчых вырабаў з сялянскага ўжытку. Памятаю, якое невымоўнае ўражанне зрабіла на мяне здаравенная саламяная бочка, як потым аказалася, ажно на дваццаць пудоў (трыста шэсцьдзесят кілаграмаў!), якую на ўласныя вочы ўбачыў у Лельчыцкім раёне Гомельскай вобласці. Гаспадары абыякава сказалі мне (для іх гэта была справа прывычная), што бочкі такія бывалі і большыя. Шчыра кажучы, не паверылася, бо куды ўжо большыя?! Старэнькі дзядулька даводзіў мне, што вясковец, перш чым выплятаць такую "пасудзіну", неаднаразова прымяркоўваў і вымяраў, куды ж ён яе паставіць, каб тое месца дазваляла "прасунуць" гэтакага памеру штуковіну. Глядзелі, каб яна і ў дзверы пралазіла, бо яе кожную вясну ці лета, пасля таго, як у ёй заканчвалася зерне, дбайныя гаспадары выцягвалі ў двор, там чысцілі і ... мылі з сярэдзіны. Потым старанна прасушвалі на сонцы і ўносілі назад, да будучага ўжо ўраджаю.

Пераканаўча і спакойна даводзілі: «Так людзі нашы думалі, што "затхласць" з бочкі выйдзе, што пылу не застанецца, а чыстае паветра, свежы пах зерня, то ён спачатку і мышэй не прыцягвае. Хітрыя ды мудрыя нашы бацькі былі, многаму маглі навучыць, дарма, што непісьмен-

нныя ды ў школу не хадзілі. Іх жа само жыццё вучыла. Яно ж самага хітрага за пояс засуне, ніколі прамашкі не даруе. Палянуецца нехта з вяскоўцаў прасушыць бочку, прамыць яе і “спылаваць”, то потым зmолатае з такой пасудзіны збожжа, будзе мець стойкі пах гнілі, затхласці, едкага пылу».

Саламяная бочка нават у нечым была лепш за драўляную. Не варта здзіўляцца ўжо толькі з той нагоды, што яна была надзвычай лёгкая і яе спакойна мог перасоўваць, а то і пераносіць у іншае месца ўсяго толькі адзін чалавек. Калі ставілі ў хаце, то звычайна месца адводзілі непадалёку ад печы (за печчу). Выгода была падвоеная: і зерне прасыхала, бо яно было побач з цёплым бокам печы, ды і сама саламяная сценка бочкі “дыхала” (прапускала паветра), і ставілі бочку на акуратна выробленае з дошчак ці з кругляшоў узвышэнне, каб дно не праваліласся ад цяжару. Нельга забывацца, што салома не такая ўжо і трывалая, нават свежага ўмалоту. А з другога боку, то і мышэй ў хаце, як бы ўжо там не гаварылася, было значна меней, чым у свірне ці ў гумне. Яшчэ ж і пра ўсюдыісных зладзеяў ніколі стараліся не забывацца. У хаце ж пастанна, амаль што, нехта знаходзіўся, асабліва калі ў сям'і былі старыя бацькі. Усё ў ранейшых сем'ях планавалася і прадумвалася наперад. Так мяне пераконвалі, але дзе гарантыя, што сярод продкаў таксама не знаходзілася вялікая колькасць вяскоўцаў абыякавых, лянотных, бэйбусаватых і г. д.

Ад мышэй, ад іхніх вострых і ўсёпаядаючых зубоў таксама імкнуліся неяк бараніцца. Адвечная гэта барацьба: паміж чалавекам і надакучлівым звярком. І адназначна не засведчыш: на чыім баку пастаянна была перавага, асабліва, калі выпадала браць у разлік галодныя, неўраджайныя гады. Тады мышы і каменныя бочкі грызлі, прабіраючыся да спажывы, адчуўшы пах зерня. Гаварылі, што калі ў хаце было чыста (ці параўнальна чыста), то мышы ў першы год увогуле маглі не з'явіцца. Гэта ўжо потым яны завітвалі ў “госці”. Таму гаспадары ставілі ля саламяных бочак пасткі, прывучвалі хатніх кошак спаць на зерні ці побач з “пасудзінай”, ля якой хатнім “муркам” налівалі есці, каб у іх быў “нюх” на тую салому. Добра, калі котка ля бочкі выводзіла і гадавала сваіх кацянятак. Тады ўвогуле дарога мышам туды была замоўлена! Чамусьці, як сёння падаецца, то гэта ўсё ж была перавялічаная перамога, бо і ад кацінага “войску”, асабліва ад катоў, адвечна патыхала лянотай. Тым болей, што каты і сваіх кацянят не кармілі, а “скідвалі” ўсё на котак.

Пару разоў чуў, як нейкі стары-стары дзед усё румзаў, нібыта пад нос, але рабіў гэта так, каб адначасова чулі і іншыя: “Бочка саламя-

ная... Саламяная бочка... Вынайшлі... Толькі мышэй у хату валаклі... Адной саломы гэтулькі перавядзеш, што яе і не навазіцца... Калі ўсё з саломы пачнеш рабіць, дык чым свінні насцілаць станеш?.. Папрыдумлялі... Здагадаліся... Вось драўляная бочка, ды яшчэ дубовая – зусім іншая справа... Яна ж вечная... Ёй жа зносу няма... Праз дзясятак гадоў дно зменіш і зноў яна, як новая... А то пачынаюць тут плёмкаць, што саламяная пасудзіна яшчэ і намнога лепшая... Няпраўда гэта...”.

Але не доўга ён размаўляў, знайшліся і на яго вастрасловы: «Ага, жаба цябе пастаянна душыла, што не мог такой пасудзіны сплесці, бо рукі ў цябе не з таго месца растуць. Дык ты, не каб прызнацца, а ўсё роўна пачынаеш сваё даводзіць. Яна ж і лёгкая, і зручная. Калі няма вялікага ўраджаю і яна непатрэбная, дык такую бочку можна і на гарышча закінуць. Яна ж і там не папсуецца. А пра тваю дубовую, то ажно слухаць няёмка. Думаеш, што мы горай разбіраемся? Не. Усё ведаем, таксама ж не першы год на белым свеце жывём. За дубовую трэба і грошы добрыя заплаціць, бо яе далёка не кожны вырабіць, і ўзняць яе аднаму, нават самаму моцнаму чалавеку, не з рукі будзе. Калі ж гэта ў нашых людзей лішнія грошы на бочкі былі? Прыгадай сам, як старыя пасудзіны, толькі і рабілі, што з года ў год “перасыпалі”, але ж з ужытку ўсё роўна не выводзілі. Старыя і тыя ніколі не выкідвалі, а “сыпалі-перасыпалі”, каб яшчэ пад якую нагоду спатрэбіліся. А саламяную што: пасядзіць майстравіты чалавек з тыдзень і мае сабе пасудзіну. Ды яшчэ якую. Так, што ты дарэмна не мянташ языком. Пасядзеў бы, лепей, пабач з майстрам, дык і сам бы нечаму паспеў навучыцца».

Распавядаюць, што ў суседняй вёсцы Ботава, што на Піншчыне, падчас вайны, той, што з гітлераўцамі была, кемлівыя гаспадары ўмудрыліся ў саламянай бочцы схаваць яўрэйскую дзяўчынку і тым самым выратавалі ёй жыццё. Атрымалася ўсё да банальнага проста: дзяўчынку тую вясковая сям’я хавала амаль два з паловай гады. Спецыяльна выкапалі патаемна ў хляве ямку, у ёй зрабілі нешта падобнае на ложак, уцяплілі, а зверху наслалі жэрдкавую падлогу. З самага верху стаялі авечкі. Нават калі б якія карнікі прыйшлі з сабакамі, то тыя не ўзялі б следу чалавека, бо авечы дух перабівае любы іншы. Аднае раніцы паклікалі дзяўчынку ў хату. Была надзвычай халодная ноч, сяляне збаяліся, што яна ў сваёй ямцы ўвогуле акалее. Але не, ратавалі авечкі, якія заўсёды трымаліся своеасаблівым клубком і ад іх таму пастаянна ажно пара валіла, так у іх усходзілася цяпло. Вырашылі, каб малая пераапранулася, памылася, а заадно і перакусіла з імі па-чалавечы, за сталом седзячы.

Калі дзяўчынка мылася, то гаспадыня залівалася гаручымі слязьмі, гледзячы на яе худзенькае цельца. Толькі шаптала, нібы заведзеная:

«Нічога, нічога, што худая... Мяса нарасце... Галоўнае, каб жывою засталася... Але ўжо хутка, кажуць, і Саветы прыйдуць, то тады і твая бяда мінецца... Нагаравалася ты за гэты час на ўсё сваё будучае жыццё... І з родных нікога няма... Усіх чыста вынішчылі, нікога не пашкадавалі... Цябе знайшлі, як кацянятка, пад плотам... Значыцца, трэба табе было выжыць... Нічога, нічога, усё будзе добра... Пабачыш, мне нават сон такі прысніўся, што мы дажылі да таго доўгачаканага намі вызвалення...».

Гаспадар нечага памкнуўся да акна і крыкнуў: «Немцы! Ужо ў двор заходзяць!». Крутнуўся туды-сюды і рэзка сказаў: «Лезь, малая, у бочку і сядзі там цішэй за мышэй! Калі знойдуць, то тады ўсіх паб'юць, нікога не пашкадуюць!». Малая шуснула з-за печы ў бочку, дзе зерне было толькі на самым дне: «А ты на яе накідай тых смярдзючых лахманоў, якія мы з яе садралі! Ды хутчэй, чуеш, яны ўжо на ганку грукаюць! Не марудзься, родненькая, бо потым не ўратуемся!».

Праз парог, неяк адначасова, пераваліласся трое чужынцаў. Аказалася, што гэта былі не немцы, а мадзьяры. Гаспадар ажно адразу збялеў. Пра гэтых нелюдзяў вяскоўцы распавядалі такія жахі, што ажно валасы дыбам паўставалі: так яны лютавалі і зверствавалі ў наваколлі. Шуснулі па хаце, агледзеліся прыйшоўшыя, са стала адразу ж забралі вялікі бохан свежага хлеба і кавалак сала. А потым адзін з іх чамусьці звярнуў увагу на вялізную саламяную бочку. Магчыма, раней такога посуду яму проста не даводзілася бачыць. Нешта прамовіў да сяброў і весела замахаў рукамі. Потым дастаў з сумкі фотаапарат. Гаспадары анямела маўчалі. Двое падаліся да бочкі і сталі па баках, а трэці збіраўся іх сфатаграфаваць. Гаспадыня ўскінулася, падбегла да падушак, сцягнула з іх вышываную палатніну і падбегла да бочкі, каб накрыць яе зверху. Сама ж і патлумачыла, быццам бы тыя маглі нешта зразумець: “Каб на картачцы прыгажэй было, а то ж мы туды сваё рыззё скідваем... То і цягне з яе не вельмі хораша... А так прыкрыем, дык і кветачкі на картцы застануцца і вам, паночкі, стаяць лепей будзе... Гэткая ж памяць надоўга ў вас застанецца”. Мадзьяры пашчоўкалі фотаапаратам, папазіравалі перад аб'ектывам і падаліся да выхаду. Праўда, не забыліся забраць з сабою і вышываную палатнінку.

Хвілін колькі гаспадары не маглі прамовіць і слова, не спяшаліся клікаць да сябе дзяўчынку. Баяліся, што чужынцы могуць чаго-небудзь зноў вярнуцца. У другі раз так можа не пашанцаваць. Збялелая дазвання жанчына прыйшла ў сябе першай. Падышла да бочкі і стала нервова выкідваць рыззё, якое было навалена на іхнюю “кватарантку”. Тое, што гаспадыня ўбачыла, яе ўразіла яшчэ больш: малая, скруціўшыся нейкім неверагодным абаранначкам, спала на зерні. Толькі і ў сне

дрыжэла. Гаспадар паціху прамовіў: «Гэта яна са страху заснула... А яшчэ памылася за некалькі месяцаў першы раз... Сама разумееш, як яе расслабіла... Вось і правалілася, няшчасная, у глыбокі сон... Давай, будзі яе ды няхай на печ лезе... Не павядзем яе сёння ў тую земляную нару... Раз, пан Бог, нас тут уратаваў, то і на другі раз не адступіцца... Няхай на печы паспіць, адагрэецца...».

Ажно і сапраўды, праз нейкі тыдзень мадзьяры ўцеклі з вёскі, а па дарозе на Лунінец патрапілі пад удар Чырвонай авіяцыі, а рэшткі іхняга войску дабілі партызаны, якія ўжо цікавалі за імі і спецыяльна наладзілі засаду. Так незайздросна і закончыўся зямны шлях тых вылюдкаў, якія шмат гора паспелі прынесці за гады акупацыі мясцовым вяскоўцам.

Распавядалі, што тая дзяўчынка стала ўрачом, потым з'ехала ў ЗША і адтуль усё сваё жыццё прысылала грошы і пасылкі з рэчамі для сваіх выратавальнікаў. А тая саламяная бочка служыла гаспадарам многія гады і яе выкінулі новыя ўладальнікі хаціны, якія прыдбалі сабе будынак і перавезлі яго недзе бліжэй да Пінска. Стары сусед, то так і казаў: «Стаяла тая бочка, з пачарнелае ўжо саломы... Мінулым яшчэ летам стаяла... Вунь пад той яблыняй... Пайшлі, глянем...». На тым месцы, дзе стаяла саламяная "пасудзіна", ляжала толькі невялічкая гурбачка ўтравелага смецця. Рэшткі саломы з лазовым пруццем. Дзед ледзьве чутна прамовіў: «Вось і ўсё, што засталося ад саламянай выратавальніцы... Гэта не жартачкі – чалавечае жыццё ўратавала... І гаспадары малайцы... Не кожны, далёка не кожны здолее так хутка ацаніць сітуацыю і знайсці правільнае рашэнне... А тут... Не разгубіўся сусед, паспеў скеміць. Значыцца, яму сам Усявышні падказаў, значыцца, пажыць гэтым людзям яшчэ выпадала».

Асабліва майстравітыя гаспадары імкнуліся абавязкова нечым здзівіць сваіх аднавяскоўцаў: калі не багаццем, то арыгінальнасцю задумы і непаўторнасцю яе выканання. Прыгадваюць, што ў недалёкім фальварку жылі двое суседзяў: адзін – заможны, а другі – не надта каб. Абодва затое са шляхты. Зноў-жа, са шляхты саламянай ("лапцюжнай"), якая не мела надзвычай слаўнага і даўняга радаводу. Адзін аднаму зайздросцілі, асабліва той, што быў ... багацейшы. Здавалася б, навошта зайздрыць: і парабкаў сезонных наймаў, і аднаго-двух на ўсю зіму пакідаў, і поля меў ладны кавалак, ды такога, што на ім усё чыста расло; і лесу добрую дзесяціну ў пасаг за жонкай перапала. А ўсё роўна, убілася такая ў чалавека чамярыца і не давала яму нідзе (і ніколі) спакою. Як убачыць, што сусед нешта робіць, то стараўся любым чынам пракрасцца да таго, каб хоць адным вокам зірнуць: чым жа ён там, у сябе, заняты? Грызла яго, атрымліваецца, усё з сярэдзіны, не давала

спакою ні днём, ні ноччу. У халодным поце, ад зайздрасці, ноччу часта прахопліваўся, ускокваў з палацяў і пёр на вуліцу, бо баяўся, што сусед там нешта без ягонага пільнага “нагляду” паспее зрабіць. Ужо нават бяднейшы і той не такі, як пераказвалі вяскоўцы, быў зайздроснік. У яго і зайздрасць зразумела адкуль выходзіла: з беднасці, з таго, што ў ягонай “панскасці” хлеба нават ад старога да новага не заўсёды хапала.

Праўда, і сусед той бедны хітраваты быў. Ведаў жа выдатна пра тую чорную зайздрасць. Гэта ж не забароніш, а вось паздзекавацца ды пагіграць на нервах сквапніка лішні раз можна было. Яны былі шляхтай, але ўсё ў іх ішло па-мужыцкаму звычаю: адно што трохі ў гаворцы «пшэкалі» і ўсё на тым, уся іхняя “панскасць”. Задумаў тады бяднейшы зноў здзівіць зайздроснага суседа. Рукі ў яго былі залатыя, там, дзе іншыя грошы плацілі, у майстроў замаўлячючы ці на дом іх запрашаючы, гэты сам упраўляўся. Ды яшчэ так выштукоўваў, што потым тыя майстры дзіваваліся: нідзе чалавек спецыяльна не навучаўся, а так хораша ўсё ўмее вырабляць.

На той раз, гледзячы на сваю маладзюсенькую дачку-прыгажуню, якая харашэла з кожным днём, гаспадар думаў, як жа зрабіць так, каб у яе было нешта такое, чаго ў іншых дзяўчат ва ўсім наваколлі нельга было б адшукаць. І прыдумаў – вырашыў сплесці ёй куфар пад пасаг, які гаспадыня складвала пакуль што ў чыстую ліпавую бочку. І сплесці не з лазы, а з саломы! У гэтым і будзе заключацца адметнасць. Куфры ў нас традыцыйна рабілі з дошчак і замаўлялі іх майстрам, а тыя, хаўрусуючы з кавалямі, усё чыста выраблялі. Бралі за такую працу, звычайна, надта дорага. Толькі ж у гаспадароў проста выйсця іншага не было: дачку ж замуж з пасагам выпадала аддаваць, а без куфра тут ніяк не абысціся. Згадвалі пра некалькі выпадкаў, калі гэтакія куфры выпляталі з ашкуранай лазы. Таксама хораша глядзеліся. Асабліва калі іх да гэтага ніколі не бачыў. А тут з саломы. Дадумацца і то цяжка, а то зрабіць!

Не адразу ўзяўся гаспадар за выкананне ўласнай задумы. Яно і зразумела: неабходна было ўсё прадумаць, акуратненька спланаваць, каб потым не абмішурыцца перад людзьмі. Яны то і зайздросціць умеюць, але калі што якое, то і высмеюць напоўніцу. Такія ўжо нашыя вяскоўцы. Таму ўсё хадзіў ці нешта рабіў чалавек па гаспадарцы, а галава іншым была занята, але адчувалася, што ён “выспельвае” сваю задуму. Потым пачаў саломку адбіраць. З тых снапоў, якія ў яго былі прызначаны для пляцення, стаў па жмені другой салому выбіраць і складваць асобна. Глядзеў, каб яна была гнуткая, падатлівая, не ломкая, але разам з тым жаўтавата-бліскучая, доўгая. Наскладваў цэлы ворах і ўжо не ў снапы яе звязваў, а проста так ладкаваў. Потым узяўся

ашкурваць вярбовыя, а не лазовыя, дубчыкі. І іх падбіраў цярпліва, не спяшаючыся, каб і тут ніякай хібы не даць. Калі ён стаў выплятаць куфар – ніхто і заўважыць не паспеў. Вось сядзеў пад уласным гумном у зацішку чалавек, нешта прымяркоўваў, круціў, падплятаў паціху і, часта адыходзячы, пільна ўглядаўся. Потым садзіўся зноў і нешта сам сабе, нібыта, гаманіў, а, магчыма, што і спяваў-падспеўваў. Калі нехта выпадкова праходзіў па вуліцы і бачыў занятага гаспадара, то, вядома ж, задаваў усялякія пытанні, каб даведацца: чым жа гэта ён там займаецца? Але тут ім не надта шанцавала, бо на ўсе пытанні майстра рабіў адно – адмоўчваўся, не ўдзяляў увагі людской цікаўнасці...

У адзін надвячорак сходзіў да мясцовага каваля, нешта доўга з тым гаманіў, паказваў, нават на пясочку маляваў, прасіў, каб усё было зроблена менавіта так, як ён сказаў, бо ў адваротным выпадку нічога станоўчага не атрымаецца. Кавалю і таму стала надзвычай цікава: у ягоным жыцці амаль ніколі яму не здаралася каваць тое ... не ведаю што. Гаспадар катэгарычна заявіў, што зараз раскрыць свой сакрэт не можа, іншая справа, што калі ўсё будзе гатова, то тады першага каваля пакліча, каб ён глянуў і ацаніў. Так і дамовіліся. Можна сказаць, што і ад хатніх скрываў сваю задуму майстравіты чалавек. Тыя прызвычаіліся, што чалавек пастаянна нешта рабіў, майстраваў, ладзіў ці падладжваў і таму, каб не адрываць яго ад справы, не задавалі лішніх пытанняў. У любой вясковай справе ёсць пэўная рызыка, якая заключаецца ў тым, што па ўласнай неасцярожнасці, не толькі на благія словы нарвешся, але і ў каршэнь ці пад азадак можаш атрымаць. Таму за лепшае лічылі: абыходзіць бокам, не назаляць, “не напрошвацца” на гнеўны выбух таго, хто не жадаў дзяліцца ўласнай таямніцай.

Недзе з месяц катурхаўся чалавек. Сходзіў зноў да каваля, забраў у таго каваныя часткі (калёсікі, замок, ланцужкі-паскі, на якіх нават сымітаваны былі чорненькія шляпкі аднолькавых цвічкоў-кляпанцаў) і прынёс іх да сябе ў варыўню. Усё да апошняга трымаў у сакрэце. А неяк, пад вялікае гадавое рэлігійнае свята, паклікаў усіх хатніх зірнуць на той выраб, над якім ён так старанна і доўга працаваў. Гаспадыня з дочкамі і сынамі нават дыхнуць спачатку не маглі напоўніцу ад таго захаплення, якое імі апанавала, і толькі праз нейкі час пачалі задаваць пытанні. Гаспадар адно – пасміхаўся, адчуўшы, як даспадобы ўсім прыйшоўся саламяны куфар. Потым, папярэдзіўшы, каб у яго яшчэ адразу не перакладвалі пасаг з бочкі, падаўся да каваля. Той нават сваю працу кінуў і папёрся за майстрам, так яму карцела, да чаго і ён сам, не ведаючы пра тое, меў непасрэднае дачыненне. Адно, што адразу зазначыў, калі ўжо былі на месцы, што здагадваўся пра нешта самабытна-адмысло-

вае, але не пра ... такое. Пры гэтым ніякай чорнай зайздрасці ў словах каваля не адчувалася і блізка. Гаварыў спакойна, з ласкавай усмешкай на пабурэлым ад пастаяннага агню твары. Проста, атрымлівалася, што адзін майстравіты чалавек выказваў сваё захапленне гэткаму ж сама-му. А магчыма, што ў плане выканання, і больш умеламу.

Доўга потым сядзелі яны і гаманілі паміж сабою: спачатку – пад сцяною хлява, а потым ужо ў хаціне, за сталом, які паспела накрыць здагадлівая гаспадыня. Гаварыць то гаварылі, але, няма, няма, ды і зноў звярталіся да саламянага куфра. Толькі тут гаспадар, як на чыстым духу, прызнаўся, што да апошняга сумняваўся ў сваім поспеху. Ніколі раней не выконваў такога, а тут – сам задумаў і сам жа зрабіў. Перанеслі выраб у хаціну, паставілі на падлогу і той нячутна пакаціўся па дошках на старанна змазаных колцах. Дакаціўся да сцяны і спыніўся. Гаспадыня ўсклікнула: «Раз ужо так, то тут яму і надалей стаяць... Ажно да таго самага часу, пакуль не выйдзе замуж наша апошняя дачушка... Сам куфар сабе месца абраў... Не будзем і мы яго змяняць...».

Многія прыходзілі, спецыяльна для гэтага грабіўшы ладны крук, каб паглядзець на нечуваны выраб. Усіх здзіўляла тое, што зроблены ён быў з саломы, якая вунь як сябе праявіла, сябе паказала і ў такім ужытку. Некаторыя нават прасілі гаспадара, каб ён і ім такую "штуку" вырабіў, толькі той не пагаджаўся, ні за якія грошы, бо, маўляў, баюся, што не спраўлюся, што не атрымаецца, ды яшчэ што-небудзь адгаворачнае. А па шчырасці, то яму проста не хацелася, каб яшчэ ў некага быў такі ж самы куфар ды, мала гэтага, яшчэ і зроблены ягонымі рукамі. Хацелася, каб такі ўзор быў толькі ў ягонай дачушкі.

Выйшла ягоная прыгажуня замуж, але засталася разам з мужам жыць у сваіх бацькоў, бо тыя былі ўжо ў даволі сталым веку, ды і паразыходзіліся іншыя родныя па самастойных гаспадарках. Выпадала ж некаму і бацькоў даглядзець, і родныя нівы-гоні апрацоўваць. Не доўга працягвалася іхняе шчаслівае жыццё. Праз нейкі год "прыйшлі Саветы" і пачалі палохаць усіх хутаранцаў, што будуць аб'ядноўваць у нейкія, нечуваныя тут раней, калгасы. Праўда, не паспелі гэтага здзейсніць, бо пачалася вайна з гітлераўцамі і ўсім стала не да аб'яднання. Кожны імкнуўся выжыць, ацалець ад той нечуванай бязлітаснай калатэчы, а пра рэчы ўсялякія, то і задумваліся мала. Тым не меней найбольш каштоўнае ды неабходнае стараліся дзе-небудзь прыхоўваць, каб, калі што якое надарыцца, дык можна было самім паўцякаць, а рэчы тыя ў схованках заставаліся. Малодшая дачка падзудзіла свайго мужа, каб выкапаў ямку далекавата ад хаціны і туды ўгаварыла перанесці свой куфар, у якім ужо знаходзіўся не толькі яе пасаг, але і яшчэ тое-сёе з хат-

ніх пажыткаў. Стары бацька пераконваў, што не трэба гэтага рабіць, бо саламяны куфар не вытрымае земляной вільгаці і згніе, сапрэе, стаяўшы ў такой схованцы. Але дзеж гэта вы бачылі, каб нехта перапёр палескую жанчыну, ды яшчэ шляхецкага роду! Няхай сабе і самага захудалага! Як пачала крычаць, як стала даводзіць, што ўжо зусім хутка ўлада зноў пераменіцца і таму асабліва баяцца няма чаго, дык мужчыны за лепшае вырашылі зрабіць так, як яна сказала.

Рабілі ўсё ноччу, бо баяліся чужых вачэй, якія ў тыя гады асабліва, здавалася, што цікавалі з-за кожнага куста, з-за кожнай купіны. Першыя дні, дык неяк міжволі галовы паварочвалі ў той бок, дзе было схавана іхняе майно, а потым – крыху супакоіліся і сталі думаць, што так сапраўды лепей, што хто ў хату не зойдзе, а куфра няма. Не пачне ж дапытвацца, бо зразумее, што ўсё роўна праўду не скажуць, схлусяць нешта такое, чаго і слухаць асабліва не захочацца. Тады ж не толькі па начах, але і днямі па хатах вяскоўцаў шасталі самыя розныя рабаўнікі: і гітлераўцы, і мадзьяры, і паліцаі, і бульбоўцы, і акаўцы, і свае, так званыя, "партызаны". Кожнаму ж хацелася нечым ды пажывіцца. На якія толькі хітрыкі не падаваліся, каб дабіцца свайго.

У адзін надвячорак, калі ўся сям'я сабралася вячэраць і сядзела ўжо за сталом, муж нечакана ўскочыў: «Пабач, яны ж наш куфар валакуць!». І торкнуў рукою ў вакно. Чалавек заўсёды садзіўся тварам да падворка, каб бачыць, што там рабілася. Ліхалецце да ўсяго такога прывучыла. Усхапіўся і вылецеў з хаціны, а там ужо адчайдушна загарлаў: «Што ж гэта вы, злыдні, робіце?! Апошняе валачэце?!». Але тыя не кінулі ўзятае, а адно прыспешылі крокі, пёршы за сабою ўкрадзенае. Яшчэ з сотню крокаў і лес пачнецца. А там не проста лес, а старадаўняя пушча. Там ужо нікога не знойдзеш і нічога не справіш назад. Адчайны чалавек кінуўся да невялічкай дрывотні, якая стаяла нібыта з краю двара і праз імгненне выляцеў адтуль з ручным кулямётам у руках. Не доўга думаючы і не гарлаючы болей, прама з калена пусціў доўгую чаргу па-над галовамі грабежнікаў. Такога тыя не вытрымалі. Але, мабыць, са страшэннага пераляку: ніхто ж не чакаў, што па іх пачнуць страляць, ды яшчэ з кулямёта! Тут у іх і атрымалася загваздка. Чужынцы, нібы прывязаныя, пачалі тузацца на месцы, а гаспадар крычаў, каб кідалі, бо ўсіх пераб'е. Напамін пра далейшы лёс быў і так ім прадказальны. Тузануліся-рвануліся і ўсё з куфра выляцела долу. Самае недарэчнае, што тыя, відаць, прыдурэўшы са страху, куфар так і не кінулі, а паперлі з ім прама ў лес.

Давялося гаспадарам зноў увесь свой самы важны і каштоўны нажытак хаваць у ранейшую бочку і закопваць усё гэта ў іншым месцы.

Стары бацька, то той адно толькі скрушліва пакручваў галавою і здзіўляўся людской нахабнасці: гэта ж трэба – сярод белага дня прыйшлі красці і ніякае сілы на іх няма. Зяць задаволена параготваў – ёсць, самі ж бачылі. Жанчыны вялі сваё, што сапраўды саламянае дно і сценкі надта хутка сапрэлі без паветра ў земляным палоне. Трэба было паслухацца і не рабіць па-свойму. Мужчыны іх супакойвалі, што тады б увесь нажытак тыя чужынцы павалаклі б з сабою. А так, усё засталося, толькі саламяны куфар, атрымліваецца, укралі. Праз некалькі дзён знайшлі яны і свой куфар, кінуты ў лесе, непадалёку ад ускраіны, дзе зладзеі прыйшлі ў сябе і, пераканаўшыся ў тым, што ўсё стала непатрэбным і непрыгодным, не пажадалі несці з сабою пустую "пасудзіну". Таму і кінулі. Аказалася, што тады яны затрымаліся на месцы, бо зачапіліся колцамі за нейкі корч, які яшчэ даволі моцна і трывала сядзеў у зямлі. Прыспешаныя кулямі, якія свісталі над галовамі, так рванулі саламяную прыладу, што тая не вытрымала і ... парвалася знізу. Усё і высыпалася, а збіраць ужо ў іх магчымасці не было.

Стары, пакірхваючы ды стараючыся яшчэ трымацца, пераконваў, што спляце іншы, яшчэ прыгажэйшы за гэты куфар, бо цяпер ведае, як усё рабіць і дзе пастарацца трэба, каб была больш трывалая і даўгавечная аснова, так што няма чаго адчайвацца. Не атрымалася ў яго на гэты раз здзейсніць задуманае: нечакана прастудзіўся і, праляжаўшы на печы нейкі з тыдзень, памёр. Праз кароткі зусім час зяця ягонага таксама мабілізавалі ў войска і моцна паранілі пад Варшавай. Назад яшчэ вярнуўся, але ўжо працаўнік ды і жыхар з яго быў ніякі. Нават год не працягнуў сярод сваіх родных – адправіўся на вясковыя клады.

Падчас сваіх летніх адпачынкаў, бываючы на той мясціне, дзе некалі жылі шляхціцы, абавязкова спыняюся. Хочацца проста пастаяць, паразважаць пра тое, якое кароткае і непрадказальнае жыццё, якое яно ломкае, залежачае ад самых розных абставін. Як і тая самая салома, якая пераспее, перастаіць у полі і потым ламаецца-крышыцца пры першым неасцярожным да яе дотыку.

На Лунінеччыне расказвалі таксама даволі цікавую гісторыю, звязаную з саламяным куфрам, але тая была больш вясёлая і без нейкіх смяротных зыходаў. Тым не меней пра яе ў вёсцы Цна ведаюць і да гэтага часу. Параготваюць, праўда, ужо без асуджэння і без нейкай там асаблівай злосці. Справа была таксама "пры паляках". Вёска тая была амаль што ўжо прымежная. Хлапцоў прызыўнога ўзросту, як і вадзілася, прызывалі ў польскае войска. Там яны служылі адпаведны тэрмін і потым варталіся дамоў. Калі ўжо прыходзілі, то некаторыя з іх, асабліва па першым часе, месца сабе быццам бы не знаходзілі, па адсутнасці

тут таго “гарадскога” жыцця, якое ім даводзілася пабачыць у месцах дыслакацыі іхніх баявых падраздзяленняў. Праўда, не ўсе былі такія фанабэрыстыя і ганарлівыя да такой ступені, калі мясцовая моладзь вымушана была звычайнымі кіямі збіваць пыл і гонар з паспрабаваўшых цывілізаванага парадку сваіх жа вяскоўцаў. Чамусьці менавата тады тыя пачыналі і думаць, і ўсё ўчыняць так, як рабілі гэта да адыходу ў войска. Аказваецца, і звычайны дручок мог спрыяць у рознай ступені ў працэсе такога самабытнага “выхавання” (“вяртання да каранёў сваіх першасных”).

Мясцовых хлапцоў, амаль усіх, за рэдкім хіба што выключэннем, забіралі ва ўланы. Ясная справа, што тады важная роля ў любой арміі адводзілася кавалерыі. Таму і зараз, калі глядзіш на старыя, парудзелыя фотаздымкі, на якіх зафіксаваны тыя “огеры” падчас свайго выканання воінскай павіннасці, то міжволі хочацца ўсміхнуцца: гэтак ужо недалужна глядзяцца тыя шаблі, прычэпленыя да іхніх паясоў ці ўтрыманыя ў руках “на ўзважай!”. А тыповыя палескія кірпы выдаюць у іх маіх непасрэдных землякоў за многія сотні кіламетраў. Калі прыходзілі вайскоўцы ў адпачынак, то рэдка хто змаўчаў, каб не прамовіць пры сустрэчы (у спіну, ці самому сабе пад нос): «Во, яшчэ адзін “саламяны” пан сунецца... Важна йдзе і ногі шырока расстаўляе, значыцца, не раз, не два прышчаміў свае “інтарэсы” па поўнай праграме... Нялёгка яму даводзілася і на кані гарцуючы... Той яшчэ “саламяны” пан, а і гэты пачне распавядаць, што лётаў на сваім жарабцы (няйначай!) хутчэй ветру... Але ж які гэта цначук, калі не схлусіць... Па сабе ведаю, што так і жывецца лягчэй, і да тваёй асобы ўвага заўсёды большая...».

Адзін з вясковых хлапцоў у польскім войску і сам ледзьве не выбіўся ў “паны”. Так яго пастаянна падзуджвалі суседзі. Аказваецца, яго нейкі афіцэр узяў сабе за ардынарца. Хлапчына быў спакойны, кемлівы, здаровы і прыгожы з выгляду. Яму было ўсё роўна, дзе службу несці. Так і прабыў тыя два ці тры гады. Вядома ж, ездзіўшы паўсюль за сваім панам афіцэрам, бачыць яму даводзілася значна больш, чым іншым радавым байцам. А ад нараджэння вясковец быў надзвычай запамінальным. Калі глядзеў на нешта адметнае, то пастаянна думалася: вось каб і мне (ці маім родным) такое ж самае. Атрымлівалася, што нібы адкладваў усё на потым, калі вернецца дамоў.

Хлапчына прыйшоў з войску, а яго малодшая сястра ўжо замуж збіралася. Вырасла з падлетка ў гэтакую прыгажуню, што брат адно ўсміхаўся, з радасцю назіраючы за ёю. Вось недзе ў тыя моманты і мільганула ў ягонай галаве думка: а што, калі я падарую на вяселле сваёй любай сястрычцы нешта такое, чаго ў іншых не было. Вядома ж,

зыходзіў са сваіх матэрыяльных магчымасцей. Спачатку хацеў купіць, у Столін з'ездзіўшы, хвацкія дзявочыя боцікі, сшытыя пад замову. Але, як аказалася, тут ён ужо прыпазніўся, бо старэйшы брат з жонкай ужо вырашылі зрабіць менавіта такі падарунак.

Тады, папакутаваўшы яшчэ нейкі дзень, кінуўся да роднага дзеда. Стары быў выдатным майстрам. Яму што рэзаць, што шыць, што вязаць, што плесці было ўсё адно. Прыбег і на праміλы Бог просіцца: «Дзядулька, паслухай мяне... прашу цябе... Ведаю, што цябе не ўгаварыць, калі нешта табе не даспадобы, але зрабі для мяне так, як я табе скажу...». Стары здзіўлена пазіраў на ўнука, мяркуючы, чаго гэта ён так на гэты раз перада мною рассыпаецца? А той, ледзьве не на каленях стоячы, працягвае: «Сплясці, дзядулька з саломы маёй сястры на хуткае вяселле куфар. Ні ў кога такой рэчы не было і, думаю, не будзе. А тут такі падарунак. Сястра ўзрадуецца, людзі падзівуюцца... Зрабі, добра. У цябе ж рукі залатыя. Я табе ва ўсім дапамагаць стану. Толькі не адмоў, паслухайся...».

І трэба ж было, не падумаўшы, хлопцу далей узяць і ляпнуць: «Я у паноў такія вялікія сундукі з саломы на ўласныя вочы бачыў... Яны ў іх усялякую вопратку ды і якое іншае начынне возяць... Зрабі...».

Сказаў і чакае, а дзед адно – мыляе вуснамі. Спахмурнеў і прамовіў: «Панскага, унучак, я нічога рабіць не буду! У мяне з панамі свае рахункі! Ты з імі гарбату піў, а я па-іншаму паступаў! Так і ведай! Рабіць не стану!». Як не прасіўся ўнук, як не ўмаўляў дзеда, але той быў непарушны. Нездарма ж гавораць, што ўпартасць палешука далася яму панам Богам разам з нараджэннем. Ужо і бабця прасіла, і хлопцавы бацькі падключыліся, а стары стаяў на сваім: "Панскага не зраблю!". Калі ўжо моцна населі, то нібыта здаўся і сказаў: «Угаварылі, але калі што не атрымаецца, то каб потым на мяне не плявалі і не гаварылі абы-чаго!».

Ужо тады стары ўдумаў учыніць унуку і, адпаведна, унучцы ліхое, але, ясная справа, выгляду не паказваў. Зрабіў усё, як мае быць: прыходзілі людзі, дзівіліся, захапляліся, хвалілі непаўторны талент вяскоўца. Дзед, здавалася, не чуў тых слоў захаплення, не рэагаваў на ўсё, што адбывалася навокал. Адным словам, паводзіў сябе на дзіва спакойна, калі неабыякава. Хутка прыспеў і час вяселля. Усё ішло адвечнай чаргою: госці спявалі, маладыя наглядзецца не маглі адно на адное, а калі пачалі выносіць куфар, то ўсе прысутныя, зноў-жа, загулі ад адабрэння. Такую штуку падараваў маладой родны братка, а выканаў яе – родны дзядуля. Дружкі жаніха, ухапіўшы куфар на чатыры плечукі, удавалі, што ён для іх, маладых і здаровых, з'яўляецца амаль што непад'емным. Вынеслі на вуліцу і, перад тым як паставіць на воз, яшчэ

раз вырашылі ўзняць над сваімі галовамі, каб паказаць, што маладая са сваёй матуляй назбірала туды за гады дзявоцтва. Ускінулі адначасова і ўсе навокал ажно вохнулі ад нечаканасці: дно ў куфра, нібы некім падрэзанае, гопнулася долу, а разам з ім паляцела і ўсё тое багацце. Добра было б, каб на якую траўку ўпала-высыпалася, а то ж у лужыну, у якой стаяў іхні вясельны поезд. Маладая адразу ж загаласіла і пачала ... праклінаць злым праклёнам свайго роднага братку, які, нібыта, нечага недагледзеў і ўсё так атрымалася з-за ягоных хібаў. Хлапчына кінуўся да дзеда, але той развёў рукі і надзвычай спакойна прамовіў: «Я ж вас заранёў папярэджваў, што калі нешта не так выйдзе, ці не так атрымаецца, то каб мяне вінаватым ні ў якім разе не рабілі. Так жа было. Успомні?». Што ж тут крычаць, як жа тут станеш папракаць, калі на самой справе майстра так і гаварыў з месяц таму.

Потым ужо ўмелыя людзі раскапалі, як гэта ўсё атрымалася: дзед на дно куфра ўжыў не жытнюю, а аўсяную салому, якая і не трывалая, і празмерна мяккая. Пры жаданні можна зрабіць так, што нічога не адрозніш і не зразумееш, у чым крыецца падробка. Вось так ён расплаціўся з той «панскай» задумай. Вось табе і палеская ўпартасць: сказаў з першага разу, што не згодны і таму трэба было адступіцца. Не, пачалі далей напрошвацца, пераконваць, даказваць. Вось вам і зусім нечаканы, дакладней, адваротны вынік!

Пасля гэтага здарэння маладая ніколі болей не загаварыла са сваім братам. Яго ва ўсім чыста звінаваціла і сказала, што знаць не хоча такога роднага. Выйшла так, што са сваім мужам пражыла яна доўгае і шчаслівае жыццё: нарадзіла многа дзяцей, узгадавала іх, дачакалася ўнукаў-праўнукаў. І нічога благога тое здарэнне ёй не прынесла. Затое родны брат загінуў нежанатым. Падчас вайны пайшоў у партызаны, падаўся ў злучэнне да славутага Каўпака. Калі ішлі на Карпаты праз родныя мясціны – папрасіўся наведацца да бацькоў, каб глянуць, як там яны. Вяртаўся ўжо да сваіх і недзе па дарозе нарваўся на варожую засаду. Мужную смерць прыняў, не здаўся ў палон, а сябе і некалькіх ворагаў падарваў гранатай. Калі яго прывезлі да роднага падворка, падказалі добрыя людзі, дзе ляжыць іхні сын, каб пахаваць, то сястра, нібы каменная, так і тады не заплакала, не загаласіла адчайна.

Бацька, гледзячы на такія адносіны сястры да брата, не ўтрымаўся і ледзьве чутна прамовіў: «Эх, ты, пустэча... Роднага брата закляла... І з-за чаго, з-за саламянага куфра... Дык я ж дзеда таксама прасіў... Ён жа мой родны бацька... І мяне стары не паслухаў... Цяпер я і сынка свайго ля яго пахаваю... Няхай там унука падманвае...».

Гаварылі, што такая злосць, агіда і непавага да ўсяго панскага ў старога палешука з'явілася з маладых гадоў. Надта яму перападала ад мясцовага памешчыка за непакорны характар, за тое, што быў нястрыманым на язык. Усе ўжо і папярэджвалі, і адгаворвавлі, а ён усё роўна, недзе ды нешта не такое скажа. За гэта яго і лупцавалі ды яшчэ пастаянна насміхаліся, што, маўляў, "хлопа" б'ць лазою, а вось пана... Пана – саломаю: бо ў "хлопа" цела чорнае, усё вытрымае, а ў пана яно ж далікатнае. Таму яго, калі што якое, то толькі саломкаю і сцябаюць. Закатуюць чалавека да такога стану, што ў ім толькі душа і жыла, скуру палосамі здзіралі, а ён не паддаваўся. Толькі свой непакорны нораў не змяніў, не здрадзіў яму. Яно то, відаць, і добра, што такі цвёрды ды непахісны на сваё рашэнне быў, але ж не ў гэтым, канкрэтным, выпадку. Тут дзед схібіў, бо сваім махлярствам моцна падставіў ні ў чым не вінаватага ўнука.

Прыходзілася сустракацца з тым, што даволі часта вяскоўцы гаварылі пра выплеценыя з саломы не куфры, а "сундукі", "сундучкі", каробкі, якія ў сялянскай гаспадарцы заўсёды былі да месца. У іх і пакласці можна было ўсё, што захочаш, і ўпарадкаваць нейкія рэчы ці вопратку, збожжа ці насенне, а то і іншыя матэрыялы, сыпучыя і несыпучыя. "Сундукі" выплятаді хвацкія: аплеценыя па вуглах нават ашкуранай лазою, з накрыўкамі-вечкамі. Адным словам, яны поўнасцю паўтаралі па форме драўляныя. Тут нечага асабліва адметнага знаходзіць не даводзілася. Адно, што патрабавалі такія рэчы і прадметы да сябе больш ашчадных і ўважлівых адносін. А так гаспадыня, напрыклад, зладуе чыстую вопратку, складзе акуратненька, зачыніць века і ўсміхнецца задаволена: столькі "сундук" у сябе ўвабраў, яшчэ і месца нават вольнае засталося. Потым можна будзе і яшчэ дадаць. Затое не пыляцца рэчы навідавоку, не задымляюцца, не замінаюць. Гарантавана і тое, што ў "сундуку" не столькі кузурак усялякіх стане заводзіцца, асабліва, калі перакласці вопратку высушанымі раслінамі, якія маюць п'янкі і невыносны для гэтых шкоднікаў пах. Ва ўсім проста трэба было разбірацца, «ведаць толк».

Добра было і тое, што калі "сундук" запыльваўся, пачынаў вільгацець, прастаяўшы дзе-небудзь у цёмным месцы, а так яно, звычайна, і здаралася, то яго ў сухое надвор'е выносілі на вуліцу. Усё чыста даставалі і раскладвалі ці развешвалі, каб яно перасушылася. Праўда, учынялі такое не навідавоку, а дзе-небудзь за хатай ці за свірнам, у садочку, каб чужыя вочы не бачылі, колькі гаспадыня сабрала таго дабра. На ўсё знаходзіліся чорныя вочы. З імі асабліва не жадалі сутыкацца. Тое ж самае рабілі і з самім "сундуком". Яго "апыльвалі" (выбівалі пыл), маглі

наваt прайсціся па дне ды па сценках вільготнай анучкай, а потым таксама выставіць пад гарачыя сонечныя прамяні. Такую “аперацыю” гаспадыні імкнуліся рабіць у “прысвяткі”, калі, паводле царкоўных канонаў, нельга было “цяжка працаваць, затое дазвалялася выконваць нешта з хатніх прац. Такога, адкладзенага “на заўтра”, у гаспадарлівых жанчын заўсёды было шмат, “усяго ж не паспявалі адразу нават парабіць; здавалася, што і хата тая малая і сям’я не надта вялікая, а працы ніколі ўсёй не пераробіш: за што-небудзь ды вочы абавязкова зачэпяцца. За такую працу то і грэх ніколі людзям не прылічваўся”.

Вялікія “сундукі” заказвалі майстрам, якія карысталіся адпаведнымі заслугамі ў гэтым плане перад вяскоўцамі. Далёка не кожны мог сплесці “сундук” ды яшчэ з накрыўкай, з ручкамі па баках. Усё ж выконвалася толькі з саломы і лазы. І выпляталі іх дадаткова да традыцыйных драўляных куфраў. Тады ж ніякіх шафаў у сялянскіх гаспадарках не існавала. Яны з’явяцца значна пазней. Таму такі “сундук” быў акуратным сховішчам, найперш для вопраткі, палатна, тканых вырабаў і г. д. Адным словам, гэта былі прадметы “пераходнага” ладу жыцця: ад даўняга сялянскага да нейкага ўжо больш акультуранага – вяскова-мяшчанскага. А па вёсках любая завядзёнка перадавалася ў асноўным па прынцыпу: ат, у таго (ці ў тае) бачыла, то хачу, каб і ў мяне такі “сундук” з’явіўся. Тым болей, што яго, калі сам не агораеш, то не надта дорага і майстры возьмуць. Так разважалі вяскоўцы, улічваючы пры гэтым, што салома – ёсць салома! Матэрыял свой, а толькі ўжо за працу, за выкананне, давядзецца заплаціць. Заадно нібы дапамагаць, а на самой справе, то пастарацца пераняць найбольш складаныя элементы гаспадарчага пляцення, збіраліся і іншыя мужчыны: суседзі, вяскоўцы, проста зацікаўленыя ці майстравітыя сяляне, якім карцела зірнуць і параўнаць: ці так яны самі ўсё робяць або ёсць у нечым адметнасць.

«Тыя сундукі нашы вяскоўцы наглядалі ў Пінску ці ў Лагішыне, куды зрэдчас у сваім жыцці ўсё ж выбіраліся па нейкай надзвычай пільнай патрэбе. Таксама ж наймаліся на працу да сярэдняй рукі гараджан і местачкоўцаў. Асабліва ахвотна вяскоўцаў (маецца на ўвазе: і жанчын, і мужчын) бралі да сябе яўрэі і ... шляхта. Першыя таму, што спадзяваліся, як заўсёды, крыху абшукаць сваіх слуг, амаль што парабкаў, а другія з тае нагоды, што яны хоць і з’яўляліся ці лічылі сябе шляхтай, але працавалі гэтаксама цяжка, як і лапцюжныя мужыкі. Выбіралі працавітых, а не лайдакоў. Перапытвалі ў знаёмых і пасля гэтакіх “рэкамендацый” залічвалі ў свой, амаль што сямейны “штат”».

Самі надрываліся, не дасыпалі, не даядалі, а дзяцей імкнуліся любым чынам выправіць на лягчэйшы хлеб, каб тым потым у жыцці той

акрайчык дастаўся значна прасцей. Таму і прыязджалі да іх потым іхнія нашчадкі з розных вялікіх гарадоў: і з Вільні, і з Кіева, і з Пецярбурга, і з Варшавы, і з Прагі. Ды мала з якіх навуковых цэнтраў ехалі да бацькоў дзеці. Яны ж таксама прывозілі з сабою ўсялякія куфры-"сундукі": і скураныя, і плеценыя з лазы ці з іншых парод дрэва, і з саломы. Кемліваму чалавеку дастаткова было зірнуць на такія вырабы, дакрануцца да іх рукамі, каб паглядзець, што да чаго там выраблена, каб потым змікіціць і назаўсёды пераняць. Раз у галаве застанецца, то рукі абавязкова паўтораць. Мала гэтага, яшчэ абавязкова нешта больш удасканаліцца мясцовым майстрам, які ад сябе дадасць нетрадыцыйна-самабытнае: і простае, здавалася б, і зручнае, не тое, што ў тых, прывезеных аднекуль.

Такі хітры чалавек з нашых вяскоўцаў, першы раз толькі, будучы маладым хлапцом, наняўся ў шляхецкую сям'ю, "ва ўслужэнне". Так любілі гаварыць ягоныя бацькі, тым самым падкрэсліваючы, што іхні сын не парабкуе, а "служыць", як раней у паноў служылі. Добры працаўнік быў, спакойны, калі выпадала, то нешта і без загаду гаспадароў рабіў, бо бачыў, што там парадку належнага няма. Два разы на месяц яго адпускалі на выхадныя, як і на штогадовыя праваслаўныя святы, дамоў. А што для маладых ног тыя два дзясяткі кіламетраў? Прабяжыць іх на адным духу. Затое з хатнімі ўбачыцца, пра навіны даведаецца, а ў нядзельку позным вечарам у адваротны шлях ідзе, каб да панядзелка быць у гаспадароў, каб тыя не ўзлаваліся, не пакрыўдзіліся, не знайшлі нейкую зачэпку для пакарання. Вельмі спагадліва адносіліся тыя гаспадары, няма чаго дурнога гаварыць, да свайго парабка. Хваліліся нават перад суседзямі, што пашанцавала з чалавекам, што няма чаго ў ім сумнявацца. А працавіты, то за траіх управіцца. Усё гарэла ў ягоных руках і, самае галоўнае, усё выконваў спакойна, весела, з нейкай лагоднай усмешкай. Магло запроста падацца, што ён і не стамляецца пры гэтым.

Неяк да тых шляхціцаў прыехала іхняя дачка, якая навучалася ў Кракаве. Было падобна на тое, што яны спадабаліся адзін аднаму (маю на ўвазе дзяўчыну і парабка) адразу, з першай сустрэчы, выпадковай, мімалётнай, прама ў двары бацькоўскага падворка. З таго моманту іх часта бачылі ўдваіх: хлопец што-небудзь рабіў, а дзяўчына сядзела і ўважліва сачыла за тым, як усё нібы ажно гарыць у ягоных майстравітых руках. Маўчыць, маўчыць, а потым усміхнецца і запытаецца: «Адкуль у цябе ўсё гэта? Яшчэ ж зусім малады, а ў цябе ўсё атрымліваецца лепей, чым у каго-небудзь іншага бачыла?». А хлапчына таксама быў не промах: прыгожы, высокі, на зайздрасць, жаніх. Да яго прыбягалі суседскія дочкі, нібыта па нейкай патрэбе, а самі ўсё на сабе хла-

печыя позіркі стараліся лавіць. Час вакацый надта хутка праляцеў, сталі ўжо гаспадары паціху сваю дачушку ў адваротны шлях збіраць: то тое складуць, то тое зладкуюць. Маці дык усё плакала цішком. Ясная справа, адзіная дачушка ды і тая гэтак далёка апынулася. Дзе ён гэта той Кракаў знаходзіцца і калі яна ў наступны раз з'явіцца дома. Узяліся з дачкою ў саламяны "сундук" складваць яе бялізну, недзе, мабыць, крыху залішне націснулі і той распоўзся прама на іхніх вачах.

Дачка, хутчэй за ўсё, з усяго таго жалю, ды яшчэ ўзмоцненага адчаем убачанага, заплакала горкімі слязьмі. Збегліся ўсе да дзяўчыны. Бацькі супакойваюць, а хлопец стаіць і ўсміхаецца. «Ты, чаго гэта? – здзіўлена прамовіў гаспадар. – Бачыш, якая бяда прыключылася?». «Гэта і бяда? – хмыкнуў парабак. – У вас жа саломы многа?». «Так, чаго-чаго, а саломы хапае», – адказаў шляхціц, не разумеючы, да чаго хіліць хлапчына. «Спляту я вам сундук, яшчэ лепшы і прыгажэйшы... Знайшлі з-за чаго перажываць... Толькі ці ёсць у вас зімовая лаза?.. Калі няма, то складана будзе добрую рэч зрабіць... Летняя лаза крышыцца, а тут трэба гнуткая, моцная...». «А дзе ж яе ўзяць, чалавеча? – разгубіўся гаспадар. – Можа, я па суседзях паезджу, папытаюся...». «Пакуль ездзіць станеце, то час мінецца, а ў нас усяго пару дзён... У мяне ўдома такая лаза ёсць, заранёў нарыхтаваная... Трэба бегчы, каб паспець да ад'езду вашай дачкі сплесці сундук...». «Чаго гэта бегчы? Вазьмі каня ды прапрэш тыя кіламетры туды-сюды за пару гадзін», – рашуча запярэчыў гаспадар. «Гэта ж мне, у першую чаргу, трэба, а не табе. І так стамляешся. Ногі, хоць і маладыя, а іх, якраз-такі, з маладосці і берагчы трэба. З гадамі ўсё выявіцца. Таму бяры каня, запрагай і едзь. Толькі хутчэй абарочвайся».

Усю ноч працаваў парабак. І шляхціц не спаў, дапамагаў, чым мог: саломку чысціў, у жмуцікі раўнюткія яе размяркоўваў, падаваў хлапчыне. І ўвесь час гаварыў з ім, каб таму спаць не так хацелася. Затое да раніцы зрабілі "сундук" ды і накрыўку з ручкамі па баках прымацавалі. Хлапчына, як заўсёды, нечаму ўсміхаўся і пакручваў галавою, каб праверыць ці не схібіў у чым-небудзь, а гаспадар раскатурхаў жонку і паклікаў глянуць на тое, над чым цэлую ноч давялося прасядзець. Тая, яшчэ ад сну ды аслупянелая ад убачанага, адно толькі рукамі гладзіла па баках "сундука", нібы замаўляючы залацістую саломку і прамаўляла: «Ні за што б не паверыла... Ні за што... Калі б нехта і сказаў пра такое... Але ж тут бачу і тое, што зроблена, і таго, хто гэта зрабіў... Вось жа, малайчына... Мы табе за гэта добра заплацім, не будзеш на нас у крыўдзе... Ты ж нас так выручыў у цяжкую хвіліну... Дачушка, дачушка, як узрадуецца, а то так расхвалявалася ад гэтай неспадзяванкі, што і спаць не спала. Такая ўжо яна ў нас уражлівая, што цяжка ёй у жыцці будзе...».

Вось такі саламяны "цуд" адштукаваў парабак усяго, нібыта, за адну ноч. Дзяўчына, калі прыйшла да сям'і за стол і ўбачыла "сундук", то ўспляснула рукамі: «Федарка, гэта ты сам зрабіў?». Яна паехала на далейшую вучобу: радасная і супакоеная. А хатнія засталіся. Але, як потым аказалася, то той "сундук" ці тая салома ў іх сапраўды аказаліся нейкімі магічна-чарадзейнымі. Не забылася яна пра Федара. Не забылася. Праз добры дзясятак гадоў прыехала па яго з Польшчы. Тады, пасля вайны, палякам якраз і дазвалялі выезд у суседнюю краіну. Многа ў нас вяскоўцаў, асабліва хутаранцаў, запісаўшыся ў "палякі", назаўсёды змянілі сталае месцажыхарства.

Вырабілі нейкія паперы ў мясцовых актывістаў, добра спаіўшы тых, і паехалі разам. Там ужо не разбіраліся, што яна са шляхты, а ён з – мужыкоў. Каханню не загадаеш. Потым прыязджалі адведваць федаравых родных. Рэгулярна з'яўляліся: раз на два гады. Дзеці ў іх былі, якіх яны таксама прывозілі, каб паказаць бацькоўскія мясціны. І тыя вельмі дзівіліся на вялізную вёску, на непаўторныя мясціны, на той зарослы ўзвышак, дзе некалі стаяла хаціна, у якой нарадзілася іхняя матуля.

Вось такой трывалай, на зайздрасць, аказалася тая шчырая "саламяная" гісторыя. Моцна, надзейна, даскону звязала яна людскія лёсы ў шчаслівую сям'ю. Шкада, што болей не прыязджаюць нашчадкі адведаць родныя абшары, пахадзіць па былых сцежках-дарожках.

Вясковыя ўмельцы заўсёды стараліся паказаць, як яны ўмеюць працаваць з самым простым матэрыялам, імкнуліся выканаць з саломы нават такія рэчы ці вырабы, якія і ўяўляліся б цяжка, калі б не пабачыў іх на ўласныя вочы. Тады іншая справа. Тады – задавальненне і здзіўленне: і ад убачанага, і ад выкананага, і ад таго, што думаючая чалавечая галава на многае здольная. На Палессі з саломы спрабавалі рабіць амаль што ўсё. Некаторыя майстры здзяйснялі гэта проста так, з цікавасці: атрымаецца ці не (вытрымае тая салома гэтакую нагрузку або адразу рассыплецца-парвецца), а калі не будзе прыдатная рэч для гаспадарчага ўжытку, то хоць застанецца пастаянным напамінам пра тое, што такая спроба была ўчынена і даведзена да ладу, а тое, што практычнасць яе аказалася не на належным узроўні, дык гэта ўжо ад якасцей самога матэрыялу залежала. Магчыма, што і ад некаторых пралікаў майстра.

Адзін даволі сталага ўжо ўзросту гаспадар усё дзівіўся на панскія вазкі: лёгкія і дарагія, каштоўныя і трывалыя, не тое, што звычайныя сялянскія вазы, якія і рухаліся паволі, і скрыпелі так, што хоць ты было вушы затыкай. Яны толькі для перавозкі ўсялякіх грузаў, найперш, прызначаліся, а людзям то на іх і ездзіць было няёмка. Ды да ўсяго

прызвычаіліся, так і вазы сталі неад’емнай часткай “гужавога транспарту”. Іх ужо і не адрознівалі нават: для перавозкі грузаў ці для перавозкі людзей. Аднолькава выкарыстоўвалі і там, і там.

Стары ж усё цікаваў, падглядваў, нешта нават маляваў на пясочку, а потым, азірнуўшыся лішні раз, каб ніхто не здагадаўся, над чым ён пастаянна галаву ламае, заціраў нагамі. Аказалася, што вясковец ужо адштукаваў для сябе драўляны вазок: лёгенькі, нізенькі, мяккі на ходу, а да яго захацеў яшчэ вырабіць і палукашак, які звычайна сяляне, асабліва не імкнучыся да нейкіх непаўторных асаблівасцей, выпляталі з лазы: неашкуранай, бо калі з яе садраць кару, то палукашак ад гэтага зробіцца не надта даўгавечным – ламаецца. І служыць мог гаспадару, ад сілы, нейкі год-два, а кожнаму ж хочацца, каб любая рэч у гаспадарцы служыла доўга і надзейна. Каб яе зняў, некуды паставіў, павесіў, а то і проста – кінуў і ўсё на тым. Няхай сабе там ляжыць ці вісіць да наступнага часу выкарыстання.

Выплеў той умелы чалавек палукашак з саломы. Так адштукаваў, што ён ажно свяціўся на сонцы, а прашнураваны лазовымі пруткамі (раўнютка-раўнютка, хоць ты было на дакладнасць сантыметрам замярай) выдаваў з невялікай адлегласці рэч цудоўную ў сваім выкананні. Калі першы раз паклаў палукашак на воз, усё, як мае быць, падагнаў, заслаў і прыкрыў стракатай хатняй дзяружкай, а зверху пасадзіў жонку, сеў сам і пакіраваў да бліжэйшай царквы, то сустрэчныя толькі языкамі цокалі. Усялякае і ў сялянскім жыцці бачылася, але такое! А калі пад’ехаў да храма і там спыніўся, то ўсе кінуліся паглядзець ягоную працу. Бацюшка, і той не ўтрымаўся, а заламаў разам з людзьмі. Хадзіў ды гаварыў: «Вось на што яго Бог спадобіў! Вось як яму дапамог! Адчуў сілу творчасці ў руках гэтага чалавека!». Вяскоўцы ж пачалі гаварыць сваё, што не толькі паны могуць дазволіць сабе ездзіць у карэтах ды экіпажах, а гэтакі выраб, чым горшы? Любога пана пасадзі, то праехаць у такім вазку, з такім палукашкам не адмовіцца.

Быў ля той царквы і дабраслаўскі памешчык, які любіў усё непаўторна-адметнае, арыгінальнае. Пабачыў, што народ кінуўся не ў царкву, а ў іншы бок, пайшоў і ён паглядзець, што там да чаго. Меў той пан надзвычай вялікую ўласную вагу, так і гаварыў, калі быў у добрым гуморы: «Я адзін за дваіх чалавек: і з’ем, і месца займаю!». Вясёлы быў на дзіва памешчык, не глядзеў на людзей у залежнасці ад іхняга матэрыяльнага становішча. Многім дапамагаў: і словам, і справай, а то і грошы пазычаў, калі нехта звяртаўся. Звычайна перад тым, як пазычыць, падкрэсліваў, пасмейваючыся: «Многа, братачка, не дам, бо што будзе, як аддаць забудзешся? Па свеце тады мяне пусціш». А яшчэ той пан

надта любіў жартаваць ды падстройваць усялякія штучкі іншым. Але не са злосці, а проста так, каб пасмяяцца. Потым жа сам і давядзе, што гэта менавіта ён падрабіў. Калі заўважыць, што чалавек застаецца пакрыўджаным, то ўсуне ў руку і некалькі злотых: «На, вазьмі, толькі даруй і не злуйся, а то мне няёмка становіцца. Раз ужо так моцна пакрыўдзіў, то даруй і не трымай болей зла...».

Глянуў ён на той вазок, на палукашак, аценіў па-свойму і адразу ж на гаспадара: «Прадай мне, чалавеча, гэты вазок... Ты ж сабе яшчэ зробіш... Прадай, буду суседзям сваім паказваць, якія людзі ў нас майстравітыя... Тым болей, што ты з жонкай у палукашак садзішся... Удваіх улазіце, а я адзін-сам умяшчацца буду... Прадай, мае вяльможныя знаёмыя ад зайздрасці шалець пачнуць... Яны і так мяне, паміж сабою, "саламяным пузам" клічуць, а тут яшчэ і палукашак, ды таксама ж саламяны, ды такі прыгожы... Усё адно да аднаго... Прадай, не пакрыўджу з аплатай, ды і ведаеш жа ты мяне... Не раз і не два мы з табою сустракаліся... Ведаемся добра... Прадай, бо ўсё роўна не адступлюся... Так ужо ў мяне ёсё загарэлася... Не адмоў мне, чалавеча...».

Не ўстаяў гаспадар, упрасіў яго пан. Чалавек і на самой справе пагадзіўся з довадамі: і звяртацца прыходзіцца да памешчыка, і жывуць жа побач, і заплаціць добра, і ... сабе яшчэ вазок адштукуе. Было б там нешта дзіўнае. Толькі той вазок з жартаўніком-панам адыграў не надта добрую штуку. Не трагічна-жудасную, а такую, як ён сам і любіў – вясёлую. Усё наваколле потым пакочвалася ад таго, што здарылася. Найбольшыя жартаўнікі, то заўсёды спыняліся ля тае мясціны, а то і садзіліся ля яе, і адразу ж пачыналі рагатаць, нібы гэта толькі што зноў паўтарылася прама на іхніх вачах.

А нічога там асабліва дзіўнага і не адбылося! Проста так, мабыць, у жыцці часам супадае: і месца, і час, і акалічнасці. Ехаў памешчык са свайго маёнтка ў суседні. Туды запрасілі яго на нейкае святкаванне. Задаволены чалавек, песню адну за другою спявае. А голас меў прыгожы, зычны, і песні нашы, палескія, надта ж любіў. Цягне на ўсё наваколле, стараецца. Ажно наперадзе здаравенная лужына, якая ніколі не перасыхала (нават у самую страшэнную спёку) і ніколі не замярзала (нават у самыя лютыя маразы). Прыцішыў пан коніка, па краю едзе, дзе не так глыбока. Узняў вочы, а на іншым баку стаіць селянін: спусціў штаны і спрабуе зірнуць на ўласны азадак. Аказалася, што ён вяртаўся дамоў, быў, як звычайна, у лапцях, і не пайшоў абапал лужыны праз лес-кустоўе, бо паленаваўся зрабіць пару лішніх крокаў, а пайшоў, як найкарацей. Пайшоў, пасклізнуўся і гопнуўся азадкам у лужыну. Зняў штаны і вырашыў праверыць, ці не прамачыў споднае. Самому і не

відаць, і нязручна, а тут пан едзе. Чалавек да яго з просьбаю (знайшоў да каго звяртацца!): "Паночку, паглянь, а ці не намок я ззаду... А то ж сам галаву ледзьве не звярнуў, а нічога не ўбачыў...". Пачціва гэтак звяртаецца.

Пан зірнуў і ўсміхнуўся сам сабе, маўляў, але ж ты таксама, чалавеча, не худы! Нават прамовіў: «А якога лысага чорта цябе ў гэтую лужыну ўсунула?!». А пасля захацеў лайдака яшчэ і пугай шлёгнуць, каб ведаў, як быць неабачлівым. Прыўзняўся, замахнуўся, а ўласную вагу не ўлічыў жартаўнік, і як ... махануў з усяго пляча, то і паляцеў у самую каламуць лужыны! Ды з вазком, які на яго абрынуўся, ды з палукашкам! А конік распрогся і ўцякаць, абы на волю вырваўся! Добра, што селянін той не збег, а прыйшоў пану на дапамогу. Выбраліся абодва з тае гразюкі, паселі на ўскрайку паляны, глядзяць адзін на аднаго, а потым як стануць рагатаць у два галасы!

Памешчык ускінуў галаву: "Але ж ты, Уладак, і смярдзіш!". А той, узважаючы панскую годнасць, адказвае: "І ад цябе, паночку, не мёдам патыхае...". "Гэта ж трэба, зняў штаны і просіцца, каб я зірнуў: ці ў яго азадак чысты. Хто ж тут утрымаецца, каб не перацягнуць пугай?! Шкада, вельмі шкада і вазка, і палукашка. Раструшчыў я чыста ўсё, падаючы ў лужыну. Цяпер зноўку ў карэту давядзецца забірацца...". Уладак супакоіў: "Нічога, паночку, мой сват вам новае ўсё зробіць, яшчэ лепшае па выкананні...". "Дык гэта твой сват?". "Так, паночку, і мне ён не адмовіць". "Супакоіў ты мяне, чалавеча, тады давай, Уладак, яшчэ з табою паспяваем... Твой голас ды мой голас... У нас гэта заўсёды добра атрымлівалася...".

Ужо вечарам уся вёска пакочвалася ад тае гісторыі, як Уладак пана ратаваў. Калі пра гэта даведаўся сам дабраслаўскі памешчык, то толькі хмыкнуў: «Вось жа, шэльма, а я ж яму за маўчанне цэлую залатоўку даў. Вось табе, пане, цана: і мужыцкаму слову, і саламянаму палукашку... Уладаку ўзяў і паверыў... Ага, той яшчэ гіцаль... Нічога, што мы з ім у той лужыне важнецкі прасмерднулі, але затое і добра паспявалі».

Праўда, далёка не заўсёды шчасліва заканчваліся такія эпізоды вясковага жыцця. Усялякімі акалічнасцямі ўносіліся своеасаблівыя змяненні у, здавалася б, ужо добра спланаваную гаспадарамі задуму. На Лунінеччыне любяць прыгадваць пра "саламяны" пасаг адной з шляхцянак (але нам даводзілася чуць, што ніякая гэта была не паненка, а самая звычайная вясковая дзяўчына). Як бы там ні было, але на самой справе здарэнне мела месца. Розняцца звесткі і пра тое, калі канкрэтна ўсё адбылося. Некаторыя падкрэсліваюць, што "пры цары", а іншыя сцвярджаюць, што "пры паляках". Праўда, тут усё не так ужо

і істотна. Для нас цікавай з'яўляецца сама гісторыя, а не дакладны час яе здарэння.

Раней жа, калі дачку бацькі аддавалі замуж, то за ёю абавязкова павінны былі даваць пасаг. "Беспасажніца" ніколі не карысталася "попытам" у кавалераў. Тады ж яшчэ маладыя самі мала што вырашалі, усё залежала, якраз-такі, ад бацькоў, як з аднаго, так і з другога боку. Калі прысылалі сватоў, то першае, на чым спынялі ўвагу тыя "брахлівыя" людзі па сваім вясельным прызначэнні, гэта – пасаг. Агаворвалася ўсё, да самых драбніц, каб потым не ўзнікала нейкіх недарэчнасцей. Добра было шляхце, бо ў тых усё "пісалася". А вось у сялян усё зыходзіла толькі ад вуснай дамовы. Звычайна, бацькі дзяўчыны давалі надзел зямлі, нешта з хатняй жывёлы. Грошы тады мала ў каго з вяскоўцаў вадзіліся, то калі і ўсплывала нейкая залатоўка-другая, дык гэта лічылася нечуванай падзеяй. Яшчэ прысутнічаў абавязкова дзявочы куфар, у якім змяшчалася ўсё, што дзяўчына (сама ці з матуляй разам) паспявала назапасіць да ўласнага вяселля. Просьбы будучай нявесты, што, маўляў, тата, дай яшчэ тое і гэтае, маглі, наадварот, адмоўна паўплываць на надзяленне пасагам. Тады ўзлаваны бацька мог запроста "закапыліць" губу і значна "ўрэзаць" памер абяцанага. Палітыка была сямейнага характару, тым не меней, вельмі хісткая і асцярожная. З іншага боку, ва ўсім трэба разбірацца і ва ўсім неабходна мець меру. Прысутныя з абодвух бакоў выдатна ведалі і разумелі, як зараблялася тая маёмасць, як давалася тая зямля і як ашчаджалася тая капейка.

Дык вось, у той дзяўчыны бацька быў, ці не ад самога нараджэння, надта ж сквапнаваты. Нават ягоная жонка і тая сваю моцную палавіну клікала няйначай, як "чэрсцвеннік" (гэта азначала тое, што гаспадар ніколі не даваў спекчы свежага хлеба, а давіўся сам і прымушаў гэта рабіць іншых, цвілымі-працвілымі скарынкамі; тады і гэта ў некаторых лічылася разнасоламі). Нам асуджаць такога чалавека, нават праз столькі гадоў, не выпадае. Справа ў тым, што, паўторымся, надзвычай цяжка давалася тагачасным людзям іхняя заможнасць: не даядалі, не дасыпалі, працавалі, рук не пакладаючы, зарабляючы шматлікія хваробы, якія не было калі вылечваць, бо і дарага каштавала, і праца не стаяла на месцы. Усе жылі з уласных мазалёў. За рэдкім выключэннем, якое складалі лайдакі і тыя, хто ўвогуле не меў зямельных надзелаў, а таму былі вымушаны наймацца парабкаваць ("ва ўслужэнне").

Вядома, што шкада было аддаваць многае за дачкою, няхай сабе і за роднаю, і за любімаю. Бо ж нездарма паўтаралі ў народзе: "Што за дачкою аддаў, то, лічы, за плот выкінуў". Дасі многа ці, наадварот, выдзеліш мала – усё роўна аддача атрымаецца тая ж самая. Таму і паку-

таваў вясковец з гэтай нагоды. Паходзіць гаспадар, паходзіць па сваіх палетках, пастаіць – падумае і сам сабе прамармыча: «А калі аддам не ўсё гэта поле, а толькі палову... Таксама ж няблага атрымаецца... Невядома яшчэ, які працаўнік з майго зяця выйдзе... Я яму аддам, а ён усё з рук спусціць ці поле задратуе так, што на ім нічога расці не стане... Дам поля, пару дзесяцін лесу, кароўку, пару парасятак, авечку-другую... А залатоўку-другую... Можна было б не даваць, але ж я збіраў грошы не толькі, каб зямлю ды лес купляць, але і для дачкі крыху адкладваў... Ды і вяскоўцы не зразумеюць... І так гатовы мне ў вочы пляваць за маю ж ашчаднасць... Толькі не ашчаднасцю гэта называюць, а сквапнасцю... Можна падумаць, што ў іх саміх нешта лепей атрымліваецца. Наадварот, у іх горай усё намнога. Некаторыя, то і дзясятай часткі ад майго даць не маюць магчымасці. Колькі вясковых дзяўчат увогуле замуж выходзяць амаль што «беспасажніцамі», а неяк жа выжываюць... І нічога, іхнія бацькі ад чырвані ды сораму не паміраюць».

Выхадзіў бацька, папрыдумваў, што трэба было дачцэ падараваць на вяселле. Ні з кім не раіўся. Нават словам ніводным адносна ўсяго гэтага не перакінуўся. Толькі з кожным днём да вяселля ўсё больш і больш пахмурнеў. Ужо нават прыдумаў, як устане і будзе гаварыць перад бяседай, як тая зайздросна папрыціхне і стане паціраць спацелыя рукі. Гэта падавалася гаспадару найвышэйшым момантам у ягонай мудрасці і практычнасці. І ўсё ж, недзе за ноч ці дзве да вяселля, чалавек не ўтрымаўся: паклікаў да сябе жонку і пачаў ёй распавядаць, як і што будзе гаварыць, як і што аддасць дачцэ і маладому зяцю за пасаг. Потым памаўчаў і рашуча дадаў: "Яшчэ і саломы з гэтага ўжо ўраджаю тры вазы дам! Салома і самім нам прыдалася б. Жывёлы многа трымаем, дык на сечку ўсё пойдзе. Ды ўжо раз такая справа завялася, то і тут вырашым. Каб ніхто не асмеліўся на нас рот раскрыць".

Жанчына не перабівала і нічога не пыталася, бо такая сітуацыя ў іх атрымалася ўпершыню за дваццаць гадоў сумеснага жыцця. Раней муж усё вырашаў сам. Па-шчырасці, то і зарабляў ці цягнуў ён адзін, недзе стараючыся наймаць парабкаў, а недзе выжыльвацца самому. Адно задаволена працягнула, асцярожна датыркнуўшыся да плечука свайго гаспадара: «Малайчына, бацька, ты ў мяне... Усё так прадумаў, так распланаваў, што дачка наша назаўсёды тваю ласку і шчырасць запомніць... А сваты, тым болей, павінны будуць радавацца... Не надта ў іх свае зямлі хапае... У іх жа адных сыноў чатыры: і кожнаму – дай, аддзялі, адвядзі... Малайчына, добра прадумаў...».

Ніколі б і ў страшным сне не мог дапусціць сабе такое ашчадлівы гаспадар, што здарылася за тыя ночы да вяселля. Прахапіўся са сну ад

таго, што ў вокны свяціла нейкім чырвоным святлом. Кінуўся чалавек у двор, а там! Гарэў ягоны вялізны стог ("не стог, а сціртa") свежай саломы, якая, добра што, была складзена, дзеля бяспекі, у канцы агарода. Калі б гэтага не прадумаў, дык увесь падворак бы дымам пайшоў. Убіваўся вясковец, але вяселле, канешне ж, не адмяніці. Усялякае ў жыцці здараецца, не будзеш жа з-за кожнай дробязі запланаванае перамяняць.

Сабраліся госці, ядзяць, п'юць-выпіваюць, дабра-шчасця маладым жадаюць, а потым і за песні ўзяліся. Весела за сталамі. Музыкі іграюць не сціхаючы, жару яшчэ болей паддаюць. Прыспела, нарэшце, хвіліна абдорваць маладых. Устаў бацька дзяўчыны. Устаў, а з галавы чыста ўсе словы, задуманыя раней, выляцелі. Ажно кулакі ад натугі сціснуў. Толькі – сціскай не сціскай, а гаварыць жа нешта трэба! Вось гаспадар і пачаў, але далёка не тое, што гаварыў жонцы: "Эх, Божачка, і салома згарэла... І зямелькі шкада...". Невядома да чаго б яшчэ дагаварыўся, добра, што бацька зяця выручыў, перабіў: "Эй, сваце, чаго ўжо ты так убіваешся? Пабач, каго я табе ў сыны аддаю!" – і торкнуў даланёю ў здаравенную спіну маладога. «– А салома... Што салома – неядома.... На наступны год новая будзе... Былі б мы ды нашыя дзеці, а ўсё астатняе, сам разумееш... Не ўбівайся, чалавеча, ужо так... Салома згарэла, а нешта ж і засталося... Давай лепей вып'ем ды заспяваем... Бяседа ў тваёй хаце сабралася на дзіва галасістая... усяго ў нашым жыцці хапала, а мы ж жывем... вытрымалі... Абыдземся і без той саломы...».

Простыя словы чалавека ажно расчулілі гаспадара. Ён жа заўсёды прывык сам з усім спраўляцца, а тут яму дапамаглі, выручылі, не справай, а словам, тым не меней, усё так да месца аказалася.

Калі запісаў гэтую гісторыю, то яна мне падалася звычайнай вясковай выдумкай. Ат, нейкі жартаўнік прыдумаў ды пусціў па наваколлі аповед пра такое здарэнне. Ажно не, гадоў праз пятнаццаць, калі вандраваў па Лельчыцкім краі і аднаго вечара разгаварыўся са старым гаспадаром, які пусціў мяне начаваць, а пасля багатай вячэры мы ўжо проста гаманілі з ім за сталом. Я неяк зачапіў гэтую "саламяную" тэму. Стары здзіўлена ўскінуўся: "А ты што, такі граматны, а не чуў, каб саломай на вяселлях дарылі? Не паверу". Давялося скласці рукі і пераконваць вяскоўца, што не чуў і на самой справе падобных гісторый. Тады дзед адрэзаў: «А што ўжо далёка хадзіць, калі мне мой цесць у пасаг за ўласнай дачкою яшчэ і два вазы саломы даў... Болей таго, на наш падворак сам і прывёз... Гэта і жонка пацвердзіць...». Жанчынка ўмільна хіснула галавою, а гаспадар весела ўжо працягваў: «Тады ж вяскоўцы бедна жылі. Не было з чаго раскашаваць. Таму задаволеныя былі ўсім,

што перападала. Гэта толькі гаварылі, што падараваў карову, а на самой справе бацька даваў цялушачку, амаль яшчэ цялятка. Толькі ж кожнаму хацелася і пахваліцца, і неяк паганараваццa перад іншымі. Часта ў нас здаралася, што і салому да пасагу прылічвалі. Бачыш, атрымліваецца, што я сваю жонку сабе на ўсё жыццё за жытнюю салому прыдбаў. Нічога не папішаш, калі будні свае законы пісалі...».

Бабуля ўсхліпнула, прыгадаўшы, мабыць, самае балючае і гаротнае, а потым весела ўзмахнула рукою: «А раскажы ты чалавеку, як шляхцянка разводзілася і назад сваю салому ад былога мужа патрабавала... Ты ж гэтую гісторыю пастаянна сваім сябрам раней распавядаў... Няхай і Алеська паслухае... Раз нам не верыў, то панам адразу ж паверыць, бо ж шляхцянка – гэта пані. Іншая ўжо справа, што магла быць бяднейшай за сялянку, але гонару таго насіла, што і ў тры ношкі не збярэш... Гаварылі ж, што шляхецкі гонар не заўсёды на грашах ды на заможнасці трымаецца. Па-ўсялякаму і ў іх вадзілася».

Дзед распачаў апавяданне. Аказалася, што ў недалёкім фальварку жыла старая “дзявуха-векавуха” – шляхцянка, якую ніхто не хацеў сватаць. І не тое, што з-за яе беднасці, а з-за сварлівага характару. Усе ведалі, які ў той паненкі язык і за лепшае лічылі аб’язджаць і абыходзіць той дом бокам. Праўда, неяк усё ж ёй пару адшукалі. Знайшлі і для векавухі “пана”. Аднак нашы вяскоўцы сцвярджалі, што ніякі гэта не “пан” быў, а самы звычайны мужык, толькі што бацькі ягоныя празмерна ганарлівыя былі і лічылі сябе з гэтай нагоды “панскай крыві”. Ды яшчэ маці таго самага сына ў панскім двары ці то кароў даіла (ці то іх пасвіла). Згулялі і вяселле. Як і мае быць: з “панскімі” замашкамі і надта ж мудрагелістымі танцамі, якія кожны з гасцей танцаваў па-свойму. Вось тут і ўсплыла тая самая “пасажная” салома. Аказалася, што сквапны і хітры бацька шляхцянкі ўпісаў у пералік даруемага і ... два вазы жытняй саломы. Нікуды яна “не сплыла”, калі прыйшла часіна “разлічвацца”, то і прыдалася. Ды яшчэ з такой незабыўнай гісторыяй-суправаджэннем.

Не надта доўга яны і нажылі разам. Усяго недзе нейкую зіму і перакачаліся, а ўжо пад лета малады муж не вытрымаў болей згрызот і здзекаў сваёй слабай палавіны. Сам ёй усе рэчы паскладваў на воз (можа дзе і сваіх прыхапіў), адно толькі каб хутчэй хатнюю “мамзэлю” за вароты падворка адправіць. Быццам бы (сведкі гаварылі), што і пужкай на развітанне, не толькі кабылку хвастануў, але і былую жонку хвацка разоў колькі апяразаў. Уедзеная тая была, што і аглядзець сябе ўсю адразу не магла. Людзі адно пасмейваліся, што маладая жанчына гэтак “з галадухі, мабыць, апухла”.

Але ж гэтай сцэнай іхні «развод» не закончыўся. Шляхцянка апамяталася, ужо ў бацькавай хаце седзячы, што яе былы муж ёй не ўвесь пасаг назад аддаў, што засталося вярнуць два вазы ... жытняй саломы. Гэта ж і ў "дакуменце" было ўпісана. Яна з тымі паперамі падалася ў суд, каб прышчучыць свайго "прахіндзея", які гэтакі ўрон нанёс яе матэрыяльнаму становішчу. Неўзабаве туды выклікалі саму падавальшчыцу і яе былога мужа, каб ужо канчаткова разабрацца ў заблытаных словах жанчыны. Суддзя пачытаў тыя паперкі, паглядзеў на стоеных перад сабою былых гаспадароў і прамовіў, нібыта сабе пад нос, але так, каб усе прысутныя пачулі: "Раз ты сабе такі хамут знайшоў, то аддай, пане, усё: нават тую жытнюю салому... Не трэба быць вінным, бо ў горшым выпадку грашыма заплоціш... Зразумеў?..".

Адказчык знайшоўся што сказаць: "А дзе ж я тае саломы вазьму, калі жніва, пане суддзя, яшчэ і ў памінках не было?..". Ляпнуў і стаіць задаволены тым, што хвацка з незайздроснага становішча выкруціўся. Толькі і суддзя быў біты жыццём чалавек, многае пабачыў, усялякіх гіцляў і прайдохаў спыняючы, таму і прамовіў, ды спакойна гэтак, пасмейваючыся аднымі вачыма: "Раз умудрыўся такую жонку сабе знайсці, то і салому без цяжкасцей адшукаеш. Станеш хітраваць і круціцца, то яшчэ штраф заробіш. Дайшло маё апошняе слова?".

Што ўжо рабіць заставалася адказчыку, як не прамямліць: "Дайшло... Чаго ўжо там... Вярну я тыя два вазы жытнёвае саломы... Мне ж, сказалі, трэба ўсё гэта за тыдзень здзейсніць?..". Але тут усіх перагнала былая жонка: "Будзеш ведаць, як мяне пугай хвастаць! Жытнёвая салома, каб на падворку ў мяне да гэтай суботы ляжала! А не, то надалей у турму цябе засуджу!".

Разгублены і прыніжаны прыджгаў дамоў той няшчасны "кавалер". Старыя бацькі нічым не маглі супакоіць, не выпадала ад іх пачуць і слушнае парады. Адно толькі рукі ўбакі развялі: дзе ж ты зараз тае саломы набярэшся, калі да жніва яшчэ добрыя два месяцы чакаць? Была б для іх невырашальная задача, каб не стары парабак, які жыў у іх ужо, амаль што, за свайго: і працаваў разам з усімі, і за сталом з імі сядзеў. Той як пачуў, дык са смеху зайшоўся: "І над гэтым хваляваццa выпадае? Табе ж пан суддзя сказаў прывезці жытнёвую салому. Два вазы, але ж ён не ўдакладніў пры гэтым, старую ці ўжо новага абмалоту. Не?..".

Гаспадароў сын пагадзіўся з усім сказаным: "Дык слухайце мяне: у вас трэба свіран тэрмінова перакрываць... Мы ж гэта збіраліся зрабіць у мінулым годзе, але нешта не склеілася, то давайце зараз раскрыем страху, складзем на два вазы адразу і завязем той скнары. Няхай



*Хата з саламянай страхой*

парадуецца згніўшай пацярусе...". На наступную ж раніцу прыступілі да працы. Гаспадары ажно не верылі, што ўся іхняя страха гэтак прагніла і пасыпалася, што праз яе вада прама так і цурчэла. Добра, што парабак здагадаўся, то новай саломай і перакрыюць свіран. Добрая справа і тут атрымаецца, і там выйдзе. Неяк склалі тое гніллё на вазы, калы паўстаўляўшы, бо ляжаць гэтакзваная салома сама ўжо не хацела і рушылі ў дарогу.

Па дарозе стары ўсё падвучваў гаспадарова сына: «Ты, даражэнькі, маўчы, а я за цябе "тры капейкі" ўстаўляць пачну. Зразумеў? Не трэба табе, ні слова, ні паўслова гаварыць. Маўчы, як вады ў рот набраўшы, а то сапсуеш нам увесь план. А ён у нас харошы. Мала хто да такога б дадумаўся». Прыехалі да варот шляхецкага падворка, слуга і закрычаў: "Адчыняйце тэрмінова, бо салома да саламянай удавы прыехала. Паказвайце, куды яе складваць, а не, дык прама тут шухнем. Ды завіце сведкаў, каб яны потым, калі што-якое засведчылі!". Сведкі прыбеглі самі, нават залішнія, каб на такую сцэну паглядзець. А парабак далей гарлае: "Глядзіце, людцы, якая салома? Жытняя? Чысцютка жытняя, ніякага дамешку ў ёй няма, каб скаргаў надалей не зыходзіла". Пачалі скідаць тую труху, а пылота такая ўзнялася, што, здавалася, яе слуп ажно да неба цягнуўся. Сведкі рагочуць, пальцамі тыркаюць, гатовы з панскага "багацця" па траве качацца, а тут яшчэ дачка іхняга су-

седа ўмудрылася ляпнуць: "Мы ж свежую салому прывезлі... Жоўценькую, а гэтая... Гэтая – не салома, а гніллё!..".

Кемлівы парабак і тут адрэзаў, нібы ў сук уляпіў свае словы: "Эх, даражэнькая, пакуль ты ў нас сядзела, то ў гэтую саломку кароўка бз...а, а пакуль ты ў нас ляжала, то ў яе неаднойчы і свінка нас...ла!". Пачуўшы такое, разгневаная шляхцянка паперла ў хату, каб болей не чуць абразлівых слоў і смеху ад прысутных. Але на наступны дзень яна ўжо была зноў у судзе. Там адшукала таго самага суддзю, які "прыгаворваў" яе былога мужа і распавяла яму чыста ўсё, нават парабкаў адказ даслоўна паўтарыла. Той не вытрымаў і засмяяўся: "Знайшоўся, значыцца... То не такі ён і дурны, як мне падалося... Малайчына... усё ён па закону зрабіў: салому ж мы не падкрэслівалі якую – старую ці новую, а па колькасці, то два вазы, як вы і прывезлі з сабою... Так што болей судзіць яго няма за што...".

Яно б неяк так і засталося ў вусна-паэтычных аповедах. Нават і сумненне не закрадвалася, што гэта чарговая народная выдумка. Пакуль у мінулым годзе, працуючы над тэмай бортніцтва-пчалярства, я ў архіўных дакументах не наткнуўся на афіцыйныя звесткі, што сапраўды, на самой справе, на Убарцкім Палессі, а туды і адносіцца якраз-такі Лельчыцкі рэгіён, даволі шырока (прыводзіліся толькі даныя па шляхецкіх сем'ях) практыкавалася даваць у пасаг (ці ў якасці пасагу) і пэўную колькасць, частку ... саломы. Мала гэтага, яшчэ і пазначалася не проста колькасць саломы, але ўжо і якой: жытняй, аўсянай, ячнай. Падкрэслівалася таксама, што "свежай, сёлетняй, старанна абмалочанай, а не перабітай, не счарнелай і не гнілой". Праўда, пшанічная ці грэцкая салома ў гэтым своеасаблівым пераліку не згадвалася. Яно і зразумела: пшаніцы палешукі амаль не сеялі ніколі, землі тут не для гэтай земляробчай культуры, таму яны болей спадзяваліся на традыцыйную – жыта. Грэцкая ж салома – яна занадта кароткая і празмерна ломкая. Яе ў такія справы, як пляценне, не выкарыстаеш, бо і майстар напакутуецца падчас працы, і выраб у далейшым можа запроста падвесці ў самы нязручны момант.

Аказваецца, што многае ў сямейным жыцці беларусаў, нават у іхніх, асабліва незайздросных лёсах, параўноўвалася ці асацыіравалася з ... саломай. Прыгадаем шырокавядомае выслоўе "саламяная ўдава". Найперш, адразу ж у памяці ўсплывае вобраз няшчаснай жанчыны, якая так і не зведала ніколі напоўніцу сямейнага шчасця, хоць і замуж выходзіла (ці афіцыйна, паводле царкоўнага ці касцельнага вянчання знаходзілася замужам, калі трапіла ў разрад гэтакіх "удоў"). Нам даводзілася сустракаць ці не з дзясятак вызначэнняў гэтага выразу. Самы

папулярны з іх – гэта тое, што жанчына была замужам за нейкім надзвычай старым, няздольным для актыўнага сямейнага жыцця чалавекам: “Той стары, калі толькі жаніўся, то ўжо ні да чога не здатны быў, а яна ж маладая пайшла за яго; поўная сілы і энергіі. Ёй жа мужчына патрэбны быў, а не гэтакі стары абабак. Не выключана, што ён і пра жаніцьбу сваю, і пра тое, што жонку мае, ужо не памятаў. Сядзеў бы на печы сабе ды катам там казкі баяў, дык не, захацеў на маладой ажаніцца, паказаць, што ён яшчэ хвацкі кавалер, што ягоныя грошы ўсё могуць зрабіць. Грошы – грашыма, а бабе мужык спраўны патрэбны. Яна ж дзяцей хоча мець, гадаваць іх, лашчыць. Жанчына ж, найперш, маці, а тут такая злыбяда. Што заставалася рабіць, як не працягваць ранейшы лад жыцця: гуляць з хлопцамі ці з вяскоўцамі. І муж дома, калі што якое, ёсць і нагуляецца сабе напоўніцу”.

Так і вялося сярод вяскоўцаў, што калі нечыя жонка пачынала бегаць па вуліцах паселішча і шукаць свайго гаспадара. То ўсёведаючыя суседкі адразу ж падказвалі: «Да “саламянай удавы” твой, мабыць, паціснуў... Надакучыла яму ў вашай курнай хаціне, вось ён і падаўся да яе ў тыя пуховыя падушкі... А там і аладкі свежыя яму на стале, і чарка налітая ў любы момант». Потым ужо і падказкі не трэба было, адразу перліся да той хаціны, якая і стаяла яшчэ надта выгодна для такой справы: на ўскрайку, за якім адразу ж пачынаўся густы лес. Толькі пільнасць не губляй, прыглядвайся ды прыслухоўвайся. Пачуе чарговы “наведвальнік”, што нешта тупаціць-крычыцца, хапае свае лахі пад пахі і прэ ў густыя лаўжы, толькі водгулле за ім нясецца. Так і ўрывалася чарговая “саламяная ўдава” са сваімі “штучкамі” ў звычайны (будзённы) лад жыцця вёскі.

Старому колькі ні гаварылі, ні падказвалі людзі, каб за жонкай сачыў, але ён толькі лыпаў няўцямна вачыма і нешта спрабаваў сказаць. Калі ўжо надта дапякалі, то чулі аднастайнае: «Яна ж са мною на печы ляжала... Ага, на печы... З вечара мы там атабарыліся і да раніцы праспалі... Нешта гаворыце незразумелае... Якая там “саламянка”?.. Гэта яшчэ што такое?.. Ідзіце дамоў лепей ды за сваімі жонкамі сачыце... Мне на печы цёпла і ўтульна... Чаго гэта вы ўсе да мяне чэпіцеся?..».

Пабачаць вяскоўцы, што бескарысна дзеда папярэджваць, што гэта ні ў чым не дапамагае, то потым ужо ўвогуле нічога і не гаварылі, адно што паміж сабою распавядалі ўсемагчымыя гісторыі, звязаныя з чарговым пахаджэннем “саламянай удавы”. У вёсцы ўсё ж было спакойна, ціха, аднастайна. Так было пры дзядах-прадзедах, так і тут ішло. Мужчыны і за грэх ніякі не лічылі “схадзіць на бок”. Яшчэ потым ганар-

ліва распавядалі ў мужчынскіх кампаніях, як ды што ў іх там атрымалася і якая яна гарачая тая салодкая жанчына. Затое вяскоўкі браліся ўсур'ёз "перавучыць" тую юрліўку. І запынялі яе ў цёмным кутку, і пагражалі, але нічога станоўчага не выходзіла. Яна ж здаровая была, то што малады жарэбчык: жанчыны да яе, каб за валасы пацягаць ды ўсю праўду выказаць, то давялося самім у розныя бакі ўцякаць ды агародамі потым, каб ніхто не бачыў, у якім выглядзе яны гэта рабілі, прабірацца. А калі пачыналі проста сварыцца, то і тут вяскоўцы аказваліся далёка не на вышыні: празмерна вастрасловая была "саламянка". Так іх "адголіць", што тыя адно іртамі зяхаюць, ды паміж сабою анямела пераглядваюцца, бо не ведаюць, як і чым крыць пачутае. А што там ужо маглі пачуць? Самае непрадказальнае. Напрыклад, такое: «Што, зноў мне пра маё "саламянства" гаварыць станеце? Вы лепей на сябе азірніцеся. Я – "саламянаю ўдавою" стала, бо жыць хачу так, як і вы. Дзяцей для сябе хачу. А вы чаго дабіваецеся? Прывязвайце тады сваіх мужоў да хаты мацней, а то, атрымліваецца, што яны ў вас нейкімі саламянымі пярэвяслямі прыкутыя. Ірвануцца і паперлі, як сабакі, па вёсцы ды па падворках шнырыць. Лепей за імі сачыце ды ім пра ўсё выказвайце. Чаго яны сваіх сем'яў не трымаюцца, а да мяне ляцяць. Не палохайцеся надта, бо і мой жаночы век кароткі, гэтаксама, як і ваш. Потым не трэба будзе ніхто. Не лезьце, не замінайце жыць. Я ж да вас не чапляюся».

Ага, лёгка ёй было сказаць, што ідзіце да мужоў ды з імі разбірайцеся. Толькі скажы, то тыя такую "бубну" выб'юць, што ратунку ў якім склепу шукаць станеш: так адходзяць якімі лейцамі ці цуглямі, а то і пужкай сырамятнай, што потым не да "саламянкі" стане. Каб жа сапраўды біліся саламянымі пярэвяслямі, а то ж не.

А тая "саламянка", сапраўды, як ім і гаварыла, праз пару гадоў супакоілася і стала жыць гэткім жа жыццём, як і астатнія жанчыны. Толькі за гэты час нарадзіла сабе трох прыгожанькіх сынкоў. Сама іх і называла "саламянікамі". І не таму толькі, што яны ўсе на яе вельмі падобныя знешне былі, але яшчэ і на валасы светлыя. Вось, як спелая жытнёвая салома.

...Павыраслі тыя хлопцы, што дубы якія сталі: здаровыя, вынослівыя, а прыгожыя, што іхняя матуля. Нарадавацца яна не магла, на сваіх гадаванцаў гледзячы. Ды і іншыя ўжо маўчалі, ніхто і нідзе болей не прытыкаў ёй яе "саламянасць", яе "саламяныя" паводзіны. Цяпер і дапамога, і абарона была надзейная ў матулі. Але не ўсё ў жыцці толькі радаснае, чамусьці абавязкова змрочная паласа ўмяшаецца. Так і тут. Грымнула тая вайна, забралі сыноў у войска. Двое з іх недзе ў той

Германіі і галовы свае склалі. Матуля толькі аднаго, але ўсё ж дачакалася. Самага малодшага свайго – Грышку. Галасіла недзе з тыдзень: і ад радасці, і старэйшых успамінаючы. А потым неяк незаўважна злегла і болей не паднялася. Грышка завербаваўся ў Казахстан ды там, відаць, і прыжыўся. Назад болей не вярнуўся. Так і застаўся назаўсёды сярод чужых людзей, магчыма, што там і сваё сямейнае шчасце сустрэў. У нашай вёсцы яго болей ніхто не чакаў. А, можа, не жадаў, каб, калі-некалі, ды нагадвалі яму пра тую няшчасную “саламянасць” і пра тыя гаротныя старонкі дзяцінства. Хто ж яго там разбярэцца ў чалавечым жыцці. Вось тады “саламянікі” (дакладней, толькі назва, бо вірлівых і юрлівых ва ўсе часы хапала) у нашым паселішчы і перавяліся.

Даволі часта ў беларускіх вёсках у “разрад” “саламяных удоў” траплялі шматлікія салдаткі. Яно і сапраўды, становішча ў тых жанчын атрымлівалася зусім неакрэсленае: і замуж, быццам бы, (“па закону”) выйшлі, і дзіця ці пару дзяцей нарадзілі, а потым мужоў пазабіралі, бо нечым сваім панам не дагадзілі, у царскае войска. Туды ж як патрапілі, то невядома, назад прыйдуць ці не. Нават калі і прыйдуць, то недзе праз дваццаць, а то і болей гадоў. У тым складаным жыцці і імёны іхнія забываліся, не тое, што выразы твараў. Вось і дадавалі “весялосці” ў вясковы жыццёвы каларыт гэтыя менавіта жанчыны.

Не ўсе, праўда. Няма чаго ўсіх пад адну вышыню раўняць ды агаворваць іхнюю памяць. Былі і надта верныя, чакалі, састарваліся, усё вызіралі на дарогу, а потым, неяк, відаць, ужо выразна адчуўшы набліжэнне старасці, пераставалі верыць у тое, што з далёкіх краёў вернецца законны муж. Ды і тыя, якія дазвалялі сябе называць “саламянымі ўдовамі”, далёка не заўсёды вялі такі лад жыцця ад таго, што ім кожную ноч хацелася новага “мужа”. Не, тут, відаць, умешвалася яшчэ адна сур’ёзная акалічнасць: калі жанчына выпівала, аддавалася напоўніцу розным уцехам, то ёй лягчэй было пераносіць жыццёвыя нягоды, працей забывацца ў складаных сітуацыях. А яшчэ такім чынам можна было расплаціцца і за нейкую дапамогу, аказаную па гаспадарцы, і капейку якую сэканоміць. Па-рознаму ўсё рабілася, па-ўсялякаму. І калі некаму выпадала пачуць, як галасілі тыя “саламяныя ўдовы”, якія словы яны прамаўлялі, зашыўшыся куды-небудзь у глухі куток, каб іх не пабачылі, то апускалі ніжэй галовы і стараліся стрымлівацца ў адносінах да “саламянак”, нават у нечым дараваць тым іхні “грэх”.

Пачуў неяк, што была адна такая “саламяная ўдава”, прыгожым-прыгожая салдатка, якая на ўсе перасцярогі і папярэджанні вясковых жанчын адказвала, соладка прыжмурыўшы вочы: “Што ж вы ад мяне хочаце? Чаго вы дабіваецеся? Паглядзіце на сябе і на мяне пагляньце.

Вы ж і ўмыцца забываеце з-за сваіх сем'яў ды з-за той клятай працы. Толькі ж нашу работу, жаночкі, усю ўсё роўна не пераробіш. Як бы ты не імкнуўся, а яна валіцца і валіцца. Трэба і на сябе ўвагу звяртаць: апранацца чысцей, усміхацца часцей. Жыць жа хочацца. Самі ж выдатна ведаеце, што жаночы век карацейшы яшчэ і за мужчынскі. І каму тады наша прыгажосць патрэбна стане, калі ўсё цела балець пачне, калі прыпомняцца былыя раны і прастуды, хваробы і пераломы. А што да мяне, то супакойцеся, не надта я ля вашых мужоў знайду сабе ўцеху. Пакуль вы тут са злосці ды зайздрасці да мяне ўсе чыста заходзіцеся, то я з-за вашай непрыязні і рэўнасці сабе яшчэ і пана завяду. Самага сапраўднага. Вось пабачыце...".

Парагаталі вяскоўкі ўволю над ганарлівай жанчынай і пайшлі, як заўсёды, па сваіх сялянскіх справах. А тая ж працягвала юрліва паводзіць сябе пры любым зручным выпадку. Неяк так атрымалася, што да яе ў хаціну завіталі позняй восенню паляўнічыя. Скалелі людзі пад пранізлівым ветрам ды пад мокраю ледзяною крупою. Захацелася хутчэй абагрэцца. Вось і падаліся ў бліжэйшую будыніну. Незвычайныя паляўнічыя то былі, а самыя сапраўдныя паны. Але тут ім было не да шыкавання. Адно – каб да цяпла дарвацца ды сагрэцца. Потым ужо сваю панскасць будуць даказваць, а на марозе ды ў бядзе – усе аднолькавыя. Пераваліліся цераз парог і спыніліся. Ясная справа, не кожны дзень ім выпадала ў сялянскіх хацінах бываць. Стаяць, вачыма зыраць, нават слова сказаць не могуць, бо шчэлепы пазводзіла. Бачаць, што памяшканне, хоць і замалое, толькі надзвычай чысцютка прыбранае, дагледжанае. Гаспадыня да іх з-за кудзелі ўзнялася, жэстам папрасіла распранацца і да гарачай грубкі ды да печы прысаджвацца. Паноў і запрашаць асабліва не выпадала. Жанчына тым часам загрымела чыгунамі ў печы і паналівала ў гліняныя місы гарачай стравы, а потым яшчэ і бульбы насыпала. Пах такі прыемны пайшоў, што ў прыйшоўшых рукі самі да лыжак пацягнуліся.

Паелі і адчулі, як сіла стала да іх вяртацца. Падзякавалі шчыра і пераселі да грубкі, да яе спінамі папрытульваліся, каб прасушыцца. Трое было паляўнічых. Двое – старэйшых, а адзін не надта малады, але і не тое, каб стары. Адным словам, сярэдняга ўзросту. Сагрэліся паны і ўжо з-за ўдзячнасці пачалі распытваць у жанчыны, у чыю хаціну іх гэтакая непагадзь занесла. Гаспадыня хораша ўсміхнулася і неяк з сумам прамовіла: «Ды завіце мяне "саламянкай". Усе нашы вясковыя так клічуць і нічога. А да майго імя вам, паночкі, і справы мала». Пераглянуліся паляўнічыя ад такога дзіўнага адказу, а яшчэ болей ад таго, як вяскоўка параіла ім сябе клікаць. Неспадзеўку, на печы, заўважылі двух хлапчукоў,

якія ўважліва назіралі за тым, як паводзілі сябе прыйшоўшыя. Абодва яны былі светлавалосыя, амаль што пагодкі. Гаспадыня ўскінулася і працягнула: «Гэта таксама мае “саламянікі”. Гэтых ужо адвеку і да скону так клікаць будуць. Яны і падобныя на спелую жытнюю салому. Каб і хацеў неяк адгаварыцца, то ўсё роўна не атрымаецца, бо валасы іхнія выдадуць. Мая радасць, мая ўцеха адзіная ў гэтым нялёгкім жыцці».

Гаворыць пра сынкоў, а сама, міжволі, ажно засвяцілася. Паны тут і ўбачылі, якая прыгажуня перад імі. Дзіўна ім стала, што ў звычайнай сялянскай хаціне, дзе і каштоўнага нічога няма, а такая кветка жыве-квітнее. Старэйшыя, то яшчэ нічога, а малады пан, то неяк адразу ж загарэўся, пачырванеў, не асмельваўся вачэй лішні раз узняць на жанчыну. Сагрэліся, абсушыліся паляўнічыя і пачалі збірацца, каб кіравацца да маёнтка, да якога было далекавата, але яны ўжо выразна чулі, што з вуліцы даносіліся крыкі іхняга фурмана, які шукаў паноў. Усталі, апрануліся і, амаль аднačасова, усе працягнулі гаспадыні грошы. Тая сумелася: “Паночкі даражэнькія, вы што гэта? Я ж вам ад шчырай душы прапанавала і сагрэцца, і перакусіць, а вы... Навошта мне грошы?.. Я ж нават не патрацілася?”. Толькі паляўнічыя не супакойваліся. Нарэшце, самы старэйшы прамовіў: «А мы не за ежу плацім, не за цеплую грубку, а за вашу шчырасць... Грошы вам абавязкова спатрэбяцца... Потым, як знойдзеце... А ў вас, вунь, і “саламянікі”, як вы сказалі, падрастаюць... Вазьміце, няхай будзе і ў вас пра нас добрая памяць... Не ўсе і далёка не заўсёды і паны ліхія ды паганыя...».

І што ж вы думаеце. Праз нейкі тыдзень зноў да “саламянкі” госць прыйшоў. Той самы маладзейшы паляўнічы. І ўжо не з пустымі рукамі з’явіўся, а з падарункамі. І гаспадыні хусцінку паднёс, і хлапчукам цацкі ўсялякія ды па крамнай сарочцы. Сядзіць, спрабуе размаўляць, а сам усё любуецца жанчынай. Круціўся, круціўся і ўсё ж асмеліўся: “Ведаеш што, я адзін з бацькамі ў маёнтку жыву. Старыя яны ў мяне, нават занадта. Знямоглыя ўжо, то ўсё на мне вісіць. Аканомка ў мяне добрая, гаспадарлівая. Але таксама старая. Просіцца, каб адпусціў яе на спакой у родную вёску. Папярэдзіла, каб шукаў ёй каго ўзамен, бо калі не паслухаюся, дык збярэцца і пойдзе ад нас. Таму ў мяне такая прапанова: забірай сыноў ды паехалі ў наш маёнтак. Там станеш новай аканомкай. Паглядзеў я, як усё ў цябе акуратна ды чысцютка: і на падворку, і ў агародзе, і ў хаціне, то і ў мяне будзеш да месца”.

Сказаў і прыціх, чакае, што ж яму, вострая на язык, жанчына адрэжа. Тая спачатку маўчала, мабыць, перабірала ў галаве, што да чаго, а потым і ціха дадала: «Ведаеш, пане, калі ты мяне дабіваешся, калі мне яшчэ аднаго “саламяніка” падкінуць хочаш, то я ... не супраць.

А вось, ці ж атрымаецца ў мяне вялікай гаспадаркай кіраваць ды за ўсім сачыць? А адносна такой пасады? Дзяцей рабіць у нашай жаночай справе мудрасць не надта закручлівая, як і з вашага боку. А вось з гэтакай пасадай, дык я магу і не справіцца. Ад шчырага сэрца гавару…».

Хто ж яго ведае, якія там ужо словы пан той знайшоў, але перабраў "саламячную ўдаву", разам з яе дзецьмі, да сябе ў маёнтак. Пачала яна там аканомкай служыць. Спраўлялася з працай, з абавязкамі і гаспадару ўмудрылася яшчэ аднаго сына нарадзіць. Таксама белага, таксама "саламянага". Пан добра адносіўся да дзяцей, не падзяляў іх на "чужых" і на "сваіх". А ягоныя бацькі спачатку былі нешта нібыта заўпарціліся. А потым, як пабачылі, што іхні сын шчаслівы, якая ўвішная ды ўпраўная ягоная новая аканомка, то і яны супакоіліся. А што яшчэ на старасці гадоў трэба? Сын не прапівае нажытае, у карты не прайграе, справы па гаспадарцы ідуць выдатна, а што не паненку сабе ўхапіў, то невядома яно, як бы лепей атрымалася.

Вясковыя жанчыны потым расказвалі, што калі яны па святах хадзілі ў царкву, то туды і "саламянка" са сваім мужам прыязджала. Думалі, адвернецца ад іх, ажно не. Заўсёды падыходзіла, гаманіла з імі, не выдавала з сябе "пані", а яшчэ абавязкова прывозіла цукеркі і пернікі. Частавала жанчын і прымаўляла: «Бярыце, болей бярыце… У вас жа дзеткі… Скажаце, што гэта ім ад "саламянкі" падарункі… Колькі таго жыцця… Памятаеце, як мы некалі з вамі заходзіліся, а цяпер… Няма нам чаго дзяліць… Лепей раскажыце, што ў вас новага?.. У мяне то ўсё добра… Дзеткі растуць… Весяляць мяне і бацьку…».

Неяк, седзячы на Пінскім аўтавакзале (яшчэ на старым, тым, што застаўся ад польскай улады) сярод тлумнага натоўпу людзей, мне заўсёды асабліва падабалася гэтакае гаварлівае зборышча вяскоўцаў, мой слых выхапіў, як нейчы густы бас прагуў: "Памяць твая саламяная… Пацяруха ты гнілая, а не чалавек слова… Сам гэтакі і памяць адпаведную ўзгадаваў… Як жа так можна сярод людзей жыць… Усё жыццё толькі і выкручваешся, як тая салома пад ветрам… Усе пра цябе так і гавораць, так і пераказваюць… Пустэча саламяная…". Я жвавенька крутнуўся на той голас і знайшоў прычыну падсесці да чорнавалосага здаравеннага дзядзькі, які толькі што некага добра-такі "адспавядаў".

Мужчына круціўся, яму карцела да некага загаварыць, каб "выліць душу", а я маўчаў. Чакаў, калі надыдзе мой момант і тады распытаю, даведаюся, што там да чаго. Гэта быў мой шмат разоў правераны падчас фальклорных экспедыцый прыём. Ён заўсёды спрацоўваў. Ды яшчэ як эфектыўна! І дачакаўся: дзядзька рэзка павярнуўся да мяне і ледзьве не ў самы твар стаў гусці: «Мы ж з ім раслі разам, гадаваліся, а ён



*Чухаўская хата*

са мною так няхораша абышоўся... Думае, што я не здагадаўся, хто ж гэтакую свінню падклаў... Вось жа, гад, яшчэ і сеў побач са мною... Дык усё й пачуў адразу... Можа, думаў, што стану саромецца, што людзей спалохаюся... Няхай ведае, як гадзіць чалавеку. Няхай і іншыя ведаюць таксама, каб на яго дзе ненарокам не напароліся. Ён і ім "падкіне", ды на іншых потым зваліць. Налаўчыўся за сваё жыццё...».

Я адно – хістаў галавою і спадзяваўся, што дзядзька раскажа і пра самую існасць: чаму ў іх заварылася такая справа і, адпаведна, такая аднабаковая "водпаведзь". Аказалася, што той "сябрук" дзяцінства пастаянна ... краў. Дзе не з'явіцца, то там і прыбярэ тое, што "дрэнна ляжыць". Потым адразу ж кідаецца валіць усё на некага іншага. Так і падстаўляў невінаватага чалавека. Пакуль вяскоўцы разбяруцца, а то і разбірацца надта не стануць, а адразу ж "настраляюць" у каршэнь. А тут, на днях, яго сярод ночы злавіў калгасны брыгадзір з мехам, вядома ж, калгаснага жыта. Злодзей, заспеты на месцы злачынства, адразу кінуўся ў ... наступ: "Гэта ж не я ўкраў! Не я! Я такі мех і не падыму нават! З месца не зрушу! Гэты мех прывалок Аляксей! Во, ён і ўкраў, а мяне папрасіў пасядзець, пакуль ён за другім абернецца!".

Брыгадзір жа спачатку таму дурню і паверыў, стаў чакаць і мяне, каб падлавіць на гарачым. Сядзеў, сядзеў, нічога не выседзеў, паддаў тады мех са збожжам злодзею на спіну і загадаў несці назад у калгасны свіран. "А ведаеш, якое жыта цяжкае?" – раптоўна ўскінуўшыся, звярнуўся да мяне дзядзька. «Ведаю, бо не раз даводзілася самому

іх насіць, ды яшчэ рабіць гэта ў мяшках-“сяменніках”». “А, братачка, – зайшоўся смехам мой суразмоўца. – І ў мяне плечы не адзін раз балелі, нават у маладосці, калі я, здавалася, увогуле ніякай стомы не адчуваў. Колькі перапрацаваў, колькі перанасіў ды пераваэіў, а не адчуваў. Толькі калі ўжо адпачываць клаўся, то цела гуло ад стомы”.

Мне ж карцела іншае: “Дзядзька, а як жа з пакражай?”. «А, там атрымалася далей надта ж весела: я яшчэ спаў, калі ў вакно пасыльны па канторы пастукаў і загадаў мне быць у старшыні калгаса. Ну, раз чалавека прыслалі, то, значыцца, справа пільная, адмаўляцца не станеш. Тым болей, што і сам калгаснік. Пайшоў я раненька на калгасны “нарад”. Там людзей шмат, усе на мяне касавурацца ды пасмейваюцца. А мне ж невядома, чаго гэта яны так сябе паводзяць. Паклікалі ў кабінет да старшыні, а там, акрамя яго, праўленцы і гэты зладзюга. Гаспадар кабінета і пытаецца сходу: “Чаго ж гэта ты, Аляксей, збожжа калгаснае крадзеш? Мала табе таго, што на працадні перападае? Захацеў лягчэйшага заробку, каб і пыл вочы не еў і салома цела не калола? Адказвай?!”.

Я ж на гэта і гаварыць што не ведаю. Потым ужо ачомхаўся і кажу: “Хто ж гэта на мяне такога наплёў? Я ж, старшыня, на вяселлі быў, з вечара пачынаючы і амаль да самага ранку, у суседняй вёсцы. У мяне ж сведкаў гэтулькі знойдзецца, што калі ім па мяху калгаснага збожжа на плечы ўскінуць, то яны за адзін раз палавіну таго вялікага свірна павынеслі б. Няхай во людзі пацвердзяць, што я ў сваім жыцці ніколі чужога не чэпіў, што такія грахі за мною не водзяцца!”. Магчыма, што і зарэзка я пачаў гаварыць, але ж такое абвінавачванне на маю галаву ўзляцела, што трэба было бараніцца. Старшыня не ўтрымаўся і ўголас зарагатаў, за ім, на розныя галасы, пачалі заходзіцца прысутныя. Усе, акрамя злодзея, які выдатна зразумеў, што тут ужо ўсё чыста раскрылася і што давядзецца яму адказваць напоўніцу. Кіраўнік, выцершы вочы ад слёз, зусім іншым тонам працягнуў: “Я адразу, Аляксей, здагадаўся, што ты тут не прычым, але ж захацелася гэтага злодзея і пустабрэха перад людзьмі раскрыць і паказаць, хто ў нашым калгасе найпершы лайдак, пляткар, злодзей і зайздроснік. Ідзі, чалавеча, ды прабач, што гэтак рана цябе ўскалацілі”».

Дзядзька задаволена засоп і прыхіліўся да майго пляча: «Хоць мяне старшыня і адпусціў, і прабачыўся за ўсё, але я не адразу дамоў пайшоў. Стаў чакаць ля праўлення, калі з яго той злодзей выйдзе, каб у вочы ягоныя зірнуць. Недзе праз паўгадзіны і ён, чырвоны, упараны, мітуслівы, выскачыў на ганак. А тут і я пытаюся: “То што, мех жыта, атрымліваецца, я ўкраў і да твайго саду амаль што прынёс?!”. Яму і ска-

заць няма чаго. Тады я яму ў вуха як трэснуў, то ён гарбузом з прыступкаў пакаціўся. Добра, мабыць, урэзаў, бо сёння да доктара прыязджаў. Сустрэліся во, на вакзале. Цяпер тая саламяная душа недзе за вуглом чакае, каб аўтобус прыйшоў ды хутчэй у яго шаснуць. Ведаеш, я яго яшчэ падлаўлю, але ўжо ў вуха біць не стану, а ў азадак ягоны тлусты нагою стрэльну. Так, каб ляцеў і сваімі нагамі ледзьве паспяваў перабіраць!».

Ведаў я і жанчыну, якую ўсе з вёскі клікалі няйначай, як "сташанка-саламянка". Не, імя яе было Маня, а "сташанка" таму, што родам паходзіла з вёскі Сташаны Пінскага раёна. "Саламянкай" стала па ўласнай "ахвоце". Была бабуля Маня надзвычай вясёлая, гаварлівая, юрлівая і таўшчэразная. Нашы ўсе любілі падкрэсліваць: "Што ў вышкі мае, то і ў таўшчыню. Ёй і спадніцу заўсёды вялікім квадратам шыюць". Пайшла другая мянушка ад таго, што вострая на язык бабця, "адмянтэшвала" ад сябе вельмі цікаўных, якія імкнуліся даведацца, "чаго ж вяскоўка, якая і працавала нароўні з усімі, і дваіх дзяцей выгадавала, так уелася...". Раззлаваная адрэзвала катэгарычна: "Салому ем цэлымі днямі! Яна мяне так і пушыць! Паспрабуйце і вы салому есці, то і ў вас праблем з вагою не будзе! А то, як вецер падзьме, то за платы трымаецеся, каб не паляцець разам з пылам! Сухарэбрыны! Будзеце і вы ведаць, якая саломка смачная! Асабліва зялёная, не праспелая яшчэ!".

Тады ўжо ў такога "адхрышчанага" вяскоўцы, момант "спавядання" якога ўсё чулі, а то і бачылі, дапытваліся: «Што і цябе "сташанка" саломкай падкарміла? Ведай, да каго чапляцца і з кім звязвацца». Самае галоўнае, што, нягледзячы на такую празмерна лішнюю вагу, сялянка была на дзіва хуткая і праворная. Здавалася, што тады яе нейкая нячыстая сіла падкідвала і імкліва накіроўвала ў патрэбным напрамку. Нават у танцах, вясельных ці нейкіх іншых, бяседных, "сташанка" круцілася нароўні з маладзейшымі ды яшчэ падпіскавала таненькім галаском, які ніяк ужо не дапасаваўся да такой мажнай фігуры: "Давай, дзеўкі, саломкай лётайце! Саломкай! Няхай глядзяць і ведаюць, у чым наша сіла!".

Вяскоўцы пастаянна кпілі з старой, што яна ў сваім жыцці ніколі не падбегла. Няпраўда гэта. Аднойчы мне самому ўдалося ўбачыць гэтакі "цуд" на ўласныя вочы. Праўда, "сташанцы-саламянцы" дапамаглі ў той раз у гэтай справе. Атрымалася так, што недзе адранку наш сусед – дзядзька Васіль – паспеў добра джгнуць, а ягоная жонка не знайшла нічога іншага, як "учапіцца ў няшчаснага чалавека і бэсціць яго апошнімі словамі", ды яшчэ паспрабавала і кухталямі "патлумачыць". Ды не на таго нарвалася! Узыграла ў суседа мужчынская кроў, ударыла ў га-

лаву, падкінула з месца і ... панесла за жонкай! Тая ўцякаць, а муж – за ёю! Бачыць, што не даганяе, дык нічога, што п'яны, а ўсё роўна здагадаўся, як можна выйсці са становішча: ухапіў даўжэзную лазовую тычку, якой у нас тады салому ды чарот на стрэхах прыціскалі, і папёр. Цяпер ягоныя стрэлы, хоць праз адзін, але не былі дарэмнымі. Толькі войкала жанчына і прыкрыквала: "Не патрапіў! Зноў не патрапіў!". А калі маўчала і не адзывалася, то гэта азначала, што патрапіў і яна проста не паспявала падражніцца. Вяскоўка паджгала хавацца ў натоўп, які сабраўся, каб паглядзець ранішнюю "спектаклю". Цікаўныя гаспадыні, здаецца, ажно ў двор гатовы былі залезці, каб потым распавядаць пра ўсё чыста да драбніц. Самым цікаўным з іх і перапала ад шчырай рукі гаспадара: хвастаў усіх, асабліва не разбіраючыся, хто перад ім узнікаў.

"Саламянка" з прычыны свайго маленькага росту не магла бачыць, што адбываецца ў двары з-за чужых спін і тулаваў, таму праціснулася і стала наперадзе, крокаў за колькі ад астатніх. Не паспела яна нават і крутнуцца, калі Васіль з усяго маху аперазаў яе! Адно толькі віскнула "па-дзявочы", ды так голасна і здзіўлена, што прысутныя, нават імкнучыся ўцякаць, зарагаталі. Тым вяскоўцам, то было зрабіць гэтае дзеянне значна прасцей, бо яны лёгка праціскаліся ў брамку: і па самому выскоквалі-выляталі, і па двое, а то і па трое. А вось "сташанцы" тут выпала ліхая доля: яна зашчамілася ў брамцы. Як кажуць: ні туды і не сюды! Добра, што Васіль адразу ж "выручыў!" Так ужо ўлупіў некалькі разоў запар па "саламянчынай" "фігуры"; і ўдоўж, і ўпоперак, што тая, паскораная такімі хвацкімі ўдарамі, выскачыла з брамкі, нібы засырэлы шпунт з вялізнай піўной бочкі. Як вырвалася на "аператыўны" прастор, то ... пабегла! Гэта было менавіта так! Яна моцна тупала нагамі, уся калыхалася, сіпела, булькала, але ж ... бегла. Імчала, наколькі гэтае слова падыходзіла да яе "бегу", па нашай вуліцы. Кіравала да ўласнай хаціны. Мой тата, які стаяў на падворку і назіраў, як там усё ў суседа робіцца, калі з ім параўналася "бягунння", здзекліва запытаўся: «Што, "саламянка", і цябе Васіль "перамераў"? Хвацка гэта ў яго атрымліваецца! Пачакай, затрымайся, ён жа табе яшчэ "гузікі" не паўшываў!"». "Сташанка" не ўтрымалася, каб не адказаць, на бягу адрэзала: «Каб твае дзеці цябе так пастаянна "мералі"! Калі ты з хворае і няшчаснае жанчыны кпіш! Я ж нічога там благога не рабіла, адно толькі стаяла і глядзела! А ён... Каб жа яму, гіцлю крываногаму, ды яшчэ і рукі павыкручвала! Ніводнага разочку па мне не прамахнуўся! Ды так балюча лупіў, што ажно недзе спадніца лопнула!».

Тата не даў ёй доўга размаўляць: «Уцякай, бо вунь Васіль даганяе! Будзе табе працяг "прымеркі!"». Сусед падляцеў да нашага плоту і, за-

сопшыся, спрабаваў нешта сказаць, але тата сам перабіў яго: «Глядзі, а "сташанка" цябе не баіцца. Толькі што сказала, што ў цябе ногі крывыя і ты яе не дагоніш, таму яна пешкі пайшла. Ледзьве сунецца ды яшчэ і смяецца з цябе, што няздольны ты бегаць за жанчынамі». Васіль лыпнуў вачыма і ўзвіўся: «Я няздольны?! Ды ад мяне ў войску ніхто не ўцякаў, а тут нават «саламянка» смяецца?! Зараз я ёй пакажу!». Прамовіў так і "ўдарыў на пяту", што ажно пыл за ім зыкурыўся ланцужком.

А то ўсё гаварылі, што "сташанка-саламянка" ніколі не бегала. Няпраўда гэта, сам назіраў, як адзін раз у жыцці яна ўсё ж бегла і не проста нават бегла, а джгала!

У розных рэгіёнах Беларусі любяць згадваць пра тое, як маладая сямейная пара, толькі ажаніўшыся, дамовілася, што ўсё сваё далейшае жыццё яны будуць жыць душа ў душу, не сварыцца, не лаяцца, а тым болей ніколі не біць адно аднаго. Потым, мілуючыся па начах, усё ж вырашылі, каб іншыя не надта зайздросцілі, то і яны стануць, быццам бы, біцца, але ... прытвараючыся, не па праўдзе, бо пугу на жаночую спінку мужык спляце з ... саломкі. Намілуюцца і засынаюць моцным сном. Але ж і ў такіх абставінах трэба было быць больш вытрыманымі і асцярожнымі. Жылі ж яны разам з яшчэ некалькімі сем'ямі ў старой, але затое вялізнай прадзедаўскай хаціне. Трэба было не так гучна шаптаць, бо ж далёка не ўсе людзі дрэнны слых маюць. Нават самыя старыя. Так і тут атрымалася. Дажываў свой век у гэтым памяшканні і старым-стары дзед, які, здавалася, што і з печы ўвогуле не злазіў. Ляжаў сабе, нікога не чапаў, думаў пра нешта сваё, адвечнае, рэдка калі голас падаваў. Затое памяць і слых у дзеда былі, то дай, Божа, маладым такога!

Сплёў той чалавек з саломкі пужку, прывязаў яе да бярозавага дзяржальна і пры ўсіх заявіў: "Цяпер, жонка, трымайся! Не станеш болей мне супярэчыць! А то не паспею падаць свой голас, як ты мне рот адразу ж затыкаеш!". Ды яшчэ і свіснуў той пужкай маладзіцы ніжэй спіны, а тая ўжо ўголас, давай выплакваць, што ў яе муж ліхі, што слова сказаць не дае, а ледзьве што якое, то пугай сячэ-б'е і не глядзіць нават, па чым пападае. Яна верашчыць, а ў хаце асабліва ніхто і ўвагі на гэта не звяртае. Тады ж у любым родзе такое было, як заведзена, што калі муж уласную жонку "вучыць", то ніхто іншы не ўмешваецца. Назіраць можаш, колькі захочаш, "раіць-падказваць" – таксама, а ўмешвацца, барані Божа! Бо тады і сабе на арэхі заробіш і распачнеш у хаце адвечнае варагаванне.

А старому ж не было чаго рабіць: дарослыя па гаспадарчых справах кіруюць, дзеці – на вуліцу гуляцца, а яму і сумна самому, і пагава-

рыць хочацца, ды няма з кім. Чуў ён добра, як маладыя паміж сабою дамаўляліся і вырашыў падстроіць ім "штуку". Знайшоў тую пужку-"саламянку", адчапіў яе ад дзяржальна і пачаў перарабляць па-свойму: узяў і ўсярэдзіну саламянага жгуціка старанна ўплёў сырамятную палоску. Здавалася, нічога істотна і не перамяніў, адно што пужка стала крыху цяжэйшая, але гэта на вагу, а на вока, то нічога і не разгледзіш. Паклаў стары дзед яе на месца і цікуе: як жа яна "спрацуе" на гэты раз? Ажно і чакаць асабліва доўга не прыйшлося. У бліжэйшую суботу, калі ўжо папрыходзілі з працы, ды пачалі мыцца перад святой нядзелькай, той малады муж нешта сказаў жонцы, а тая, не звяртаючы ніякай увагі на ягоныя словы, па-ранейшаму займалася сваёй справай. Узлаваны муж прыкрыкнуў: "А дзе ж гэта мая пужка?!". Але маладзіца і тут не надта спалохалася: "Дзе паклаў сам, то там і вазьмі... Я на цябе пугу не выраблялa...". Муж, нібыта завёўся: "Зараз ты ў мяне зведаеш!". Жонка спакойна сабе павярнулася і пазірае, як той у запечку пужку шукае. Хацела яшчэ нешта насмешліва сказаць, але муж, як джгнуў яе па азадку, то яна так раўнула, што і мухі падохлі адразу. Чалавек ведае ж, што пужка саламяная, і зноў па жонцы, ды па босых пятках. Пасля гэтага жанчына ажно закалацілася і пачала хуценька церці пяткі. Калі хто на сабе некалі гэта адчуў, то выдатна разумее, які гэта невыцерпны боль! А таму весела, што жонка так па-майстэрску паказвае, як ёй баліць, і яшчэ пару разоў па азадку "стрэліў". Тады толькі да жонцы дайшло, што ратавацца трэба, закрычала немым голасам, ні на кога ўвагі не звяртаючы: «Што ж ты робіш, дурында?! Ты ж мяне па-сапраўднаму лупцуеш! У мяне ўжо ўсё цела гарыць! Перастань, бо крывавыя "пісягі" па скуры застануцца!».

Палеглі спаць, а жонка на спіну легчы не можа. Мужу падалося, што і тут яна прыдурваецца: ціхенька правёў рукою па яе целу, дзе яна паказвала і жахнуўся – сапраўды там былі набрынялыя, крывавыя пісягі. Тады ўжо стукнула чалавеку, што з іх паджартавалі. Прыслухаўся, не, здаецца, у хаце ўсе чыста спалі, толькі стары дзед нечага катурхаўся на печы. Магчыма, што лепей уладкоўваўся, у чарговы раз павярнуўшыся.

Затое з самае раніцы ўсе хатнія, спачатку па-змоўніцку пераглядваючыся, а потым ужо зусім асмялеўшы, пачалі весела дапытвацца: "А што, Сямёнка, гэта твая жонка так учора верашчала? Няйначай ты ўзяў саламінку і набіў яе ў спінку? Гэта ж такая яна ў цябе нявытрыманая да болю. Ты яе ўяўна саломкай хвастаў, а яна верашчала, як перад канцом свету. Каб хто і хацеў такое прыдумаць, то не дадумаўся б, а ты ж неяк здолеў. Калі ты такі разумны, што ўсіх адразу перахітрыў, то павінен быў і на гэты раз на пужку глянуць, магчыма, нехта ды там нешта

перамяніў і яна пачала па-сапраўднаму джгаць. Як жа ты гэтак, чалавеча, абмішурыўся?”.

Кінуўся чалавек да тае няшчаснае пужкі, глянуў, ухапіўшы ў руку, і выразна ўбачыў, бо саломка расплялася, што ў сярэдзіне на самой справе ўплецена сырамятная палоска! Занасіўся па хаціне, але ўсе рабілі выгляд, што нічога такога не бачылі і, тым болей, не ведаюць. Адно што на печы нечага, вясёлым-весела, заходзіўся дзед-перастарак. Толькі што ты ж старога возьмеш, калі ў ягонай галаве свае жартачкі.

Неаднойчы ў нашым наваколлі прыгадвалі пра тое, як вяскоўцы ноччу бегалі з гарэўшай саломай вакол хаты мясцовага лесніка, якая ў той момант ужо гарэла ясным полымем. Раніцай, вядома ж, ад хаціны нічога не засталося. Хоць своечасова прымчала вясковая пажарная каманда, а лічылася яна найлепшай у акрузе, толькі і тыя хвацкія ды добра вымуштраваныя хлопцы, нічога не паспелі зрабіць. Сумна канстатавалі яны, што, маўляў, з-за надзвычай гарачага надвор'я ўвесь падворак, разам з хатай, хлявом, свірнам, дрывотняй, трымя стагамі свежанакошанага сена, пайшоў дымам. Добра, што ўмудрыліся павыпускаць няшчасную жывёлу, а то і тая б пагарэла.

Але паліцыянты аднекуль разнюхалі ці нешта такое знайшлі, што выклікала бясспрэчнае падазрэнне, што гэта быў невыпадковы пажар, а нехта падпаліў сядзібу лесніка. Тым болей, што і сабакі, якія чужых людзей, па словах хатніх, на дух не пераносілі, былі атручаны і самога гаспадара некалькі дзён не маглі адшукаць. Яго знайшлі выпадкова, праз некалькі дзён. Чалавек быў павешаны. Пры медыцынскім аглядзе было высветлена, што чалавека спачатку забілі, а потым ужо ... павесілі. Нехта ўмела маскіраваў сляды, імкнучыся спісаць усё на няшчасны выпадак.

Тады пачалі апытваць вяскоўцаў, найбольш бліжэйшых суседзяў, спадзеючыся такім чынам праясніць сітуацыю. Аказалася, што ў загінуўшага лесніка і ворагі былі, і нядобразычліўцы, і не раз яму пагражалі расквітацца, бо “надта шчыра панам служыць...”. А падчас гэтых апытанняў, зусім выпадкова, хлапчук, гадоў дзесяці, нечакана ўмяшаўся ў справу пана следчага і заявіў, што бачыў, як іхні сусед, пастаянна азіраючыся і стараючыся дзейнічаць патаемна, у тую ноч нешта хаваў у сваім стозе. Хлопчыку добра было відаць, бо спаў ён на свежым сене ў гумне, а той стог знаходзіўся якраз насупраць акенца, прарэзанага ў шчыце страхі. Пайшлі туды і знайшлі там бляшаную каністру з-пад газы. Схапілі тады таго гаспадара, прыціснулі добра ў пастарунку і той выкрыў усё, распавёў, як ды што там рабілася. Аказалася, што і быў ён не адзін, а некалькі чалавек сабралася і змовіліся яны разлічыцца

з ненавісным лясным служакаю. Яго выклікалі з хаты, забілі і, аднесшы на значную адлегласць, павесілі ў нейкім напаўразбураным свіронку, якім даўно ніхто не карыстаўся. Таму няшчаснага і не маглі доўга адшукаць. Потым злыдні вярнуліся і з усіх бакоў, папярэдне паабліваўшы будынкі газай, падпалілі сядзібу. Таму так спапяляюча ўсё і згарэла.

Самае цікавае, "з гаручай саломай", пачалося на судзе, які адбываўся ў павятовым Пінску. Туды ж, адпаведна, выклікалі ў якасці сведкаў і многіх вяскоўцаў, каб падчас судовага разбіральніцтва яшчэ раз пераканаўча даказаць віну, пакуль што, падазроных. Людзі ж, як вядома, розныя бываюць: як па фізічным, так і па разумовым складзе. Вось і тут так атрымалася. Выклікалі чарговага вяскоўца. Стаіць ён, са страху перад высокім судом, дрыжыкі пускае, а тут пан суддзя і пытаецца:

«– Раскажыце, сведка, будзьце ласкавы, па праўдзе і па парадку, як там усё адбывалася?

– Праўду, толькі праўду, пане суддзя, – залапатаў селянін. – Людзі там з саломаю бегалі... А салома тая, аказваецца, яшчэ і гарэла... Сухая, бачыце, была...

– Якая салома? Што ты вярзеш?! – зароў суддзя. – Я ж цябе папярэдзіў, каб гаварыў толькі па парадку, і толькі па сутнасці справы... Што салома гарыць, то мы і самі здагадацца можам! Давай далей і без усялякай дурноты, бо яшчэ загадаю, каб табе за такія сведчанні і лозаў усыпалі!

Пачуўшы згадку пра лозы, вясковец ажно засакатаў, сыплючы "важнымі фактамі", як яму ўжо тут падавалася:

– Я спаў, але прахапіўся ад крыкаў і тупату па вуліцы... Нехта ўсё бегаў... Таму, падскочыўшы да акна, задраў жончыну спадніцу і, ясная справа, убачыў, што ўвесь канец збегся да "машонкі", бо гарэла "машончына" сядзіба. Там ажно страляла ад той гарачыні. Туды ўсе і беглі, – выпаліў вясковец і, задаволены сабою ды ўласным красамоўствам, выпраміўся на ўвесь рост.

Але тое, што ён убачыў, збіла яго з панталыку яшчэ болей – усе прысутныя трэсліся са смеху і адно торкалі пальцамі ў ягоны бок, маўляў, во гэта "сведка" – усім сведкам сведка. Такое ў судзе адмачыць умудрыўся! Нават грозны суддзя і той выціраў вочы хусцінкай і круціў галавою. Пачулася ягонае выразнае:

– Але ж і насмяшыў... У такой справе і гэтулькі смеху... Каб жа на яго, такога сведку...

Але ўсё вельмі хутка і вельмі проста патлумачыў вясковы солтыс, які таксама ў якасці сведкі быў выкліканы ў суд. Ён, папрасіўшы прабачэння, устаў і пачаў амаль што даслоўна "перакладаць" сказанае селянінам на нармальную, зразумелую для ўсіх мову.

– Пане суддзя, задраў гэты сведка жончыну спадніцу, якая вісела на вакне замест фіранкі, якую гаспадыня днём памыла, а "ўвесь канец збегся да "машонкі". Тут ён меў на ўвазе, што ўся вуліца збеглася да гарэўшай хаты. Лесніка таго, забітага, па-вулічнаму, па-вясковаму, у нас клікалі за вочы, няйначай, як ... "машонкай".

Зала зноў зайшлася ў нечуваным рогаце. Цяпер ужо смяяліся з удалага народнага аповеду...».

Калі іду міма падворка, дзе некалі стаяла хата мясцовага гультая Трафіма, то абавязкова прыпыняюся. Вядома ж, зараз тут жывуць іншыя людзі, узвышаюцца іншыя будынкі, але ўсё роўна "памяць" пра таго бэйбуса, з ягонымі ўсялякімі гісторыямі і прыключэннямі, прымушае пастаяць і па-новаму ўзнавіць у памяці з таго, што пра гэтага лайдака ведаў я. Гэта толькі я, а іншыя, якія знаходзіліся з ім побач з самага дзяцінства і ажно да смерці. Адных толькі "саламяных" выпадкаў хапіла б на таўшчэразную кнігу. І ва ўсіх галоўнай дзеючай "асобай" быў ён – Трафім. Прывяду толькі некалькі з іх, найбольш для мяне памяткіх, бо тады ўжо я быў школьнікам і хадзіў на працу, у летнія месяцы, у калгас. А там, ля старэйшых, многаму можна было не толькі навучыцца, але і наслухацца, а нарагатацца так, што ажно прападаў голас і потым балелі бакі. І гэта ўсё было нявыдуманае, а жыццёвае, непрыдуманае, а некалі здзейсненае.

Нічога, што бэйбас і лайдак, але з-за таго, што замнога гаварыў, абралі яго вяскоўцы першым старшынёю мясцовага калгаса. Праўда, не доўга быў на гэтакай важнай пасадзе Трафім, недзе праз год яго выперлі ("як ён сам сцвярджаў: за палітычныя рэпрэсіі і ганенні.."), панізілі, бо ж партыя "сваіх не кідае", а Трафім выбіўся ў "парцейцы" яшчэ ў партызанах, зрабілі брыгадзірам. Тут ён не кідаў сваёй ранейшай дурноты, але не так быў навідавоку і пастаянна знаходзіўся дзе-небудзь са сваёй брыгадай. Звычайна спаў і надта не любіў, калі яго будзілі. Тады пачынаў крычаць, тупаць нагамі, пырскаць слінай, пагражаць, што ўсіх чыста "перасаджае, уладкуе ў турму на пару гадоў» і г. д. За лепшае лічылі яго не чапаць, бо звяжашся з дурнем, то потым сам не рады будзеш. Аднак здараліся і выключэнні – не частыя, затое ўдалыя.

Аднаго разу жала жаночая палова брыгады жыта ў далёкім урочышчы. Раней жа ўсюды дабіраліся пехатою. Адно што торбачкі ды якое калгаснае, неабходнае для працы, прычындалле, везлі на вазку. Туды ж ставілі і пару бітонаў з вадою, бо невядома, ці акажацца побач якая прыдатная крыніца. Піць жа ў жніво заўсёды хочацца. Праца ж надта цяжкая ды выжыльваючая. Усе заняліся сваімі справамі: жанчыны кінуліся "па халадочку" жаць, а Трафім уладкаваўся спаць і праз

пару хвілін хроп так, што ажно пошчак нёсся па блізкай дуброве. Неўзабаве адна са жнеяк, бо "добра ў хаце паснедала", захацела піць і падалася да вазка. Колькі там бітонаў не шукала, іх не аказалася. Тады давай будзіць брыгадзіра, а той, нават не ачомаўшыся ад сну, адразу кінуўся да вяскоўкі біцца. Толькі і тая аказалася не з палахлівых і давай яму працівіцца. Завязалася ў іх "барацьба". Папрыбеглі астатнія жанчыны і глядзяць з цікавасцю: хто ж пераможа? Ажно злаўчылася цётка і гэпнула брыгадзіра на спіну. Тут ужо, як апынулася зверху, то "дала яму панюхаць духам з-пад спадніцы". Няшчасны Трафім пачаў верашчаць, што задыхнецца. Магчыма, лепей яму не трэба было гэтага рабіць. Але ж зробленага не адкладзеш! Ды і калгасніцы сталі раіць "перавярнуць, гада, чэравам уніз, каб лішняга не бачыў". Перавярнулі і сталі дамаўляцца, як жа яго пакараць так, каб надалей запомніў, але каб і іх за гэтакае самаўпраўства потым не перасаджалі, бо часы былі надта ліхія.

Прыдумалі. Садралі з Трафіма штаны і ажно зайшліся з рогату, бо брыгадзіраў азадак нагадваў зараз сабою цеста, якое расплылося ва ўсе бакі. Расплылося ды яшчэ і дробна-дробна дрыжэла. Ведаў жа, гіцаль, што простым аглядам ягонай "маёмасці" разгневаныя жанчыны не абыдуцца. Так і выйшла! Дзве самыя дзябёлыя жанчыны сядзелі на плячах і на нагах, а завадатарка ўхапіла свежазвязаны сноп, распусціла яго, узяла ў здаравенную далонь пук каласоў і зрэзанымі канцамі рэзка пачала торкаць у "расплывісты" азадак. Трафім заверашчаў. Яму б, дурню, маўчаць, а ён – крычаць. У такіх выпадках крыкі ды пагрозы толькі лішне раз'юшваюць людзей. А ён рабіў і тое, і другое. Жанчына здаволілася і напрыканцы яшчэ з усяго маху разоў колькі перацягнула каласамі, як пугай, свайго начальніка. Можа нехта не ведае, што свежыя каласы, сабраныя ў пук, па сваёй цяжкасці і моцы нагадваюць змочаны канец вяроўкі. Таму сіла такога ўдару і моцная, і балючая.

Разагнуўшыся, разгневаная ўсё яшчэ жанчына закамандавала: «Цяпер слухайце сюды, жанкі! Раз і зваліла і біла нашага дурнога начальніка я адна, то каб ніхто потым на мяне не данёс, няхай кожная з вас зробіць тое ж самае. Тады і вы будзеце са мною звязанымі. Ніхто залішне языка не распусціць. А гэтаму дурню ні ў кога веры няма. Скажам, што ён голым азадкам са сцірты вырашыў паспускацца, каб праверыць, ці добра яна складзеная. А штаны зняў, каб іх не парваць. Споднікаў, боўдзіла, ніколі не насіў. Усе чулі? Давайце, па парадку, пайшлі!».

Перапала тады Трафіму "саламянай кашы" ажно залішне. Мала гэтага, у той паўбрыгадзе ("звяне") з жанчынамі аказаліся і два старыя дзяды, якія таксама смыкаліся працадні зарабляць для сваіх хатніх.

Калі ўсе жанчыны "адстраляліся", то мужчыны, пераглянуўшыся паміж сабою, падышлі да завадатаркі: «І мы, Ганна, папрацуем над гэтым гіцлям, каб і на нас нічога дрэннага не падумала... Толькі нам няёмка саломка, то мы яму лозкай упішам... Няхай і ад нас крыху зведае, як гэта людзей крыўдзіць...». Нічога, што старыя, але ля трафімавага "сядла" пастараліся на славу! Як толькі брыгадзіра адпусцілі, то ён гэтак ламануў ад грамады, што адно тупат разлёгся. Уцякаў, што нават штаны пакінуў.

Людзі неяк вытрывалі без вады, але калі вярталіся дамоў, а ісці было больш за дзесяць кіламетраў, то чым бліжэй станавілася да вёскі, тым беспакойней і трывожней жнейкі сябе адчувалі. Усе ведалі, што Трафім гэтага проста так не пакіне, ён пабяжыць адразу скардзіцца, "падаваць паданне". Сапраўды, на блізкім да паселішча мастку стаяла старшынёва "тачанка", на якой сядзеў не толькі сам старшыня, але і ўчастковы міліцыянт. Калгаснікі толькі падышлі, як пачулі злавесны брыгадзіраў голас: "Што, папаліся? Цяпер я вам у азадкі саломай тыкаць стану! Цяпер вы ў мяне ўсе зведаеце! Яшчэ і ў міліцыю пазабіраюць, там пасядзіце ды падумаеце, як начальства крыўдзіць!". Ён бы і яшчэ гарлапаніў, але яго перабіў міліцыянт: "Што вы з ім такое ўчынілі, што ён бегае і ўсёй чыста вёсцы свой азадак паказвае? Кажа, што вы яго моцна збілі. Гэта праўда?".

Ага, а навошта тады жанчыны змаўляліся? У адказ дружна, амаль хорам, прагучала: "Ды не, гэта ж ён уздумаў, як малы, са сцірты спускацца... Яшчэ і вухкаў пры гэтым... Увесь бок сцірты сасклізкаў... І штаны ўласныя падзёр, то там і кінуў, а дамоў голабздыкам папёр, бо мы яго сарамаціць пачалі...". Дзяды, якія толькі падышлі, таксама згодна захісталі галовамі: "Так, так і было, старшынька... Ты б не на жнеяк сварыўся, а гэтага лэмцюха пакараў... Ён жа што ўтварыў... Ён жа людзей на ўвесь спякотны дзень без вады пакінуў... Хіба ж гэта брыгадзір?.. Іншы б даравання прасіў ды ў вёску ці да якога бліжэйшага калодзежа з'ездзіў ды піць прывёз... А гэты яшчэ на людзей абы-што пляце... Саломай яму ў азадак штурхалі... Яго б добрым дручком за такія здзекі вучыць...".

Старшыня ўскочыў і, як трымаў пужку ў руцэ, то так і памкнуўся да Трафіма: "Ты што, людзей без вады ў такую спёку пакінуў?! Ды такіх страляць трэба, а не саломай палохаць!". Брыгадзіру выпадала перамоўчаць, каб не накаляць сітуацыю, але той паспрабаваў было нешта сказаць. Хацеў ды не паспеў, бо старшыня хвацка перацягнуў падначаленага пужкай. Стрэліў прама па натырканым азадку. Гэта было так нечакана, што Трафім ажно віскнуў, кінуўся ўцякаць і атрымаў яшчэ разоў

колькі. Але ж і на гэтым справа не закончылася. Брыгадзір адскочыў метраў на сто, перагнуўся і пачаў ляпаць рукамі па сваім, атрымаўшым за дзень добрую порцыю лупцоўкі, "сядлу": "Вось вам! Вось вам усім! Ведайце, што Трафім вас не баіцца! Вось вам, атрымайце, задавольцеся!". Ад гэтакага свавольства ўзвіўся міліцыянт: «Ах ты, выпаўзень, то ты прадстаўнікам улады свой "арэх" паказваеш, ды як сварлівая жанчына лямантуеш?! То я табе яшчэ і пяць сутак прыпішу! Сам прасачу, каб ты і ў аддзяленні без працы не застаўся! Гэта ж трэба, да такога дадумацца!».

Вось так Трафім і апынуўся ў шэрагах "палітычна пацярпелых". Гэта менавіта з ягоных слоў. Калі вярнуўся ў вёску пасля "адсідкі", то ўсім даводзіў, што ён і там "усімі камандаваў". Назбірае вакол сябе людзей і пачынае: «Выводзяць гэта нас дровы да кацельнай рэзаць. Начальнік толькі мяне ўбачыць, адразу і кажа, што ты, маўляў, Трафім, будзеш за старшага... Глядзі ў мяне, каб усё было належным чынам, бо з цябе, у адваротным выпадку, спытаюся... Я й камандую, стараюся, каб і там выслужыцца...». Нехта не вытрымаў: «А колькі ж вас, такіх гарапашнікаў, там сядзела? У Лагішыне ў такі гарачы час ашывалася?». Трафім і ўрэзаў, асабліва не чакаючы нейкіх хітрыкаў: «Двое было: я і Мікіта-"пярдун", што на мінулым тыдні п'яны сваю стадолу спаліў... Мы ўдваіх і шчыравалі...». Вяскоўцы рагаталі, а брыгадзір хлусіў далей: «Мне начальнік міліцыі нават штаны выдаў... За добрую працу... Амаль што новыя, толькі ў некалькіх месцах фарбай запэцканыя... Так мяне ўзнагародзіў, ацаніў мае старанні... Не тое, што тут, у калгасе... Ніхто не цэніць, адно толькі глядзяць, каб насмяяцца...».

Хто-небудзь з весяльчакоў падтрымліваў "гульню": «Трафім, а дзе ж тыя амаль новыя штаны?.. Што, начальнік табе іх толькі панасіць даў?..». Брыгадзір мыляў губамі і адразу ж пачынаў: «Ды не, братачка, гэта я ўжо калі дамоў вяртаўся, то ля лышчанскай крыніцы спыніўся вады напіцца. Тут ужо ўсяго пару кіламетраў заставалася. Напіўся, памыўся чыста ўвесь студзёнай вадзічкай і прылёг, каб перадыхнуць. Неяк незаўважна і заснуў. Прахапіўся, а ні сарочкі, а ні штаноў няма... Нехта ўкраў...». «То што, зноў, брыгадзір, пёр дамоў з голым азадкам?». «А я, людцы, жытам, жытам, а там і не відаць нічога... толькі каласы, каласы па падчарэўі хвасталі...».

А недзе праз месяц (усяго толькі праз месяц) Трафім учыніў новае "злачынства", за якое быў звольнены (па ягоных словах, "з хлебнай і ганаровай пасады") з брыгадзірства і пераведзены ў калгасныя пажарнікі. Тае раніцы прыбегла да брыгадзіра некалькі падлеткаў і наперабой затрашчалі: "Трафім Пятровіч! Трафім Пятровіч!". Той ажно ўсха-

піўся і выцягнуўся перад імі ад нечаканасці. Справа ў тым, што да яго ўсе звярталіся проста: “Трафім” ці “брыгадзір”. Ён спрабаваў было змагацца за ўласную “саліднасць” і прымушаць звяртацца да яго больш афіцыйна, але людзі адмахваліся: “Ат, Трафім ён і ёсць Трафім, каб ад гэтага ды паразумнеў”, – і адыходзілі, каб болей не вязаўся са сваімі павучаннямі.

А тут такое! Вылупіў шалёныя вочы і глядзіць на хлапчукоў. Тыя ж не заціхаюць: “Нам старшыня загадаў вераб'ёў з аднаго боку страхі калгаснага склада перагнаць на другі! Во, і запалкі даў, каб іх падпалілі ды, як мага хутчэй, прымусілі ўцякаць! Мы падумалі, што вы, наш брыгадзір, больш умела ўсё выканаеце! У вас і рост дазваляе, не тое, што нам: давядзецца адзін аднаму на плечы залазіць, каб да саламянай страхі дастаць! Нам падалося, што да вас ва ўсіх калгаснікаў і даверу болей!”. Выпалілі хлапчукі і ўважліва сочаць, як сябе Трафім стане паводзіць.

А той, адразу ж перамяніўшыся ад нечаканага афіцыйнага звароту, толькі і знайшоўся, што суха працадзіць, маўляў, вязацца тут з вамі: “Раз старшыня загадаў ды мне даверыў, то і выконваць трэба! Абавязкова, неадкладна! З-за лішняй разяватасці ў нас і парадку ў калгасе асаблівага няма! Вось, калі я быў старшынёю, то такога не было!”. Хлапчукі падзуджвалі: “То вы станеце падпальваць ці нам самім пачынаць? Час жа ідзе, вераб'і з-пад страхі паразлятаюцца і потым ажно да вечара чакаць давядзецца. А за цэлы дзень яны яшчэ колькі шкоды калгасным палеткам прынясуць”.

Брыгадзір рашуча перабіў: “Хопіць верашчаць упустую! Давайце запалкі ды глядзіце, як тых вераб'ёў з-пад страхі выкурваць трэба! Вучыцеся, пакуль я жыў-здароў! У жыцці ўсё можа спатрэбіцца!”. Праз пару хвілін хлапчукі заенчылі: “Во, гарыць, гарыць, ды, бачыце, як весела агонь узяўся. Але вераб'ёў нешта не відаць”. Трафім ганарліва запэўніў: “А куды яны дзенуцца?! На той бок зараз стануць пералятаць, пабачыце!”. Толькі хлапчукам было не да глядзення, яны, чуйдух, маханулі хавацца ў розныя бакі, бо ўбачылі, што ад канторы да зернясховішча нясуцца калгаснікі.

Трафім сустрэў разгарачаных людзей сваім, не надта разумным пытаннем: “Што, пагрэцца ды паглядзець прэцеся?! Як падпаліць, то вас і агнём не знойдзеш! А тут прыперліся!”. Далей, праўда, пагаманіць не ўдалося, бо, падляцеўшы, старшыня ўляпіў такога “ляшча” свайму брыгадзіру, што той нібы і не стаяў, а імгненна кувількнуўся на спіну. Як толькі перавярнуўся і стаў на калені (“ракам, браточкі”), то атрымаў яшчэ і ад падбегшага агранома нейкім кіем уздоўж “арганізма”. Адбегшыся, “падпальшчык” пачаў даказваць сваё: “Сам жа загадаў падпа-

ліць, а калі зрабіў, то яшчэ і б'ешся! Я на цябе сёння ж у суд падам! Там табе пакажуць і навучаць, як за выкананне задання біць чалавека!".

Увечары ў калгаснай канторы было не толькі густа накурана, але і крычалі людзі так, што ажно ўзмакрэлі. Даводзілі, маўляў, колькі гэтаму дурню ўсяго дараваць можна? Іншага ўжо ў турме згнаілі б, а з гэтага пасмяюцца і нават з пасады не здымаюць. Калі старшыня і далей усё замоўчваць будзе, то і на яго скаргу пададуць. А тут жа, бачыце, якая закавыка была: усе кіруючыя пасады ў калгасе, пачынаючы ад старшыні і заканчваючы рахункаводам, пажарнікам і нават намеснікамі брыгадзіраў, былі ... былыя партызаны. Трафім таксама ж быў адным з іх. Таму яго так доўга і "не здавалі". Але тут ужо такое атрымалася, што прыкрываць не выпадала. І ўсё роўна партызаны адстаялі свайго "байца", не перадалі справу ў суд, а прызначылі яго ... калгасным пажарнікам. Тым болей, што той напярэдадні палез да чужой жонкі на гарышча і ўпаў з лесвіцы. Упаў няўдала, бо зламаў нагу, а прыбегшы муж паспеў яшчэ зламаць юрліваму "вогнеборцу" і некалькі рэбраў, калі абходжваў нечаканага госця ладным калочкам.

Але і на той пасадзе пратрымаўся Трафім толькі да зімы. І зноў падвяла яго салома. Кепскі з гэтага вяскоўца быў гаспадар, надта кепскі. Дроў, здаралася, і ў лютую зіму не было, а ў хаце ж тады холадна ды невыносна ажно знаходзіцца, а сагрэцца ж неяк трэба. Трафіму было значна прасцей, бо днямі ён недзе лазіў, вечарамі – прападаў на ўсялякіх нарадах, хоць яго туды не выклікалі. Але як жа гэта нейкі збор людзей ды без Трафіма? Дзе ж яшчэ можна лішні раз "язык ушчаміць"? А няшчаснай, збалелай жонцы, то ніхто не зайздросціў. Толькі галовамі суседкі хісталі асуджальна ды перамаўляліся паміж сабою, што вось жа лёс чалавеку выпаў, няма ёй, на каго абаперціся. Клікалі жанчыну да сябе, нібыта па нейкай нагодзе, а на самой справе, то каб тая хоць сагрэлася. На мужа яна прыкрыкнуць не магла, бо па характары сваім была ўвогуле несварлівая, а спакойная, пакладзістая, неканфліктная.

Нехта ды недзе ж папракнуў Трафіма, што замест таго, каб лазіць па чужых падворках ды правяраць цягу з комінаў, то няхай бы сам лепей заняў дзялянку пад высечку ў лесе ды дроў, хоць раз у жыцці, дамоў навазіў. Сам бегае, як на спружынах падкідваецца, і халера яго ніякая не бярэ, затое жонка па людзях грэцца ходзіць. Тады "пажарнік", ідучы дахаты, каб усе сустрэчныя бачылі, ухапіў з сабою на калгасным таку вялізны сноп абмалочанай саломы. Валок і ўсім чыста патлумачваў: "Вось, пратаплю ў хаце... У мяне, то і так цёпла, бо хаціна добра зробленая, уцепленая ды нагрэтая, а зараз, галоўнае, толькі паветра змяніць і ўсё... Салома для такой справы найбольш падыходзіць... Яшчэ некалі мой бацька так рабіў...". Сустрэчныя здзіўляліся: "Што, і твой

бацька саломай хату ў такія лютыя маразы тапіў? Такі ж недарэка быў, як і ты. Цяпер зразумела, у каго ты такім лайдаком ды пустабрэхам вырас. А мы думалі, што сам па жыцці такой ляноты набраўся, ажно табе яна гатовая перадалася".

Жонкі дома не было, відаць, зноў у некага з суседзяў грэлася, таму кінуў сноп ля вусця грубкі і, паціраючы рукі, задаволена бурчэў: "Зараз, зараз пратаплю і нагрэемся так, што дзверы яшчэ адчыняць будзем, каб крыху бакі грубкі астылі...". Неакуратны Трафім быў ва ўсім без нейкага там выключэння. Таму і тут напхаў саломы поўныя дзверцы і нават паленаваўся прапхнуць далей, каб засцерагчыся на ўсялякі выпадак. Запаліў, карыстаючыся яшчэ, мабыць, дзедавым ці прадзедавым вогнівам, і радасна сеў насупраць агню. Вядома ж, агонь з саломы, нават з самай сухой, надзвычай кароткачасовы і ад яго не сагрэешся. Яшчэ калі сядзець ля яго і пакрыху падкідваць, па танюсенькай жменьцы "карміць агонь", то хоць у думках ды стане цяплей, ці рукі крыху зацепляцца. А так...

Вырашыў гаспадар і жонку паклікаць дамоў, каб і тая ля "гарачай" грубкі пасядзела. Толькі выскачыў, толькі гукнуў, туды-сюды паварочваючыся, як раптоўна нешта дзіка зараўло ў трафімавым коміне і адтуль паваліў густым-густы дым. Гаспадар рвануў у хату, але не паспеў пераступіць парог, як вымушаны быў выскачыць назад, бо і ў памяшканні чыста ўсё было ў дыму і нічога нельга было там убачыць. Вось тады, з вялікага пераляку, вясковец і раўнуў адчайдушна: "Людцы!!! Ратуйце!!! Гарым!!! Гарым!!! Ратуйце!!!". Неўзабаве ягоны падворак быў поўны людзей, але ніхто нічога не рабіў, адно стаялі і рагаталі да слёз. Нейкі здаравяк прагуў: "Ага, нас Трафім пастаянна штрафамі і турмой палохаў, а ў сябе комін гадамі не чысціў. Здагадацца не мог, то там нейкая варона сабе кубло зладкавала ды сажы, магчыма, вёдзер з пяць сабралася. Вось табе і гарым. Глядзець за ўсім трэба, гаспадар, а то і штаны на табе ненарокам яшчэ загарацца". З таго часу ў вёсцы і з'явілася нечуванае раней выслоўе: "Сагрэўся, як Трафім ад саломы: туды-сюды бегаўшы!".

Саламянае полымя, калі гарыць вялікая колькасць саломы, – відовішча надзвычай страшнае: не толькі таму, што палае, што горача, але і таму таксама, што імгненна ўспыхвае ўвесь ворах. Гэта гнілая ды моцна згноеная салома спачатку нібы абсыхае, а потым ужо нясмела займаецца весялейшым агеньчыкам, а з сухой – справы небяспечныя. Салома нават за сена гарыць нашмат хутчэй. Даводзілася за гэтым назіраць неаднаразова. Хіба ж можна забыцца на тое, як дзіка верашчала суседка, якая сваім крыкам спрабавала склікаць людзей на пажар. Праўда, людзі папрыбягалі даволі хутка і, па даўняй, яшчэ поль-

скай завядзёнцы, хто з чым, каб тушыць, толькі нехта са старэйшых адразу ўзяўся камандаваць: “Блізка не падыходзьце! Не падлазьце – гэта салома гарыць! Перакрыйце агню подступы да гаспадарчых будынкаў ды да суседскіх хацін! Добра, што ветру няма, бачыце, як полымя ўгару шугае, а па баках нават і не кідаецца! Перакрывайце ды малых не падпускайце да агню! Які не агонь, а жартаў усё роўна не любіць!“.

Той вялізны саламяны стог ніхто не тушыў. Ён асунуўся сам па сабе і недзе праз паўгадзіны ад яго засталася толькі невялічкая гурбачка гарачага попелу. Людзі разыходзіліся, а некаторыя заставаліся, каб ад гаспадыні паспрабаваць высветліць, што ж тут такога здарылася, бо ні навальніцы, ні нейкага іншага вогнішча паблізу заўважана не было.

Усё аказалася надзвычай празаічна. Жанчына разам са сваімі дзецьмі і ўнукамі, бегаючы па калгасных палетках, награбла многа саломы. Пляменнік ажно тры разы па трактарным прычэпе прывозіў. Радавалася: гэта ж, лічыце, што задарма, толькі і заплаціла, што пляменніку пару бутэлек самагону дала, але ж і яго не купляла, а сама выціснула. Склалі стог на зайздрасць людзям. Узвышаўся ён над усімі надворнымі будынкамі, унук, які яго вяршыў, пастаянна крычаў, што можа зваліцца, бо пад нагамі ў яго ўсё хістаецца. Радавалася: вось прыедзе муж з заробкаў, а ў яе гэтулькі “падспор'я” для корму.

Аднаго дня сярэдні ўнук прыбег да бабулі і агарошыў тую: “А ў цябе пад свежым стогам ужо куры нясуцца... Я сам бачыў, як яны туды залазяць, а потым і галасы свае падаюць... Там ужо, мабыць, яек гэтулькі, што і ў маю шапку не ўлезуць...”. Зацікавіў, бясспрэчна, гаспадыню, яна на ўнука: “Лезь, даражэнькі, ды падаставай яйкі, то я табе капеек на кіно дам... На два разы дам...”. Той палез. Неўзабаве пачуўся ягоны голас: “Бабуля, тут цёмна, не відаць нічога... Дай мне запалкі, каб падсвяціць...”. Жанчына сталага ўзросту, ахопленая азартам часовай спажывы, хуценька шуснула ў хату, схапіла з каміна пачак запалак, прыбегла і прасунула ўнуку: “На, ды добра там свяці... Каб усе яйкі пазбіраў...”.

Астатняе вы ведаеце. І пра гэта пазней гаварылі, апошнімі часамі то ўжо забыліся, “пайшлі да Ганны, яна сёння ў стозе яйкі смажыць будзе!”.

Здавалася б, усяго толькі простая, звычайная, жытнёвая салома, а гэтулькі разнастайных прыкладаў, здарэнняў, фактаў выплывае з нашай памяці. Дастаткова проста прызадумацца ці паставіць сабе за мэту нешта аднавіць у гэтым плане і ўсё паўстане, нібы наяве, нібы толькі ўчора было, адбылося, здарылася. І тут ужо і не мае асаблівай розніцы, мабыць, сур'ёзнае гэта ці жартоўнае. Галоўнае, што яно некалі жыло, існавала, захавалася сярод нашага люду.

ТРАДЫЦЫЙНЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ

# ЖЫТА – ЯНО ВЕЧНАЕ

У жыцці ўсё самае значнае чамусьці можа падавацца спрошчаным дазвання, звычайным да такой ступені, што на яго проста перастаюць звяртаць увагу, не надаюць асаблівай значнасці. Але гэта таму, што з першых часоў выкарыстання, ужывання ці прыстасавання да гаспадарчых патрэб прайшло надта многа часу (нават не стагоддзяў, а тысячагоддзяў). Гэтая вялізная часавая прастора, найперш, і прывяла да таго, што многае са значнага перайшло ў будзённае. Неяк так атрымалася, што ўсё гэта нібы і нарадзілася адначасова з чалавекам, на тым сівым заранку чалавецтва. Таму і адметнасці не захавалася, таму і першастваральнасць знікла, бо да жыта, напрыклад, наш продак паспеў так прызвычаіцца, што яно проста стала нечым неаддзельным ад ягонага жыцця, ад ягоных жыццёвых клопатаў. У любога гаспадара, атрымлівалася, што спрадвеку было "запраграмавана" ў галаве: збожжа трэба сеяць, палоць, жаць, малаціць, захаваць насенне новага ўраджаю і – потым усё пачынаць па-новаму. Гэта і ёсць гадавы цыкліч-

ны земляробчы абрад, які ў гісторыі развіцця грамадства быў увіты шматлікімі павер'ямі і прыкметамі, практычнымі навыкамі і перасцярогамі, прымхамі і забабонамі. А куды без іх было паткнуцца старажытнаму, а то і сярэднявечнаму селяніну? Усё ў тагачасным жыцці завязвалася толькі на ўраджаі, а ўраджай асацыіраваўся з сяўбою і жнівом, з жытам, найперш, менавіта з ім. Сяўба планавалася загадзя, абавязкова зыходзячы з народных прыкмет і ўсёпрыкмячаючага народнага календара. Ураджай планаваўся таксама, але ўжо ў залежнасці ад надвор'я, якое заўсёды актыўна ўплывала на гаспадарчыя цыклы земляроба.

Здаецца, што пра сімвалічнае, міфічна-біблейскае значэнне сяўбы для беларуса вельмі хораша і змястоўна сказаў У. Караткевіч у заключнай сцэне свайго гістарычнага рамана “Хрыстос прызямліўся ў Гародні”. Прыгадаем і мы гэты жыццесцвярджальны фінал:

«...Вус надзеў на шыю Юрасю сявеньку.

– Ідзі першы, – сказаў ён.

Хрыстос, смеючыся, правадзіў Іуду вачыма. Пасля пераступіў цераз паваленае страхлелае распяцце і стаў на мяжы ворыва.

Прыладзіўшыся, пайшоў, працуючы адной рукой. Раўнамерна, са свістам, у такт крокам правай нагі, разляталася насенне. І Вус падумаў, што на тым месцы, дзе так працуюць, абавязкова ўзыдзе раўнюткая, сіне-зялёная, а з самага пачатку чырванаватая рунь.

Хрыстос азірнуўся. За ім ішлі паловай жураўлінага ключа, астатнія. Фама сеяў дзвюма рукамі і высалапіў Хрысту язык: “Ведай шляхту!”.

І тады Хрыстос прымерыўся і таксама пачаў працаваць дзвюма. Шырока, роўна клалася ў раллю зерне.

Іуда ўжо знік. Неапалімыя купіны дрэў стаялі на ўзгорках. Сумавала вакол капліцы шыпшына. А сейбіты падымаліся на вяршыню круглага пагорка, як на вяршыню зямнога шара. І першым ішоў насустрач нізкаму сонцу Хрыстос, мерна размахваючы рукамі. І, гатовае да новага жыцця, падала зерне ў цёплую, мяккую зямлю.

Выйшаў сейбіт сеяць на нівы свая» [5, с. 490].

Што б ні здаралася ў жыцці, як бы яно ні ішло, а сеяць трэба ўсё роўна. Так вялося ад нараджэння Хрыстова, не выключана, што і да ягонага з'яўлення людзі ўжо навучыліся спажываць жытнёвы хлеб. І ўсё ў гэтым, здавалася б, дазвання простым працэсе, таксама традыцыйна-сімвалічнае. Колькі людскіх пакаленняў змянілася ад часу першай сяўбы і да нашых дзён, а ўсё засталося і ў той самай пабудове, і ў тым самым пераліку. Нездарма ж сапраўдны вясковец ніколі не гаварыў “араць зямлю”. Рабіў гэта з-за таго, што не хацеў надта спрошчваць

земляробчы працэс, бо ён хоць і просты, але ж жыццядайны! Таму і зазначаў, задуменна, не спяшаючыся: “Даглядаць зямлю”. А гэта ўбірала ў сябе многае. І гэтае многае мог, не распытваючыся і не ўдаючыся ў падрабязнасці, адразу зразумець гэткі ж чалавек працы. Яны, атрымліваецца, не проста выконвалі тую цяжкую фізічную працу, яны яе … стваралі. Навыкі яе перадавалі з пакалення ў пакаленне, пры гэтым абавязкова захоўваючы самыя, ледзьве прыкметныя пільнаму воку, драбніцы. Стараліся нічога не прапускаць, нічога не забываць, бо справа тычылася ўраджаю на «гэтае лета», а яго цесна лучылі з Жыццём. Нічога складанага, здавалася б, усё проста, як і наша Жыццё. Некалі так і гаварылі, што яно, Жыццё, надзвычай простае, а ўскладняе яго сам чалавек, ягоны, атрымліваецца, уладальнік.

Калі я быў першакласнікам, мяне таксама вучылі сеяць “па-старому”. Вясна стаяла роўная па надвор'і, без замаразкаў, без празмернай вільгаці. Паціху пачыналася сяўба на невялікіх прысядзібных надзелах, на якіх не расла ніякая гародніна, таму іх загадзя планавалі засяваць жытам, “каб хоць нейкі мех збожжа сабраць і то добра, і то зямля не прагуляе…”. Тое поле перайшло да дзеда Уладака яшчэ ад ягонага прадзеда. Дбайны то быў чалавек і адмысловы гаспадар. У ягонай хаце болей такіх не вадзілася. Нашчадкі пайшлі больш прагматычныя: ленаватыя, гультаяватыя, не жадаючыя займацца прысядзібнай гаспадаркай, гатовыя спляжыць апошняе, каб толькі было болей вольнага часу, каб можна было займацца тым, што ім было па душы. Вось і дзедава поле засяваў не адзін чалавек (дзед), а ажно тры мужчыны: ён сам, ягоны сын і ягоны зяць (мой тата). Усё тут было таксама пралічана наперад: будзем жа дзяліць тыя мяхі са збожжам на траіх, то і сеяць павінны ўсе – трое.

Мяхі з зернем прывезлі на возе. Мяне ўзялі з сабою, “каб не валэндаўся дома ды не нарабіў незнарок якой шкоды”. Першым чынам мужчыны добра перакурылі. Дзед, то той ледзьве не захроп, так “расслабіўся”. Потым, зыходзячы з прынцыпу “хочаш – не хочаш, а рабіць жа трэба”, пачалі рыхтавацца да сяўбы. Раней мне часта даводзілася чуць слова “сявенька”, а што гэта такое, я сабе проста не ўяўляў. Аказалася, што гэта звычайная саламяная каробка. Проста ў аднаго гаспадара сявенькі былі спецыяльныя і ні для чаго іншага ў гаспадарцы не ўжываліся. Яны былі дагледжаныя, са старанна падагнанымі вяроўкамі ці ручнікамі, дзякуючы якім сявенька мацавалася на грудзях сейбіта. У нядбалага чалавека то за сявеньку служыла каробка, якой шырока карысталіся і ў іншых справах. Так дзед гаварыў пра сынаву прыладу: «У гэтага, дурынды, вечна ўсё абарванае і абас…нае! У яго і ў сявеньку

куры панакладалі! Добра, што хоць карова туды не знеслася! І ў каго ён толькі такі ўрадзіўся?! Во і вяроўкі людскай не мае ды нейкім рыззём падвязваецца! Сейбіт! Ён ужо мне тут насее! І з году ў год так! Нічога не мяняецца!».

Бацька маўчаў, а дзядзька мой гыгыкнуў з вышыні свайго двухметровага росту: «Я за вас больш і з далані засею! Мала, што вы тут мне прытыкаеце! Зараз пабачым, хто як сее! Языкамі плямкаць, то вы ўжо ўсё поле засеялі. А як да працы дойдзе, то ўсё на мае плечы дастанецца! Я за адзін раз болей займу, чым вы ўдваіх! Я ж у дзве рукі сею, а вы ж так не ўмееце! Таму лепей маўчыце і не нарывайцеся! Насыпайце жыта ў сявенькі ды пайшлі, а то!».



*Традыцыйная сявенька*

Яшчэ "перабрахнуліся" дзед са сваім сынам, насыпаючы зерне ў каробкі. Старэйшы сказаў, каб меншы гэтулькі не сыпаў у пасудзіну, бо ягонае рыззё не вытрымае і парвецца, а сын даводзіў, што ўсё будзе добра, бо ён кожны раз столькі бярэ і ўсё вытрымлівае. Нарэшце яны пасталі на ўскрайку палетка. Першым стаяў дзядзька, другім тата, а апошнім – дзед, які нечага яшчэ і азіраўся. Мабыць, шукаў прыдатную мясцінку, каб дзе можна было прыткнуцца ды падрамаць. Амаль аднагалосна прамовіўшы: "З Богам!", рушылі. Мне думалася, што сяўба – гэта нешта надзвычай прыгожае, а тут: ішлі мужчыны і адно – памахвалі рукамі. Дзед з бацькам – правай, а дзядзька, праўда, махаў абедзвюма. Але не доўга ў іх працягвалася працоўная ідылія, бо недзе крокаў праз пятнаццаць у дзядзькі нешта трэснула, ён з усяго кроку спатыкнуўся і гопнуўся ва ўвесь свой вялізны рост на раллю. Адразу ж пачулася дзедава: «Я ж гаварыў, не сып поўную каробку, бо яна не вытрымае... У яго ж не сявенька, а нейкая расклізканая каробка... У яе

больш, чым паўмяха, улазіць, а ён жа не паслухаўся... Во, цяпер няхай адразу і жне, бо зерне з зямлі давядзецца збіраць... Эх, недарэка, і ў каго ты такі ўрадзіўся?..».

Я першы падскочыў да дзядзькі. Тое, што ўбачыў, выклікала ў мяне выбух смеху: сейбіт быў увесь у пыле, ягоны няголены твар нагадваў сабою нейкую пушыстую ляльку, з якой вызіралі толькі два глыбокапасаджаныя вокі. Зерне, сапраўды, высыпалася на раллю і не ў адну гурбачку, а вакол сейбіта, бо на самой справе ў дзядзькі парвалася ягонае саламянае прычындалле ды яшчэ і падвязка трэснула. Праўду казаў дзед, што «вечна карыстаецца нейкім рыззём». Няшчасны гаспадар з сораму нават і зірнуць у бок астатніх баяўся, нешта гроб сваёй здаравеннай даланёю назад у рэшткі дазвання парванай каробкі. Добра, што тата здагадаўся і крыкнуў мне: «Алёшка, збегай вось у гэтую хацінку і там папрасі сявеньку... Там дзядзька Валодзя жыве, ты яго ведаеш... Ён мой напарнік на трактары... Растлумач, што такая неспадзеўка здарылася, то ён выручыць...».

Той дзядзька Валодзя не толькі даў сявеньку пакарыстацца, але і сам прыйшоў на дапамогу. Убачыўшы, што да чаго, усхадзіўся: «А ты, Алёшка, чаму ж не дапамагаеш? Чаму ж гэта не сееш? Я цябе зараз сеяць навучу. Нічога тут складанага няма. Чалавек, які кожны дзень шукае на стале хлеб, павінен абавязкова ўмець і яго вырошчваць. А як жа ты думаў? Такая наша сялянская завядзёнка. Гэта на трактары проста. Там сеў і паехаў, а тут, братачка, пра ўсё падумаць трэба. Зараз я і табе сявеньку прынясу. У мяне ёсць спецыяльная, дзіцячая, для сваіх хлопцаў сплёў. Мае ўжо павырасталі, а выкідваць – шкада, то і падарую табе, каб памятаў, хто цябе сеяць жыта навучыў...».

Неўзабаве я, як дарослы, з сявенькай зерня на грудзях, стаяў на ўскрайку палетка, а дзядзька Валодзя лагодна вуркатаў: «Усё запамінай і паўтарай... Складанага нічога няма, але калі з першага разу атрымаецца, то ніколі не забудзешся... З першага разу абавязкова пастарайся ўлавіць і ўсё на гэтым... Паглядзі спачатку, як я пайду... Вось глядзі, крок з правай нагі і ўзмах правай рукі... Зразумеў... А займаць табе трэба поля на паўтара плячэй... Многа не хапай, бо не засееш роўна... Не засееш, тады лысіны будуць, а гэта – кепская праца... А мы з табою мужчыны... Пабачыў, як я раблю?.. Цяпер станавіся перада мною і ступай... Я буду ісці за табою ззаду і камандаваць... Пад крок табе падаваць голас, каб лягчэй было... Толькі не бойся, не палохайся нічога і нікога... Крыўдзіць я цябе ім не дам... Слухай мой голас і смела працуй... Нікому не давалася нешта надта лёгка, а старацца ўсё роўна трэба, бо само і ў сне не прысніцца... Ну, давай, пайшоў, родненькі... Не бойся, я за та-

бою...». Я нясмела зрабіў крок з правай нагі і сыпануў справа налева з правай рукі, а ззаду весела загучала: «Малайчына, будзе справа, малайчына... Правы крок, правы ўзмах... Малайчына... Смялей, смялей трымайся... Упэўненней кроч... Усё добра... Я назіраю...».

Ці доўга дзядзька Валодзя камандаваў мне “крок” – не памятаю. Чамусьці, здаецца, што хутка ён замоўк і мы з ім, малы і дарослы, сеялі моўчкі, ужо ведаючы (ці засвоіўшы) сваю справу. Засеялі тое поле параўнаўча хутка. Потым сядзелі ля хаты дзядзькі Валодзі. Мужчыны, як водзіцца, “прымочвалі”, не забываючыся нагадваць пры кожнай чарцы, “каб расло і бралася, каб каласы сонцам наліваліся...”. Я сядзеў непадалёку ад дарослых, перакусваў і стараўся слухаць іхнюю гамонку. Памятаю і адно пытанне, якое я задаў дзядзьку Валодзю, калі ён у чарговы раз узяўся мяне хваліць: «А так можна сеяць усё, ці толькі зерне?». Усе наперабой сталі запэўніваць, што калі засвоіў з першага разу, то астатняе нічым не будзе адрозніваецца. Падсяваць траву, рассыпаць угнаенні выпадае гэтаксама. Адно, што там ужо трэба, “сачыць за тым, куды болей сыпануць, а ў астатнім – толькі ідзі і пад свой крок сып з правай рукі...”.

Дамоў вярталіся, седзячы на возе. Мужчыны і заспявалі б, але ехалі па цэнтральнай вясковай вуліцы і яны пасаромеліся “павыць сярод белага дня”, бо людзі б іх няправільна зразумелі б. Затое менавіта тады я прывёз дамоў маленькую сявеньку, якую дзядзька Валодзя мне падараваў. Так і сказаў: «Раз так хутка ўсё ўхапіў ды стараўся, то няхай яна табе будзе нагадваць пра маю “навуку”».

З таго самага дня, калі мне нешта прыходзілася падсяваць, то я, ужо будучы і ў сталым узросце, насыпаў зерня ці насення, а то і гранулянага ўгнаення ў сваю персанальную сявеньку і крочыў да палетка. Самае дзіўнае, што як толькі станавіўся і акідваў поле позіркам, то ў вушах, нібы ўчарашнія словы, гучала адразу ж: «Алёшка, правы крок і з правае рукі... Не спяшайся, усё пазірай перад сабою, не прапускай... Яно ж не так і складана, адно што вочы палохаюцца, а сялянскія рукі то ўсё чыста зробяць... Правы крок і з правае рукі... Бачыш, як ладна атрымліваецца?.. Не забыўся, малайчына... Я ж табе гаварыў, што назаўсёды мая навука табе спатрэбіцца... Мала што ў жыцці здараецца, а гэты занятак за плячыма не насіць ніколі...».

Усе мае настаўнікі-сейбіты выбраліся ў свой час да дзедавага поля, там і знайшлі свой вечны спакой, бо поле тое было побач з вясковымі могілкамі, прама за агароджай. Абыходзячы клады родных і блізкіх мне людзей, абавязкова прыгадваю пра тое, як вось, прама тут, мы тады

сеялі. Здаецца, што і зараз чуецца ў вушах адчайдушнае дзедава: «І ў каго ты такі ўзрадзіўся?! Я ж цябе папярэджваў!».

Жыта пасеяць – не азначала, што кінуў зерне ў раллю і ўсё на тым, яно само і вырасце, і нальецца, і дачакаецца вострага сялянскага сярпочка. Не, калі толькі паспадзяваешся на само зерне, то глыбока памылішся і нічога добрага з твайго ўраджаю не атрымаецца. Вядома ж, зерне будзе прарастаць, набірацца сілы, налівацца жыццядайным сокам, але яму выпадала абавязкова дапамагаць. І зноў, усе гэтыя клопаты клаліся на жаночыя рукі. Паправімся, жаночыя і дзіцячыя. Тады ў вёсках існавала абавязковая і цвёрдая “градацыя” сялянскай працы. Гэта азначала, што была мужчынская: сяўба, касьба, малацьба, ворыва, сенакос, нарыхтоўка дроў і многае іншае, але ж паралельна ішла і жаночая, не менш важная і адказная: хатнія справы, нарыхтоўка ежы, дзеці, догляд свойскай жывёлы, праполка (нудная, невыносна-невыцерпная, надакучлівая) агарода і ўсіх сваіх палеткаў. Асобна стаіць жніво і капанне бульбы, а потым трапанне льну ці канопляў, прадзенне кудзелі, ткацкія працэсы і гэтак далей. І паспрабуй нешта прапусціць ці спашліся на сваё недамаганне, хваробу або знайдзі якую іншую агаворку. Ага, хутка «агарод ці ніву запрэ зеллем, а вострыя языкі суседак (праўда, тут ужо і суседзі не адстануць!) нагадаюць пра тваё лайдацтва ды ляноту, выведуць цябе на чыстую ваду».

Прыходзілася з самага ранняга маленства, спачатку нібыта гуляючыся ля мамы, бо не было мяне на каго пакінуць у хаце, а потым ужо і “на правах раўнапраўнага памочніка”, палоць і наша жыта, і грэчку, і проса (калгасныя буракі, каб яны і зараз пасохлі ўсе дазвання!), і бульбу. Нічога там адметнага асабліва ці нечага выключнага не існавала. Там выпадала рваць зелле і не парушаць кволенькія парасткі збажыны. Старацца рабіць усё акуратна. Самае страшнае, што рабіць гэта трэба было, сагнуўшыся крукам, пільна ўглядаючыся ды асцерагаючыся павырываць збажыну. А яшчэ пастаянны кантроль з боку матулі і яе гняўлівае: «Што ты зелле, як гусь шчыплеш? Яго з карэннем выдзіраць трэба, бо яно за табою адразу яшчэ пышней распусціцца, то тады ніякага ўраджаю не дачакаешся. Вырывай толькі з карэннем ды ў гурбачкі паміж радочкамі збажыны складвай, то яно і паабсохне на сонцы. Адзін раз, сыночак, добра зробім, то, магчыма, болей палоць тут не давядзецца. Збожжа, калі надвор'е яму будзе спрыяць, то вельмі хутка ўздымаецца, а ўжо калі пойдзе ў сілу, то зелле збажыне не так страшнае. Ёсць і сярод зелля такое, якое ніколі не адчэпіцца і заглушыць можа любую ніву дазвання. Найперш, гэта асот. Той калючы, кусцісты, з доўгім карэннем, яго, калі адразу не апамятаешся, то потым і спраба-

ваць выкарчоўваць бескарысна. Адно што збожжа вытапчаш. Збажыну, калі яна ўжо выперла па грудзі, напрыклад, то ніякі гаспадар табе палоць не дазволіць. Тады такая праполка толькі на шкоду ніве. Таму ўжо так і будзе стаяць яна да самага жніва. А яшчэ званец, які віецца-сплятае любое збожжа так, што тое ледзьве хліпіць, але ніякай сваёй сілы не набіраецца. А яшчэ валошка (васількі). Гэтакія прыгожыя, сіненькія кветачкі, аказваецца, яны то прыгожым-прыгожыя, але ж для жыта ды і для іншай збажыны надзвычай шкодныя...».



*Уладзімір Зянюціч*

Здаецца, што жыта палоць было не вельмі яшчэ і страшна. Старанна праглядваеш зялёныя кусцікі і паціху ціснешся наперад. Марудна, але ж не на месцы прыкіпеў. А надта млосна і нудна было палоць проса. Яно, асабліва маладзенькае, такое кволенькае ды далікатнае, што і пальцамі датыркнуцца лішні раз проста баішся. Але побач была матуля, яна і падвучвала, як ды да чаго там трэба рабіць, каб не ўчыніць шкоды. Удваіх было значна весялей, «бо было з кім пагаварыць, было да каго звярнуцца, параіцца і запытацца, як рабіць так, каб рукі, у кісцях, не гарэлі гэтак агнём (у нас гаварылі "ажмяніў рукі", што азначала, па-мойму, расцяжэнне сухажылляў і тады пальцы амаль увогуле не мелі сілы і толькі гарэлі агнём; з такога працаўніка на ніве ўжо было мала толку, іншая справа, што стараўся імітаваць працу, але выконваць яе напоўніцу ні ў якім разе не атрымлівалася з-за фізічнай няздольнасці працуючага)».

Вядома ж, можна было так не шчыраваць, як рабілі некаторыя з суседзяў, агаворваючыся пры гэтым: «Збажына як падымецца, як пойдзе, то ніякае зелле яму болей не страшнае. Тут зямля добрая, то

жыта (проса, ячмень, грэчка) і само за сябе пастаіць: не паддасцца зеллю. Пабачыце, мая ніва будзе не горшая за вашу. Вы тут поўзаеце, не каб адпачыць ды пасядзець дзе-небудзь у халадку, песню якую заспяваць, а то гарбы сабе панажывалі за лета. Я прыйду, абыду ніву, пагляджу з усіх бакоў і ўсё на тым. Няма чаго ўжо такое высокае збожжа таптаць. Потым сажнем, прыбярэм і ніхто на ніве таго зелля і знаку не знойдзе. А то папрыдумвалі тут: днямі-тыднямі прападаць. Вы ж самі гэтаму збожжу расці перашкаджаеце, вытоптваеце, выкарчоўваеце, карэньчыкі падрываеце. Калі ж яно ўмацавацца ды ў рост пайсці паспее?».

Адным з такіх лайдакаватых вяскоўцаў быў наш сусед. У яго і мянушка адпаведная была, з-за празмернай пахвальбы яму прыпісаная, – “Багатыр”. Так ужо ўсім даводзіў, што ў яго ўсё самае лепшае ды ўрадлівае, самае прыгожае ды адметнае, што і мянушка такая прыляпілася. Таго разу ён пасеяў побач з нашым вялікаватым загонам, на якім мы старанна выполвалі грэчку, проса. Прыйдзе, пастаіць на ўскрайку, да нас нават не падыходзячы, нечаму ўсміхнецца і пойдзе сабе дамоў. А на вуліцы ўжо гарлае ва ўвесь рот, што, маўляў, ніяк пылоты суседзі ягоныя не панаядаюцца, мала ім, бачыце, яе: тую грэчку ў зямлю так пазатапталі, што яна, няшчасная, і праз тры гады не вылезе. Сам смяецца і вяскоўцы смяюцца. Ім то якая справа, адно што душу адвядуць, а потым зноў па падворках разыдуцца сваімі справамі займацца.

Некалькі разоў палолі ў тое лета мы з мамай загон з грэчкай, але выпалалі так, што толькі грэчка пагойдвалася пад ветрыкам сваімі невялікімі кусцікамі, на якіх, нібы гронкі, вісеў ураджай. Прыйшоў дзень, калі ўсёй сям’ёй пайшлі на палетак, каб скасіць збажыну. Грэчку, з-за яе невысокіх сцяблоў, нашы вяскоўцы ніколі не жалі, а касілі ў радочкі, старанна іх зграбалі і потым ужо дасушвалі па дварах. Далей, адпаведна, іх вымалочвалі, прасявалі і чыстае зерне зноў акуратна прасушвалі, каб збожжа “не зляжалася і не прыпрэла”, бо тады крупа будзе мець у сабе стойкі пах цвілога і гнілога.

Тата забіў касу, нешта прашаптаў сам сабе і пайшоў, мерна, спакойна, памахваючы касою. За ім заставаўся раўнюткі радочак. Неўзабаве туды ж прыйшоў са сваёй жонкай і старэйшымі дзецьмі і “Багатыр”. Жанчына адразу пачала нешта крычаць, размахваць рукамі і торкаць у наш бок. Тата спакойна, прыпыніўшыся, кінуў цераз плячо: «Во ўжо яго жонка “спавядае!” Чуеце, як заходзіцца?! Гэта, відаць, праполку ягоную яму выгаворвае! Яны тут да паўдня яшчэ і паколюцца!». Тата касіў, мама зграбала ў валок і ўсё радасна прыгаворвала: “Але ж і ўрадзіла... Сыночак, памятаеш, я табе гаварыла, што родны бацька гэтуль-

кі не дасць, колькі благая ніва... Памятаеш... Цяжка было, але мы вытрымалі... цяпер будзем і бліны пячы грэцкія і суп малочны варыць... Грэчка – яна смачная...”.

“Багатыр”, нагрызены жончынай лаянкай, кінуўся далей ад яе. Прыджгаў і стаў ля нас, але нядоўга ён і тут адпачываў, бо тата, азірнуўшыся і заўважыўшы таго пустабрэха, запытаўся: «Што, “Багатыр”, у цябе проса ў х... павілося?!». Выгукнуў незнарок моцна, каб пачула ягоная жонка і дзеці. Сусед плетануў і ад нас.

Часам даводзілася і мужчынам выконваць жаночую працу. Так складваліся абставіны: калі вяскоўка нараджала дзіця (хоць, па шчырасці, то ў такіх выпадках працавалі яны да апошняга, незважаючы на вялікі жывот, на пастаянныя болі; нярэдка і нараджалі прама ў полі, на сенажаці, на жніве) або моцна хварэла. І тады ўжо гаспадару нічога іншага не заставалася, як кіраваць на праполку самому. Да нашага часу старэйшыя вяскоўцы, прыгадваючы гэтую гісторыю, ледзьве не коцяцца з рогату. Яшчэ б пабачыць гэта ўсё на ўласныя вочы. Толькі малы тады я быў.

Мой хрышчоны бацька, вышэйзгаданы ўжо дзядзька Антось, калі ягоная жонка нарадзіла пятае дзіця – доўгачаканага сына, паабяцаў гаспадыні, што не пусціць яе на цяжкую працу, “каб яна там не парвалася, а ўсё стане выконваць сам-адзін”. Так ужо чалавек быў задаволены, што і ў ягонай сям’і з’явіўся прамы нашчадак па мужчынскай лініі. Праўда, паспрабаваў было бацька “націснуць” на сваіх дочак, але ў тых аказалася «гэтулькі хвароб, што ў сабак лішаёў і то меней бывае; самая старэйшая паступіла яшчэ куды прасцей: паслала свайго татачку туды, куды і спраўныя цягнікі не даходзяць». Тут ужо нічога іншага вяскоўцу не заставалася, як ісці палоць жыта самому. Збіраўся на працу ён у той дзень, “як на турэцкую вайну”, па словах ягонай жонкі; кавалак сала прыхапіў такі, што ўся наша вуліца б месяц ела, а яшчэ ўзяў амаль новы вялікі кажух, браў на той выпадак, калі моцна прытоміцца, то прыляжа на ім адпачыць, каб не застудзіцца на сырой зямлі разгарачанаму падчас праполкі.

Калі сонца ўжо паказвала гадзін на дзесяць, то хрышчоны выбраўся на поле. Ішоў, не спяшаўся, з тым-сім прыстойваў, гаманіў. Скардзіўся на цяжкае жыццё, на такую няшчасную долю, што, «маўляў, самому даводзіцца жыта палоць, бо жонка яшчэ зусім слабая, але нічога: ён справіцца... Куды галаднейшыя і страшнейшыя часы перажылі, перагораем і гэта...». Прысунуўся на ніву, а там! Якога зелля там толькі не было! Бо і ўзараў не надта старанна палетак, як гаворыцца, каб хутчэй перабыць. Спадзяваўся на жаночыя рукі, як звычайна, а магчыма, і на

тое, што зелле не возьмецца. Не спраўдзілася, аднак, ні тое, ні другое. Перагнуўся і давай рваць зелле. Ага, а там усё аказалася значна складаней, бо поле было цвёрдае, рукі не ўбіць. А як жа тое пустазелле парвеш. Крыху папоркаўся гаспадар, а потым вырашыў: цяжка мне, з вышыні ўласнага росту, пастаянна нагінацца і разгінацца ды і спіна ўжо ледзьве не смыліць, таму рассцялю я кажух, лягу на яго бокам і, пaціху пасоўваючыся, буду палоць. І чысцей зраблю, бо ж усё добра відаць, і не так моцна стамлюся. Улёгся на кажуху, якіх хвілін пару "папалоў" і заснуў сабе, як ні ў чым не бывала! Прачнуўся ад таго, што стала яму халаднавата. Усхапіўся на ногі, зыркнуў туды-сюды, а ўжо позні вечар на двары, ужо зоркі на небе густа высыпалі. Нагнуўся чалавек, каб кажух забраць і дамоў падасціся, а кажуха няма на месцы. Усё аблазіў, але нічога не знайшоў, так і паплёўся дахаты, "з той турэцкай вайны...". Доўга, вельмі доўга галасіла тады ягоная жонка. Аказваецца, што ёй ужо жанкі паспелі падказаць, як «старанна поле збажыну яе муж; храпе так, што і ягонага гусенічнага трактара не чуваць было б; яна ўжо гатова была яго голымі рукамі задушыць, а тут яшчэ і гаспадар прыцёгся, ды не проста пераступіў парог, як чорт мурзаты, але і кажух ягоны ўкраў нехта».

Седзячы неяк у нашай хаціне, вячэраючы разам з намі, дзядзька, пасмейваючыся, як ён гэта любіў рабіць у любых сітуацыях (хоць зямля на неба пляснiся, а ён усё роўна будзе параготваць), даводзіў: «Мне, сястра, здаецца, што я нібыта і чуў, як нехта нада мною сонным прабурчэў: "Антось, перавярніся на другі бок". Я і перавярнуўся, а ён, той гад, тады ж кажух з-пад мяне і свіснуў. Каб яму ніколі ў тым кажуху не сагрэцца, раз так над спрацаваным чалавекам пажартавалі. Любы, як натоміцца, то спіць, нічога не чуючы і нічога не заўважаючы...».

Хрышчоны пайшоў, а ўсе мы яшчэ доўга смяяліся, на розныя лады пераказваючы антосеву "праполку". Кажух той, недзе праз тыдзень, нехта ўсё ж падкінуў. Маўляў, пажартаваць то пажартаваў, падкрэсліў гаспадару важнасць жаночай пастаяннай працы, тым не меней чужое мне не трэба. Праўда, падкінуў не хрышчонаму на падворак, а ягонаму бацьку – дзеду Уладаку. Тады ўжо бабуля на ўсю вёску гарлала, што ў аднаго лайдака і абібока ўкралі, а да другога, а магчыма, што яшчэ і больш спраўнага ў гэтых адносінах, прынеслі. Дзед не адспрэчваўся, бо выдатна ведаў, што гэта бескарысная справа і што калі і паспрабуе сказаць слова-другое, то будзе "спляваны і зняслаўлены гаспадыняй".

З таго часу ў вёсцы пра лянотнага, лайдакаватага чалавека звычайна гаварылі: «І гэты, відаць, у антосявым кажуху жыта палоў! Бачыш, як за дзень на працы надрамаўся, што ледзьве сунецца! Ногі і тыя перастаўляць ад соннай млявасці не здужае!».

Спраўны гаспадар ніколі не забываўся пра сваю жытнёвую ніўку, як і гаспадыня таксама. Не толькі ездзілі і хадзілі туды, каб працаваць, але як толькі ў іх выпадала нейкая вольная хвілінка, звычайна прысвятак ці свята, то кіравалі туды, каб лішні раз зірнуць, як буяе жытнёвае поле, як убіраюцца ў жытнюю сілу каласы. Прыгадаем коласаўскага Міхала з паэмы "Новая зямля" – служаку па леснікоўскай пасадзе, а шчырага земляроба, селяніна-гаротніка – у душы:

І часта ў добрую пагоду
Ідзе Міхал дамоў з абходу,
І хоць чуваць, што ныюць ногі,
Але зварочвае з дарогі
І робіць крук, бо як стрымацца,
Каб не пайсці палюбавацца
І ярыною і жытамі?
Ідзе, а ветрык з каласкамі
Вядзе прыемную размову
І цешыць душу леснікову.
Міхал падыдзе і прыстане,
І лаву жыцейка агляне
Ды возьме ў пальцы асцярожна
Яшчэ няспелы і парожны
Ён колас жытні і пагладзіць,
Рукою лёгенька пагладзіць,
Нібы сынка свайго малога,
І ў сэрцы дзякаваў ён бога [7, с. 34].

Любы ашчадны гаспадар спадзяваўся толькі на добры ўраджай, бо выдатна ведаў, што сваёй працай ён гэта заслужыў. Ведаў, аднак, вясковец, што па няхітрай, па немудрагелістай сялянскай статыстыцы добры ўраджай надараўся, прыкладна, адзін раз на пяць гадоў, а ў астатнія гады даводзілася чакаць, "каб хоць гэтулькі намалаціць, колькі пасеяў". Пра штодзённы бохан хлеба на хатнім стале і гаворка нават не вялася. Найперш трэба было думаць, дзе ўзяць зерня на насенне, а потым ужо пра ежу. Гэта была суровая рэальнасць тагачаснага жыцця, ад яе не выпадала нікуды ні ўцекчы, ні схавацца. Яна даймала паўсюль. Таму і прыходзілі да жытнёвага палетка, да жытнёвай нівы, нібы да нейкай жывой, адухоўленай істоты, і глядзелі са спадзяваннем, імкнучыся загадзя прадбачыць, які ж чакаецца ўраджай на гэтае лета? Такая ўжо чалавечая існасць: карціць яму пра ўсё даведацца наперад. Гледзячы на "лаву" зеленаватага жыта, селянін у душы спадзяваўся толькі на самае добрае. І не толькі ад таго, што хацелася прыбытку,

а, хутчэй, ад таго, «каб уволю наесціся жытняга свежага хлеба, накарміць сваю сямейку, адысці ад таго голаду, які быў, напрыклад, у папярэднія гады; выпадала абавязкова ўвабрацца ў сілу гаспадарам, іхнім дзецям, па-новаму ўзняць ці падтрымаць хатнюю жывёлу, бо і ад яе заўсёды таксама залежаў традыцыйны сялянскі дабрабыт».

Існавалі адвечныя народныя прыкметы, па якіх спрактыкаваныя вяскоўцы ўмелі (ці спрабавалі) вызначыць, які ён, ураджай, давядзецца на канец лета, калі надыдзе часіна жніва. Душа абавязкова радавалася, заўважаючы, як спорна ідзе ў рост жыта, як наліваюцца жытнёвыя каласы, але, адначасова, усё больш і больш трывогі ўбівалася ў сэрца, не давала спакойна спаць. Чалавек працы заўсёды баяўся прыроднай стыхіі: непагадзі, навальніцы з вятрамі ды праліўнымі даждкамі, празмернай засухі і г. д. Менавіта гэта ўсё магло знішчыць дазвання, прама на карані, прама на вачах, усё тое, што нейкі тыдзень таму абяцала быць добрым ураджаем. Сялянская будзённасць ніколі не была ад гэтага надзейна застрахавана. Вось таму і хваляваліся: і Богу маліліся, і на неба пастаянна ўзіраліся, «каб толькі якой груvasткай хмары з даждкамі-ліўнямі, а то і з градам, не прынесла, каб толькі сонца не падвяло, ды свяціла ласкава і з ветрыкам, бо са свайго боку сялянскія мазалістыя рукі ўсё зрабілі, як мае быць». Гэта і быў адвечны клопат земляроба: не толькі пасеяць, не толькі прапалоць, але яшчэ спадзявацца на дапамогу Неба, Усявышняга, Прыроды. Лічылася, што ва ўсім і паўсюдна чалавеку працы абавязкова дапамагае яшчэ адна, надзвычай магутная і ўсюдыісная сіла, якую яны і неяк, хоць бы даволі ўмоўна, не маглі абмаляваць, перадаць словамі. Затое цвёрда былі ўпэўнены і перакананы, што яна ёсць, прысутнічае і што да яе выпадае звяртацца за кожным разам. Гэта была своеасаблівая духоўная складаючая, вядучая глыбінныя карані з ранняга язычніцтва, няхай сабе ў нечым і празмерна прымітыўная, не вытрымліваючая рэальных тлумачэнняў, але яна, цвёрда быў перакананы продак, яго ніколі не падводзіла, не адварочвалася ад ягоных клопатаў і спадзяванняў. Таму ў яе існаванне неабходна было верыць. У крайнім выпадку, калі і закрадваліся нейкія сумненні, калі нешта “шкрабло на душы”, то ні ў якім разе не трэба было гэтага паказваць, выносіць на суд іншых; за лепшае лічылі прамаўчаць, каб не выклікаць нейкіх непажаданых непаразуменняў ці абвінавачванняў на свой адрас.

Нарэшце, жыта выспявала, паводле народнага календара, яго ўжо выпадала жаць. Звычайна тэрміны маглі разыходзіцца ўсяго на некальki дзён, у залежнасці ад ранейшых перападаў надвор'я, якое ўплывала на рост збажыны. Зноў звернемся да радкоў знаўцы народнага жыцця – Я. Коласа:

Цяпер увагу дайце хлебу, –
Сярпок крывенькі просіць дзела,
Жытцо падходзіць, пабялела.
Саломку выгнуўшы дугою,
Звісае колас над зямлёю,
А спела-поўныя зярняткі
Глядзяць, як спонкі-вачаняткі
Нібы ім хочацца хутчэй як
Спаткаць-убачыць мілых жнеек [7, с. 215–216].

Проста, будзённа пачынаецца жніво, як самая звычайная праца, толькі больш адказная і знясільваючая, якая "дазвання выцягне сокі з земляроба, дасца яму ў знакі на цэлы год". У Я. Купалы момант зажынак (аднайменны верш) паказаны больш узнёсла: адразу з вынікам усяго жніўнага працэсу:

Ляжа сноп у снапок,
Стане мэтлік, крыжок,
Не акіне і песня шнурка!
Будзе рад бедачок
Звозіць скарб у тачок, –
Вось яна, з мазалямі рука! [8, с. 79].

Замілаванасць да людзей, да іхняй цяжкай і выжыльваючай працы, да ўсяго таго, што яны рабілі, пастаянна выклікала пачуццё цеснай знітаванасці з прыродай. І атрымлівалася, што ўсё, выконваемае імі на ўлонні прыроды, спрыяла таму, што яшчэ больш спляталася жыццё вяскоўцаў з тым самым "патаемным подыхам далёкіх сіл, якія дапамагалі ў любым выпадку, не давалі апускаць рукі, а, наадварот, супакойвалі, пераконвалі, што і цяжкая праца ўсё роўна некалі канчаецца". Таму для жыхароў вёскі, напрыклад, жніво было своеасаблівым святам. Ад усяго патыхала гэтай святочнасцю: ад вопраткі (на цяжкую працу кіруюць жанчыны, а апрануты, то нібыта на кірмаш!); ад вясёлай гаманы, ад стракатасці фарбаў і г. д.:

Угрэла сонца. Жней чародкі
Ідуць паважна, як лябёдкі,
У хустках лёгкіх, кофты белы,
Іх рукі дужа загарэлы.
Ідуць дзяўчаты, маладзіцы
І жарты строяць, як блазніцы,
Ідуць шумлівы, гаварлівы,
Звініць іх голас, смех шчаслівы;

Чутна і песня маладая,
І поле раптам ажывае.
І мацяркі з дзяцьмі малымі
Ў лубках-калысках за плячыма –
Такая ты, жаноча доля, –
Марудна цягнуцца на поле.
Прыйшлі на вузкія загоны,
Дзе каласочкі шумы-звоны
У таямнічы спеў зліі,
Упаўшы чолам да зямлі [7, с. 216].

Вось так умела і хораша перадаў класік беларускай літаратуры выхад жаночай грамады, “настроенай на важную бітву-жніво”, на поле. І, магчыма, той, хто не зведаў, як гэта жаць уручную, як гэта разгінацца ў суткі ўсяго на некалькі гадзін, а потым зноў шчыраваць з сярпом, можа не ўлавіць не толькі ўсю адказнасць такога моманту, ягоную звышнастроенасць, але і не зразумець: у чым жа складанасць такой сітуацыі? Яна ж жыццёвая. А раз так, то ўсё ў людзей ідзе па-старому, пракладзеным продкамі шляхам. Затое хто сам жаў сярпом або хоць бы вязаў перавяслы і збіраў зжатае ў снапы, то той выдатна ўяўляе і па-новаму адчувае “былую” атмасферу. Мала ў ёй было зайздроснага: спёка, стома, салёны пот, гнюс. Здранцвелая спіна, дрыжачыя ад бяссілля рукі і ногі.

Ад гэтага стараліся таксама ратавацца, неяк пазбаўляцца фізічнай стомы. Прадугледзець магчымую траўму (хоць такога прадбачыць не мог і самы асцярожны знахар!), прытрымлівацца даўняй завядзёнкі ў плане распачынання працы, у тым, як зрабіць так, каб хоць крыху меней балелі рукі. Некалі мама гаварыла, відаць, навучала мяне, малога: «Сыночак, калі ідзеш у першы раз на жніво, то яшчэ ўдома абавязкова трэба перавязаць правую руку, ля кісці, чырвоным каснычком... Вузенькім такім, як звычайны шнурочак... Некалі яшчэ мая бабуля так мне самой казала: “Чырвоны каснычок – чырвоная кроў, а ён яе стрымлівае. Не дае магчымасці надта хутка кіпець, а значыцца, і стамляцца”. Яшчэ старая даводзіла, што калі вечарам пакратаць руку перад каснычком і ніжэй яго, то можна пераканацца, што вышэй рука ніколі не будзе гарачэйшай, чым ніжэй. Калі пачынаеш жаць, а потым займаешся гэтым пару тыдняў запар, то ў любыя перасцярогі паверыш. Адно толькі хочацца, каб не балелі рукі, каб была хоць нейкая палёгка». Такія сведчанні-навучанні былі распаўсюджаны па ўсёй тэрыторыі Беларусі (а то і свету, дзе толькі людзі жалі сярпамі). Напрыклад, А. Сержпутоўскі таксама прыгадваў амаль што аналагічнае: «Каб у жанцоў не балелі

рукі, зажынаючая жанчына абвязвае сваю правую руку чырвонаю ніткаю або жычкаю. Калі ж у каго з жанцоў забаліць рука, та той хутчэй абвязвае сабе руку чырвонаю ніткаю» [22, с. 97].

Былі і больш абагульненыя "жніўныя" прыкметы. Старыя жанчыны звычайна пераконвалі, што жаць трэба ў чырвонай хусцінцы, а мужчыны даводзілі сваё, што, працуючы на жніве, неабходна мець на сабе чырвоны паясок (магла быць і паска-палосачка): «Наша сядзіба на хутары была. Там зараз і месца таго не знойдзеш, бо затапілі яго, калі возера пашыралі. Ніва знаходзілася непадалёку. Зусім побач. З двара выйдзеш і ў край поля ўпіраешся. Таму далёка ісці не выпадала. Яно то і добра, бо і вадзіцы напіцца, і перакусіць, і, калі што якое, то і адпачыць дамоў хадзілі. Самую спёку можна было ў халадку перасядзець. А вечарам пазней папрацаваць. Выгода свая была. Старыя таксама з намі ішлі. Ім жа не сядзелася ў такі час. Смешна было глядзець, як бабуля павязвала старым-старую чырвоную хусцінку, а дзядуля даставаў чырвоны каснычок, які ў яго ў пячной кубачцы да гэтага ляжаў. Нам яны патлумачвалі, што гэтыя прадметы дапамагаюць целу. Не даюць яму празмерна стамляцца. Я пастаянна, калі жаць выходзіла, то перавязвала сабе правую руку, у якой серп трымала. Навяжу чырвоны каснычок, а пад самы вечар, здаецца, што ён яшчэ чырванейшым станавіўся. Можа, і праўда дапамагаў, а магчыма, што і ад поту набрыняў і прасольваўся дазвання. Старэйшыя ж верылі, то і мне хацелася, каб лягчэй працавалася, каб не такая дзікая стома навальвалася. Яно то, калі здаровы, ды нічога не баліць і ведаеш, што ў хаце ды па гаспадарцы нехта ўправіцца, дапаможа. То і жаць не страшна. Уцягнешся, спор надыйдзе і адно толькі душа радуецца, на ўсё навокал гледзячы, а, сыночак, яшчэ як спяваць пачнуць, дык не перадаць словамі: ні таго жалю, ні таго хараства і замілавання».

Зразумела, што тут ужо і пра жаночую долю падумаеш, і пра несправядлівасць сялянскага жыцця, і пра тое, як добра было ў дзяцінстве, калі не даводзілася мець клопатаў са жнівом:

Гарачы дзень! Эх, спёка, спёка!
А прахладзь вечара далёка.
Замлела ўсё ў жары-тамленні,
Зямля гарача і каменні;
А ўсюды ціха, нема, глуха,
І толькі заедзь каля вуха
Гудзе агідна, надаедна,
Бы сама наша доля бедна,
Ды дзіцянё з лубка-калыскі

Заводзіць плачы свае, піскі,
А кучаравыя снапочкі,
Над ім злучыўшы каласочкі,
Стаяць спакойна і маўкліва,
Бы кажуць жнейкам тым жычліва:
«Да нас ідзіце, дабрадзейкі!
Пад наш цянёк хавайцесь, жнейкі!» [7, с. 217].

Адметна тое, што як бы цяжка не было, але не чуліся праклёны (ці якія іншыя злосна-брыдкія словы) на адрас жніва, бо жніво заўсёды асацыіравалася толькі з святым хлебам. І нельга было, ні ў якім разе, лічыць гаспадарчыя справы выкананымі, калі заставалася хоць жменя стаячага ў полі жыта. Яго не выпадала пакінуць. Гэта быў вялікі, незамольны грэх! І любыя агаворкі тут не прымаліся. Такое лічылася пустаслоўем, а гаспадара такіх слоў заўсёды асацыіравалі з гультаём, абібокам, пустадомкам, які за лепшае лічыў пашукаць агаворку, каб толькі лішні раз не напнуцца, не давесці распачатую справу да лагічнага і практычнага завяршэння. Па-рознаму здаралася і падчас жніва. Усялякія і жнеі былі. Нездарма ж гавораць, што і не ўсе людзі роўныя. Так і тут. Асаблівае захапленне заўсёды выклікалі ў вясковак жнейкі “з лёгкімі рукамі”. У гэтае азначэнне ўкладвалася найперш тое, што гэтакія “жнейкі ніколі не адчувалі стомы ў руках і жалі надзвычай спрытна і ўмела”. Яны, звычайна, заўсёды зажыналі агульнае поле (раней – панскае, а пазней – калгаснае, бо працяглы час і ў абагуленых гаспадарках жалі далёка не машынамі: ручная праца доўга ішла паралельна з “крыху механізаванай”). А. Сержпутоўскі пісаў: «Зажынкі робяць у аўторак або чацвер (мужчынскія дні. – *А. Н.*, *Я. Н.*), та пагода будзе шанцаваць. Калі ж зажынаюць у суботу, та жанчыне не будзе балець сярэдзіна. Калі ж зажынаюць у п’ятніцу, то хаць мышы не будуць есці збожжа, але жніво вельмі доўга працягваецца, бо памяшае непагадзь» [22, с. 96].

У нас, памятаецца, не падбіралі асобныя дні, а арыентаваліся на надвор’е. Вядома, бо гэта была другая палова XX стагоддзя і, бясспрэчна, многае з патрыярхальна-прымхлівага ўжо назаўсёды адмерла. Маладзейшым не вельмі карцела карыстацца старымі павер’ямі і прыкметамі: на першае месца выступала звычайная практычнасць і імкненне, як мага хутчэй прыбраць ураджай.

Зажынкі – гэта быў не кароткачасовы акт пачатку працоўнага працэсу, а “размеранае”, спланаванае дзеянне. А. Сержпутоўскі прыгадваў: «Зажынкі робіць сама ці другая старшая жанчына. Яна чысценька ўмываецца, надзявае чыстую сарочку й святочную адзежку, бярэ з сабою хлеб, соль, сыр, хрэшчык, грамнічную свечку, вярбу й серп, каторы

часамі яшчэ абгартае свянцоным зеллем. Кала паўдня яна йдзе на поле, дзе расце жыта, залазіць у яго на два-тры шагі ад дарогі ці суваратаў, перахрысціўшыса да памаліўшыса, зажынае дзве жмені, каторыя кладзе на землю накрыж. Потым яна есць хлеб, соль і сыр і, нажаўшы маленькі снопік, нясе яго да хаты й ставіць на покуці пад абразамі. Палажаныя накрыж дзве жмені жыта ляжаць датуль, пакуль не кончаць жаць. Тагды забіраюць іх разам з тым снапком, што стаіць на покуці, выціраюць зярнята, свецяць іх і сыплюць у насенне, каб на другі год зарадзіло жыто» [22, с. 96].

Як бачым, жнеі толькі выйшлі на ніву, толькі распачынаюць справу, але сваімі думкамі яны ўжо далёка наперадзе: ім ужо мроіцца, што яны завяршаюць гэты адказны перыяд сялянскай справы, што яны ўжо ... пачынаюць "новую сяўбу на весну". Так вялося, што думаў вясковец не толькі пра ўчарашні дзень, не толькі пра сённяшні, але і пра заўтрашні – таксама. Нездарма ж сцвярджалі, што "дрэнны той гаспадар, які жыве адным днём".

Традыцыйнасць, у меншых ці ў большых памерах, усё роўна заставалася, яна прысутнічала, але зноў-жа яна ў многім залежала ад развіцця грамадства і ад свядомасці саміх людзей. Абавязкова звяртаецца ўвага на ўрачыстасць моманту, на ягоную гадавую значнасць, на адвечную сувязь жыта з жыццём. Гэта адзначалі ўсе – і вяскоўцы, і навукоўцы: «Жыто – самае старшае збожжа, бо з яго мы маем хлеб, а хлеб – бацько, хлебам жывуць людзі» [22, с. 96]. Святасць жыта і прымушала жнеяк не забывацца пра тое, што павінна прысутнічаць не толькі душэўная сакральнасць, але і фізічная, будзённая таксама: «Зажынаючая жанчына не толькі сама мыецца й абраджаецца па-святочнаму, але й у хаце мые лавы, стол, засцілае яго чыстым настольнікам, каб як трэба, як павінно быць, прыняць новага госця – Божы дар – новы хлеб» [22, с. 96].

Незабыўны Я. Купала па-свойму паказаў жніво. І, як нам падаецца, яно ў яго адлюстравана больш дэталізавана і з моцным уплывам псіхалагічнага аспекту, што сведчыць пра разуменне аўтарам сапраўднага значэння гэтай працы і тых спадзяванняў вяскоўцаў, якія на яе ўскладваліся. Вельмі многае, глыбінна-шчымлівае, запазычыў паэт з народнай вусна-паэтычнай творчасці, з народнага ўспрымання "міфалагізацыі" жніва, бо яно ў яго не праца, а "бітва", а жнейкі – гэта "раць", якая дружна ідзе змагацца на поле, перамагаць усялякія нягоды і цяжкасці, а жытнёвае поле – надзея на лепшае жыццё: з потам, з крывавымі мазалямі, але ўсё роўна толькі на лепшае. Інакш і быць не выпадае:

Красаваў, наліваўся
І даспеў шнур мужычы:
Час вам, жнейкі, на бітву!
Постаць кліча, ой, кліча.
Сонца ўзыйдзе і зайдзе,
Не кідае зямелькі,
Правядзе і спаткае
Ў поле, з поля вас, жнейкі.
Выйшлі з хатак за вёску,
Гнуцца, бедныя, ў полі,
Толькі песню чуваці
Іхняй долі-нядолі.
Жніце, жніце, галубкі,
Сваю радасць і слёзы!
Трэба многа нажаці –
Прыйдзе зімка, марозы:
...Ходзяць хмары па небе
З нейкай дзіўнай трывогай;
Чутна жнейкіна песня,
Нуды ў песні той многа [9, с. 137].

І тым не менней кантраснасць гэтая – святочнасць і надзвычай цяжкая будзённасць – вельмі ўражвала. Далёка не кожны раз даводзілася чуць, што праца – прыгожая, непаўторная, узвышаная. Праца, у нашым разуменні, яна і ёсць праца, але ж нельга забывацца, што такая праца, напрамую звязаная з ураджаем, хлебам, заўсёды стаяла на асобнай пазіцыі. Я. Колас ні ў чым не схібіў, калі распавёў пра сваё бачанне жніва (а яно ў яго, якраз-такі, і не адрознівалася ад народнага, сялянскага, старадаўняга). Не выключана, што і сам паэт прымаў непасрэдны ўдзел у жніве. У прыватнасці, на сваёй сядзібе, у самым цэнтры Мінска, ён штовесну сеяў некалькі жменяў зерня і сачыў за тым, як убіраецца ў "рост" збожжа, набірае сваю жыццёвую сілу. Ён мог і ў памяці вяртацца ў тыя незабыўныя дні выканання калектыўнай сялянскай працы:

Гарачы дзень. На полі душна.
Прыціх той ветрык непаслушны,
Яу бы сваім аддаўся марам.
Зацішак поля дыша варам
І гоніць з твару поту рагі,
І сохнуць губы ад той смагі.
А жнейкі жнуць. У моры збожжа
Мільгае постаць іх прыгожа,

Калі ў паверхні таго жыта
Ўсплыве галоўка самавіта
І так прыгожа азірнецца,
А гібкі станік разагнецца;
Або калі над галавою
У жнейкі спрытнаю рукою
Пучок калоссяў мільгатнецца,
Апіша дужку, бы вясёлку,
Бы нейкай znічкі след пагаслы,
І борзда ляжа ў перавяслы,
Што распасцёрты на падполку, –
Дапраўды: ўзмахаў гэтых мгненне –
Адна любота, заглядзенне! [7, с. 217].

З радкоў Я. Купалы пастаянна патыхае нейкай непрадбачанай сялянамі трагічнасцю, “вялікім сумам”, “самаацэнкай таго, што было, мінулася і што яшчэ чакае наперадзе”. Яно і не здзіўляе, на такім паказе адлюстроўвалася асабістае бачанне, уласна пражытае і ацэненае, вопыт свайго жыццёвага шляху. У Я. Купалы рана памёр бацька, і жніво таму параўноўвалася са шматлікімі сем’ямі, больш “поўнымі і больш шчаслівымі”, калі не выпадала хваляваццa за тое, як паспець сабраць саспелы жытнёвы ўраджай:

Годзе, жытцо маё, годзе, наспелае,
З хмарамі, з бурамі знацца, дружыць;
Годзе шумеці, думкі нясмелыя,
Годзе загоны сабой харашыць!
Жнеяў прыйшла во дружына вялікая,
З песняй за дзела ўзялася сваё;
Серп, як маланка, ўскок бегае, сыкае,
Глуха снапамі кладзецца жытцо.
Сталі ў калючым аржанні з павагаю
Мэтлікі шнурам адзін за адным;
Сэрца забілась надзеі адвагаю:
Ёсць на што глянуць, пацешыцца чым.
Эх, заплаці ж, дабрыцо, ты аратаму
За яго ў полі ўвесь труд над табой:
Дай ты багацце яму, небагатаму, –
З клець не зводзься ягонай пустой.
Хай яго збудуцца думкі, адналеча
Гэтулькі выцерпе, вынесе ён,
З году у год аручы, засяваючы,
Потам, крывёю абліты загон [9, с. 138].

Ёсць у Я. Купалы паэтычны твор “Жняя”, які асацыіруецца ў нашай свядомасці не з будзённымі, а з рамантычна-ўзнёслымі матывамі вусна-паэтычнай творчасці. І вобраз дзяўчыны-працаўніцы прыраўноўваецца класікам беларускай літаратуры да царыцы, пад рукамі якой раўнюткімі копкамі пакрываецца жытняя сялянская ніва. Яе, гэтую дзяўчыну, вітае шчыра ўся прырода: сонейка, ласкавы ветрык, шум-калыханне збажыны:

Як сама царыца
Ў залатой кароне,
Йдзе яна ў вяночку
Паміж спелых гоняў.
З каласкоў вяночак –
Маладасці сведка –
На ёй зіхаціцца,
Як у садзе кветка.
На грудзях шчаслівых
Каптанок ружовы,
У руцэ сярпочак
Зублены, сталёвы.
Вецер абнімае
Стан яе дзявочы,
Сонца ёй цалуе
Шыю, твар і вочы.
...А яна – царыца –
Весела, шчаслівa
Карануе песняй
Залатое жніва [9, с. 32–33].

Такі ясны, сонечны персанаж, непаўторна прыгожы ў сваёй маладой красе, сіле, можна сказаць, што і ў працоўнай магутнасці, патрабаваў і многіх рамантычных дэталяў у яго апісанні. Імі з’яўляюцца самыя звычайныя рэчы і прадметы. Нават “сярпок сталёвы” нагадвае сабою не агульнавядомую сельскагаспадарчую рэч, а нешта з міфічнага ўжытку язычніцкіх боствaў, і тое, што гэтакая жнейка здольная заняць там пачэснае месца. Паэт нікольні не сумняваецца ў такім меркаванні. Галоўнае, каб усё залежала не толькі ад чалавека-працаўніка, але яшчэ і ад акаляючых абставін. Усё ад таго ж надвор’я.

Звернемся да яшчэ аднаго твора Я. Купалы – “Над нівою ў непагоду”:

Постаць нязжатая слотамі гноіцца,
Птушкай цярэбіцца, ветрам малоціцца.
Колас сагнуўся, змяшаўся з гразёй;
Зжатыя снопікі ў мэтлях валяюцца,
Віхрам зрываюцца, зерне зрастаецца...
Як жа ты, шнур наш, глядзіш сіратой!
Столькі і працы, і поту загнанымі
Ўложана ў ніву скупую сялянамі,
Столькі пайшло ўздыхання, мальбы!
Гляньце – ўсё нішчыцца злой непагодаю,
Неба не зжаліцца над зямлі ўродаю,
Неба не чуе ні скарг, ні кляцьбы [9, с. 139].

Жальба хлебароба распасціраецца па наваколлі, а на душы ў вяскоўца выспела даўняя, вядомая дазвання, думка: а што ж будзе далей? Гэта ж голад, немінучы голад, які пацягне за сабою гэтулькі непрыемнасцей у будучым жыцці. І здарыцца гэта вельмі хутка. Голад – гэта і хваробы, і заўчасныя смерці, і слёзы адчаю, бяссілля. Асабліва страшна, калі галадаюць дзеці, якія глядзяць тады ўмольна на дарослых сваімі жаллівымі вачанятамі. Гэта выдатна памяталася Я. Купалу:

Белай пялёнкаю снег разлягаецца,
З гікам мяцеліца дзіка ўздымаецца,
Ў сцены бязлітасна валіць мароз...
Дзе тут схавацiся, дзе прытуліціся?
Дзе на кусок хлеба ў сцюжу разжыціся?
Божа... а слёз тых, о, колькі тых слёз! [9, с. 139].

У іншага класіка – Я. Коласа – ёсць надзвычай шчымлівы верш – “Жытні колас”, які трапіў у ягоную творчасць не толькі з народнага разумення і адчування жніва, але і з матываў рускай класічнай літаратуры, якія актыўна пераймаў наш малады паэт напачатку сваёй творчасці:

Сушыць яго сонца,
Хіліць вецярок.
Ные сірацінка,
Плача каласок.
Плача, што няма з кім
Думку падзяліць,
Смутную галоўку
Ціха прытуліць [6, с. 99].

Мама некалі надта любіла паўтараць, што «жаць асабліва добра тады, калі спор пойдзе... У такія часіны адна добрая жняя лёгка можа

справіцца з некалькімі... Толькі сярпок яе мільгае, толькі жмені жыта кладуцца на паўснапкі... Снапы ж не адразу звязваюць, збожжу даюць час паляжаць на жніўі, прысохнуць-прывянуць, адысці ад ранішняй расы... Жаць намнога цяжэй, а вязаць снапы крыху лягчэй... Там жа можна разагнуцца і стоячы спакойна сабе вязаць перавясла... Звязаў яго, азірнуўся і толькі потым за сноп бярэшся... Так навучыліся жнейкі адпачываць крыху і падчас складанай працы... А яшчэ, надта асцерагаліся людзі заўсёды за зажынаючых жанчын. Здаўна гаварылі, што яны не мелі права ў той дзень ні з кім ні сварыцца, ні лаяцца, ні прыгадваць некаму старыя грахі, бо пры жніве ўсё гэта імгненна аддасцца. Такая жанчына павінна была не лезці наперад (але і не адставаць), трымацца спакойна, горда (але не ганарліва), адчуваць усю адказнасць, якая легла на яе пры зажынках».

Адносна "спору", "спаравання" знаходзім звесткі ў многіх даследчыкаў беларускага фальклору: «Цэнтральнай для жніва становіцца ідэя спору, сытнасці, увасабленне якой магчымае і праз прадметны сімвал (колас-спарыш, апошні сноп, барада і г. д.), і ў сістэме міфічных вобразаў. Спарыш, Спешка-Спарышка залічваецца да апякунак жніва. Яна быццам прылятае "з белым ветрыкам, на белым матыльчыку" і дапамагае ў працы. У аснове вобраза Спарыша – Бога ўрадлівасці і дастатку – ляжаць язычніцкія ўяўленні аб продках, ад якіх залежаў дабрабыт земляроба...» [2, с. 489].

Праўда, у гэтым выказванні надзвычай завуалявана значэнне Спарыша (і яно моцна ўзвышана, бо тут Спарыш – "бог урадлівасці і дастатку"), а ў нашым разуменні і ў тлумачэнні нашых інфарматараў «спор – гэта калі табе пачынаецца працаваць надта хутка і спорна, не адчуваеш тады асаблівай стомы, толькі жыхаеш сярпом і валіш збожжа сноп за снапом... Спор – ён нежывы, ён знаходзіцца, сядзіць у кожным чалавеку і прачынаецца ў нейкі адказны момант... Не выключана, што спор з'яўляецца тады, калі жняя "ўвабралася ў сілу, прыжалася ў значнай ступені" і не адчувае такой стомы і знясілення, як раней... На яе нешта найшло і гэтае нешта часцей за ўсё звязвалася са спорам...».

Бабуля, якая не ведала ніякай граматы, пераканаўча сведчыла, што «спор – гэта калі ты пачынаеш працаваць, нібы заведзены...». Няма ў табе стомы і ты жнеш, не разгінаючыся, не спыняючыся, чым выклікаеш зайздрасць суседак. Тыя потым так і гаварылі, што «ў яе спор увайшоў... сёння ён ёй дапамагае і з такой жняёю няма чаго і спрабаваць зжынацца... яна ўсё роўна перагоніць усіх астатніх... у такі час цела жняі нібы дзеравянее і становіцца непрыступным для стомы і нават – для болю... спор такая сіла, якая можа многае пераадолець...

калі жняі на ўсё жніво выпадае некалькі такіх спорных дзён, то гэта вялікае шанцаванне. Найчасцей здараецца, што ўвогуле пра ніякі спор і гаворка не заходзіць...».

А. Сержпутоўскі прыводзіць у сваёй працы шматлікія перасцярогі, якімі неабходна, паводле народнага светапогляду, карыстацца зажынаючай гаспадыні, на якую ў той дзень ускладваліся заўсёды асаблівыя спадзяванні і надзеі: «Зажынаючая жанчына, як ідзе зажынаць жыта, та вельмі сцеражэцца, каб хто не перайшоў дарогу з пустым вядром, бо жыта будзе пустое, мало ўмалотнае ці ў сям'і стрэне якое-небудзь другое ліхо.

Як жанчына йдзе зажынаць жыто, та яна павінна асцерагацца, каб ні з кім не затрымацца на дарозе, бо пры жніве будуць усялякія затрымання.

Зажынаючая жанчына не павінна ні з кім гаманіць, а лепш моўчкі рабіць свае дзело, каб у жніво не было ні якае перашкоды і каб людзі не званілі ды не часалі языкоў» [22, с. 96].

Дзед гаварыў, што «ў жніво трэба на сваю ніву выбірацца як мага раней. Адправіць хоць некага першым з сям'і. Робіцца гэта для таго, каб тыя, хто будзе дабірацца пазней, праходзячы міма, гаварылі такой гаспадыні: "Памагай Бог!". Гэтым самым, атрымліваецца, яна, знаходзячыся на ўласным загоне, "спор" ад людзей збірае. А той "спор" вельмі спрыяе ў працы. У жніво без такой хітрасці нельга. Пра тую своеасаблівую хітрасць маладзейшых заўсёды навучалі старэйшыя людзі, якія ўсё дазвання ведалі пра жніво, пра тое, як там асцерагацца ад чужых позіркаў, чорных слоў, ад выпадковых парэзаў, усемагчымых калецтваў. З такімі ведамі гаспадыня нідзе і ніколі не прападзе і не адстане ад іншых. Не яна, а ёй, будуць па-добраму зайздросціць жнейкі, якія стануць казаць, што яна – найлепшая, наймайстравіцейшая сярод іх».

Асаблівая ўвага ў жніво ва ўсе часы надавалася сярпу (сярпочку, серпейку, сярпеньку), на якога спадзяваліся, што гэты «сталёвы памочнік не падвядзе, не схібіць, а будзе рэзаць і рэзаць сваімі вострымі зубчыкамі жыта, падбіраючы яго жменя за жменяй, няхай сабе і надзвычай марудна, але набліжаючы жанцоў да дажынак, да найшчаслівейшага моманту завяршэння новага ўраджаю».

І тут таксама было шмат усялякіх перасцярог адносна паводзін жнейкі падчас жніва. Сцвярджалася, што гэта заснавана на пільных назіраннях людзей працы за тым, як такія "адхіленні" ад традыцыйнага жніва могуць потым "дацца ў знакі" вяскоўкам. Найперш ім, бо жніво і асацыіравалася цвёрда з жанчынай (жанчынамі). А. Сержпутоўскі запэўніваў: «Жнучы, як трэба пастаяць ці зкруціць перавясло, та не можна

ўбіваць сярпа ў зямлю, а трэба яго вешаць сабе на плячо або на што другое, бо нячысцік хопіць серп і наробіць на ём псоты, так што той серп будзе рэзаць рукі.

Калі хто пяройдзе паміж постаццю і жанцом, та ён пашкодзіць таму жанцу тым, што ён парэжа сабе рукі.

Не можна перадаваць сярпа з рук у рукі, а трэба яго кінуць на зямлю ці палажыць на сноп, бо тыя жанкі хутко пасварацца адна з другою.

Як задасца ліхі серп і ім жанчына абрэжа руку, та яго трэба занесці да каваля, каб ён ачысціў серп ў горні й зноў назубіў яго.

Сярпом не можна кроіць хлеба, бо той серп будзе рэзаць рукі.

Не можна пераступаць цераз серп, бо такім сярпом будуць жанцэ рэзаць сабе рукі» [22, с. 97].

Многае, вельмі многае спрадвеку назапашвалі ў сваёй памяці нашы продкі. Што толькі яны туды не ўбіралі! Здавалася б, што, з аднаго боку, гэта было надзвычай прымхлівае, непраўдзівае, а з другога – нібыта вяртала ў старажытнае язычніцтва, калі чалавек і прырода былі непадзельныя, жылі адной, супольнай душою. Чым іншым выпадае растлумачваць пэўныя народныя павер'і, а то і прымхі ды забабоны: "Каб не балела сярэдзіна, жанчына як першы раз пойдзе жаць, робіць сабе пояс з пераўясла да й падпяразваецца так, каб каласы былі ззаду. Яшчэ лепш, калі тая жанчына раздзенецца, бы маці радзіла да так і пажне цэлы дзень" [22, с. 97]. Канешне, тое, што старажытныя людзі, займаючыся земляробствам, у канкрэтных выпадках баючыся парушыць сакральнасць зямлі, распраналіся дагала і так "зачыналі" працу (сяўбу агуркоў, бульбы, зерня і г. д.), доўга непарушна захоўвалася ў народзе і ўжывалася на практыцы недзе яшчэ ў 20–30-я гады XX стагоддзя – неаспрэчны факт. Праўда, найбольш прымхлівае, архаічнае, а то і чыста цемрашальскае адмірала, адыходзіла, заставалася толькі ва ўспамінах і фіксавалася даследчыкамі як рэлікты мінуўшчыны.

«Павер'і, звязаныя са жнівом, прадстаюць у непадзельным адзінстве з адпаведнымі магічнымі рытуальнымі дзеямі. Час уборкі ўраджаю быў адзначаны пэўнай адкрытасцю, а адпаведна, актывізацыяй духаў і дэманаў. У гэты час забаранялася расказваць казкі, непажаданымі лічыліся сямейныя ўрачыстасці (выраз "жаніўся, як жыта жалі" пра чалавека, што дзейнічае неабдумана, заганна). Усё было накіравана на дасягненне адной мэты: сабраць ураджай і забяспечыць плён на наступны год. Гэтай мэце падпарадкоўвалася і выкарыстанне матываў вясельнай абраднасці. Эратычныя элементы (эратычная сімволіка барады, варожбы, песенная вобразнасць – "Як пан паню абдыме, так такое жыта мае" і інш.) з іх агульнай ідэяй урадлівасці першасныя, "нату-

ральныя" ў абрадзе, вясельныя – больш познія, хоць і не чужыя. Значнае месца ў сістэме жніўных уяўленняў займаюць элементы культу продкаў. Верылі, што поспех у жніве залежыць ад апякунства продкаў, якія ў сваю чаргу патрабавалі адказных захадаў на працягу года. На Каляды жанчыны імкнуліся зачарпнуць няпоўныя тры лыжкі куцці, каб у час жніва на іх долю выпала менш працы. Як месца і сродак кантакту з "тым" светам выступае дажынкавая барада, што мела назвы "дзед", "дзедава барада" і г. д. Пасля заходу сонца забаранялася жаць, не дазвалялі спаць на ніве і інш.» [2, с. 488].

Нашы вяскоўцы, з якімі даводзілася гутарыць, амаль аднагалосна сцвярджалі, што «сон на жніўнай паласе – не надта добрая справа». Яшчэ калі жняя засынала днём, падчас кароткага адпачынку, то гэта амаль правілою і не лічылася. Там у чалавека ўсё атрымлівалася міжволі: такая ўжо стома, такая ўжо млявасць навалілася, што сон сам напаў, нібы нейкім туманам напусціўся. Таму і заснула прама на сырой зямлі. Іншае, зусім іншае гаварылі пра тых, хто не слухаўся парад і спецыяльна ўкладваўся спаць. Мала гэтага, яшчэ і адмахвалася грэбліва ад такога папярэджання, ад таго, што можа "ўсю за такі сон на палетку скруціць". Гаварылі і пра тое, што калі аслухацца і заснуць на ніве, то стануць пастаянна сніцца ўсялякія страшныя і пачварныя сны, якія не будуць даваць спакойна адпачываць непаслухмянай жанчыне. Звядзецца хутка, знясілее і абвяне, нібы якая лугавая кветка падчас спёкі. Сон, нават кароткі, нават урывачны, павінен быць абавязкова здаровы, моцны, а калі ён страхлівы, то «гэта не да здароўя».

Звярталі ўвагу і на тое, калі нейкая з сялянак старалася жаць сваю ніву пасля заходу сонца. У народзе заўсёды лічылася, што светлавы час – гэта чалавечы, а начны – гэта "чарцячы". Ні ў якім разе нельга было ўлазіць у чужую, асабліва дэманалагічную прастору, парушаць яе межы. Атрымлівалася, што людзі здаўна дамаўляліся з нячысцікамі і імкнуліся болей не нарывацца на абвастрэнне адносін, няхай сабе, і з чарцямі. Хапала вяскоўцам і іншых праблем, акрамя гэтых. Тым болей, што іх лёгка можна было абмінуць, пазбегнуць такой недарэчнасці: «Неабвольна нашы людзі глядзелі на тых, хто не слухаўся і ўсё роўна стараўся нешта парушаць на жніве. Іх лішні раз перасцерагалі, але такія перасцярогі дурням і дурніцам не заўсёды адкрывалі вочы. Сонца ўжо за лес села і на ноч паказвае. На вечар, то зразумела: тут можна пастарацца якую гадзінку, а вось на ноч, то там выпадала прыспешвацца і кіраваць дамоў. Нездарма ж гаварылі продкі, што "ў Бога дзён многа", колькі б тае працы не было, а ўсё паспееш зрабіць, бо Богам яно ж спланавана. А некаторыя толькі пахваляюцца, што ў такі час

і жаць добра: і прахалода ўпала, і ветру няма: жні сабе ды ад гнюсу адмахвайся. І пра такіх працаўнікоў у нас казалі здаўна: "Людзі спаці, а сава – жаці". Сцвярджалі, што калі нехта такое ўчыніць, то яго потым нячыстая сіла дамоў не пускае і па палетках да самага рання водзіць. Такое пакаранне на іхні лёс выпадае».

Яшчэ калі жнеі жалі свае палоскі (загоны), то гэта не так было заўважна, а вось калі наймаліся ці раней ішлі на прыгон, а пазней – на калгасныя палеткі, дзе іх ставілі ("выстаўлялі") жаць клінам-ланцугом, а то і ўвогуле ў адну лінію, то станавілася ясна, «як і якая майстрыца тут увіхаецца». Зразумела, што ўсе аднолькава жаць не маглі: і з-за сваіх фізічных магчымасцей, і ў залежнасці ад майстравітасці, практычнасці. Таму і адставалі адна ад другой жнеі, таму і лаяліся, што «я намнога болей за дзень сажну, а ты працаваць не стараешся, затое ад стала не адагнаць...». Часта спорнай працы не спрыялі шматлікія хваробы, якія тады нікім (маецца на ўвазе з прафесійных медыкаў) не лячыліся: «усё ішло, як ішло, адпускалася на самацёк... таму і паміралі людзі заўчасна... звычайна пра такіх гаротнікаў-працаўнікоў і гаварылі, "што ён і не ляжаў, а амаль што на сваіх нагах памёр". Затое нам тут бачыцца зусім іншае: чалавек пакутаваў, трываў боль да апошняй хвіліны, ажно пакуль неяк усё ж мог самастойна ступіць... усё ў працы і ў працы... ужо ледзьве дыхаў, а ўсё роўна пёрся сваім хоць нечым дапамагаць... думаў, што праца падлечыць... не, такога ніколі не было: праца нікога на ногі не ставіла, а, наадварот, заўчасна ў магілу зводзіла...».

Затое даставалася лянотным жнейкам. Гэтым ніхто асабліва не спачуваў і не шкадаваў іх. Калі толькі глядзелі пры выпадку, як "гаравала" такая жанчына, то вяскоўцы тады паміж сабою параготвалі: «Зноў Ганне "Сідар" на спіну сеў... За цэлы дзень, а ўсяго нейкі дзясятак снапоў нажала... І што гэтай дурніцы перашкаджае? Надвор'е ж стаіць добрае: і не спёка, і ветрык патыхае, і дажджу няма. Працуй сабе ў асалоду, ды, адначасова, не забывайся і пра тое, што летні спрыяльны час таксама кароткі. А ўб'ецца непагадзь, то ніякага ўраджаю ўвогуле не збярэш. Гэтая ж працуе, як гнілое гарыць: махне адзін раз сярпом і пастаіць з паўгадзіны, нібы нешта абдумвае. Каб хоць не заснула стоячы, як тая старая кабыла ў возе. Колькі ўжо яе муж ганяе-лупцуе, а ёй, што ў парожняе ліць: ніякага толку, ніякай карысці. Як хто іншы паспрабуе прысароміць-прыстыдзіць, то ў яе тысяча агаворак знойдзецца: што і хворая, і слабая, што і баліць сярэдзіна, што і спіна не гнецца, не выпрамляецца. А самае галоўнае, чым адрэжа – зраблю, куды я не паспела, не ваша ж у полі збожжа стаіць нязжатае, а маё... Я ж да вас не лезу, чаго вы затое да мяне пастаянна торкаецеся?».

Гэта нібыта адна з такіх жней яшчэ і пахвалялася пазней перад суседкамі, а пахвальба тая ў народную песню ўвайшла-перабралася ды так у ёй і засталася назаўсёды: «А я жыта не жала, у баразёнцы ляжала...». У нашай вёсцы пастаянна прыгадвалі, як нейкая Нінка пайшла на другі дзень пасля вяселля (адны дадумаліся вяселле падчас жніва наладжваць, а другая з “хворай” галавой і “запалым арганізмам” на ніву з сярпом сунуцца) жыта жаць і ... прапала. Нават вечарам дамоў не прыйшла. Тады муж, разам з суседзямі, арганізаваў “пошукі”. Што, як гаворыцца, шукалі – тое і знайшлі, за што бароліся – на тое і напароліся. Нінка, атрымалася, толькі сноп і нажала, а потым ля яго і завалілася спаць. Ды так ужо яе “разабрала”, што і не заўважыла, як даўжэзны светлавы дзень праспала. Калі яе будзілі, то нават нагамі адбівалася, каб не перашкаджалі ёй “далей жаць”. Муж потым няўцямна круціў галавою і ўсё працягваў здзіўляцца: «Гэта ж, мабыць, з сабою яшчэ гляк прыхапіла, бо на цвярозую галаву чалавек гэтулькі не тое, што праспіць, а і не вылежыць...».

Нельга забывацца і пра тое, што нават ежа, якую бралі з сабою жнейкі на ніўкі, была традыцыйнай, пра што звычайна і гаварылася: «Жанчына (ці дзяўчына) з сабою бярэ на полудзень тое, чым хата багата. Іншая справа, што на такія цяжкія сезонныя работы заранёў пакідалася нешта з лепшых прыпасаў, якія стараліся не расходаваць у звычайныя дні. Вядома, што абавязкова быў хлеб і сыр, а яшчэ стараліся ўзяць што-небудзь скаромнае (кавалачак сала, мяса ці якой рыбіны), “каб лягчэй працавалася, каб сіла ў целе захоўвалася даўжэй”. Старэйшыя казалі, што на жніўнае поле заўсёды выносілі з хат і косці, якія спецыяльна збіралі і не выкідвалі на сметнік. А тут прыносілі і закопвалі, як “пачостку маці-зямлі”. Працаўнікі заўсёды думалі, як аддзячыць сваю адвечную карміцельку. У першыя тры дні з хаты абавязкова прыносілі густа звараную кашу. Гушчыня стравы павінна была сведчыць пра тое, якога ўраджаю сабе жадаюць гаспадыні. У першы дзень прыносілі крыху гарэлкі, якую самі жнеі толькі прыгублялі, а астатнюю стараліся выліць на стаячыя каласы. Гарэлка не заўсёды лічылася нейкай абавязковай стравай ці напіткам. Яе бралі толькі для таго, каб захаваць даўнейшае стаўленне да зямлі, да пачосткі, да рытуальнасці. На жніве ніхто не імкнуўся піць гарэлку, бо гэта было небяспечна як для справы, так і для здароўя. Паспрабуйце, выпіўшы, папрацаваць потым на санцапёку. Самы моцны чалавек і той не вытрымае, а што гаварыць пра жанчын».

Некаторыя пацвярджалі, што традыцыйныя стравы (кашу, сыр, тварог) елі толькі ў дзень зажынак ці ў першыя тры дні, а потым ужо ўсё

перайначвалася, бо «дзе ж ты таго смачнага набярэшся, калі жніво такая часіна, дзе і спёка не дасць захаваць асабліва скаромніну, каб яе ўжываць: у гарачыню, не салёная крута, яна паслізне і есці яе будзе немагчыма, а калі моцна пасоліш, то вады потым абап'ешся. Нездарма ж у народзе казалі: "Хто падчас жніва п'е многа вады, то той сабе шукае рознай бяды". Іншыя звярталі ўвагу на тое, што вада нібыта і крыху ўзбуджае, але яна не дадае сілы, наадварот, забірае іх, ды і хваробы ўсялякія з вадою вельмі лёгка на людзей перакідваюцца. У такую гарачыню не вытрымае жнейка, нап'ецца халоднай вады, каб астудзіць цела, і атрымаецца, што моцна застудзіцца, а то і, папапіўшы вады ў вялікай колькасці, учыніць усемагчымыя праблемы са страўнікам ці з жыватом. Таму і пілі, і елі тое, што было заўсёды ў хаце. Вядомая справа, што скаромніна сілу падтрымлівае, але ў гарачыню ды ад той страшэннай стомы і ўвогуле есці не хацелася. Адно што жадалася – гэта адпачыць. Хоць якіх лішніх пару хвілін. Здаецца, паляжыш ці пасядзіш спакойна і далей усё пойдзе значна хутчэй і спарней».

Сапраўды, многае тычылася практычнага боку жніва, прыёмаў працы, падрыхтоўкі і вырабу прылад працы (сярпоў, кос, вілаў, якімі пастаянна карысталіся на нівах). Вядома ж, ні ў якім разе не забываліся абмовіцца аб тым, што жанчыны-жнеі не павінны "заводзіцца", спрачацца, лаяцца, бо жніво – справа святая, і калі нехта не ўтрымаецца, то тады надоўга застанецца на "языку" ў вясковых вастрасловаў: «Трэба асцерагацца, каб, жнучы, дзве жанчыны не бразнулі сярпом аб серп, бо пра іх ліхія жанкі будуць судачыць» [22, с. 97].

Паводле народных прыкмет вынікала, што калі жнеі ішлі на працу, то павінны былі «па магчымасці, прыветна ўсім усміхацца, ласкава гаварыць і не злавацца на тое, што іх, быццам бы, нехта спецыяльна прытрымлівае, не дае магчымасці, як мага хутчэй дабегчы да свае нівы, да свайго загона. А калі жняя ішла не адна, а несла з сабою калыску, то такой гаспадыні, звычайна, жадалі сілы і здароўя яе немаўляці: каб яно крэпка спала, гулялася і ад працы не вельмі адрывала; каб за час жніва "на цэлую галаву вырасла", каб "спор" ёй ва ўсім спрыяў, ды каб рукі "не ажмяняла і не рэзала". Іншыя даводзілі, што калі маці з калыскаю на поле прыйшла, то яна не адразу яе ўмацоўвала-ставіла, а спачатку павінна была нажаць і звязаць добры сноп жыта, паставіць яго "на папа" і толькі потым займацца калыскай. Так у нас казалі трэба рабіць для таго, каб у немаўляці быў зацішак і цянёк ад жытняга снапа, які тут ужо выступаў надзейнай засцярогай ад усяго самага ліхога, што можа здарыцца падчас працы. Асабліва важна гэта было не забыцца пастроіць усё па парадку на той ніве, дзе паблізу не было кустоўя, а на-

вакол адсвечвалі толькі суседскія загоны. Нават гляк з вадою, які неслі з дому, выпадала паставіць пад першы зжаты на полі сноп. Калі зробіш па-іншаму, то вада адразу моцна нагрэецца і не будзе захоўваць ніякай здаравушчай сілы».

Першы сноп выступаў своеасаблівай засцярогай, у народным уяўленні меў пэўную магічную сілу, якая падтрымлівала жнейку, аберагала яе і дзіця, дазваляла даўжэй захоўваць нестамляльнасць: «Як толькі жняя нажне сноп, яна яго ставіць сярод загона й тагды кладзе пад снопам дзіця ці яду або ставіць ваду, потым складвае бабку ці хрэшчык і ўсе тое пераносіць туды. Снапоў не можна класці на мяжу або на разору, каб там не прыдушыць нячысціка, а то ён будзе мсціцца й рабіць усялякую псоту» [22, с. 97–98].

Не выпадала хавацца вяскоўкам у такі адказны момант – збожжа ў полі заўсёды прыносіла хлебаробам вялікія хваляванні і перажыванні. Нават у паселішчах у такі час амаль немагчыма было сустрэць дарослых людзей, адно толькі малыя гуляліся ды старым-старыя яшчэ сядзелі на прызбах, прыглядваючы за ўнукамі. Калі пыталіся: «Дзе ж усе сяляне і сялянкі?». Сцішана, абавязкова сцішана адказвалі: «А на жніве... Жніво ў нас зараз... Яно займае да сябе ўсё і ўсіх...»:

А жнейкі жнуць. Іх твар палае,
Іх пражыць, сушыць смага тая,
Якую трудна ім здаволіць,
Якая толькі «піць! Піць!» моліць.
Сярпок скрыгоча прагавіта,
Жытцо згрызаючы сярдзіта,
Як бы яму ўсё мала стравы –
Нядарма ж вылез ён з-за лавы;
Цяпер яго краса-часіна:
Шпарчэй, шпарчэй жа гніся, спіна!
І спіны гнуцца, бы ныраюць;
Па струнах-кальвах пальцы граюць,
Напрост кладуцца жмені жыта,
Растуць снапочкі самавіта,
Стаяць, бы лялечкі якія,
Глядзяць, як госці дарагія [7, с. 217–218].

У Я. Коласа сустракаюцца і зусім іншыя, цалкам адваротныя, сцэны з сялянскага жніва, у якіх, бясспрэчна, падкрэсліваецца не рамантычна-ўзнёслы характар гэтай працы, а яе надзвычайная напружанасць, празмернае выжыльванне, “змаганне” на ўзроўні “змагу і не змагу”, імпульсіўна пульсуючае з свядомасці кожнай жнейкі: дажаць сваю

ніўку, прыбраць "свой хлеб – божы дарунак". А тое, што многае было наканавана не толькі з неба, але і іншымі, у тым ліку і будзённымі, справамі, гэта агульнавядомы факт:

Рэдкае збожжа, травы палавіна.
Колас не гнецца зярном да зямлі.
Знаць нешчаслівa была та часіна,
Як кідалі зерне сяўцы па раллі.
Выйшлі на поле вось жнеі з сярпамі,
Ў лапцях лазовых, а хто без лапцей;
Ніва пустымі шуміць каласамі,
Ніва не цешыць жаночых вачэй.
Цяжка ўздыхнуўшы, збанкі пастаўлялі,
Клункі на межы паклалі жанкі.
Бабы старыя свой твар пажагналі,
Моўчкі за працу ўзяліся дзяўкі.
Горача ў полі. Эх, жар дакучае,
Праца марудна, бясконца, цяжка!
Спіну і плечы іх боль адбірае,
Аж дзервянее у жнеек рука.
Збэрсана жыта, чапляецца колас;
Жменю нажне – разагнецца жняя,
Жыта паложыць на скручаны пояс...
Цяжкая, жнейка, работа твая! [6, с. 79].

У пісьменніка І. Мележа ў рамане "Людзі на балоце" нават не адчуваецца нейкай узнёсласці, рамантычнасці пры апісанні жніва ў палескай вёсцы Курані. Жніво падаецца як непазбежная, але надзвычай адказная і важная праца: «Ішоў жнівень. Дні плылі спякотныя, неба глыбілася нязмерна высокае, неабсяжнае, сонца зіхацела нясцерпна іскрыстым кругам. Трава на вільготных узлессях, купы і купкі хмызняку на падсохлых узболатках, асіны каля цагельні былі ў пары самага росквіту. Узлессі, палянкі поўніў неўтаймоўны, руплівы гул, звон незлічоных дробных насельнікаў добра ўвагрэтай зямлі. Звон гэты і шматгалосы птушыны спеў у шчодрых, пранізлівых сонцам зарасніках сплеценага галля і лісця чуліся тут цудоўнай песняй жніўня.

Поле жыло ўжо іншым настроем, ціхай, шчымлівай журбою. Журба гэтая ішла не толькі ад таго, што поле галела, што ў ім адчуваўся нядобры, пагібельны подых недалёкай восені. Знакі звядання там і тут прыкметна прабіваліся ўжо і ў лесе. Чэзлыя, рэдкія бабкі, што нядружна ўставалі пад сумныя, падобныя на ціхае галашэнне песні жанок жней, былі як страшныя знакі марнасці, няспраўджанасці чалавечых надзей.

Сіратлівыя бабкі гэтыя выглядам сваім як бы казалі: вось усё, на большае неспадзявайся, большага не будзе, гэта ўсё, чым магла адплаціць за працу няшчодрая на аддарункі тутэйшая зямля...» [13, с. 216–217].

Э. Яленская адзначала: «Жнівом жа займаюцца выключна жанчыны, хіба толькі вязаць і складваць снапы бяруць якога-небудзь хлопца. Снапы складваюць па 10 штук разам, і гэта называецца *мар'янка*, шэсць мар'янак утвараюць капу. Гэтак і лічаць, бо амаль ніводная не ўмее лічыць больш як да сарака» [27, с. 19]. Прыгадаем яшчэ і тое, што акрамя мар'янкі сустракаліся назвы *мэтлік* і *дзясятак*. У прыватнасці, на Пінскім Палессі існавала менавіта апошняе азначэнне ды яшчэ капа. Так яно і вялося ў нашых продкаў здавён: сноп, дзясятак, капа, стог, торп, сціртa. Усё гэта характэрна было для жыта, а не для вызначэння колькасці сена. Калі надараўся добры (ці асабліва добры!) ураджай, то так і зазначалі: «Дзякуй Богу, у гэтым годзе нажалі і навазілі цэлую сціртy снапоў».

Цікава і тое, як разумеецца слова "сціртa" ў пэўным кантэксце: «Сціртa: 1) невялікая пабудова для захавання снапоў перад абмалотам і сена. Памеры ў плане не больш як 3 на 3 м, таму кампазіцыя будынка атрымлівае вертыкальнае развіццё. Канструкцыя каркасная, аснову яе складаюць 4 слупы, укапаныя ў зямлю па вуглах. Сцены абшывалі дошкамі, гарбылямі. Падлогу прыпаднімалі над зямлёю. Уваход у С. толькі па драбінах. Страха заўсёды двухсхільная. Ставілі С. звычайна ў садзе ці на агародзе. У наш час С. захаваліся ў Ваўкавыскім і Зэльвенскім р-нах; 2) вялікі, звычайна прадаўгаваты стог сена, саломы або снапоў збожжа для захавання пад адкрытым небам» [2, с. 484].

# СТРАШЛІВАЯ ЗАЛОМКА

Нельга, распавядаючы пра жніво, прайсці міма тэмы завіткі, якая ў народным усведамленні заўсёды асацыіравалася з самым моцным "заломам" ("падробам","паддзелам", "падстройкай"). Галоўнае заключалася ў тым, што ад яе нельга было пазбавіцца без удзелу надзвычай моцнага знахара. Заўважыўшы завітку, самі нават не спрабавалі падыходзіць да яе, пачынаць працу, а адразу пасылалі за чалавекам, пра якога ў наваколлі сцвярджалі, што «ён усялякае ліха зводзіць і ад завіткі дапаможа, проста іграючы, на яго чаруючая сіла тых сплеценых каласоў не ўплывае...». Даводзіцца проста здзіўляцца – гэта ж колькі пакаленняў простых вяскоўцаў працягвалі верыць (галоўнае, што амаль не сумняваючыся) у страшную сілу "падробу".

Э. Яленская даволі падрабязна апісала значэнне і працэс пазбаўлення ад "падстройкі": «Аднак самая страшная помста – гэта *завітка*. Яна выклікае панічны страх і неапісальную пагрозу. Трэба быць неймаверным зайздроснікам, мець вельмі злое сэрца, каб зрабіць ка-

му-небудзь завітку. Тым не менш гэта здараецца часта і прыводзіць да жахлівых вынікаў. Калі завітка зроблена толькі са злосці, несправядліва, без прычыны, то ўсе яе вынікі ўпадуць на таго, хто яе рабіў. Калі ж, наадварот, яна мела слушныя прычыны для гневу, то бяда вінаватаму! Нішто не зможа дапамагчы яму, і лёс будзе помсціць яму за зробленыя злачынствы. Завітка робіцца наступным чынам: жанчына, якая мае крыўду, напрыклад на суседку, вырашае зрабіць на яе полі завітку. Туды яна ідзе апоўдні, распранаецца дагала, расплятае валасы і выбірае ў жыце суседкі 7 каласоў, звязвае іх чырвонай ніткаю, прыгінае да зямлі і гаворыць: “Кручу, кручу на опакі, штоб не було у N. ні хлеба, ні мукі” або якія іншыя злосныя пажаданні, напрыклад, каб расхварэлася ўся сям'я, каб павыдыхала ўся жывёла і г. д. Суседка, знайшоўшы на сваёй ніве такую завітку, упадае ў роспач, бо адчувае пагрозу бяды і не ведае, як ад яе пазбавіцца. Калі яна зусім не вінаватая, то можа вырваць каласы і занесці іх уночы на могілкі, там пакласці на якой-небудзь магіле, і няшчасці адвернуцца ад яе. Але пайсці адной у цёмную ноч на могілкі – страшная выправа. З усіх бакоў высоўваюцца жудасныя прывіды, яны пужаюць, гукаюць, чапляюцца, нават хапаюць за адзенне. А азірацца нельга, бо ўсё прападзе, і зноў трэба будзе ісці. Калі ж яна сапраўды мае грэх на сумленні, то нічога ёй не дапаможа, і ўсе беды будуць праследаваць яе. Пару гадоў таму назад адна жанчына з Заполля, Аксеня Лабачова, украла ў сваёй суседкі пару вязак ільну; тая зрабіла ёй на полі завітку, жадаючы ёй смерці. Бабуля, якая жала непадалёку ад яе загона, расказала мне, што калі Аксіння дайшла да завіткі на сваёй ніве, то збялела, як труп, і хоць старалася яшчэ жаць, але рукі ў яе трэсліся, галава круцілася, і яна мусіла вярнуцца дахаты. Потым на працягу трох дзён яна ў цяжкіх пакутах канала. Усіх баб склікалі, але нічога яны не маглі парадзіць. Прыбыў і фельчар, але, уражаны, пасяшаўся як мага хутчэй знікнуць, бо гарачка была такая моцная, што проста кідала яе на пасцелі, яна адпіхвала ўсіх так, што вымушаны былі яе звязаць, і толькі тады яна сканала. Звычайна ж, калі ўбачаць завітку, то нават не спрабуюць абараняцца і з абыякавай пакорлівасцю чакаюць прызначанай ім бяды. На маё пытанне, чаму ўжо некалькі месяцаў хворая жанчына не лечыцца, муж яе адказаў з поўным спакоем: “Да не, панейко, уж яна будзе хварэць да Пятра, так уж ёй задалі”. І сапраўды, каля свята Пятра ёй зрабілася лепей, і цяпер яна зусім здаровая» [27, с. 59–60].

На прыкладзе гэтага ўрыўка выразна адчуваецца спрадвечная прымхлівасць, жыццёвая наканаванасць палешука, які нават не спрабуе супраціўляцца складзенай сітуацыі. Э. Яленская нічога не адзна-

чае, хто ж быў мацнейшы знахар у вёсках – мужчына ці жанчына. З тэксту атрымліваецца, што іменна жанчына, бо яна ж займалася жнівом, вяла адвечны рэй у гэтай справе. У творах А. Сержпутоўскага, наадварот, паўстае даволі арыгінальны вобраз «ведзьмара»: яго і баяцца быццам бы, да такога ведаючага чалавека і звяртаюцца, але яму могуць і моцна "насаліць". Асабліва тыя, хто ўжо пачынаў сумнявацца ў вядзьмарскіх здольнасцях – ягоным бачанні чужых лёсаў наперад, адчуванні блізкага завоблачнага жыцця, тлумачэнні прыродных з'яў, вылячэнні таямнічых хвароб і г. д.

Менавіта пра гэта сведчыць "Заламка" – адметны палескі твор, запісаны даследчыкам: «...Ніхто не смеў ему (ведзьмару. – *А. Н.*, *Я. Н.*) сказаць наперакор – так его баяліся. Только быў там адзін чалавек; ён много па свету хадзіў, кажуць, быў аж у Кралеўцу. От гэты чалавек не баяўся ведзьмара й усе казаў, што ён толькі чмуціць. Але ему не верылі. От той чалавек пайшоў у свае жыто й зрабіў там заламку. Цераз недзелю, а моо й дзве прыходзіць к таму ведзьмару й просіць, каб ён вырваў тую заламку. Пашлі ены на поле. Падышоў ведзьмар к заламцэ на шагоў дваццаць да й кажэ, што не можэ йці далей, такая моцная заламка. Скінуў гэто ён нагавіцы й сарочку да так, як маці радзіла, папоўз к заламцэ ракам. Паўзе й усе стогне, што вельмі моцно ўдзеяно. Маўчаў гэто, маўчаў той чалавек, а як падышлі другіе людзі, уссеў на ведзьмара верхам, дастаў з-пад палы гарапнік да давай палосуваць ведзьмара: "От жэ я табе, хварэць, – каа, – тваёй матары, пакажу, як моцно удзеяно, бо гэстую заламку я зрабіў сам". Раве немым голасам ведзьмар, а той яго лупіць. Біў-біў, покуль здаволіўся, да й пытае: "А што, – каа, – не будзеш больш добрых людзей чмуціць?" – "Не буду, – просітца ведзьмар, – только пусці жывого". Пусціў той чалавек ведзьмара. Усхапіўса гад, забыў і сарочку й нагавіцы апрануць, да так і сунуў наўцекача. Падзівіліся людзі, думалі перш, што ведзьмар таго чалавека са свету зжыве, але бачаць, што той чалавек жыве сабе й не лыс, пачалі гаварыць, што, мабыць, той чалавек мацнейшы ад ведзьмара, калі так з яго пакпіў. Годзі ведзьмар з тае пары чмуціць. Але не доўго жыў, бо вельмі его збіў той чалавек. Дак от якіе е ведзьмары» [23, с. 65–66].

Нам у сваім жыцці даводзілася на ўласныя вочы бачыць, як вясковыя жняцы (і мужчыны таксама!) пазбаўляліся ад сумнавядомай заламкі, якая сустракалася на іхняй ніве. Першы раз, калі быў першакласнікам, то мама ўзяла мяне на калгасную ніву, якую павінны былі жанчыны жаць уручную, бо жыта было пасеяна прама ў міжраддзі калгаснага саду. Вядома ж, ніякі камбайн са сваёй жаткай туды ўлезці не змог бы. А так, жыта зжыналі ў снапы, ставілі ў дзясяткі, а потым, калі

яно добра праветрывалася-прасыхала, яго грузілі на вазы і вывозілі на ўскраек вялізнага саду, а там ужо да справы прыступаў камбайн.

Кожнай жанчыне выпадала зжаць палоску, паміж двума радамі яблыні, прыкладна метраў пяць шырынёю і метраў дзвесце даўжынёю. Мама жала вельмі хутка і спорна, за ёю не любая б жанчына ўгналася. Спачатку мне было цікава назіраць, як яна шчыруе, як цяжкія каласы паслухмяна збіраюцца ў яе жмені і імкліва зразаюцца вострым сярпом. Жняя клала іх у "паўснапкі", каб яны на ржышчы праветрываліся, а потым ужо выпадала вязаць збожжа ў снапы. Мама азірнулася і, заўважыўшы, што я нічога не раблю, прамовіла: «А давай, сынок, я навучу цябе вязаць перавяслы і ты недзе праз якую гадзіну пачнеш сам вязаць снапы. Я табе ўсё падкажу, а мне, ведаеш, якая падтрымка ад цябе будзе. Так мы з табою сваю палоску за два дні і сажнем. А то пакуль дзед пад самы вечар прысунецца вязаць дапамагаць, ды яшчэ дзе-небудзь, як звычайна, спыніцца пагаманіць, то дамоў прыйдзем з першымі znічкамі».

Недзе праз гадзіну, каб перадыхнуць ды прыкінуць вокам, колькі ўжо "палегла збожжа пад яе сярпом", мама падышла да мяне. Папіла свежай вадзічкі і, расчырванелая, потная, ухапіла ў жменю пук збожжа: «Глядзі, вось так трэба звязаць каласамі адну жменю з другой, а потым перавясла абавязкова неабходна старанна перавіць. Калі так не зробіш, то перавясла будзе нетрывалае і тады сноп проста распаўзецца. За гэта гаспадары сварацца на нас, бо ім жа снапы возам вазіць выпадае, а там рознае здараецца. Менавіта тады і шукаюць вінаватага. Перакруціш і адзін канец добра ўціснеш сабе пад левую руку, а астатняе збожжа будзеш перакручваць. Потым сам убачыш і адчуеш, калі перавясла будзе гатова, бо яно стане тугое. Тады яго трэба пакласці на іржышча і на гэтую папярэчынку пакласці два, а то і тры "паўснапкі". Гэта робіцца ў залежнасці ад таго, хто якія снапы вяжа. Адзін робіць вялікія, бухматыя, каб сноп і нагадваў сабою самы сапраўдны сноп, а іншыя, то абы б зляпіць. Вось нейкі "капшук" сціснуць і лічаць гэта снапом. Гэта, каб потым пахваліцца колькасцю коп ды тым, што ў іх, быццам бы, ураджай у гэтым годзе небывалы. Праўда, калі стануць малаціць, то абман даволі хутка раскрыецца, бо збожжа з іхніх снапоў будзе зусім мала. Давай, рабі гэтак, як я, і будзем стаўляць першыя снапы». Ага, лёгка сказаць, мама сваё перавясла скруціла за лічаныя імгненні, а я то ажно язык высалапіў некалькі разоў запар (завядзёнка ў мяне такая: калі нешта раблю, то язык, сам па сабе, вылазіць з рота). Матуля не падганяла, адно настойліва прасіла-паўтарала: «Тут, сыночак, спяшацца не трэба, старацца больш выпадае і сціскаць снапы не-

абходна. Калі будзеш вязаць, то зверху каленам прыціскай і наймацней сцягвай. Яны ж яшчэ ўсохнуцца. Гэта ўлічвай, тады снапы і папаўзуць, гаспадару трэба будзе іх перацягваць па-новаму. Двайную работу давядзецца выконваць ды яшчэ слоў крыўдных наслухацца на свой адрас, што і вушы паабвянуць».

Першы сноп я звязаў "капітальна", бо матуля ажно ўсміхнулася і дадала: «Гэты ўжо не распаўзецца. Малайчына. Ведаеш, якая гэта мне дапамога: маці жне, а сын – вяжа. Нам з табою зайздросціць стануць. Не ў кожнай гаспадыні такі малы сын і ўжо памочнік на ніве». Гэта яна сказала з асаблівым гонарам, а тое, што пакуль я катурхаўся з адным снапом, то яна звязала добры дзясятак, мама не ўлічыла. Тым не меней яна хутка пакінула мяне аднаго, а сама падалася зноў жаць жыта. Кожны сноп я клаў так, як мяне і вучылі, падцягваючы бліжэй да ягоных саламяных сабраццяў, каб потым на адным месцы выпадала адразу ж паставіць дзясятак. Налічыш дзесяць снапоў і па-новаму пачынаеш новы радочак. Неўзабаве пачуў, як матуля голасна ўскрыкнула: «Ой, Божачка! Ды што ж гэта такое?! Ды за што мне гэтае ліха?! У каго гэта розуму хапіла?! І каму я ўжо так дарогу перайшла?!».

Я прыскочыў да матулі. Яна, усхваляваная, заведзеная, паказала мне рукою: «Глядзі, а нехта мне "залом" зрабіў. Каб жа таму рукі пакрывіліся самі па сабе, хто такое на адрас іншых людзей вырабляе! Каб ён сну добрага не ведаў, каб ён лыжкі да рота не паднёс! Раз так да людзей адносіцца!». Упершыню пачуўшы пра "залом", хацелася як мага лепей яго разглядзець, таму зрабіў некалькі крокаў наперад і ўтаропіўся вачыма. Нічога там асаблівага ці незвычайнага не ўбачыў: некалькі каласоў, звязаныя ў адзін жмуток, былі пакінуты на ніве. Вось і ўсё. А матуля так усхадзілася. Не ведаў я тады, што з "заломам" у нашых вяскоўцаў асацыіравалася ўсё самае нячыстае і непажаданае ў сямейным жыцці і гаспадарчых справах. Рабіўся ён на зло, на псоту, на смерць, на нешанцаванне, таму і вязалася ўсё самае горшае з гэтым "заломам". Але матуля яшчэ крыху пастаяла, відаць, супакоілася і да яе прыйшла здольнасць цвяроза разважаць. Тройчы перахрысцілася і, прамовіўшы: "Са мною Бог і Божая Маці!", рашуча падалася да "залома". Ухапіла яго праваю рукою і рванула на сябе. Потым аднесла ўжо вырваны "залом" да бліжэйшай яблыні і ўскінула на яе галіны: «Тут няхай ён прасыхае і траціць назаўсёды сваю вядзьмарскую сілу! Яблыні і яблычкам ён не страшны, а да збожжа не дастане! На ветры ды на сонцы як папахварэе, то ўвогуле нічога з яго не застанецца! Гэта ж собіла некаму такое ўчыніць?!».

Калі пад вечар на самой справе прыйшоў дзед, то матуля адразу ж распавяла і яму пра “залом”. Яе бацька спахмурнеў: «Колькі ўжо гэтых дурнёў ні вучылі, каб не рабілі іншым нічога дрэннага, а ўсё роўна на іх гэта не дзейнічае. Бачыш ты, да нашых дзён вядзецца гэтакая зараза! Ніяк ад яе адмовіцца не могуць! Каб ведаў, хто гэта, дык два б набоі яму буйной соллю ніжэй спіны засадзіў бы! Я б яго адвучыў!». Дзед вязаў снапы побач са мною і ўсё бубнеў і бубнеў, а потым не вытрымаў і падаўся да вісеўшага на яблыні “залома”, схапіў яго і перакінуў на іншы надзел. Тады ўжо прыйшоў, стаў побач і весела зазначыў: «Я “залом”, унучак, да Мані-“Сташанкі” перакінуў! Яна такая гаспадыня, такая хвацкая жанчына, што яе ніякае вядзьмарства не бярэ. Самага ліхога ведзьмара, калі заловіць, прыцісне, то таму мала не падасца! Яна на ўсё такое і ўвагі асаблівай не звяртае!».

У другі раз “залом” вырываў сам дзед. Убачыў ён яго ў жытнёвай паласе свайго сына. Спахмурнеў і прагаварыў, азіраючыся ці то некага шукаючы вачыма, ці то на ўсялякі выпадак лішні раз аглядваючыся: «І гэтаму лайдаку нехта ж пазайздросціў... Каб я й хацеў такое сказаць адразу, дык не здагадаўся б... А тут “залом” і зусім свежы, во, і сляды выразна відаць. Босая жаночая нага. А мы ж некага сустрэлі, калі сюды ішлі. Гэта была наша суседка – “Барчанка”. Як што, дык да мяне за дапамогай бяжыць, а тут, дык вырашыла злое ўчыніць!». Вырваў дзед той залом і, скруціўшы яго ў руцэ, прынёс дамоў. Там падышоў да суседчынага падворка і перакінуў каласы цераз плот: «Няхай яе куры гэтым ”заломам” і давяцца! Я ёй яшчэ таксама падраблю, каб болей дурніцай не займалася!».

Даводзілася бачыць, як тата жаў жыта камбайнам. Вядома ж, палешукі, асабліва тыя, што жылі на той час па хутарах, стараліся ўпрасіць камбайнера, каб ён адарваўся ад калгаснае нівы і “паратаваў іхнія надзелы, бо ўжо жаць уручную ў іх сілы не стае, а цяпер жа і наймаць нікога нельга, бо прышыюць усялякую прапаганду”. Сапраўды, сеялі дзяды збожжа многа. Магчыма таму, што не прызвычаіліся, каб поле пуставала, зарастала лебядою ды іншым зеллем. Некалі ж давіліся за кавалачкам зямлі, а тут... Ніхто не звяртаў увагі на тое, што сілы ўжо не тыя, што гадоў ужо многа за плячыма і не выцягнуць яны такой знясільваючай працы. Але ж сеялі, ды яшчэ і прыгаворвалі: «Паміраць збіраешся, а жыта сей!».

У аднаго дзядулькі жалі жытнёвае поле прама за ягоным агародам. Старэча стаяў і толькі пасміхаўся ды галавою пакалыхваў, гледзячы, як камбайн раўнюткa зжынае ягоны шчодры ўраджай. Потым нечага ўстрапянуўся і пачаў паказваць рукою наперад. Аказваецца, там нехта

паназакручваў шмат "заломак". Яны проста стаялі гурбамі, перарываліся і зноў паўставалі амаль сцяною. Дзядулька захваляваўся, нешта крычаў бацьку, але той у адказ на ўсё гэта адно – махнуў рукою. Як ішоў камбайн, так і заглынуў усе тыя "заломкі", разам з усялякімі павер'ямі, страхамі і папярэджаннямі. Потым механізатар запэўніваў гаспадара, што яму ўжо не адзін раз даводзілася вось гэтак менавіта абыходзіцца з праявамі мясцовага вядзьмарства. Мне то чамусьці тады падалося, што гэта маглі зрабіць і дзеці, якія ўрываліся ў жыта пагуляцца, калі побач не было дарослых.

Атрымліваецца, што ў кожнага з вяскоўцаў была свая "методыка" ратавання ад перажыткаў даўняга вядзьмарства. Іншая справа, што яшчэ многае гаварылі, сцвярджалі, адзначалі, але ўжо амаль не заставалася прымхлівасці у паводзінах жнеяк, механізатараў. Нешта і яны чулі, пра нешта і ім распавядалі, але ўжо трывалай асцярогі ад лютай "падробкі" супраць вяскоўцаў не было. Не выключана, што ўсё роўна гаспадыня, на полі якой сустракалася "заломка", адразу ж пачынала ўспамінаць, што яна зрабіла не так, у чым магла правінавацціцца, што атрымала гэтакі "знак", але не болей таго. Даўняга страху неназіралася, яго выціснула больш глыбокае людское веданне жыцця, гаспадарчых спраў, адвечных прыродных працэсаў.

ТРАДЫЦЫЙНЫ
ЛАД ЖЫЦЦЯ

# "ЖНУ Я, ПАЖЫНАЮ..."

Аб тым, што людзі падчас жніва страшэнна стамляліся, сведчылі тыя факты, як жнейкі проста валіліся на зямлю ад стомы на кароткі адпачынак. Старэйшыя з вяскоўцаў распавядалі, што засыналі адразу, нават не паспеўшы ўхапіць за ежу які кавалак хлеба. Неабходна было аднаўляць сілу, бо ж жаць даводзілася не дзень, не два, а тыдзень-другі (а то і месяц!) запар. Паспрабуй, вытрымай, не парэжся, не захварэй і не зляж ад празмернай стомы.

Сведчылі нават пра тое, што падчас такога моцнага сну некаторым з людзей у рот запаўзаў вуж. А яны нават гэтага і не чулі: «Выганялі тых вужоў з сярэдзіны – вельмі проста: давалі піць чалавеку (жанчыне ці мужчыне) гарачае (напаранае на агні) малако. Ён нап'ецца, а вуж і выпаўзе. Галоўнае, каб пацярпеўшы яго не бачыў, а то тады вельмі спалохаецца...».

Прыгадаем мележаўскі аповед: «Бачачы, што мачыха не жне, Ганна паклала зжатую жменю белаватых чэзлых сцяблоў на разгорнутае на

пожні перавясла і таксама разагнулася. Хвіліну стаяла так, выпрастаная, нерухомая, у выцвілым зрэб'і, з падаткнутым фартухом, з хустачкай, казырочкам насунутай на бровы, – чакала, калі перастане ныць, памякчэе здранцвелая спіна. Стаяла, нічога не бачыла, нічога не думала, жыла ціхай радасцю: можна трохі перадыхнуць. Потым, калі села на сноп, пачула, як шчыміць уколатая аб пожню нага каля костачкі, выставіла яе, смуглa, да чарнаты загарэлую, распісаную да кален белаватымі пісягамі і закарэлымі плямкамі крыві, паслініла палец і прыклала да паколіны. Паглядзела на рукі – яны таксама былі чорныя, з белаватымі пісягамі – знакамі сляпнёвых укусаў» [13, с. 217–218].

А вось як “вылечваліся” жнеі ў В. Адамчыка, калі незнарок здаралася параніць руку ці нагу: «Алеся, не ведаючы куды дзецца ад брыдкасці, яшчэ спарней шмаргала сярпом гэты пераспелы, заглушаны высокім распушаным асотам ячмень і нат не ўчула, як у мезенец на левай руцэ ўпіўся серп.

Убачыла кроў – і толькі тады ад страху і болю турзанулася, зайшлося холадам сэрца.

...Алеся падняла здранцвелую руку, баючыся глядзець на парэзаны палец, з якога капала густая цеплаватая кроў.

...– Во, кроў як свішча, аж страх глядзець...

– Пачакайце ж дзеткі, дайце сюды руку, – шастаючы жоўтым ячменішчам, да Алесі падбегла старая Літаварыха, схапіла за парэзаную руку, крыкнула на жней, каб тыя адвярнуліся, падаткнула руку пад падол свае доўгае, аж да пят, суконнае спадніцы і пачала мачыцца, як агнём апякаючы Алесін парэзаны палец» [1, с. 124–125].

Нядзіўна, што нават у сне адной з галоўных гераінь рамана “Чужая бацькаўшчына” В. Адамчыка сніцца тое, як яна парэзалася сярпом падчас жніва. Гэта была даволі частая і звычайная з'ява ў вясковым жыцці, таму і západалі такія здарэнні глыбока ў памяць, таму, нават у сне, па немалым часе, усё роўна адчувалі гераіні тыя боль і страх: «Алеся ловіць вострым, надоечы толькі, мусіць, назубленым у каваля сярпом слізкае, абвітае бярозкай жыта, бярэ яго зверху не надта спрытнаю леваю рукою і, трохі заламаўшы, цягне да сябе серп.

Спяшаецца. Забыўшыся, ловіць спярша не сярпом, а рукою гэтае жывое, што ўцякае з пальцаў, жыта. І шморг сабе па руцэ, па ўсіх пучках.

Але боль, здаецца, спярша і не ўчула, толькі скрыгат сярпа, што дайшоў да косці. Падняўшы руку, убачыла аблітыя ліпкаю крывёю пальцы, той мезенец, што вісеў на адной скурцы, і заенчыла, ужо, мусіць, прачнуўшыся і чуючы, як ад болю млела ўся левая рука і шчымеў той

самы, папраўдзе некалі парэзаны на жніве левы мезенец – на якім яшчэ цяпер жылаватым шнурком уздуваецца нарасць» [1, с. 122].

Мне мой дзед таксама даводзіў, што з яго сялянскага, рыбацкага і вайсковага вопыту вынікала, што найлепшым антысептыкам была чалавечая ... мача: «Няма чаго дзівіцца, калі надарыцца нейкі парэз ці пасячэшся выпадкова, то, каб гразь, пясок ці пот не траплялі ў рану, найперш іх неабходна ... зассаць. Дзе ты тыя медыкаменты ў полі, на возеры ці ў лесе знойдзеш. А так здаўна ратаваліся пры раненнях, бо кроў пераставала цурком бегчы і адразу прысыхала. Гэта азначала, што яна згортвалася і неабходна перавязваць месца ранення. Тады ніякага заражэння не прыключыцца. Самі ўмелі ратавацца. Іншая справа, што многія са страху ды адчаю губляліся, нават прытомнасць трацілі. А тут трэба дзейнічаць хутка, тады гарантыя вярнейшая, што чалавеку дапаможаш, выручыш у такой бядзе. Асабліва страшна, калі сам працуеш, нікога паблізу няма, тады толькі на сябе і спадзявайся, не губляйся».

Мала было змалаціць збожжа, яго неабходна было і далей “ладкаваць”: веяць (“падсяваць”) намалочанае зерне, аддзяляць яго асобна ад пяску, кузурак і смецця. Таксама добры “кавалак” працы. Надакучваў і ён, бо асацыіраваўся з едкім, усюдыпранікаючым пылам: «Мондрыя падсявалі авёс. Усе тры бабы – сівыя ад пылу, толькі зубы свяціліся, калі яны пачыналі рагатаць, – трымаючы ў руках па рэшаце з аўсом, траслі іх, кружылі, каб высыпаўся з зярнят пясок, ляпалі далонямі па гладкім жоўтым абечку, нібы забаўляліся. Згробшы зверху скруджыны, сыпалі чысты авёс у шаснастку – неглыбокі, на два пуды, цабэрак з доўгаю ручкаю, – мералі, колькі ўсяго намалочана.

У гумне вісеў і круціўся ў дзверы рэдзенькі пыл» [1, с. 84].

Асабліва даймала жняцоў жытняя палова. Нейкія дробненькія, надзвычай кусючыя асцюкі, глыбока ранячыя рукі саламяныя перавяслы. Усё выпадала рабіць умеючы, так, каб не застацца калекай на ўсё астатняе жыццё. Я і сам тады адчуў на сабе і гарачыя прамяні сонца, і страшэнны, ломяча-агністы боль у спіне і нагах! А летні дзень, увогуле, нібы прыцішыўся на адным месцы і не даваў нябеснаму свяцілу рухацца да захаду.

Потым яшчэ аказвалася, што і салома, на першы погляд вохкая і мяккая, запроста рэзала рукі і пальцы. Толькі задумаешся на нейкае імгненне, як адразу, незнарок, шмарганеш па пальцах і ўжо выразна чуеш, як агнём запякло ў месцы парэзу. На нязначныя раны ніхто амаль не звяртаў увагі. Ат, што ўжо тама такога здарылася, на што неабходна дзівіцца? Таму так і сцвярджалі вопытныя жнеі: «Слінаю заклей

тую ранку і ўсё. Вазьмі ды зліжы тую кроў, то новая ўжо больш і не выступіць. Але трэба добра асцерагацца, калі ў жніво працуеш. Тут жа і серп у руках заўсёды, а ім менавіта, як ведаеце, можна моцна парэзацца. Тады такія раны цяжка і доўга зацягваюцца, бо яны рэзаныя. Усяго за свой век наглядзелася. Усяго давялося шмат пяражыць і вынесці, выпакутаваць і вытрываць. Жылі тады людзі, многа і цяжка працавалі, а таму і калечыліся даволі часта...».



*Воз са збажынай*

Малыя, якім давялося пабыць з бацькамі на жніве, потым з гонарам зазначалі перад сваімі сябрукамі: «Цалюткі дзень на ніве смажыліся... Так ужо там панатаміліся, так ужо там тае працы набраліся, што і вячэраць вечарам не захацелася, адно, каб неяк дабрацца да ложка ды плюхнуцца галавою на падушку... Там ужо ніякай гульні не захацелася ведаць... Стома ўсё перамагае, а жніво паказвае, якое яно значнае ды важнае...».

Шчырыя, запаслівыя гаспадары сачылі за тым, каб летам нічога не прапала дарма, каб усё чыста прыбраць, уладкаваць. Зробіш так, то працяглаю зімою нібы знойдзеш. Мая матуля любіла паўтараць: «Нават бедная ніва гэтулькі дасць заўсёды, як і родны бацька не дапаможа».

Таму і каласкі збіралі, і кукурузныя пачаткі, якія заставаліся пасля камбайнаў і палову выбіралі з-пад саломы. Ссыпалі ў вялізныя мяхі. Тады яшчэ не было сучасных: лёгкіх і танных. А раней усё рабілі самі. Вось і матуля шыла іх на вуліцы, бо ў хаце нашай, маленькай і цесненькай, такі мех нельга было расправіць. Мы з малым братам усё дапытваліся: навошта, маўляў, такі мех? Яна ў адказ загадкава ўсміхалася і гаварыла, што хутка ўбачыце самі, надта не спяшайцеся.

Аднае раніцы мы з татам паехалі на ягоным камбайне на далёкае поле ("На Вустрыцу"), там механізатары павінны былі дажынаць плошчу калгаснага аўса, а мы з мамай, адпаведна, насыпаць палову, выбіраючы яе з-пад саламяных капніцеляў, у тыя самыя таямнічыя мяхі.

Спачатку ўсё ішло, нібы дзіцячая гульня, бо працавалі ўтраіх, не было яшчэ гарачыні-спёкі, не прапацелі і не кусалася тое шматлікае зелле, якое было скошана, але ляжала непрыбранае. А недзе каля паўдня, калі мы з мамай насыпалі добры дзясятак пузатых, агромністых мяхоў, то гульнёй ужо і не пахла! Мне думалася, што лепей бы мяне пакінулі дома. Там сябры, гульні, а тут... Мама супакойвала тым, што зімою нашы кароўкі будуць сытыя і дадуць многа малака, бо мы ім сёння прыстараліся смачных кармоў. Праўда, такое супакаенне мала дапамагала.



*Расцягнуліся клінам калгасныя жнейкі*

Вясковыя людзі, прызвычаеныя жыць безадходнай гаспадаркай, стараліся цягнуць у свае двары ўсё, што магло спатрэбіцца (а даволі часта і ўвогуле не спатрэбіцца!) у нейкай справе. Так і з той паловай. Яна ж павінна была быць пастаянна добра дагледжанай, каб на яе не цякло, «бо зліпнецца, замокне і заваняе, а тады ўжо ніякая карова яе есці не стане, толькі задарма працы гэтулькі пакладзеш...». Увішныя сяляне стараліся ссыпаць яе ў такім памяшканні, дзе былі густыя, але невялікія шчыліны, «каб палову тую пастаянна прадзімала, але каб туды куры ці пісклят не пралазілі, бо яны яе так паразграбаюць ды сваім гноям прыб'юць, што і сухую карова есці не стане. Каня ўжо калі чалавек трымаў, то таксама добра ведаў, што конь есць толькі чысты корм, а да прыбітага ці прытаптанага нават сваю пысу не працягне...».

Яшчэ спрактыкаваныя гаспадары наперад ведалі, што размяшчаць нават часовыя будынкі з паловай дзе-небудзь у непасрэднай блізкасці ад вялікіх хлявоў, стайняў, свінушнікаў, тым болей жылых памяшканняў, нельга ні ў якім разе! Не паслухаецца нехта слушнай парады, зробіць па-свойму, насуперак традыцыі, то адразу ж зробіцца аб'ектам насмешак і кпінаў сярод вяскоўцаў: «Сцяпану добра раілі, каб сабраную палову ў хлеў не пёр, а ён жа яе і ў хлеў, і ў прыбудоўку да хаціны нацягаў. Магчыма, баяўся, што пакрадуць, паквапяцца на такое багацце, то і мышэй, і пацукоў, і вужоў, і вожыкаў гэтульки паназбіраў, што і не ведаў, як ад усяго гэтага потым ратавацца...».

На двары мы свае мяхі склалі на падкладзеныя дошкі, каб з зямлі іх не замочвала, і прыкрылі, нібы стог, сенам. Потым давялося пабачыць, як мама з татам рабілі нашай жывёле тую "смачную ежу": насыпалі ў цэбар палову і залівалі яе кіпятком. Там усё разбухала, разварвалася, а калі ахалоджвалася, то корм заносілі каровам. У нас тады іх было ажно тры: дзве дойныя і адна – цялушка.

Не перастаеш здзіўляцца таму, як імкнуліся, любым чынам, зберагчы свой ураджай патрыярхальныя вяскоўцы. У што яны толькі не верылі, "каб усё і ў гэты год было добра, каб нішто не пашкодзіла збожжа: ні дождж-залева, ні птушкі, ні мышы; каб на ўсім чыста быў "спор" і каб зжатае звезлі дамоў, склалі ў свірны ці ў стагі і там яно дачакалася свайго святога часу". Пры гэтым многае тычылася не толькі гаспадаркі, жніва, але і сямейнага ладу, сямейных адносін: «Калі, часамі дажынаючы свае пастаці, дзве дзяўчыны кладуць свае жмені жыта ў адну кучку, та звязваць сноп павінна тая дзеўка, каторая звівала перавясла, бо як звяжэ другая, та іх жаніхі атвяжуцца да звяжуцца з другімі» [22, с. 98].

Да такіх своеасаблівых прадказанняў-засцярог можна смела аднесці і наступнае: «Калі хто, жнучы, да забудзе на ніве жменю зжатага жыта, не звязаўшы яго ў сноп, а гэто паказвае, што на другое лето той чалавек не будзе жаць на той ніве: калі то дзеўка, та пойдзе замуж, а калі мужчына ці жанчына, то кудысь адлучыцца» [22, с. 98].

У сваёй вёсцы неяк пачулася ад старых жанчын, калі распытваў пра асаблівасці жніва ў нашай мясцовасці, і такое: «Тады дзяўчаты незамужнія і на лёс свой далейшы варажылі. Рабілі яны вось што: пакідалі на ніве ў некалькіх месцах па жмені-дзве зжатага, але не звязанага ў снапы жыта. Думалі, што калі так учынілі, то палетак дапаможа ім у тым годзе (восенню ці зімою) выйсці замуж. Усе выдатна ведалі, што жытнёваму палетку пакланяліся асабліва старанна і за гэта многія чакалі шчырай аддзякі. Дзяўчаты, ясная справа, што чакалі ўдалага (багатага

і прыгожага) кавалера і далейшага вяселля. Ніва не толькі карміла людзей, але і жывіла адначасова іх надзеямі».

На паднашэнні палетку і палявіку своеасаблівых дарункаў звяртаў увагу і А. Сержпутоўскі. У яго сустракаецца наступны прыклад: «Калі на полі як жнуць астаецца вада або квас, то іх выліваюць на мяжу або на дарогу, на гасцінец палявіку, каб ён не псаваў на пашні збожжа» [17, с. 98]. Праўда, нам даводзілася чуць зусім адваротнае. Гэтае сведчанне таксама не адмаўляла пакланення ніве і палявіку, але адносна вады ці квасу (малака, сыроваткі) жанчыны пераконвалі, што калі нешта ў збанку заставалася з пітнога, то яго нельга было выліваць на ніве (ат, адну-дзве кроплі), а астатняе прынесці дамоў і выліць свойскай жывёле ў карыта, каб такім чынам нібыта прыспорыць іхні рост. Тады свінні і авечкі будуць добра набіраць уласную вагу, а каровы стануць даваць найтлустае малако.

ТРАДЫЦЫЙНЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ

# ПРЫМХЛІВАСЦЬ НА ЖНІВЕ

Часта сустракаліся павер'і, якія прама ўказвалі на тое, што супраць канкрэтнай гаспадыні (жнейкі) нехта варожыць. Мы ўжо згадвалі пра "заломы" і "завіткі", але ж нельга забывацца і пра іншыя "паскудствы" ведзьмароў (у нашай мясцовасці сяляне былі перакананы, што болей варожаць і "падрабляюць" жанчыны). Сярод іх знаходзіцца шматлікая колькасць палескіх усёмагутных вядзьмарак і варажбітак, якія мелі "сілу і здольнасці да ўтварэння любога ліха". Адзначалі і тое, што некаторыя з іх разыходзіліся да таго і былі так ужо перакананы ва ўласнай беспакаранасці, што пастаянна знаходзіліся дзесьці непадалёку ад жнеяк, ператварыўшыся ў птушку (сароку, варону) або ў жабу-рапуху. Гэтую здаравенную і непрыгожага колера жабу чамусьці ў народнай свядомасці надзялялі толькі самымі адмоўнымі рысамі і характэрнымі ўласцісвасцямі. Так і сцвярджалі, што калі на ніве, няхай сабе і выпадкова, сустрэнеш жабу-рапуху, то яе абавязкова трэба забіць, пачакаць пакуль яна падсохне, а потым яшчэ і глыбока закапаць у зямлю, "каб

не аджыла". Тое ж самае сустракаецца і ў А. Сержпутоўскага: «Калі ў жыце як жнуць да трапіцца жаба-рапуха, та трээ яе хутчэй забіць, бо як цераз яе пераступіць якая жанчына, та можэ захварэць» [22, с. 98].

Прафесійны этнограф занатаваў і такую акалічнасць: «Жанкі як жнуць, павінны асцерагацца, каб не сцаць на постаці, а павінны атходзіць на мяжу або дзе далей на чужую пожню, бо тое можэ зашкодзіць ім і вельмі забаліць сярэдзіна, што хоць поўзай ракам» [22, с. 98].

Прыгадаўшы пра такую своеасаблівую старонку народнага жніва, павінны вярнуцца да гэтага занятку, каб падкрэсліць яшчэ раз: колькі радасці было ў вачах, у сэрцы, у душы земляроба, калі яму прыходзілася завяршаць жніво, асабліва багатае, ураджайнае. Я. Колас надзвычай чуйна ўлавіў такія моманты сялянскай душы:

Прыйдзі пад вечар ты на поле
І палюбуйся ім, саколе!
Ў якія роўныя шнурочкі
Цяпер пакладзены снапочкі!
І як прыгожа-слаўны бабкі!
Якія ладныя іх шапкі!
І хоць яны ўсе адзінакі,
Але і выраз і адзнакі
У кожнай бабкі асабісты,
А наагул усе фарсісты,
Зірнеш – дальбог жа, возьме ўцеха,
І не стрымаешся ад смеху:
Яны так мілы, так прыветны,
Так самавіты, так фацэтны,
І пазіраюць так прыхільна,
Прыгледзься толькі да іх пільна!
І многа ж іх: не змерыш крокам
І не акінеш нават вокам;
Стаяць радамі, зухаваты,
Як на ўрачыстасці салдаты [7, с. 218].

Акінутая паэтычным вокам сялянская ніва выглядае менавіта такім чынам. Але ж, паводле народных прыкмет, была своеасаблівая, спрадвечная "інструкцыя", як правільна класці звязаныя снапы, як потым іх ставіць у дзясяткі і г. д., ва ўсім павінен быць парадак. І парадак гэты не меў права на парушэнне. Улічвалася і тое, які бок палетка зацішнейшы, з якога звычайна боку выходзіць хмара, і спеласць каласоў у снапах і г. д. Калі ўжо зжалі, то думалі, як зберагчы зжатае, не растрэсці зерне, не вытрасці яго з пераспелых каласоў: «Снапы трэба класці

пасярод загона трохі наўскасок, каб збожжэ нахілялася ў адзін бок, а не мітусілася» [22, с. 98].

А. Сержпутоўскі звяртаў асаблівую ўвагу на тое, што «снапы не можна застаўляць на пожні раскіданыя, а трэба злажыць іх у хрэшчыкі ці паставіць у бабкі, та палявы дзедко будзе зберагаць іх, калі ж снапы знайдзе не ў ладу, та ён абазлуе й пачне трасці да вытрахаць з снапоў зярнята» [22, с. 99].

Але ж у беларускай народнай міфалогіі прысутнічаў не толькі згаданы "палявы дзедко". Акрамя яго называлі вяскоўцы і "палявую бабу", і "жытнюю бабу", і "жытняга дзеда", і "жыценя". Вядомая справа, што ў залежнасці ад мясцовасці гэтыя персанажы мелі нейкія рэгіянальныя асаблівасці, хоць асноўныя рысы заставаліся традыцыйнымі. Хіба можна забыцца, як мая бабуля, калі мне надакучвала сядзець-гуляцца аднаму пад пякучым сонцам на жніўным полі і я пачынаў уголас румзаць, каб хоць такім чынам прывабіць да сябе ўвагу, запытвалася: «Што гэта, унучак, цябе саплівая баба пацалавала?». Магла сказаць і па-іншаму: «Во ўжо ўвесь угнюсіўся, што і глядзець на цябе не хочацца... Мабыць, ты сёння з саплівым дзедам пасябраваў?.. Вось ён ужо цябе і плакаць прымусіў, і нам адпачынку ды вольнай працы не даў... Ці не сорамна табе, такому вялікаму, з гэтым саплівым старым сябраваць?..».

Пра "жытняга дзеда" мне многа расказвала матуля. Вяла з сабою на поле за руку і гаманіла, апавядала пра тое, што калі я буду добра сябе там паводзіць, то валадар жытняга поля – "жытні дзед" – дасць мне потым падарунак: кавалачак смачненькай каўбаскі, а то і купленыя ў магазіне цукеркі-"падушачкі". Мне яны ўжо былі вядомыя і на смак, і на выгляд, таму стараўся слухацца, іграцца на полі, каб не адрываць ад справы матулю лішні раз. Вядома ж, не раз і не два запытваўся: як жа выглядае той таямнічы "жытні дзед", якога ніхто з людзей не бачыць, затое ён пільна сочыць за парадкам у сваіх уладаннях, узнагароджвае спагадлівых і працавітых, шчырых і нязлосных і, наадварот, бязлітасна карае тых, хто асмельваецца неяк парушаць спрадвечныя законы паводзін на жытнёвым полі? Аказваецца, што ён нябачны звычайнаму воку, але калі ўважліва прыслухацца, то можна выразна пачуць, як жаласліва стогне ён, спачуваючы жнейкам, іхняму нялёгкаму лёсу. Апрануты ён гэтак, як і людзі, росту значна меншага і звычайна дасягае такой вышыні, як самыя высокія каласы на ніве. Днём "жытні дзед" стойваецца недзе ў гушчы поля, дзе яшчэ шамацяць, аб нечым размаўляючы паміж сабою, каласы, ці ў бліжэйшым кустоўі, але, па перакананнях старых людзей, ніколі не спіць. Яго непакоіць тое, як будзе зжаты і звезены свежы ўраджай. Не дае расслабляцца і забывацца

жнеям, бо калі яны толькі забудуцца і пачнуць проста механічна джыхаць сярпамі, то тады могуць даволі моцна парэзацца, параніцца сярпом, які "і назублены, і навостраны на ўсё жніво".

Сцвярджалі і тое, што "жытні дзед" меў зусім невялікі рост, "недзе ўсяго з вялікую птушку, якая таксама пастаянна жыве паблізу ад жытнёвага поля, не аддаляецца ад яго, а часта і той дзед ператвараецца ў тую птушку, бо так яму значна лягчэй сачыць за ўсім тым, што адбываецца ў ягоных уладаннях". Прыгадвалі, што тая ці іншая вяскоўка, але здаралася гэта выпадкова, магла заўважыць "жытняга дзеда" і, што самае галоўнае, нічога іншага, акрамя жалю і шкадобы, ён у яе не выклікаў. Такі ўжо быў худзенькі, зморшчаны ўвесь, ледзьве перасоўваўся ад стомы, а апрануты то, не раўнуючы, як самы сапраўдны жабрак: «Паабнасіўся ўвесь, паабарваўся, па палях ды нівах швэндаючыся, пад дажджамі ды вятрамі, пад сонцам ды халоднымі туманамі начуючы. І так маленькі, а тая вопратка на ім адно шамаціць. Ствараецца ўражанне, што апранута яна на адныя, лічыце што, косці. А ўжо валасы на ягонай спалавелай галаве то нагадвалі сабою тыя ж самыя жытнія каласы з канкрэтнай сялянскай нівы. І калі жыта стаяла раўнюткаю сцяною, то і валасы на галавае былі гладка зачасаныя, а калі жыта стаяла разбэрсанае і ўскудлачанае вятрамі ды дажджамі, то і ў "жытняга дзеда" на галаве бачылася нешта падобнае».

Як і любому іншаму міфалагічнаму персанажу, "жытняму дзеду" прыпісваліся розныя чароўныя здольнасці і магчымасці: ён мог спакойна ператварацца ("перакідвацца") у невялікіх звяроў і вялікіх птушак, ад самога нараджэння ў яго нібыта было тры вокі: «Тры вокі "жытні дзед" меў для таго, каб мець магчымасць бачыць усё, што адбывалася вакол яго на жніўным полі, нічога не павінна было праслізнуць міма ягонага погляду. Таму меў два вокі спераду, як і любы з людзей, а трэцяе – на патыліцы, але пасаджана яно было таксама на ўзроўні пярэдніх. Атрымлівалася, што як ён ні стаяў, а ўсё яму было бачна, нічога нельга было схаваць. Таму яго часта і называлі вяскоўцы паміж сабою – усёбачачым, усёзаўважаючым. Ніколі не гаварылі, што ў пакаранне за дапушчаную прамашку ці нейкі грэх у адносінах да сваёй асобы "жытні дзед" прымушаў, напрыклад, жняю рэзаць сабе руку. Такога не здаралася. Караў ён неахайных ды няўважлівых жнеяк тым, што калі яны прыходзілі дамоў, то на ўсю ноч ён балюча скручваў ім спіну. Праўда, на раніцу, калі трэба было зноў ісці жаць, адпускаў боль. Такім чынам, папярэджваў вяскоўак, каб болей яны былі больш пільнымі і ахайнымі».

Ніколі не адпачываючы лішняй хвіліны, "жніўны дзед" пастаянна ходзіць па ўжо зжатых нівах і сочыць за тым, як там папрацавалі сялян-

скія рукі. Хадзіў, углядаўся, падбіраў выпадкова прапушчаныя ці выпаўшыя каласкі, звязваў іх у свой невялічкі снапок і нёс менавіта на ржышча да таго гаспадара, дзе ўсё было зроблена сумленна і шчыра, і падкладваў там да снапоў, дзясяткаў, коп. Гэта сведчыла пра тое, што "жытні дзед" прадказвае гэтаму гаспадару: на ягонай ніве на будучы год будзе надзвычай добры ўраджай. Шчыраму чалавеку – добры ўраджай, а гультаю ды абібоку – галодны год. Тут усё справядліва, бо за доўгія стагоддзі, за якія чалавецтва мноства разоў сеяла і зжынала ўраджай, людзі прызвычаіліся да таго, што "хлеб – усяму галава". А раз так, то і адносіцца да ўсяго выпадала надзвычай асцярожна і паважліва, без нейкіх там агаворак.

Асабліва выпадала прыслухоўвацца да прадказанняў "жніўнага дзеда", калі ён паказваўся перад людзьмі. Ужо не хаваўся, не сачыў за імі, а сам выходзіў да вяскоўцаў. Апрануты тады быў ці як падарожны, ці як жабрак-вандроўнік. Меў зрэбную торбу цераз плячо, а ў руках трымаў заўсёднага спадарожніка такіх людзей – кій. Гаварылі, што раз ён не пабаяўся паказацца людзям, то рабіў гэта для таго, каб папярэдзіць іх аб надыходзячым "страшным голадзе, які дазвання падчысціць сялянскія сусекі і гумны, выб'е хлявы і пуні, не пакіне і крышачкі хлеба на заўтрашні дзень". Убачыўшы такое прадказанне-папярэджанне, вяскоўцам неабходна было не абмяркоўваць паміж сабою, што б гэта азначала, а адразу кідацца і рабіць запасы на зіму з усяго, што можна было сабраць, злавіць ці знайсці: з ягад, з рыбы, са збожжа, з агародніны. Здаўна верылі, што "жытні дзед" рызыкуе выходзіць адкрыта перад сялянамі толькі тады, калі сам перакананы, што наперадзе выпадзе ліхі і галодны год. Гэта лішні раз падкрэслівае ягоную сапраўдную спагадлівасць да людзей. Пра такое даўней часта згадвалі, бо давялося ўволю нагаладацца нашым продкам, таму яны нават такімі простымі аповедамі папярэджвалі, што з падобнымі прадказаннямі жартаваць не даводзіцца.

Пра "жніўнага дзеда" гаварылі таксама, што ён бярэ сабе за правіла абавязкова прысутнічаць пры восеньскай сяўбе: «Ён там не проста ходзіць па палетку, а старанна аглядае яго і калі заўважыць недзе зерне ці зярняты, якія не засыпаныя на той момант зямлёю, то ўтоптвае сам яго ў глебу і такім чынам не дае загінуць будучаму каліўцу збожжа. Пераконвалі, што неахайнага сейбіта "жытні дзед" мог пакараць тым, што зводзіў ягоныя рукі ў плячах і на некалькі дзён чалавеку выпадала пакутаваць ад моцнага болю. Так даходзіла да таго вяскоўца, што трэба не даваць падстаў жытняму гаспадару лішні раз караць сябе».

Як і ў любога іншага міфалагічна-дэманалагічнага персанажа, у "жытняга дзеда" была свая "пара" (жаночая палавіна), якая называлася "жытняя баба". Праўда, гэты персанаж быў вядомы толькі ў беларусаў Смаленшчыны, а на астатняй тэрыторыі нашай краіны не прысутнічаў. Існаванне такога вобраза зводзілася да таго часу, калі жнеі пачыналі ладзіць свае дажынкі. Тады яны выбіралі сярод дзяўчат самую прыгожую і працавітую, сплятали і адзявалі ёй на галаву вянок са збажыны, а на кашулі прышывалі па баках яшчэ прамяністыя зоркі з залацістай паперы ці матэрыі. Пасля ўпрыгожвання самой "жытняй бабы" ў рукі ёй уручалі невялічкі і старанна звязаны снапок, які яна, узначальваючы жаночае жніўнае "войска", несла, ідучы папераздзе, да гаспадарскага двара. Там снапок перадаваўся ў рукі гаспадару. Суправаджалася такое "дарэнне" шчырымі зычаннямі ў добрым ураджаі і моцным здароўі, у памнажэнні сям'і, у пладавітасці жывёлы, а той, хто прымаў снапок, павінен быў шчодра "аддарыць" жнеяк і саму "жытнюю бабу".



*Сучасныя дажынкі на калгасных палетках*

Наш народ заўсёды лічыў, што жніўную абраднасць, жніўны працоўны комплекс дазвання павінен ведаць любы з вясковых жыхароў. У адваротным выпадку ім пагражала суворае пакаранне з боку апекуноў палеткаў ("жытнёвага дзеда" і "жытнёвай бабы"), а таксама вялікі ўрон у вядзенні ўласных гаспадарчых спраў. Нешта парушыш з заведзенага з даўніх часоў, а адказваць давядзецца не толькі парушальніку, але і ягонай сям'і, роду. Патрыярхальнае жыццё даволі часта не патлумачвала, чаму менавіта так, а не іначай трэба рабіць: «Гавораць так ад даўніх

часоў і робяць – гэтаксама, так і мы стараемся. Тут лёсу выпрабоўваць не трэба. З аповедаў ведаем, што чакае таго, хто ці то забудзецца, ці то незнарок нешта перайначыць».

Усё гэта зыходзіла з практычнага вопыту. Да падрабязнасцей вядома было, што спалавелае жыта нельга лішні раз трэсці, бо зярняты міжволі, самі па сабе, ад драбнейшага зруху, асыпаюцца. Старэйшыя то пастаянна маладзейшых падвучвалі: «Сажне жняя жменю і кладзе яе на ржышча, але калі пільна прыглядзецца, то ўзмах рукі ў яе не толькі кароткі, але і надзвычай асцярожны, каб не хвастануць з усяго маху каласамі па зямлі ці па ржоўніку. Так зробіць, то палова зерня, асабліва калі яно добра саспелае, на зямлі так і застанецца. З дзяцінства гэтаму навучалі. Справа, здаецца, не надта каб і хітрая, а ўраджай добра зберагае. Таксама і потым, калі снапы вязалі ды іх у дзясяткі зносілі ці ў копы складалі, то таксама стараліся лішні раз не надта збожжам трэсці. Вопытныя людзі то гэта і так ведалі, а вось маладзейшым выпадала даводзіць, каб слухаліся ды каб усё, як мае быць, рабілі».

ТРАДЫЦЫЙНЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ

# ЖНІЎНЫЯ ПЕСНІ

Вядома ж, наступнае сцвярджэнне грунтуецца не на практычных ведах, а на «душэўных якасцях чалавечай душы, бо яна чуйна да ўсяго адносіцца, а вылівае свае пачуцці ў ... жніўнай песні... Якія яны цягучыя ды сумныя, малазразумелыя таму, хто ніколі сам не жаў, не пацеў на жытнёвым палетку, не смажыўся пад бязлітасным сонцам. Такі чалавек нічога не зразумее. У нас песні гэтыя называлі не жніўнымі, а летнімі. Так і гаварылі, што, маўляў, гэтая жнейка (дзве, тры) хораша "літо" вядзе. Ёсць што паслухаць. Як зацягнуць, а галасы тыя высокім-высокія, то здаецца, што яны і з сонцам, і з небам, і з палямі, і з усім чыста гамоняць»:

Выйшла дівонька на загумэннейко,
Ручкі зложыла, тяжко ўздыхнула:
Ой, полэ, полэ, да ны батька ж мого.
У мого ж батінька загоны вузэнькі,
Загоны вузэнькі, розоры малэнькі,

А ў свюкра мойго ж загоны шырокі,
Загоны шырокі, розоры глыбокі.
Вун свойіх дочок на загун у радочок,
А мынэ ж, молодуйю, на загон самуйю.
Йёго ж дочкі пожнуть, пов'йяжуть,
Йёго ж дочкі пожнуть, пов'йяжуть,
А мні, нывістцы, ныколы ны поможуть.
Самэнька жну да й плакайю,
Самэнька жну да й плакайю,
Шчо такуйю долечку майю [18, с. 141].



*Матчына песня і жытнёвыя павевы*

Чамусьці адразу прыгадалася і маркотна-мінорнае купалава, якое таксама ўвабрала ў сябе жалліва-смутныя ноткі са жніўных песень:

Зашасталі глуха сярпы, як нажы,
Пад жніўныя вечна старыя напевы.
Спагадная, нудная песня плыве,
Ґубляючы ў пушчы свае пералівы,

У шэлестах белага коласу нівы.
Плыве гэта песня ка мне і заве,
І ў сэрцы звініць, як каса ў траве:
"Ты так жа, брат, сееш... а дзе тваё жніва?" [8, с. 122].

Ды і ў Я. Коласа перайначаныя матывы жніўных народных песень таксама былі не радасныя, не аптымістычныя. Прывядзём урывак з верша "Жніўныя песні":

Вось прыйшлі і жнейкі ў поле.
Заскакаў крывы сярпок,
І панёсся па прыволлі
Жнейчын звонкі галасок,
Сакавіты і пявучы,
Як вясенька, малады,
А тон жаласны, цягучы,
Поўны жальбы і нуды.
І панёсся ён мяжою,
Вольны будзячы простор,
Потым скаргаю-слязою
Ў неба вырваўся, замёр.
Колькі смутку ў песні жніва!
Хто той смутак парадзіў?
Ці жыцця лёс нешчаслівы,
Ці журба сялянскіх ніў? [6, с. 296–297].

Хто не чуў "у жывую" выканання жніўных песен, той многае страціў у разуменні народнага ладу быцця, бо яны надзвычай шмат чаго ў сабе акумулявалі і паведамлялі прысутным. Кожная жняя, атрымлівалася, выплаквала-спявала не толькі тое, што перадалося ёй ад папярэдніх пакаленняў, але і сваё, уласнае. Чаго, чаго, а жалю ды нудоты ў беларускіх жанчын заўсёды хапала: «Спявала, дажынаючы паласу, і Ганна, якой час ад часу дапамагала, падгалошвала мачыха.

– Да перастаньце вы ўжэ, – не вытрываў нарэшце Чарнушка. – Усё роўна як на могілкі сабраліся везці!..

– А не падабаецца, дак не слухаў бы, – адказала, аціраючы з гарачага твару пот, мачыха. – Грошай не просім жа!..

– Грошай... Да кеб булі грошы, дак не пашкадаваў бы, заплаціў, штоб не гулі, памаўчалі... І так маркота, а тут – як на хаўтуры!..» [13, с. 217].

З. Мажэйка адзначала: «Жніўныя песні, жнейскія, жытныя, жніво – частка летняга цыкла каляндарна-земляробчага фальклору. На Беларусі – узор традыцыйнай сялянскай народна-песеннай класікі. Выконваліся жнеямі на полі ("на ніве", "на паласе"). Падзяляюцца на зажын-

кавыя (пачатак жніва), уласна жніўныя і дажыначныя (канец жніва) песні. Галоўную жанрава-тэматычную групу складаюць пашыраныя па ўсёй беларускай этнічнай тэрыторыі ўласна жніўныя працоўныя песні, у якіх пераважае працоўная і сямейна-бытавая тэматыка. Асноўны матыў жніўных песень – выказванне журбы, крыўды, якія жняя стагоддзямі давярала ніве: скарга на непасільную працу ("ніхто ж мяне не пажалуе на шырокім загоне, у вялікім раздоллі"); нялёгкае жыццё ў сям'і мужа з проціпастаўленнем свайго і чужога дома, роднай і няроднай маці (бацькі); нараканне на адзіноту ўдавы, сіраты; шкадаванне пра страчаную дзявочую прыгажосць. Вобразны лад вызначае псіхалагічную тонкасць, яркасць працоўных замалёвак. Разгорнутыя маналогі жняі (часам яны перарастаюць у дыялогі) уключаюць звароты да векавых сіл прыроды – ветру, сонца, хмар ("Ой, ты, хмара-хмаранька, абыдзі староначкай"). З часоў прыгону ў жніўных песнях найбольш з усіх каляндарных выявілася антыпрыгонніцкая накіраванасць ("Па месяцу жыта жалі, а па зорах у копы клалі"). У асобных сюжэтных версіях матыў скаргі на цяжкую працу падаецца ў гумарыстычным тоне ("Ох, і дайце мне раду – мой загонічык ззаду"). Напевы жніўных песень яскрава выяўляюць характэрны для алігатонных ладава-меладычных сістэм драматургічны прынцып адначасовага кантрасту – рознанакіраванасць выразных сродкаў пры іх раўнапраўнасці, што надае падобным напевам асаблівую выразнасць. Нягледзячы на невялікі гукавы дыяпазон (найчасцей тэрцыя з захопам ніжняй кварты), напевы жніўных песень уражваюць шырынёй меладычнага дыхання, дзякуючы доўга працягнутым апорным гукам ладу, свабоднай імправізацыйнай рытміцы, інтанацыйнай гібкасці, багатай арнаментыцы. У паўднёвых (Палессе) і ўсіх раёнах Беларусі жніўныя песні гучаць напружана (накшталт плачу-галашэння), у паўночных (Паазер'е) пераважна лірычна, у заходніх і некаторых цэнтральных раёнах часта набываюць эпічныя рысы (з эпічнымі зачынамі паэтычных тэкстаў: "А заспорыў Дунай з морам за бедную сіраціну", "Да цераз лесы, да цераз боры брат сястрыцы пакланяецца"). У асобных мясцовасцях жніўныя песні збліжаюцца і нават зліваюцца з сенакоснымі (напевы, якія іх аб'ядноўваюць, называюцца "лета")» [2, с. 489–490].

Як бы там ні было і што б не адбывалася ў жыцці, але любая праца, нават такая радасная і цяжкая, вясёлая і нудная, заўсёды заканчвалася. Самае галоўнае, што ва ўсіх выпадках не існавала нейкага выключэння адносна таго, што надта добры ўраджай быў ці, наадварот, што намалоцяць столькі зерня, колькі вясною пасеялі, а ўсё роўна сцвярджалі сяляне: "Пеўню галаву скруцім у гэты дзень". Азначала гэта тое,

што гаспадары рыхтавалі багатую ("разнастайную і смачную") вячэру, каб добра пасядзець, прыгадаць найбольш удалыя, а то і не вельмі, моманты гэтага жніва.

І тут выпадала не забывацца пра традыцыю, пра "тое, як усё вялося даўней": «...Дажынаюць у той самы дзень, у які зажыналі. Часамі смяюцца з каго-небудзь і кажуць, што ён, у які дзень зажаў, у той дажаў. Смяюцца, што той кепські гаспадар, калі ў яго жыто можно дажаць за адзін дзень» [22, с. 96]. Атрымліваецца, што часта дзень дажынак спецыяльна прымяркоўвалі, думаючы абавязкова пра будучы ўраджай, ужо пра новы год, каб і там жыта ўрадзіла ды парадавала гаспадароў.

А. Сержпутоўскі згадваў: «Як канчаюць жаць жыто, та робяць дажынкі. Дажынкі робяць пад вечар. Канчаючы жаць, застаўляюць сярод загона нязжатым чуб жыта, велічыною як сесці. Гэты чуб, ці як яшчэ кажуць бараду, звязваюць чырвонаю жычкаю ці ніткаю, выполваюць чысценько зелле й кладуць паміж жыта акрайчык хлеба, солі й кусок сыра. Самі жанцы садзяцца кругом барады, паюць песні й звіваюць з жыта вянок, каторы потым нясуць дамоў і вешаюць яго на покуці пад абразамі. Адны бараду зжынаюць і нясуць яе дамоў, каб там разам з дажынкавым снапком змалаціць, а тое збожжэ пасвяціць і ўсыпаць ў насенне, другія застаўляюць бораду ў полі да тых час, пакауль яе не саб'е гаўядо ці не зьядуць зайцы» [22, с. 98–99].

Першы раз на ўласныя вочы я бачыў дажынкі чыста "індывідуальныя": у выкананні мамы. Калгасную палоску яна дажынала на трэці дзень, пад самы вечар. Потым, паклікаўшы мяне да сябе, прагаварыла: «Вось, сынок, і жніво наша на гэтае лета скончаецца. Дамоў трэба нам вяночак жытні занесці. Давай, дапамагай мне яго сплесці. Абразам пашану аддамо, каб і на наступны год жніво было ў нас у добрае надвор'е, каб здароўе спрыяла, каб рукі не рэзала, нічога не траўмавалася. Вось гэтыя каласочкі мы з табою сажнем. І называюцца яны "барадою". "Барада" – у яе заганяецца жніцай уся сіла з усяго чыста поля, у ёй і захоўваецца. Бачыш, каласы гэтыя і буйнейшыя, і жывейшыя, і вышэйшыя. Так і атрымліваецца, што "барада" ўсё старанна захоўвае, і нам выпадае зберагчы тое, што я ад сваёй бабулі ды прабабулі чула. Ты з гэтага боку па аднаму каліўцу вырывай і складвай сюды, а я буду сплятаць. Вянок пляцецца такі, каб гаспадыні быў у самы раз на галаву, яна яго і прымервае. Раней то вяскоўкі з поля ўсе чыста ў вянках з поля вярталіся, а яшчэ спявалі вельмі хораша. Каб ты толькі паслухаў, каб пабачыў, як усё гэта рабілася. А мы прыйдзем дамоў, я там табе пару летніх песень праспяваю. Тату пачакаем, ён таксама з працы прыйдзе, тады і пад абразы павесім. А пеўную галаву адсячэм, мы з табою гэта зарабілі».

Вяночак, звіты акуратна, з уплеценымі ў яго кветачкамі валошкі, быў надзвычай прыгожы. Мама надзела яго на галаву і мы пайшлі да краю поля. Дома жніца на самой справе мне паспявала. Рабіла гэта, седзячы пад абразамі, і наша маленькая хата напоўнілася яе звонкім голасам. Засмяялася і запэўніла: «Цяпер у нас усё ў парадку, усё зрабілі, як мае быць. Вяночак пакладу на стале, а прыйдзе тата, то ўсёй сям'ёй і павесім пад абразы. Ты вазьмі панюхай, які пах свежае збожжа мае. На полі ты паспеў нанюхацца, але там зусім іншы пах жытніх каласоў. Яны там пахнуць потам і слязамі гаручымі, часам што і крывёю, а тут, тут жа зусім іншае. Усё, сыночак, трэба ведаць, потым у памяці застанецца, а то іншыя нічога такога і не ведаюць, і не хочуць. За плячыма такое не насіць. Калі я жыла ў татавай хаце, то ў нас тры сям'і ў гэтым удзельнічала. Галасы ва ўсіх прыгожыя, звонкія, а старэйшыя яшчэ і даўнія песні знalі, то на паўночы ўрачыстасць тая расцягвалася».

Прыйшоў тата, умыўся, пераапрануўся, да ўсяго паставіўся на поўным сур'ёзе і адразу заявіў: «Не, Манька, ты жала, ты на полі гаспадыняй была, то і вянок пад абразамі вешай, а мы з сынам толькі "Ойча наш..." прагудзем ды за стол сядзем. Пеўня я яшчэ ўчора галавы пазбавіў і ён у печы за суткі добра ўпарыўся. Так што вячэра ў нас атрымаецца святочная».

Другі раз мне даводзілася назіраць дажынкі масавыя, калі вясковыя жнейкі, якія жалі ўручную ўсе калгасныя далінкі, ускрайкі, палегліцу, замоклыя ўчасткі палёў, завяршалі працу. Атрымалася гэта выпадкова: я тады працаваў памочнікам камбайнера ў свайго таты. Быў ужо вопытным «чалавекам», які многае ведаў і ўмеў у гэтай справе. Таму бацька ўжо і звяртаўся да мяне не так, як да першагодка. Камбайны выпадала ў той дзень пераганяць з аднаго далёкага поля на іншае, не надта блізкае. Гэта недзе каля дваццаці кіламетраў, а на камбайне, "як і на карове", не надта прыспешышся, таму тата закамандаваў: «Сядай з шафёрам у кабіну і едзьце туды, а я буду паціху пхацца. Там і адпачыць паспееш».

Яно то і на машыне па пыльных дарогах давялося дабірацца добрую гадзіну, так што можна было і на самой справе перадыхнуць. Усеўся я на беразе шырокага канала і ажно ў галаве зашумела ад нечаканай цішыні. Яна была нейкая на дзіва ўсюдыпранікальная, усёавалодваючая. Непадалёку касіў бераг стары вясковец. Ён неўзабаве прыйшоў да мяне і адразу працягнуў руку, якая нагадвала сабою нейкую ракавую кляшню: вялікую, цвёрдую, учэпістую. Сказалі адзін аднаму пару слоў. І аказалася, што дзед з Новага Двара і што яму ўжо за восемдзесят гадоў, а сена косіць, бо «і сыноў траіх мае, а ніхто з іх дапа-

магаць не прыязджае, адно – што нібыта па якой невядомай камандзе з'яўляюцца на "разбор" кабанчыка. І ўсё, зноў да новага такога выпадку іх не даклічашся».

І тут мне падалося, што нехта спявае. Ды не адзін, а некалькі галасоў адначасова павічкуюць песню. Няўцямна прыўзняўся са свежага пракоса. Дзед сядзеў нерухома, нібы нічога і не чуў нават. Такое магло здарыцца, асабліва ўлічыўшы ягоны ўзрост. Толькі я памыліўся. Стары, не рэагуючы, неяк сумна-сумна прамовіў: «Гэта, ўнучак, вашы жанчыны, якія дажыналі гэтую здаравенную даліну, дажынкі свае спраўляюць... Чуеш, як выводзяць... Птушкі і тыя прысаромлена заціхаюць... Во, дзе галасы, во дзе ўжо славяць ніву... Я наслухаўся іхніх песень і за ўчарашні дзень, нават гаварыў ім, што такіх спеўных жніц даўно не чуў... Нямала пражыў, а такія галасы не кожны дзень сустракаліся... Гэта ж ты толькі паслухай... Вецер і той прыціхае... Малайцы якія... Такая праца цяжкая, так іх за дзень сілу павысмоктвае, а яны ў песнях заходзяцца... Ты ўсё запамінай, калі граматны, то, можа, некалі напішаш... Усё гэта, унучак, адмірае вельмі хутка... Не паспееш азірнуцца, як і песень такіх болей не пачуеш... Ведаю, што гавару, бо жыццё хутка цячэ, а гады ляцяць, то што коні вараныя... Вось гэтае лета канчаецца і наступнага чакаць трэба. А ніхто ж не задумваецца, што ўсё гэта ў чалавечы карак укладваецца. У тую ношку гадоў, якую, з часам, і насіць цяжка бывае... Зараз вашы жнейкі на бераг выйдуць ды тут спяваць стануць...».

Ззаду віскнулі тармазы і спыніўся старшынькі "козлік". Запылены і мурзаты ад пылоты, гаспадар калгаса падышоў да нас, паручкаўся і адразу запытаўся: «Хараша спяваюць мае жніцы?». Дзядулька адно кірхнуў у адказ: «Ды яшчэ як выводзяць. Такое слухаў бы, здаецца, цэлымі днямі. Працуюць, а весялосць ад іх не адыходзіць. Яна так і патыхае ад гэтых жанчын». Старшыня задаволена чмыхнуў: «У іх сёння дажынкі. Я ведаю. Вось і прымачыць ды святочны стол накрыць прывёз з сабою. Мяне аграном папярэдзіў, што выручылі жанчынкі, не падвялі... Усю палегліцу, усе далінкі дазвання павыбрылі сярпамі... Выручылі, то і я не пастаю... Няхай паспяваюць... А мы тут пасядзім, пачакаем, калі яны на той бераг выйдуць, каб сказаць, што ўсё чыста зроблена, што нічога з жыта не засталося на ніве... Зараз ужо пакажуцца...».

І на самой справе, песня набліжалася, гучала ўсё выразней і выразней, разляталася па наваколлі. Неўзабаве на бераг высыпалі жніцы. Усе – і старыя, і маладыя – у белых кашулях, з вянкамі на галовах, з сярпамі на левых плечуках, яны нібыта выстройваліся па галасах. Песня не заціхала, а, здавалася, яшчэ і яшчэ мацнела. Наперадзе вы-

ступала дародная жанчына – Ксеня, якая трымала ў руках сноп жыта. Невялічкі, акуратненькі, павязаны чырвонай лентай, па баках ад яе стаялі дочкі, гэткія ж рослыя і прыгожыя, ля іх пакалыхвалася і мая матуля.

Азірнуўшыся, убачыў, што старшыня і дзядулька стаяць, а не сядзяць побач са мною. Усхапіўся і я. Але гэта яшчэ не ўсё: па мурзатым, агромністым твары старшыні ... цяклі слёзы. Ён, ад хвалявання, ці то ад той павагі, ад той непасрэднай урачыстасці моманту, ці то ад таго, што жанчыны пастаянна кланяліся яму, не мог прамовіць ніводнага слова. Прыціскаў капялюш да грудзей і спрабаваў нешта рэкнуць, бо ўсё паказваў рукою на жнеяк. Песня сціхла і Ксеня пачала звонкім грудным голасам: «Старшынька, з дажынкамі цябе! Дзякуй, што намі кіруеш ды нас паважаеш! Ты – чалавек строгі, дысцыплінаваны, але слова благога ад цябе ніхто з нас не пачуў! Выручаў ты нас, калі прасілі, то і мы цябе не падвялі! Стаіць твая ніва ў снапах! Камбайнаў чакае! Сноп ад нас вазьмі, а нам, сам разумееш, старшынька, дай што-небудзь, каб з жаночых сэрцаў сум-клопат сышоў, то мы табе не толькі дажынкі, але і вяселле яшчэ пакажам! Урачыстасць, сам бачыш, якая! З дажынкамі цябе!».

Ксеня нахілілася і трымала снапок на выцягнутых руках. Яго выпадала забраць, але ж канал перашкаджаў. Ззаду пачулася дзедава: «Унучак, не падвядзі... Забяры ад іх снапок...». Старшыня дрыготкім галасам дадаў: «Так проста не аддадуць... Ім жа падарункі трэба... Чакай, я зараз», – і кінуўся да «козліка». Праз якую долю хвіліны я ішоў да тога берага, трымаючы над галавою цэлую скрыню з віном, а на самым версе былі пакладзены яшчэ і розныя пакункі. Ксеня закамандавала: «Жаночкі, забярыце ў Алёшкі ўсё, а я яму сноп уручу, каб нашаму старшыні перадаў! Глядзіце, каб ён не зачапіўся ды не гопнуўся ў ваду з такімі падарункамі!». Пакланіўшыся, перадала мне сноп. Матуля прашаптала недзе з-за плячэй: «Сыночак, і ты пакланіся ды падзякуй, бо ж ты не толькі тым самым адну цётку Ксеню ўважыш, але ўсю нашу грамаду таксама».

Жанчыны селі прама на беразе, хуценька і шумліва зрабілі сабе “стол” і пачалі святкаваць. І ўсё гэта навідавоку, усё весела, радасна, не стараючыся нічога хаваць ці нешта прыдумваць. У іх усё проста зыходзіла ад шчырай душы. Старшыня, нібы апамятаўшыся, рэкнуў: «Хлопцы, а ў нас жа дажынкі! Пачакайце! А то жанчыны святкуюць, а мы адно слухаем усяго!». Праз пару хвілін і мы сядзелі вакол бутэлькі віна, пакладзенага побач кавалка хлеба і колца каўбаскі. Здавалася б, звычайная вясковая праца, а гэтулькі радасці было пры яе завяршэнні,

што праз столькі гадоў тыя людзі, нібыта жывыя, нібыта наяве, стаяць перад маімі вачыма. Чуюцца іхнія галасы, бачацца іхнія твары...

Удзельнічаў я і ў камбайнерскіх сезонных дажынках. Але яны ніколі не былі такімі ўрачыстымі і спеўнымі. Не, і мужчыны спявалі, часамі, нават вельмі хараша (і на два, і на тры галасы), толькі яны вельмі напіваліся. Потым пачыналіся "танцы": і пад язык, і пад гармонік, і пад лыжкі, і пад "палена". Скакалі, хто што ўмеў і ў каго ўжо як атрымлівалася. Далей, "натанцаваўшыся" і "наспяваўшыся", звальваліся перапспелымі снапамі, і тады памочнікам камбайнераў выпадала ганаровая роля: развозіць, разносіць, расцягваць старэйшых "таварышаў" па іхніх хатах.

Толькі жыццё даволі рэдка адорвала вясковых жыхароў добрым ураджаем, цудоўным збожжам. Здаралася звычайна ўсё наадварот, бо то землі былі не надта ўрадлівыя, а то надвор'е не спрыяла гаспадарам. І. Мележ ні ў чым не схібіў, калі паказаў жніво на змарнелых сялянскіх палетках ля сваёй роднай вёскі: «У галаве яшчэ стаяў шорхат жытнёвых сцяблоў, мернае жыканне сярпа. Стомлена жмурачыся ад зіхотнага сонца, яна (Ганна. – *А. Н., Я. Н.*) перавяла позірк на поле: нібы ўпершыню заўважыла, як сумна спусцела навокал апошнімі днямі. Рэдкія бабкі тырчаць, дзе-нідзе віднеюцца вазы. На адны з іх складваюць снапы, другія, перавальваючыся з боку на бок, як жоўтыя жукі, цягнуцца к Кураням.

Нямала палос ужо зжата зусім, на другіх жыта яшчэ млее маленькімі і большымі купамі. На кожнай паласе, дзе толькі стаяць бабкі ці расце жыта, варушацца людзі: хлопцы, жанкі, дзяўчаты, мужчыны, дзеці; шарэюць, бялеюць сарочкі, хусткі – усе Курані, здаецца, перабраліся ў поле. У каторых дзеці малыя, тыя прыехалі з калыскамі. Унь Хадора падышла да калыскі, што вісіць на састаўленых дручках, узяла малое, расшпіліла кофту, не садзячыся, прытуліла дзіця да грудзей.

Карчы кладуць воз. Яўхім чапляе перадок рубля за вяроўку... Хадоська жне ўтраіх, з бацькам і маткаю. Хутка ўжо кончаць – стараюцца, з самага рання ідуць, не разгінаючыся, руплівыя. Ім сёлета пашанцавала: жыта ў іх не такое паганае, як у іншых, будзе хоць што змалаціць.

А ў Дзятлікаў, у Васіля яе, жыта таксама нікчэмнае, мэтлікаў столькі і такія, што і глядзець горка. Як і ў іх, у Чарнушкаў...

Васіль ужо таксама блізка да канца паласы. Жнуць удваіх, маці з сынам. Жне і не азіраецца, сагнуўся, утаропіўся ў зямлю, бачыць толькі жытнёвыя сцяблы ды перавясла – хоць бы раз кінуў вокам на яе, Ганну» [13, с. 218].

Далей наставала для гаспадароў самая паважная часіна: неабходна было вазіць снапы з нівы дамоў. Здавалася б, самая звычайная

справа, але ў народным побыце яна, як заўсёды, была акружана арэолам міфічнасці, патрыярхальнасці, а ў многім яшчэ, і прымхлівасці. Яно і зразумела – хлеб новага ўраджаю дахаты возяць. З аднаго боку, вельмі хацелася пахваліцца, што, маўляў, ураджай на славу ўдаўся, што з хлебам да новага жніва будзем, а з другога – баяліся, каб людская зайздрасць не пашкодзіла, не прывяла да заўчаснай страты значнай колькасці збожжа. Усялякае здаралася. Таму і баяліся, таму і асцерагаліся, імкнучыся любым чынам, хоць неяк засцерагчыся, адмежавацца ад усяго ліхога. Таму і ў дастаўцы снапоў на падворак заўсёды знаходзілася нешта спрадвечна-адказнае. Таму нярэдкія былі сведчанні наступнага характару: “Першы раз вязуць збожжэ з поля позно вечарам прыцемкам ці раненька да ўсходу сонца, та мышы не ўбачаць збожжа й не будуць у ём рабіць гняздзечак” [22, с. 99].

І. Мележ даволі падрабязна апісаў тое, як адбывалася жніво ў першы год ужо ў абагуленых сялянскіх гаспадарках. Цяжка было тым першым калгаснікам. Яны толькі распачыналі калектыўную працу, калі ўсе за аднаго, а адзін – за ўсіх: «Пасля таго як дакасілі, разам ужо выходзілі і жаць. Станавіліся ў рад, зажыналі ўсе адразу і ішлі так, згінаючыся, кладучы за сабой снапы, пакуль на паласе не жаўцела адно пожня. Разам стаўлялі бабкі. Калі зжыналі адну паласу, гуртам, гамонячы, ішлі ўсе на другую.

Разам і звозілі снапы. Яшчэ кожны на сваім возе, на сваім коніку, але ўжо не на свае гумны, а на прызначаныя. Жыта – у Хведарава гумно, авёс і пшаніцу – у Грыбковае, а грэчку і проса – да Алёшы Губатага. Гэта больш за ўсё ўражвала куранёўцаў. Усё ж стагі і бабкі, хоць і касілі і жалі разам, стаялі ў кожнага на сваім надзеле, былі яшчэ нібы сваімі, асобнымі. Тут пачыналася ўжо іншае» [14, с. 124].

Стары сусед некалі распавядаў: «Мяне бацька яшчэ з ранняе маладосці навучаў усялякім гаспадарскім хітрасцям. Асабліва, гаварыў, трэба баяцца ліхіх вачэй, калі пачынаеш вазіць збожжа з нівы. Надта важна захаваць гэтую таямніцу ў свой першы прывоз. Бацька, то ўставаў недзе з другімі пеўнямі, запрагаў коніка і кіраваў на наш палетак. Ехаць было недзе з кіламетра паўтара ўсяго. Пакуль там зложыць воз, пакуль прыедзе назад, то і сонца над лесам зайграе. Стараўся зрабіць так, каб ніхто з гаспадароў на той момант яму па дарозе не сустрэўся. Казаў, што звычайна гэта ўдавалася зрабіць так, як задумаў. А калі нехта ўсё ж выпіраўся на вуліцу ці ўзіраўся з-за плоту, то бацька сплёўваў у ягоны бок і абавязкова казаў, нібы наймацнейшую закрэпку: “Каб табе павылазіла!”. Прывозіў воз у двор, рассцілаў некалькі, заранёў падрыхтаваных, дзяружак і пачынаў здымаць снапы. Рабіў гэта не спяша-

ючыся, не ірвучыся, а паважна, з гонарам, каб падкрэсліць, што хлеб гэтага году ўжо ўвесь будзе прывезены дамоў без нейкіх там лішніх складанасцей. Далей вазіў ужо, ні на што не звяртаючы ўвагі, днём, як і ўсе астатнія вяскоўцы. Цэлая навука была – вазіць снапы. Не думай, што ўсё гэтак проста. Не. На воз, яшчэ ўдома, засцілаў дзяружку. Гэта калі зярняты будуць асыпацца, то яны не проста на зямлю праз шчыліны ў дне павыпадаюць, а спакойна даедуць дахаты. Мяне вучыў не спяшацца ў гэтай справе. Снапы трэба было ўкладваць роўненька, па чарзе, як з аднаго, так і з другога боку. Каласамі ў сярэдзіну. Вазы вялікія асабліва накладваць было непажадана, каб лішні раз не рызыкаваць. Снапы зверху прыціскаліся рублём, а з бакоў яшчэ, на ўсялякі выпадак, любы ўдумлівы гаспадар апаясваў воз вяроўкай. Лепей было падстрахавацца, чым потым трапіць на людскія языкі. Ніколі на воз з снапамі гаспадар не залазіў, а ішоў побач з ім, і дзе трэба было, яшчэ і падпіраў воз плячом, каб складзенае не перакулілася на бок. Нічога, што воз драўляны і, на першы погляд, здавалася б, такі нязграбны, затое перакульваецца ён у адно імгненне вока. Яшчэ і не падумаеш, а ўжо калёсы ўверсе круцяцца. Не залазілі на воз, зноў жа, для таго, каб лішні раз не церушыць каласы. Праўда, здаралася, што нехта і залазіў на снапы, а найбольш ленаватыя, то тыя яшчэ ўмудраліся там і заснуць ды потым трапіць у незайздросныя сялянскія гісторыі. Бацька мой быў не з такіх. Разважлівы гаспадар, акуратны, вытрыманы, на дзіва, то і цягавіты ў любой працы. Мяне многаму навучыў. Шкада, што зараз гэтае ўменне няма ўжо каму іншаму перадаваць. І ўручную не жнуць, і снапы не возяць, і таго мудрагельства, выпадае, ім нізашто не трэба».

Кожны і заможны, і не надта вясковец стараўся старанна прыбраць, своечасова звезці збажыну на прыгуменні ці ў гумны. Толькі пасля гэтага вясковыя працаўнікі адчувалі сябе больш-менш спакойна. Але кожны думаў, непакоіўся ў першую чаргу за сябе, а потым ужо за іншых. Нават бацька і сын, калі ім выпадала вазіць снапы ў адно гумно, то маглі варагаваць паміж сабою. Спачатку ўціхую, а потым, калі што якое, то і адкрыта. Усё тут выклікала рэўнасць, злосць, а то і нянавісць. Хацелася, каб рабілася так, як менавіта думалася самому, а не так, як выконвалі маладзейшыя. Не тое, што яны былі слабейшыя ці менш спрактыкаваныя. Не, у многім жа ўсё залежала яшчэ і ад характару чалавека, яго жадання весці гаспадарку. Прыгадаем старога Карча з рамана І. Мележа: «Глушак скінуў снапы ў застаронак, загадаў сыну выводзіць калёсы з гумна. Сцяпан аброццю прыціснуў галаву каня да персяў, налёг локцем на хамут – конь неахвотна, але пакорліва пачаў адступаць задам: ён адышоў так крокі са тры, калі калёсы наткнуліся на нешта, сталі.

– Пастой! – крыкнуў стары сыну, незадаволены ўзяўся за задок калёс: няўдаліца Сцяпан і тут не выкіраваў як трэба – утулкаю кола зачапіў за варотнае шула.

Глушак, крэкчучы, падняў задок, пераставіў ад шула. Калі Сцяпан выбраўся з гумна – загадаў распрэгчы, накарміць каня; сам пастаяў трохі, паглядзеў на загуменную дарогу, зноў пасунуўся ў гумно. На прыгуменні, што чырванела водсветам заходняга неба, ён зноў павёў позіркам – ці не відаць Яўхіма з возам. Яўхіма ўсё не было, і Глушак пачаў злаваць. Не першы раз падумаў, што – пагана, калі ў адным гумне разам два гаспадары, хай хоць ён, той другі, і сын табе. Успомніў, што не раз – як сваю – браў Яўхім яго мякіну, тры разы – як са сваіх – насыпаў сабе з яго мяшкоў» [14, с. 106–107].

А ў той перыяд як толькі не спрабавалі выкручвацца гаспадары, каб у першы раз прывезці снапы з поля незаўважна. Ясная справа, што ў вёсцы такое амаль немагчыма, бо яна ніколі ўся не засынае, нехта ды бадзёрыць на вуліцы ці седзячы на прызбе альбо ля вакна. Тым не меней сяляне стараліся: «Калі ў першы раз дзед ехаў на ніву па снапы, то апранаўся ў чыстае, нібы на якое вяселле. Бабуля мая паціху паджартоўвала, маўляў, каб назад абавязкова прыехаў, а то яшчэ такога прыгажуна дзяўчаты па дарозе перахопяць. Невядома да каго і паедзе. Стары таксама не губляў гумору, пасміхваўся, аднак не забываўся пра сваю асноўную мэту. З двара выязджаў, калі ўжо па гаспадарцы ўпраўляліся. Перажагнецца тройчы, пакланіцца тройчы, хіляючы галавою на гумны, туды, куды павінен будзе прывезці снапы. Хітры быў, то на палетку не грузіў цэлы воз збожжа, а клаў з дзясятак снапоў, усё роўна прыціскаў іх рублём і кіраваў назад. Калі нехта і бачыў, як ён едзе, выпадкова ці спецыяльна чакаў на дарозе, то той чалавек бачыў толькі невялічкую частку ўраджаю і ягоныя зайздросныя вочы маглі паўздзейнічаць толькі на яе. Астатняя ж збажына заставалася па-за межамі ўздзеяння варажбітных вачэй. Прыязджаў дамоў, то ля гумна яго абавязкова чакалі ўсе дарослыя з нашай сям'і. Дапамагалі тыя снапы павесіць на азяроды ці паскладваць у дзясятак, у бабку, бо ўсё стане па-іншаму, калі пачнуць звозіць усе снапы і іх стане намнога болей. Працавалі моўчкі, паспешліва. Праходзіла пара хвілін і, здавалася, што на падворку ўвогуле не было людзей. Прыходзілі ў хату, а там ужо ўсіх чакаў святочны стол. Добрую вячэру паспявалі нарыхтаваць жанчыны, каб уся сямейка пасядзела за сталом, падзякавала ніву за ўраджай, папрасіла, каб сілка, патрачаная на палетках, вярнулася, каб цела па-новаму акрэпла. Разгаворацца так, што і далёка за поўнач сядзяць ды гамоняць, а то і песні спявалі. Таксама традыцыйныя – звычайныя.

Летнія іх называлі. А ўжо з раніцы ехалі ў два, а то і ў тры вазы за астатнім збожжам. Залежала, звычайна, усё ад таго, колькі ў тое жніво нажалі. Цяпер ужо не было каго баяцца і не было куды спяшацца».

Далекавата ад нашай вёскі ёсць вялізная лужына, якая не перасыхае ў любое цёплае ці гарачае надвор'е. Нічога дзіўнага б у ёй не было, каб не назва. Уявіце толькі. У лужы і назва. І назва тая адметная – "Саламяная". Спрабаваў даведацца, ці здавён яна існуе. Толькі хітраватыя палешукі з дарослых ды старых пасмейваліся і нібыта адрэзвалі: "Ад стварэння зямлі". Вось тады я і пра назву ў лужы даведаўся. Аказваецца, асабліва надакучала гэтае "нерукатворнае смярдзючае возера" вяскоўцам падчас звозкі сена і збажыны. Яна і сапраўды размяшчалася надзвычай "зручна": з абодвух бакоў людскія надзелы, а паміж імі дарога і дарога тая такая вузкая, што на ёй ледзьве два вазы раз'едуцца. А снапы ці сена вазіць – гэта вам не жартачкі. Тут і вопытны гаспадар запроста мог прамашку дапусціць. Нездарма ж сяляне гаварылі, што «хто ў "Саламянай" не плаваў і не перакульваўся, той ніякіх цяжкасцей жыцця не зведаў».

Прызвычаіліся людзі, што калі сустракаліся, напрыклад, два вазы, то спачатку абодва гаспадары стараліся пераправіць адзін воз на іншы бераг, а потым ужо і другі. Так і ратаваліся. Але, як сцвярджалі вясковыя насмешнікі, «лужа тая ніколі не пуставала, бо адзін толькі сваё сена ці снапы павыбярэ, па-новаму перакладзе ды далей, ад таго сораму і смеху людскога ўцякае, як туды новы "парцеец" уступае». Даходзіла да таго, што некаторыя, асабліва лайдакаватыя ды гультаяватыя, адразу залазілі на верх воза, пры гэтым ужо маючы пры сабе, на ўсялякі выпадак, агаворку: пільнуйся не пільнуйся, а калі твой лёс такі сёння ў гэтай лужыне выкупацца, то нікуды ты не дзенешся. Здаралася і так, што конікі самі выцягвалі, выходзілі, нібы па роўнай дарозе, але часцей то вазы перакульваліся. Вяскоўцы выбіралі перамоклыя снапы ці замочанае сена, скідвалі на вазы, але ў іх была ўжо гатовая агаворка: ніхто гэтай перашкоды не пераадолее, бо тут нячыстая сіла гаспадарыць. Асабліва гэта даводзіў мясцовы "рэкардсмен па усялякіх дурнотах і прыключэннях" – Трахім. Гэты ўмудрыўся, везучы ўсяго шэсць снапоў, заснуць на возе і прачнуцца прама ў лужыне. Потым яшчэ расказваў вяскоўцам, што конь хацеў яго і капытом лупянуць, але ён хуценька адплыў. Не даў яму здзейсніць такога злачынства ў адносінах да гаспадара. Мне даводзілася (і даводзіцца) сотні разоў бываць ля той славутай лужыны, едучы ў лес і вяртаючыся назад. Спрабаваў разгадаць, чаму ж яна ніколі не перасыхае і чаму гэтулькі вазоў тут перакульвалася. Мне падаецца, што знайшоў адгадку: у гэтым месцы вельмі блізка ад па-

верхні залягае гліна. Расклізканая, яна ніколі не давала збегчыся вадзе, і таму любыя колы не маглі адчуваць сябе на ёй упэўнена. Ледзь што якое, крыху пасунуўся воз і ўсё, ніякай сілай не ўтрымаеш, бо ён перакуліцца. Як даўней гаварылі вяскоўцы: «Як захацеў воз, то так і зрабіў».

Прыгадаем, як вазілі снапы з палеткаў мележаўскія героі: «Ідучы побач з возам, які важка ўціскаў колішнюю раллю і пожню, крактаў, небяспечна калыхаўся, Яўхім увесь час сачыў за ім: то падтрымліваў рукой, то падпіраў плячом. Толькі выбраўшыся на дарогу, на выезджаныя каляіны, адступіў ад воза, пайшоў спакайней, лягчэй...

...Воз жаваў коламі пясок і пыл каляін, шастаў добра змазанай воссю, конь рыпеў гужамі...

...Сцяпан адчыніў вароты, і грузны воз пачаў асцярожна ўцісквацца ў ляпу гумна. Яўхім ішоў цяпер наперадзе воза, збоч каня, паглядваў, як уціскваецца воз, – і на момант на вочы яго насунулася цемра: воз закрыў святло, што біла з двара. Калі воз стаў сярод гумна, цемра ўжо як бы апала – святло зноў ішло ў вароты.

Пасля гарачага пяску і пылу дарогі нагам прыемна было чуць гладкі і цвёрды, як лёд, халадок току, свежую, прапахлую зямлёю і збажынкою, прахалоду гумна, што хутка сушыла пот на целе і адзенні.

Яўхім адматаў вяроўкі, што завязвалі рубель ззаду, кінуў іх на ток, зняў рубель і стаў падаваць віламі снапы Сцяпану, які стаяў цяпер ускрай сцірты, што стромка падымалася ў застаронку. Снапы ляжалі роўнымі радамі ўжо да палавіны страхі, а яшчэ не ўсё было звезена. Яўхім з радасцю падумаў, што поле каля цагельні і ў гэты год не падманула, урадзіла ўсім Кураням на зайздрасць» [13, с. 224, 226].

Увогуле гэта было надзвычай прыгожае і цікавае відовішча, калі ў своеасаблівы вясковы караван-ланцужок збіралася каля дзясятка, а то і намнога болей, вазоў, накладзеных снапамі. Коні ішлі размерана, атрасаючыся і адфыркваючыся ад надакучлівага гнюсу, а побач з левым бокам воза, у пераважнай большасці выпадкаў, крочыў гаспадар, які ў любы момант гатовы быў падставіць уласнае плячо пад нахіленую паклажу. Так яны і пераадольвалі перашкоду: чалавек і конь – вечны яго вясковы памочнік і падтрымка.

Вядома, што спрадвеку гаспадары надта хваляваліся за тое, каб на іхняе збожжа, зжатае, звезенае і складзенае на падворку ў стагі, сцірты ("тарпы") ці ў гумне, а то і павешанае прасушвацца на азяродах, не вельмі накідваліся мышы і вераб'і. Якія засцярогі і меры тут толькі не рабіліся, але кожны з гаспадароў чамусьці з сумам зазначаў: «Як не сцярогся, а трацiну збожжа мышы сажраць паспелі...». Такое заключэнне зыходзіла са шматгадовых (і шматвяковых!) назіранняў. Суцяшаючы

сябе тым, што "мышам таксама есці трэба", вясковец ўсё роўна перажываў. Зерне гэтае давалася з такой цяжкасцю, з такімі невычэрпнымі намаганнямі, а тут... Тачылі мышы і чарвякі, налятаалі вераб'і і шпакі. Толькі здавалася, што ў параўнанні з вялізным стогам шкоднікі нічога не вартыя. Не раз прыходзілася чуць, як сцвярджалі ведаючыя палешукі, што "маленькая мыш, а за дзень вялізны сноп абмалоціць". Гэта адна, а калі іх было многа? У некаторыя гады, паводле ўспамінаў сялян, мышэй было столькі, што яны «ад гумна да гумна цяклі ракою, здавалася, што парваўся нейкі вялізны мех з гэтай поганню і таму яны разбегліся па няшчаснай зямлі».

Таму людзі і ратаваліся, загадзя стараючыся прадухіліць гэтую навалу рознымі шляхамі. Згадвалася пра рэлігійны аспект, калі да святых рэчаў і свянцонай вады звярталіся вяскоўцы, спадзеючыся, што магутная боская сіла спыніць мышынае і вераб'інае нашэсце, не дасць ім беспакарана вынішчаць збожжа. А. Сержпутоўскі адзначаў: «Калі ў стог пашні на прыгумеччы ці дзе-небудзь або ў торп у гумне палажыць проскурку, та мышы збожжэ й не крэнуць.

Каб вераб'і не калацілі да не пілі ў азяродах збожжа, трэба яго пасыпаць свянцонаю чацвярговаю сольлю» [22, с. 99].

Пераконвалі, што заможныя сяляне, а чаму менавіта толькі яны, бо такая паслуга была платная і за яе выпадала заплаціць лішнюю капейку, звярталіся да мясцовага бацюшкі, каб той прыйшоў і над свежаскладзенымі стагамі ці сціртамі са збожжам адслужыў малебен. Такое дзеянне пераконвала гаспадара ў тым, што ніякія мышы і вераб'і, чарвякі і іншыя шкоднікі не будуць болей псаваць ягонае збожжа: «У нас Уладзімір, то толькі сажне і звязе жыта на падворак, то адразу ж у бліжэйшую нядзелю прывозіў дахаты папа і той служыў малебен ля стагоў. Гаспадар быў на дзіва заможны. Кожнае лета наймаў з дзясятак жнеяк ды яшчэ трох-чатырох парабкаў круглы год трымаў у сваёй гаспадзе. Таму яму было за што хваляваацца. Плаціў, сам хваліўся, папу добра, то той з ахвотай прыязджаў спраўляць сваю справу. Парабкі гаварылі, што і на самой справе жыта ў снапах было не надта паедзенае. Значыцца, малітва тая дапамагала ў вядомай ступені, не давала нізашто знішчыць ураджай. Яшчэ пераконвалі, што нежывых мышэй і пацукоў часта знаходзілі ў ягоных сціртах. Так і ратаваўся той вясковец».

Часам падкрэслівалі, што бацюшку запрашалі не да аднаго гаспадара, а да некалькіх адразу. Мабыць, з разліку, што так давядзецца меней заплаціць: «Я ўжо падлеткам быў. І на тое лета ўраджай збожжа быў небывалы. Гэтулькі нажалі, гэтулькі стагоў наклалі збожжа. Гумно было поўнае, сціртa цэлая на прыгуменні стаяла. Тады наш дзед закаманда-

ваў, каб бацька з суседзямі зхаўрусаваўся і прывёз да сябе бацюшку. Ён у нас добры чалавек быў. Не сквапны, бо пра іншых усялякае гаварылі, а гэты бацюшка і працаваў сам, і іншых ніколі не акідаў. Так і зрабілі. Пасля службы ў царкве прывезлі бацюшку на наш падворак, той ажно тварам прасвятлеў, убачыўшы колькі збажыны нажалі гаспадары. Адслужыў малебен і на нашым прыгуменні і да суседзяў схадзіў па чарзе. Потым яго яшчэ і частавалі ў хаціне. Бацюшка не накідваўся на ежу і пітво, а хваліў Бога, што даў людзям гэтакі цудоўны ўраджай, ды прасіў шчыра, каб і на другі год гэтакая збажына ўрадзіла і каб зямля такім чынам сваіх працаўнікоў аддзячыла. Такі ўраджай, на маёй памяці, то ўсяго пару разоў і надараўся, а то ўсё болей звычайнае жніво, а то і частыя неўраджаі выпадалі. Усялякае здаралася ў сялянскім жыцці, таму і ад мышэй тых клятых імкнуліся неяк засцерагчыся».

Былі і іншыя засцярогі, якія ў народзе перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Земляробы ў іх верылі. А, магчыма, што гэта была і простая сіла самапераканання, якая паступова прыводзіла і да сапраўднай упэўненасці, што ўсё гэта спрацоўвала ў рэальнасці: «Пакуль хлеб на полі зложан у хрэшчыкі, мышы яго не чапаюць, а як яго перавозяць у гумно, та мышы пачынаюць грызці; каб яны не грызлі, трээ ў торп у гумне палажыць хрэшчык, што спечан на хрэсцы» [22, с. 99]. Палешукі былі перакананы, што ўсё «даўняе, праверанае многімі людзьмі, абавязкова дапамагае, яно падтрымлівае і такой старой навукі няма чаго адмаўляцца, няма чаго адкарасквацца, бо дзяды дурному не вучылі. Іхнія веды выручалі ў жыцці і не раз. Таму і нам, лепей, да ўсяго адносіцца з належнай павагай». Часта гаманілі пра тое, што «звычайную прасфорку, якую куплялі ў царкве, зберагалі на цэлы год і па часцінках разламвалі і ўжывалі ў справу, калі толькі трэба было. Так рабілі, напрыклад, на той момант, калі звозілі снапы з нівы дамоў. Як першы раз прывозілі, то старэйшы з сям'і ў самы адонак стога, тарпа ці сціrты, на складзеныя накрыж два снапы, заторкваў і малюсенькія кусочкі прасфоркі. Рабілася гэта для адпалохвання мышэй ад гэтага ўраджаю збожжа. Некаторыя з гаспадароў то тыя кавалачкі расціралі ў парашок і пасыпалі імі каласы першых, перакрыжаваных паміж сабою, снапоў, а іншыя, то проста заторквалі тыя кавалачкі, каб яны адразу нікуды не выпалі, пад пярэвясла. Гаварылі, што і малітвы абавязкова выпадала прашаптаць, а сусед наш даводзіў, што замову на захаванне збожжа няблага прыпадае прагаварыць. Кожны прапаноўваў свой варыянт, але ў адно, то верылі свята: у тое, што прасфорка дапамагае ратавацца ад нашэсця мышэй. Гаварылі, што і на новым месцы, куды кемлівыя гаспадары ўмудраліся звозіць новы ўраджай, усё роўна, праз нейкі ты-

дзень усяго, знаходзіліся мышы. Нібы іх хто туды перакідваў ці спецыяльна падносіў. Яны, відаць, па паху адчуваюць, дзе знаходзіцца збожжа і дзе ім знойдзецца спажыва».

Часта чулася і надзвычай спрошчанае сцверджанне, якое грунтавалася на аналогіі: калі гаспадар, не падумаўшы і нічога лепшага не знайшоўшы, пачынае есці на прыгуменні ці ў гумне, дзе ўжо знаходзяцца снапы, то там, ратуйся ты не ратуйся, а завядуцца мышы. Ды такія будуць галодныя, такія пераедлівыя, што і салому, і тую нават пачнуць жраць: «У той час, як возяць з поля снапы, кала азярода, стагоў або гумна, не можна нічого есці, бо ат мышэй не будзе атбою, так яны будуць грызці хлеб» [17, с. 99].

Верылі, што гаспадар, які ці то быў надта галодны, ці то проста зрабіў гэта, не падумаўшы, але ён адразу сам прыклікаў мышэй да свайго стога ці да ўласнага гумна: «Хлебны дух ён далёка чутны, асабліва галоднаму. І няма вялікай розніцы: чалавек гэта, звер, ці тая ж самая дробная мыш. Не паслухаўся старэйшых, учыніў па-свойму, то і маеш суровую адплату. Яшчэ добра, калі вясковец агледзіцца, што гэтулькі мышэй адразу з'явілася і пачне перакладваць тарпы, перасыпаць іх соллю. Праўда, найбольш спрактыкаваныя, то аднагалосна сцвярджалі, што соль ужывалася для таго, каб збожжа не гніло і ў ім не заводзіліся чарвякі. А што ж ты выратуеш, калі і з месца на месца снапы перааладкуеш? Мышы дык нікуды далёка не выберуцца, тут жа і застануцца. Гаварылі, што і котак на ноч прыносілі і пакідалі, ледзьве не прывязваючы ля збажыны, і малітвы па-новаму шапталі, але такія дзеянні ўжо мала дапамагалі. Справа ўскладнялася, відаць, тым, што мышэй прыцягвала недарэчнае дзеянне гаспадара. Снапы ж ніколі, калі хто не ведае, на сырую зямлю не клалі. Рабілі спачатку адонак – недзе з паўметра вышыні над зямлёю, на ўкапаныя слупкі, слалі жэрдкі ці дошкі і на іх потым пачыналі складваць снапы. Зноў-жа, каласамі ўсярэдзіну, стараючыся асабліва не разгойдваць і не кідаць каласамі, каб заўчасна не асыпалася зерне. На ноч прыкрывалі зверху торп ці стог або сцірту саломай, каб, калі пойдзе нечакана дождж, не прамачыла прыбранае на пагоду збожжа. Раніцай – раскрывалі і зноў клалі снапы, ажно да таго часу, пакуль не лічыў гаспадар, што ў гэты стог ужо хопіць звозіць. Кожны меркаваў па-свойму. У кожнага была свая галава на плячах. Тут не надта бегалі па суседзях за парадамі. Баяліся, бо тыя з зайздрасці ці з насмешкі маглі такога нараіць, што потым час быў валасы на галаве апошнія ірваць. Вялікае ўменне было – хлеб зберагчы і захаваць».

Замоўныя тэксты "ад мышэй" вылучаюцца ў беларускім фальклоры празмернай спрошчанасцю, дзе ўвага ўдзялялася таму, што "мышы

ўжо не галодныя і з'ядуць толькі невялічкую частку", "што яны з'ядуць не болей таго, чым ім трэба", ці "простае пералічэнне шкоды, якую прыносілі грызуны". Працытуем замову "ад мышэй": «А на гарэ зайка жаліцца, на яго дзеўкі сварацца. Не сварыцеся, дзевачкі, я ў вашым садзе не бываў, салодкіх вішань не шчапаў. Толькі адну адшчапнуў, і тую пакінуў, і пясочкам засыпаў, і лапкамі затаптаў» [15, с. 350]. Тут прысутнічае алегарычнае замяшчэнне мышы (мышэй) зайкам. Продкі былі перакананы, што чым часцей ты згадваеш грызуноў, тым больш "запрашаеш" іх у свае ўладанні, на свой падворак. За лепшае бачылі выйсце ў тым, каб грызуна падмяняць іншым, але не такім небяспечным і страшным для зерня. Таму тут і з'явіўся зайка, які не надта прыпадае да збажыны.

А вось тое, пра што мы ўжо згадвалі: мышы з'ядуць толькі "сваю" частку і не болей таго. Яшчэ адна замова "ад мышэй": «Раз, два, тры, чатыры, пяць, шэсць – гэта, мышы, вам з'есць, і хваціць з вас!» [15, с. 350]. Тут абмежаванне зыходзіць і ад чалавека, які вымаўляў замоўны тэкст. Ён вызначаў, колькі зерня могуць з'есці (знішчыць, звесці) у яго грызуны.

У замове "ад чарвяка" ўвага акцэнтуецца на тым, што чалавек павінен абавязкова звяртацца да звычайнага чарвяка (чарвякоў) у ласкальна-памяншальным плане, задобрываць гэтага шкодніка, каб ён прыслухаўся, "зжаліўся і аддаліўся": «Госпаду Богу памалюся, Святой Прачыстай Мацеры пакланюся. Святая Прачыстая Божая Маці, прыступі і пажажы свяшчонай-хрышчонай (імя. – *А. Н., Я. Н.*) чарвячок замаўляці. Чарвячок, чарвячок, у цябе 9 жонак: ад 9 да 8, ад 8 да 7, ад 7 да 6, ад 6 да 5, ад 5 да 4, ад 4 да 3, ад 3 да 2, ад 2 да 1, ад 1 і да ніводнай. Другім разам, лепшым часам, свяшчонай-хрышчонай (імя. – *А. Н., Я. Н.*) памажы, Госпадзі, чарвяка заламаці (паўтарыць замову 9 разоў)» [15, с. 350].

Іншы твор больш разгорнуты, але пабудаваны таксама па падобным сюжэце "ад чарвей": «Адна баба – адзін дзед, дзве бабы – два дзяды, тры бабы – тры дзяды, чатыры бабы – чатыры дзяды, пяць баб – пяць дзядоў, шэсць баб – шэсць дзядоў, сем баб – сем дзядоў, восем баб – восем дзядоў, дзевяць баб – дзевяць дзядоў, дзесяць баб – дзесяць дзядоў. Дзевяць баб – дзевяць і дзядоў, восем баб – восем і дзядоў, сем баб – сем і дзядоў, шэсць баб – шэсць і дзядоў, пяць баб – пяць і дзядоў, чатыры бабы – чатыры і дзяды, тры бабы – тры і дзяды, дзве бабы – два і дзяды, адна баба – адзін і дзед. Нету бабы, нету дзеда, нету збожжа, нету і чарвей» [4, с. 101].

У народзе пастаянна падкрэслівалі, што ў прыродзе ўсё падзелена на дзве часткі. Адна з іх дапамагае чалавеку ў гаспадарчым працэсе, а другая – замінае, перашкаджае і яму пастаянна прыходзіцца весці з ёю барацьбу. І што характэрна, часта на дапамогу вяскоўцу прыходзілі нават стварэнні, якія, здавалася б, ніякага станоўчага ўплыву на ягоны працоўны працэс аказваць не маглі. Тым не меней сустракаліся (і сёння, зрэдчас, яны яшчэ маюць месца) выпадкі, дзе на дапамогу селяніну прыходзілі нават ... рэптыліі. Напрыклад, вужы.

Вужоў надта шанавалі за тое, што яны знішчалі мышэй. Паводле народнага павер'я, калі мышы пачынаюць грызці падлогу, парог, то абавязкова трэба чакаць цяжкага, галоднага года. Вось вужы і павінны былі распраўляцца з грызунамі, каб не прадракалі тыя нічога дрэннага. Вельмі аберагалі сяляне і свае запасы жыта, пшаніцы, іншай збажыны, дзе таксама менавіта вужы выступалі своеасаблівымі грознымі ахоўнікамі: «У хаце часта вуж-дамавік мышэй глытаў. Тады іх многа было. А вужы таксама пільнавалі. Толькі зашкрабецца дзе-небудзь мыш у кутку, ён туды падпаўзае і стаіцца. Потым, калі яна выгляне, то ён мыш глыне. Часта бачылі такое»; «Вуж пільнаваў, каб мышы парог не дай Бог не грызлі. Казалі, што гэта мышы перад голадам стогнуць-плачуць. Тут вуж іх з'ядаў, як толькі пачуе ці ўбачыць, ім адразу канец надыходзіў»; «У сцяне і мышы жылі, і вужы. Раней сцены толькі дранкай у некаторых хатах абівалі, а вось глінай не абмазвалі, і яны там жылі. Але не надта ладзіліся, бо вужы паядалі сваіх суседзяў. Мышы пішчалі, трашчалі, елі нешта, а вужы ціха сядзелі»; «Мышы, вядома ж, елі ў хаце ўсё, што траплялася, а калі нічога не было, то грызлі і дрэва: сцены, парог, дранкі. Вужы іх елі. Гаварылі, што раз мышы дрэва ядуць, то голад у тым годзе будзе»; «Вужы ў хаце месца мышам не давалі, а калі яны пачыналі грызці што-небудзь, то вужы хутка з імі распраўляліся».

Там, дзе гаворка ішла пра мышэй, якія жылі ў збажыне, заўсёды згадваліся і вужы: «Як малацілі збожжа ў гумне, то вужы, здаралася, падалі прама з-пад страхі пад цэп. Справа ў тым, што там было цёпла, ды і есці было што – мышэй-то процьма. Вось яны і жылі там. Іх людзі не выганялі. Вужы ж няшкодныя і карысць вялікую прыносілі. Столькі мышэй паядалі. У некаторых гумнах, дзе вужы жылі, дык мышэй увогуле не было»; «У гумне вужы заўсёды жылі, там мышэй многа было, дык яны іх і елі. А людзям ад гэтага добра было»; «Там, дзе збожжа хавалі, заўсёды мышы вадзіліся, а там, дзе мышы, заводзіліся звычайна і вужы і знішчалі іх. Чалавек толькі выпадкова мог забіць вужа ў гумне, калі ён пад цэп хіба што трапляў. У асноўным жа вужа не чапалі, каб мышэй еў».

Адносна шанавання хатніх вужоў можна знайсці пацвярджэнне не толькі ў спецыяльнай літаратуры, фальклоры, але і ў мастацкай літаратуры таксама. Пра гэта згадваецца, у прыватнасці, у Дз. Макавецкага (урача Л. Д. Талстога), І. Сенчанкі (украінскага дзіцячага пісьменніка), Я. Брыля [17, с. 197–198].

Захаваць збожжа ў снапах было не так проста. Справа ў тым, што многае залежала ад надвор'я, а яно, як вядома, далёка не заўсёды спрыяла земляробам. Ды яшчэ жалі жыта не пераспелым, каб яно падчас жніва не асыпалася. Звычайна гаварылі: «Каб жыта не перастояла, бо тады многа бяды будзе: высыплецца з каласоў зерня багата, а гэта – няважная справа. За лепшае лічылі жыта жаць крыху зеленаватае, каб салома не зусім саспела, каб яна была яшчэ стойкая і не надта цвёрдая, бо тады ж і жаць цяжка. А зелянейшая яна і мякчэйшая і больш падатлівая ў такой справе. Увішныя гаспадары ведалі, як дасушваць ужо зжатае і звезенае з палёў збожжа. Найпершая справа – гэта азяроды, якія стаялі на прыгуменні амаль у кожнага вяскоўца і імі надзвычай зручна было карыстацца для прасушкі (дасушвання) сена і збажыны, а то і атавы, калі надвор'е не спрыяла і даводзілася вырываць кожную прыдатную хвілінку. Калі вешалі снапы на азяроды, то сяляне пасмейваліся, маўляў, трэба справу так асцярожна рабіць, са збажыною абыходзяцца, няйначай, "як з панам". Зноў жа, баяліся надта калаціць снапы, каб не высыпалася збажына. Але на падворку ўжо любы чалавек быў сапраўдным гаспадаром. Тут і выставіць, і вывесіць, і назад снапы прыбраць можна было, надта не баючыся, што яны трапяць пад праліўны дождж ці пад якую іншую трасцу. Праўда, да азяродаў трэба было добра прыстасавацца. Яно так заўсёды здаралася, што гаспадарчае прыстасаванне простае, а тым не меней выпадала і тут асцерагацца. Таму нават па палессі азяроды не ўсюды саслужвалі сваю адвечную і верную службу».

Часта вяскоўцы за лепшае лічылі, што збажына лепей прасушыцца ў стагах, тарпах ці сціртах. Так і гаварылі, нахвальваючы дзедаўскі метад: «Няма чаго выдумваць. Трэба проста ўмець скласці стог. Падбіраць так, каб ён быў не надта вялікі, ляжаў на высокім і рэдкім адонку і прыкрыты быў старанна, тады вецер і паветра ды сонца зробяць сваю адвечную справу: высушаць так, што зерне асобна потым і не прыйдзецца болей падсушваць. Яшчэ, падвучвалі, каб стагі са збажыной ставілі на ветрыку, каб не стараліся хаваць іх за гаспадарчымі будынкамі. Недзе на прыгуменні, заранёў спланаваўшы, ці там ужо было даўняе месца, гаспадар ставіў стагі так, каб яны ўтваралі вакол тока своеасаблівае кола. Выгода была ў тым, што вецер заўсёды гуляў, скразняк

прадзьмаў прастору і потым, калі ўжо пачыналі малаціць, то таксама зручна было снапы браць і рассцілаць іх на таку. Усё, як бачым, знаходзілася пад рукамі. Стагі, калі лічылі, што збажына ў іх ужо крыху правеялася, зверху прыкрывалі больш старанна саломай, каб снапы нідзе не зацякалі, бо тады збожжа пачне загнівацца і ў ім хутка завядуцца чарвякі і ўсялякія іншыя кузуркі. У стагах, у нас найбольш, збажына і дастойвала да малацьбы. Так было не намі заведзена і не нам, адпаведна, трэба было гэта адмяняць».

Тыя вяскоўцы, якія прызвычаіліся звозіць сваё збожжа адразу ў гумно, то яшчэ, у пераважнай большасці выпадкаў, ладкавалі ў іх і грубкі ці невялічкія печы. Рабілі гэта для таго, каб у патрэбны момант пачаць абаграваць вялікія памяшканні. Снапы, якія ляжалі на жэрдкавых падлогах, а тыя ўкладваліся на высакаватыя слупкі, добра вентыляваліся. А калі яшчэ і некалькі разоў старанна і абачліва палілі печку, то збажына ажно пачынала патрэскваць ад таго, што цеплыня і скразнякі даводзілі жыта да патрэбнай кандыцыі. Вядома, што тут гаспадары нічым не рызыкавалі, хіба што трэба было пільна сачыць за тым, каб незнарок не ўспыхнула полымя ад печы. Здаралася і такое, таму і перасцерагалі, таму і заклікалі быць пільнымі ў любой гаспадарчай справе.

ТРАДЫЦЫЙНЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ

# МАЛАЦЬБА ЗБОЖЖА

Нарэшце, надыходзіла і тая пара, калі вяскоўцы браліся за малацьбу збожжа. Звычайна, гэта рабілася, пачынаючы недзе з позняй восені. Чакалі "здаровага" надвор'я – гэта азначала, што спыняліся дажджы і ўсялякія іншыя непажаданыя кліматычныя казусы. Усё ж, большасць гаспадароў малацілі на адкрытых таках: на пляцоўках, "выбітых" пры дапамозе гліны і старанна ўраўнаваных сярод снапоў ці тарпоў збажыны. Заможныя сяляне пачыналі гэтыя працы прама ў гумнах, дзе ў іх былі ўладкаваны такі для малацьбы. Там жа, звычайна, віселі і цапы, якімі і абівалі зерне з каласоў. Гаварылі, што ток пакрывалі дзяружкамі, каб зерне не сыпалася на зямлю, а было на тканіне і потым яго было значна збіраць пасля абмалоту. Мала гэтага, яно было і чысцейшым. Толькі большасць з вяскоўцаў пацвярджалі тое, што нічога яны не падкладвалі, а чысценька вымяталі ток і працавалі на ім, бо «ўсё роўна потым збожжа яшчэ веяць трэба было і ўсялякае зелле ці пясок адразу асыпалася асобна ад зерня». Лічылі, што, працуючы

"па-старому", вяскоўцы ні ў чым не парушалі традыцыйнасць і святасць гэтага працэсу. Таксама даводзілася слухаць пра тое, «што, калі ў чалавека быў добры ўраджай налета, то малаціць было яму радасна і весела, бо ён ведаў наперад, што будзе з хлебам, што ні ў якім разе не стане пагражаць яму голад, а раз так, то і іншыя свае гаспадарчыя справы паправіць за кошт збожжа». Не сакрэт, што яно было не толькі хлебам, але і выгодным таварам, які ў любы момант можна было прадаць ці на нешта, пільна неабходнае, абмяняць.

Відаць, найбольш радасна перадаў сцэну малацьбы Я. Колас, бо ў яго, атрымлівалася, малаціў не адзін селянін, а дзядзька і чацвёра ягоных пляменнікаў. Нездарма ж пацвярджалі беларусы, што "гуртом і бацьку добра біць". Не адчувалася ў кампаніі хуткай і празмернай стомы, любое вясёлае слова падтрымлівала. А калі дадаць сюды яшчэ і абавязковы дух спаборніцтва, то зразумела, чаму такая праца весяліла і трымала на аптымістычным узроўні дух працаўніка:

Антось... Ды што!.. Цяпер забыта,
Даўно пажалі тое жыта
І тыя межы пааралі,
Што дзядзькаў смутак калыхалі.
– Ну, хлопцы: зараз дамо жару!
Саб'ем пасадаў яшчэ з пару. –
Снапы ў радочкі палажылі,
Так і дзяды яшчэ вучылі,
Каб каласы ды з каласамі,
А да пярылаў гузырамі.
– Ну, грымнем, хлопцы, каб звінела!
І пяць цапоў ідуць у дзела!
Не малацьба, а бубнаў хоры!
Здаецца б цэпам вадзіў хворы!
Бічы кладуцца так рытмічна,
Само гудзенне іх музычна;
Снапы не ўлежаць, скачуць самі
І сыплюць жыта пад бічамі,
А дзядзька рэй вядзе, гукае
І адным крыкам памагае:
– Дай, дай яму, брат! Дай з-за вуха!
Гэ-гэх, скачы, баба-псяюха! –
Гудуць цапы ўгары праворна,
Ідзе работа дружна, спорна,
Аж падшыбае ўсіх ахвота,
Бо мае свой захоп работа [7, с. 139].

А вось у незавершаным вершы Я. Купалы “Малацьбіт” прыадкрываецца зусім іншы аспект: не проста працоўны, не проста радаснае дзеянне з будзённага гаспадарчага працэсу, а спроба філасофскага роздуму над адвечнасцю сялянскага (беларускага) жыццёвага шляху. Сялянская праца прыстасоўвалася да пошукаў таго, што потым у паэта акрэсліцца, як “людзьмі звацца”:

Валіць цэпам малацьбіт
Па насушэным калоссі
Збіліся людзі з пуці
Сцежкі, сцежкі ніяк не знайсці [10, с. 247].

У вясковым жыцці прызвычаіліся да таго, што любая сялянская праца не з'яўлялася нечым выключным. Гэта зусім не так. Проста яна ў многім залежала ад майстэрства працаўніка, ад ягонага выканання. У працы гаспадар заўсёды знаходзіў выйсце з цяжкага псіхалагічнага становішча. Так яму было лягчэй, бо, працуючы, ён забываўся, “адыходзіў душою”: «У дзень Васіль найбольш быў у гумне: малаціў. Зняўшы з шула цэп, размахваўся, біў і біў па разасланым жыце, па ячменю, пад якімі чулася цвёрдасць тока; зграбаў салому, падмятаў зерне; зноў зносіў, рассцілаў снапы, мерна, звыкла цупаў бічом. Часам прыходзіў дзед: памагаў веяць збожжа. Заходзіла матка: ці звала абедаць, ці прыносіла чаго-небудзь пад'есці; памагала адграбаць салому. Вярнуўшыся са школы, зазіраў Валодзя; калі аднойчы Васіль, спатнелы, зморана варушачы плячыма, выйшаў з гумна, малы ўзяў важкі, доўгі цэп, натужваючыся, размахнуўся. Біч мала не зачапіў галавы, а калі Валодзя выцяў па снапах, балюча рванула рукі, але Валодзя не адступіўся. Сапучы, падняў цэп другі раз, трэці... Васіль хутка вярнуўся, хмурна папракнуў:

– Вырас пад жаніха, а цэпам выцяць не можаш!

– От зараз, глядзі! – загарэўся Валодзя.

Ён, чырвоны ад натугі, ударыў бічом штосілы: канешне, як сам Васіль; але Васіль быццам і не заўважыў, строга загадаў аддаць цэп. Стаў моўчкі малаціць, як бы Валодзі тут і не было...» [14, с. 294].

Васіль прызвычаіўся да таго, што падчас цяжкай манатоннай фізічнай працы яму добра думалася, разважалася на самыя розныя жыццёвыя тэмы. Тут яму ніхто не перашкаджаў, не замінаў і, тым болей, не лез з усялякімі надакучлівымі пытаннямі. Праца была і падспор'ем, і дарадчыкам. Менавіта ў яе працэсе гаспадар мог спакойна знайсці выйсце з незайздроснага становішча, супакоіцца, прыйсці ў сябе, “астудзіць гарачую галаву, каб незнарок не наламаць дроў, каб з адчаю не ўкінуцца ў яшчэ большую бяду”: «Ён (Васіль. – *А. Н., Я. Н.*) абыякава ўзяў цэп.

Проста таму, што трэба было штосьці рабіць. Доўга біў па снапах, не мог супакоіцца. Стаміўшыся, сеў на сценку, перадыхваў, астываў. Злосці не было ўжо, была толькі важкая, салодкая стома» [14, с. 308].

Магло падацца, што прыгуменне, гумно, малацьба і на самой справе былі для Васіля тым месцам і заняткам, дзе ён прыходзіў у сябе, адшукваў псіхалагічную раўнавагу, адчуваў здольнасць зноў вярнуцца ў ранейшую жыццёвую стыхію: «Калі яны ўвайшлі ў гумно, Васіль азірнуўся. Ён глядзеў на іх толькі момант, амаль адразу адвярнуўся, стаў зноў зграбаць памалочаную салому, кідаць у застаронак» [14, с. 316].

Нават пра новы надзел зямлі, які яму павінен дастацца пры дзяльбе ўжо ў агульнай калектыўнай гаспадарцы, Васіль думае ў гумне. І гэтым самым таксама нібы папярэджвае адвечную думку пра будучую сяўбу, ураджай, сямейны здабытак: «Стаяў, важка думаў: пайсці хіба ў гумно – намалаціць тое, што засталася. Запаліць ліхтар і ўзяць з сахі цэп... Не было ахвоты...» [14, с. 396].

Здаралася чытаць, асабліва ў аўтараў, якія самі ніколі ў жыцці не малацілі і ўвогуле нават не ўяўлялі, што такое малацьба цапамі ("малацьба ўручную"), даволі смелыя меркаванні. Напрыклад, М. Гордзін піша: «З акна былі відаць агеньчыкі ў хацінах – уся вёска паліла печы, а на гумнах пры дапамозе спальваемай саломы малацілі збожжа...» [3, с. 111]. Магчыма, што недзе гэтак і рабілі сяляне (рускія), а нашы саломы на таку не палілі і ў гумнах – таксама з простай прычыны: баяліся пажару. Гэта ж салома. Да таго ж сухая, лёгкая, калі яна ўспыхне, то ні пра якое святло, ні пра якую малацьбу, ні пра які ўраджай ужо гаварыць не даводзілася. Асвятлялі такі ці памяшканні звычайнымі паходнямі, за гарэннем якіх пільна назіраў нехта з падлеткаў ці са старых людзей.

Сярод вяскоўцаў шырока бытавала прымаўка, што "які з гэтага чалавека працаўнік (гаспадар), малацьба пакажа". Ведалі продкі, што гаварылі. Амаль ніколі не была малацьба такой, якой яна апісана ў творах Я. Коласа. Паўторымся, там працавала грамада, няхай сабе і не надта дарослая, але дружная. А калі селянін заставаўся адзін на адзін з стагамі збажыны, то было яму і падумаць пра што, і паказаць уласную сілу, вынослівасць ды спрытнасць. Падкрэслівалі ж нашы землякі, што "з ім не змалоцішся". Гэтаксама, як і "з ім не скосішся". Гэта была пазнака працавітага чалавека, які разлічваў толькі на сябе самога, на свае рукі і плечы. Нават у вусна-паэтычных творах засталіся сведчанні пра тое, як бацька дзяўчыны (будучы цесць) выбірае сабе зяця. Э. Яленская запісала такі твор – "Беднасць не загана": «Була ў бацькі дочка вельмі красіва. Прыходзіць к ёй трох кавалераў: два ўбраныя, што толькі глядзець, а трэцій у такіх латах, што неможна і пазіраць. Так сталі аны

ту паненку сватаць, і той сватае, што ў латах. Так тые, уберание, смеюцца над ём да кажуць:

– Ты, негодный! Да латуне ты! Куды ты лезеш! Ана, тая паненка, уберана, хароша, а ты ў латах.

...Так той латун путае ў бацькі паненкі:

– А ці есць у вас, паненка, гумно?

І заве тых уберанах панічоў:

– Хадзем мы ў гумно – хто пяць коп вымалаціць жыта лучшэ, таго будзе паненка.

Пашлі аны ў гумно – той сабе насадзіў пяць коп, той сабе насадзіў, да той сабе – і малоцяць аны, і малоцяць... да той, што ў латах быў, пяць коп вымалаціў, памерыў і ў бочкі ўсыпаў. А тые і па капе не вымалацілі...» [27, с. 102].

Вось так, атрымліваецца, што далёка не ўсе і не заўсёды выбіралі сабе зяцёў па вопратцы і па пярсцёнках на пальцах, спрабавалі праверыць іх і ў гаспадарчых справах, бо ад умення зяця працаваць залежаў напрамую лёс іхняй дачкі, будучых унукаў. Хацелася ж любому бацьку, каб дачка трапіла за працавітага і ўвішнага, а раз будзе ён такім, то і заможным зможа стаць, і апранецца, як след, але самае галоўнае, што такі чалавек заўсёды пракорміць уласную сям'ю, не дасць магчымасці ісці жабраваць ці наймацца парабкаваць. Пра гэта заўсёды памяталі.

Восеньскімі часінамі па вёсках хадзілі мужчыны, якія наймаліся малаціць збожжа. Яно і не здзіўляе, бо ў многіх сем'ях не было каму гэта рабіць: заўчасна паміралі гаспадары, асноўны карміцель знаходзіўся ў войску, а то і на ад'яздных заробках, на гаспадарках заставаліся жанчыны, старыя ды малыя. Гэта такія катэгорыі насельніцтва, якіх ніколі не папракалі ў тым, што яны не працуюць, не стараюцца, але падкрэслівалі, што малацьба – гэта мужчынская справа. Яе павінны выконваць здаровыя і вынослівыя рукі і плечы.

В. Адамчык падрабязна перадаў у сваім рамане «Чужая бацькаўшчына» ўвесь працоўны працэс у выкананні прыходзячых (наёмных) малацьбітоў. Умела ўплёў у свой аповед і народныя павер'і, прыкметы і прыказкі, якія датычыліся гэтага занятку. З веданнем справы ён паказвае, як шукалі працу мужчыны, як дамаўляліся пра аплату, дзе спалі і чым харчаваліся, вядома ж, як працавалі:

«– Ці патрэбны вам малацьбітэ? – глянуўшы спярша на маладзіцу, потым на старую, спытаў мужчына ў белым кажусе.

– Чаму ж, патрэбныя, – сказала маладзіца, падсоўваючы на лаве хлеб. – Садзецеся...

...– У нас ужо мышы добра памалацілі, – ссунулася з ложка старая і, трымаючы на сашчэмленых руках вагкі клубок, панесла яго да печы – там ля коміна сохла яшчэ зеленаватая пража.

– Нічога, і нам хопіць, – сказала маладзіца» [1, с. 12].

Усё, як мае быць, азнаямляльная размова, запрашэнне да стала паснедаць, а потым і абавязковыя, як і ў любой іншай справе, змовіны адносна аплаты за працу. Прыкідвалася не толькі аплата, але і тэрміны выканання працы:

«– То мо ўмовімся з платаю, – спытаў ён, не абарочваючыся, а толькі настаўляючы вуха туды, куды гаварыў, да маладзіцы – што скажа яна.

– А сколькі ж бяруць цяперака за малацьбу?

– Два злоты і кіля солі.

Маладзіца насупілася, пакусала край ніжняй губы і падняла голаў:

– Дарагавата, але хай, бо мышы даўно авёс стачылі.

...Гаварыў толькі стары:

– А колькі ж коп нажалі?

– Чатырнаццаць.

– Ого!

– Нічога, дзядзька, зіма з велькім горам усё з'есць.

– Як, Імполь, да каляд змалоцім? – стары, задраўшы рэдзенькі чубок, глянуў на маладога, пацёр шорсткую, у вострым, як зацярушаным, шкле сівых валаскоў няголеную шчаку. – Управімся ж па капе за дзень. Шэсць пасадаў... У пасадзе дзесяць снапоў... А дзесяць снапоў што? За гадзіну не саб'ём?

– І больш, пэўня, – адкідваючы з брыва навіслую кудзерку валасоў, малады падняўся з-за стала» [1, с. 15].

Усё малацьбітамі старанна аглядалася, да ўсяго яны "прыцэньваліся", бо гэта павінна было спатрэбіцца ім у будучай працы. Як мы ўжо і адзначалі, у любым сялянскім занятку не было дробязей. Хіба толькі, што адзін вясковец рабіў усё больш жвава і акуратна. А іншы – марудна і абы з рук. Тым болей, калі людзі прыходзілі ў чужую гаспадарку наймацца, то іх маглі ацаніць яшчэ і па веданні ды абмяркоўванні будучай працы. Калі нешта не падабалася, то і аплату маглі запроста "падрэзаць", а то і ўвогуле адмовіцца ад паслуг, перарваўшы дамову. Бакі, звычайна, былі гатовыя і да такога павароту справы:

«– Сядзіш тут, а мышы жыта стачылі, – маладзіца тупнула нагою на ката і, выняўшы з прабоя прывязаную на вяровачцы затычку, адчыніла абедзве палавіны дзвярэй.

Мужчыны зайшлі ў гумно.

– Мы як змалацілі на насенне, то болей і не чапалі, – сказала маладзіца, прывальваючы каменем дзверы. – Стары ўсё яшчэ ямо.

– Ого! – пакруціў галавою стары, аглядаючы гумно. Яно аж пад кладку было заложана збожжам: адна старана жытам – тоўстымі, вязанымі па многа жменяў снапамі, каб, мусіць, лічылася, што менш коп нажалі, другая старана – аўсом і ячменем» [1, с. 16].

Такая хітрасць адносна таўшчыні снапоў выкарыстоўвалася жанчынамі, не толькі для таго, каб не злаваць нечыя чорныя, зайздрослівыя вочы, але яшчэ і для таго, што калі звозілі снапы з палеткаў, дык гаспадыні ж таксама наймалі сялян-возчыкаў, а тыя заўсёды на воз клалі толькі адпаведную колькасць снапоў. Плату ж бралі за кожны воз. Таму і атрымлівалася, што хітравалі возчыкі, але ім не паддаваліся і вяскоўкі. У кожнага, бясспрэчна, быў свой разлік:

«– Пакажыце ж вашы цапы, – стары, пераступіўшы смецце, падышоў да шула: там, на вялікім цвіку, віселі цапы і граблі. – І ліхтар нам на заўтра патрэбны. Ці ёсцека ён у вас? – спытаў ён і зняў з цвіка цяжкаваты з гладкім бічом цэп.

– Чаму ж не. Толькі пазычылі некаму... І каму ж гэта? – разагнулася маладзіца і абкруціла кругом шыі рог раз'еханай хусткі.

– Яно ж і відно, – зняў з цвіка другі, з расколатым бічом, цэп і абярнуўся да Імполя стары малацьбіт. – Бічы нам трэба было б памяняць, а то якая гэта будзе работа.

...– Бічы ёсць, – вымеўшы з гумна смецце, маладзіца кінула ў куток сухі бярозавы венік. – Мой нябожчык як палажыў іх сушыць, то і цяперака ляжаць за комінам на печы» [1, с. 17].

Малацьбіты паміж сабою дамаўляліся, з чаго пачаць працу, каб усё выглядала салідна, па-дзелавому. Нават, наймаючыся, нельга было забывацца пра парадак і толк у працы. У саміх натурах мужчын ужо трывала аселі з гадамі такія звычкі:

«– Авёс скідай, – крычаў Імполю стары малацьбіт. – З аўса пачнём, а то ж яго любяць мышы. Дый на кісель трэба ж змалаціць...

Ён стаяў на торпе збожжа, трымаў, узяўшыся за перавясла, кароткі аўсяны сноп. Чакаў, пакуль стары падмяце зацярушаны сечкаю ток.

...Алеся з-пад ражка тоўстае, накінутае на галаў суконнае хусткі цікавала туды, на торп, бачыла, як у яго, Імполя, на верхнюю губу смешна вылез кончык языка, калі ён, ганяючы вецер, адзін за адным пачаў кідаць на падмецены ток шапаткія аўсяныя снапы. З аднаго сашмаргнулася і асталася ў Імполевай руцэ перавясла – на току разбэрсалася пучкамі слізкая аўсяная салома.

– От удалы, – пакруціў калматаю авечаю шапкаю стары малацьбіт, нагінаючыся і зграбаючы ў сноп аўсяную салому.

– Велькая бяда, што каторы разаб'ецца, – яна адступілася да дзвярэй...» [1, с. 25].

А далей, як і водзіцца, – сама малацьба:

«– Не, саб'ем ужо гэты пасад, – Імполь паплёваў на далоні, зняў з шула стары, абсклізганы цэп.

– Ну, што ж, пакуль цэп, датуль хлеб, – стары малацьбіт, нібы нехаця і паволі, толькі патрапляючы Імполю ў такт, раскручваў цяжкі грабовы біч.

Бэрсаючы і падкідаючы салому, высока ўгору адзін за адным падніmaліся вагкія біччы і, перакручваючыся там, з гакам прыставалі да трапятлівых снапоў. Па дошках пярыла секлі мігатлівыя зярняты, уздрыгвалі і шапацелі, як жывыя, кароткія аўсяныя снапы.

Стары малацьбіт скінуў з галавы аб'еханую на вочы авечую шапку і, паблісквацочы мокрай лысінай, зноў з крэхтам замахаў цэпам, трапляючы Імполю ў такт. Ад натугі ў яго ўпіраўся ў левую шчаку язык – на ёй расла і цвярдзела вялікая гула.

З гумна ляцеў расцяжны гупат, аддаваўся за чужымі будынкамі. Здаецца, малацілі ў іншым гумне» [1, с. 26].

Так атрымалася, што многае з народнага календара, з промыслаў, з працоўнага і гаспадарчага працэсу не здолелі (не паспелі ці не здагадаліся своечасова звярнуць увагу) прафесійныя фалькларысты і этнографы, таму такія аспекты засталіся ва ўжытку дзякуючы, у першую чаргу, пісьменнікам, якія прысвяцілі сваю творчасць апісанню вясковага жыцця беларусаў у даўнейшыя часы. Даводзілася чуць, што ў продкаў, асабліва калі наймалі малаціць чужых людзей, бо самі не ўпраўляліся, то спраўлялі "дамалоціны". Назвы гэтага тэрміна могуць быць рознымі, у залежнасці ад рэгіёна. Спашлёмся на В. Адамчыка:

«Назаўтра спраўлялі дамалоткі.

Яшчэ перад полуднем мужчыны лёгка паляпалі цапамі па горбе змалочанага ячменю – скаласавалі яго, адбіваючы ад зярнятак вусатыя асцюкі – і вясёлыя, закураныя пылам вярнуліся ў хату. Адхаркаўшыся і папляваўшы гэтым рудым паршывым пылам у памялешнік, стары малацьбіт, чырвоны ад задухі, выцер мокрыя вочы, змераў з ног да галавы Алесю і выскаліў свой дупляваты счарнелы зуб.

– Ну, гаспадынька, не стой, лезь на хату па здор...

– Няўжо змалацілі? – нейкім вясёлым голасам перапытала Алеся.

– А ты думаеш што? – маргнуў калматымі абкуранымі вейкамі Імполь.

– Тады ўжо не грэх і да здору чаго. – Алеся азірнулася на сцяну, знайшла на цвіку свой каптанік і хустку і выйшла з хаты, вярнуўшыся назад са спацелаю, сіваватаю, мусіць, купленаю загадзя дзеля такога дня бутэлькаю і ружаватым бруском сала» [1, с. 179].

Пасядзелі найміты і гаспадыня за сталом, пажадалі адзін аднаму здароўя, падзякавалі пана Бога за тое, што даў ім "сілкі, здароўя і цярпення" і прыступілі да самага важнага для малацьбітоў моманту – разліку:

«Адвярнуўшыся спіною (Алеся. – *А. Н., Я. Н.*) і папляваўшы на пальцы, доўга адлічвала іх (грошы. – *А. Н., Я. Н.*). Нарэшце прыціснула да стала порсткія, што падымаліся, як сухое лісце, паперкі.

– Вот, дзядзька, палавіну грашыма, а палавіну гатоўкаю – жытам плачу, як і ўмовіліся (праўда, раней аўтар гаварыў, што за малацьбу па два злоты ў дзень і кілаграму солі. – *А. Н., Я. Н.*).

Стары згроб вузлаватымі, жоўтымі ад тытуню пальцамі грошы, пералічыў іх зноў, кладучы паперку на паперку. Моршчачы лоб, падумаў і зняў з купкі адну паперку, прыпляскаў яе каля паліванае з ружаватым салам талеркі.

– Умаўляліся, то на двох, а як аднаму – ці не зашмат выходзіць?

Імполь адхіліўся ад стала, паклаў рукі на калені:

– Як даюць, дзядзька, то бяры.

– О, нашто мне грэх? Нашто мне чужыя грошы? Чужога не спажывеш...» [1, с. 181].

З нашых фалькларна-этнаграфічных запісаў таксама паўстае неаднaзначная карціна малацьбы. Тое, што гэта было падвядзенне вынікаў жніва – бясспрэчна, але тое, што малацьба давалася кожнаму ў знакі па-свойму – таксама ніколі не хавалася вяскоўцамі. Нават малазямельных сялян не заўсёды асуджалі, не ва ўсіх выпадках з іх насміхаліся. Наадварот, пры любой магчымасці стараліся падкрэсліць, што «Бог усім зямлю і збожжа дае... Ён ні ад каго не адварочваецца... любы гаспадар, калі толькі добра ўпрэцца, ды ўхопіцца за сваю гаспадарку, то за некалькі гадоў можа значна павялічыць свой сямейны прыбытак... Галоўнае, не ўхіляцца ад працы. А калі яшчэ і жонка ўвішная ды працавітая, то ні ў якім разе гэтакая сям'я ніколі ззаду не будзе. Тут яшчэ ёсць адзін найважнейшы момант – здароўе. Калі Бог ім не акінуў, то ўсё прыйдзе да ладу, а там і дзеці пойдуць, падрастуць непрыкметна і дапамагаць стануць. Адным словам, гэта лёс многіх сялянскіх пакаленняў. Нікуды ты ад яго не дзенешся. Не схаваешся, бо доля твая землябробчая ўсюды цябе знойдзе».

Мае землякі пераконвалі ў наступным: «Калі пачыналі малаціць збожжа? Восенню, калі надвор'е станавілася здаровае, то тады іменна і прыступалі, каб не цягацца з снапамі туды-сюды на выпадак дажджу ці якой нечаканай залевы. У гумне мала хто малаціў, толькі тыя ў каго збажыны было мала, бо ў нас гумны, пераважна, невялікія будавалі

і там асабліва не было дзе развярнуцца. А малаціць і цэпам жа размахнуцца выпадае і сагнуцца-разагнуцца прастора трэба. А калі некалькі чалавек малоціць адразу? Таму стараліся рабіць гэта на адкрытым таку. Прама паміж стагоў са снапамі. Яшчэ паджартоўвалі, што, маўляў, там лепей, бо і вецярок гуляе і пылоту адразу адносіць у бок, і здаравей. Старэйшыя ды мудрэйшыя падвучвалі, каб там скразнякоў не было, то для гэтай мэты выкладвалі своеасаблівую сцяну са снапоў ці ўжо з абмалочанай саломы. У нас мала хто сам малаціў. Дапамагалі дзеці-падросткі, часамі, і жанчыны махалі цапамі нароўні з гаспадарамі, а то ўмудраліся схаўрусавацца і па некалькі сем'яў, па парадку, пачыналі малаціць. Ясная справа, што гуртом яно і намнога весялей ды і хутчэй. Некаму родныя дапамагалі-выручалі, а нехта парабкаў трымаў, то такія заўсёды, найперш, на ўласныя сілы разлічвалі. Пазней, калі ўжо малацілкі з'явіліся, то выразна адчуўся падзел на заможных і бедных. У аднаго машына ўсё імкліва малаціла-з'ядала, а другі цэпам тыднямі махаў, ды яшчэ Бога дзякаваў, што малаціць ёсць што».

Па-рознаму пра малацьбу распавядалі: ці як каму прыйшлося самому паспрабаваць гэтай "кашы", ці як каму ўсё ў памяць урэзалася. Але ж колькі людзей, столькі і ўспамінаў і сцверджанняў таксама: «Малаціць, звычайна, уставалі на золку. Таго дня восеньскага, што заячага хваста, таму стараліся з самае раніцы пачынаць. З вечара, а то і перад малацьбою, усё рыхтавалі, падчышчалі, а потым і снапы першыя ішлі ў справу. Цёмна было, то вешалі ліхтары і пры тым цьмяным святле працавалі. Калі ж падымаўся пыл ад саломы ды еў вочы, то гэта лічылася будзённай справай. Якая ж гэта малацьба ды без пылу? Добры гаспадар, дык той да сняданку так паспяваў напрацавацца, што мокры, як ўюн, у хату прыходзіў. Так і казалі ў нас, "хто мала спіць, то той малацьбы не баіцца". Малацілі не цэлымі днямі навылет – такое мала хто мог вытрымаць фізічна. Памалаціў з раніцы чалавек, перакусіў у хаце, абсушыўся ці пераапрануўся і пайшоў на другую якую працу. Такое чаргаванне заняткаў давала свой плён: працавалася весялей. Пад вечар, то зноў вясковец мог збіць якую капу снапоў, а то і дзве. Асабліва ніхто не хваліўся, што гэтулькі снапоў, напрыклад, за адзін дзень змалаціў. Не было такое прынята сярод сялян. Калі некаму ўсё ж карціць даведацца і задасць такое недарэчнае пытанне, то ў адказ на яго гаспадар пацісне плячыма ды спакойна, абыякава прамовіць: "На месцы ж не стаяў... Цэпам крыху ад ляноты, каб не заснуць, адмахваўся...". Яшчэ адна немалаважная акалічнасць: малаціць, калі не запрашалі, не клікалі на дапамогу, то самі ні ў якім разе і да чужых, і да сваіх людзей не ішлі. Верылі ў тое, што нечаканы памочнік – гэта да нечага нядобрага. Усе пра

такое павер'е ведалі і самі не парываліся і другіх не падштурхоўвалі. Але, здаралася, што потым уся вёска рагатала, як той ці той чалавек прыйшоў нейкаму гаспадару малаціць дапамагчы, а той яго цэпам па спіне аперазӑў і з прыгумення, як сабаку, прагнаў прэч».

У сялянскай гаспадарцы вяскоўцы ўсе прылады выраблялі самі (падганялі "пад руку"). Селянін добра ведаў рост кожнага члена сям'і, таму, звычайна, ніколі не забываўся пра такі фактар. Недарэку высмейвалі і торкалі ў яго бок пальцамі ўсе, без нейкага там асаблівага выключэння. Маўляў, панарабляў цапоў, якія амаль у два разы даўжэйшыя за малацьбітоў, то яны імі сабе ўласныя спіны паадбівалі ды гузоў на галовах пазаймелі: «Наш бацька, то стараўся любую рэч, любую прыладу ў гаспадарцы так ужо адштукаваць, што нібыта ўсё на нейкі продаж выраблЯў. Пры гэтым у яго заранёў была назапасена мноства ўсемагчымых паленцаў, кіёчкаў, жэрдачак. І ўсё з розных дрэў. Вось скажы, што тое ці тое зрабіць трэба і ён адразу пачынае перабіраць свае запасы. Гэта азначала, што ў яго для такой рэчы таксама ляжала паленца ці жэрдка. Сам біч рабіў з маладога дубовага цурбалачка. Яго ён ашкурваў, рабіў акруглую на ім баразёнку, прывязваў сырамятным рамянём да цапільна. Апошняе, як і пераважная большасць сялянскіх прылад, рабілася з яловай ці сасновай жэрдачкі. Яны і лёгкія і добра "кладуцца на руку". Асабліва, калі гаспадар яшчэ пастараецца іх зачысціць ад нейкіх там сучочкаў ці шарахаватасцей. Цапы ніколі з гумна не прыбіралі. Пасля таго, як малацьбу заканчвалі, гаспадар хрысціўся прама там, у будыніне, крапіў свянцонаю вадою і новы ўраджай, і вуглы гумна, ток, салому, збажыну, а цапы ўжо, якія таксама апырскваў, вешаў на бэльку. Не па цэнтры, а дзе-небудзь з краю. Гэта нібы пацвярджала, што яны заўсёды гатовыя да сваёй адвечнай працы».

Гаварылі таксама часта і пра тое, што сярод вяскоўцаў знаходзіліся найбольш спрытныя і ўмелыя працаўнікі. І неабавязкова гэта маглі быць амаль стогадовыя дзяды. Зусім маладыя мужчыны таксама вылучаліся майстэрствам і цягавітасцю. І так ужо з боку хораша за імі назіраць было. Яны нібы і не працу найцяжэйшую выконвалі, а песню спявалі. Так у іх усё хвацка атрымлівалася. Пра такіх гаварылі, што "яны працаваць навучыліся з малаком маці": «Мой прадзед таксама малаціў хвацка. Любіў займацца з гэтым ад самага рання. Яшчэ ўсе спалі, а ён з сабою браў ліхтар і сунуўся паволі ў гумно. Там і распачынаў працу. Здавалася, што яму ніколі не даў бы дзевяноста гадоў, якія ён ужо на той момант меў за сваімі плячыма: сухенькі, худзенькі, увесь сівенькі, а малаціў, то нібыта заведзены. Ды яшчэ нешта сабе і пад нос мармытаў. Пра яго гаварылі, што калі ён тры капы снапоў не

саб'е, то яго лепей не чапаць, бо ён раней гэтага, ні адпачываць, ні вады піць не стане. Такую завядзёнку меў. Неяк пахваліўся, што аднаго разу, праўда, у маладыя гады, да полудня, без пярэдыху сем коп снапоў змалаціў. Надта ён свайго споршчыка не любіў, таму і пакараў такім манерам. Піў дзядуля толькі падагрэтае малако, баяўся, каб вадою сярэдзіну сваю не застудзіць. Ведаў, што гаварыў. Мяне надта любіў, то вучыў малаціць. Казаў, што там самае галоўнае, гэта каб сябе не перасіліць, бо калі надарвешся ў працы, то потым адысці, аднавіцца будзе надта цяжка. Паводле ягоных слоў, то ён ніколі за дапамогай пры малацьбе не звяртаўся. І сапраўды, навошта, калі чалавек па пяць коп за дзень спакойна сабе абіваў. Напрацуецца, прыйдзе ў хату, добра перакусвіць ("у смак") і клаўся адпачыць. Заўсёды залазіў на печ, там нешта гаварыў сам з сабою. Магчыма, у галаву нейкія думкі прыходзілі, а то і ўспаміналася мінулае. Ён, самае галоўнае, што і памёр тады, калі з гумна прыйшоў. За сталом пасядзеў, устаў, да печы падаўся і асунуўся на падлогу. Было яму без двух гадоў сто».

«На аднаго глядзіш, як ён цэпам махае, то, здаецца, усю сілу ўклаў у той біч, каб наймацней ім гупнуць. А іншы, то лёгенька ўзмахнецца, спрытна тым цэпам свісне так, што і каласы не зварухнуцца і зноў усё пачынае. Машына, ды і толькі! Такому толькі не перашкаджай, не замінай, не трапляй пад руку і ўсё ў яго будзе добра. Калі даводзілася назіраць, як адразу малаціла некалькі чалавек, то нязвычнаму воку даводзілася здзіўляцца, як гэта ў іх усё атрымліваецца, нібыта па парадку. Не перашкаджаюць адзін аднаму, не блытаюцца, а раўнамерна наносяць удары па роўна разасланай збажыне. Пакладуць жыта каласамі ў сярэдзіну у адзін рад. Рассцілаюць, то тры, то чатыры, а то і пяць снапоў адразу і пачынаецца. Калі за сцяною стаіш, то ўражанне такое, што музыкі ў бубны выбіваюць нейкую мелодыю, да болю знаёмую. Такая рытмічнасць у працы была. Задаваў рытм, звычайна, самы старэйшы сярод малацьбітоў. Не даваў ён спяшацца, каб раней часу "не выдыхліся", але і не замаруджваў тэмп, каб "не пазасыналі, а то яшчэ ўпадзе каторы і захрапе на ўсё наваколле". А каб вы пабачылі, як мужчыны з гумна на полудзень ішлі: важна, не спяшаючыся, зноў-жа, па старшынству. Трымаліся такой завядзёнкі ў будзённай працы. Паважалі і старэйшых, і тое, чаму яны навучалі».

Здавалася б, у непісьменных вяскоўцаў, якія не ведалі ніякай іншай граматы, акрамя жыццёвай, усё было раскладзена наперад. Меркавалася загадзя, куды і што будзе ўжыта, дзе што і якое спатрэбіцца. Тую ж салому яны не проста адкідвалі ў бок, а стараліся адразу сартыраваць, каб і ў далейшым з ёю лягчэй было працаваць і прыдалася яна

там напоўніцу. Вопытнае сялянскае вока ўсё прыкмячала і ўсё заўважала, без гэтага не выпадала правільна весці ўласную гаспадарку: «Калі толькі пачыналі малаціць, то наш бацька, акінуўшы вачыма снапы, сам раскладваў іх па гурбах. Папярэджваў, што калі гэтыя пачнем малаціць, то старайцеся біць адно па калоссі, бо салома гэтая пойдзе на страху. Ужо ў хляве каровы праз страху з зоркамі вітаюцца і дажджы праліваюцца, не затрымліваючыся на жывёлу, таму вясною, а то яшчэ і да снегу паспеем страху перамяніць. Іншыя можна і болей прыбіваць, бо яны пойдуць на сечку, а там ніякай розніцы няма, што рэзаць. На падсціл, то ўвогуле пускалі самую бітую, паламаную і счарнелую салому, якая недзе паспела і падгніць, і папрылежаць на палетку і коньмі яна ўжо прыбітая. Асобна падбіралі салому для выплятання ўсмемагчымага саламянага посуду: каробак, каробачак, вярэнек, збаночкаў-набірушак і іншых. З гэтай то потым яшчэ і старанна перабіралі акалоты, каб павыкідваць тое, што загадзя не падыходзіла для такой справы. Ва ўсім трэба ведаць толк, неабходна проста разбірацца, бо далёка не кожны чалавек здольны адрозніць салому і па трываласці, і па валакністасці, і па стойкасці. Пачне нехта са старэйшых даводзіць, дык дзівуешся: як жа гэта ўсё можна ведаць і ўмець. Паабіваюць капу снапоў і старанна салому прыладкуюць па розных кутах, а то і на панадворак выносяць ды дзе-небудзь у прыстаронках ці пад страхою, каб на яе не зацякала, параскладваюць. Любілі сапраўдныя гаспадары парадак. Ва ўсім любілі. І надта ім не падабалася, калі нешта было не прыбрана, не прыладжана, не так, як ім хацелася, ляжала ці стаяла».

Падкрэслівалася, што на страху асабліва падыходзілі саломіны-стаякі (“стаўбуны”). Лічылася, што калі такой саломай накрыць ці перакрыць будыніну, то страха акажацца больш даўгавечная, чым пры звычайнай саломе: «Калі малацілі, то перабіралі потым акалоткі і з іх даставалі саломіны-стаякі. Яны адрозніваліся ад іншых тым, што былі не ломкія, а цвёрдыя, як чараціны, і іх стараліся пускаць толькі на накрыццё будынкаў. Калі шанцавала гаспадару і такіх “стаўбуноў” было многа, то імі запроста маглі накрыць адзін бок страхі, а то і ўсю. Тады вясковец быў упэўнены, што бліжэйшыя гадоў дваццаць такую салому не выпадзе замяняць. Тыя “стаўбуны” і на палетку заўсёды вылучаліся. Яны раслі, нібыта, паасобнымі кустамі. Гаварылі ведаючыя людзі, што гэта нейкае іншае жыта трапіла, што не з іхняга насення. Пазней мой бацька гаварыў, што ў калгасным жыце “стаўбуноў” ніколі амаль не бывае. Іх там вырываюць ці выкручваюць заранёў, гарантуючы такім чынам чысціню сорту збажыны. Затое ў “стаўбунах” каласы былі значна большыя і зерне ў іх, адпаведна, буйнейшае. Некаторыя з гаспадароў стараліся

такія снапы ці такія жмені збажыны абмалочваць асобна, каб завесці сорт такога буйнога жыта. Гаварылі, што калі іх малацілі, то давяралі такую справу найбольш вопытным малацьбітам, каб тыя ўжо ў гэтай працы верхаводзілі. А так, то яны больш нічым і не адрозніваліся. Калі сёння некаму паказаць і запытацца, што да чаго, то ў адказ адно – паціснуць плячыма, не болей таго».

Самому даводзілася некалі “малаціць” з бацькам і дзядулем. Павінен сказаць, што тут бацька паказваў сапраўднае майстэрства, а вось дзядуля, то той не надта завіхаўся. Было відаць, што гэты занятак яму не вельмі падабаецца. Праўда, мяне ўсё роўна падвучваў. Як зараз разумею, то іншыя ягоную “навуку” проста не ўспрымалі б, а я быў малы і цэп для мяне тады быў дзівосцай цацкай, якая надакучыла хвілін праз дзесяць. Бацька ж, падказваў тое, што выдатна ведаў: «Сынок, гэтую салому не лупі так, бо мы з яе будзем каробкі з табой усю зіму плесці. У саломе ж зерня няма. Яно толькі ў каласах, а каласы, самі па сабе, займаюць толькі сёмую ці восьмую частку каліва. Таму вопытныя малацьбіты не расходуюць дарма сілу на салому, а біч апускаюць адно на каласы, на верхнюю частку снапа. Бачыш, як збажына рассцелена. Знізу і малаціць нічога не выпадае. Навошта, калі там жыта няма. Адно што сілку сваю будзеш расходаваць задарма. Вось туды, туды трапляй. І яшчэ, калі збажына спелая, то яе і малаціць даволі проста. Стукнеш бічом адзін-другі раз і ўвесь сноп асыплецца на ток. Дадаеш удараў толькі для таго, каб падстрахавацца на ўсялякі выпадак. Мне самому давялося з сваім дзядулем малаціць з малых гадоў. Ён усяму гэтаму мяне і навучыў. Тут усё важна: і куды біць, і як біць, і колькі ўдараў, і як правільна цэп трымаць, каб пры замаху ды ўзмаху ён не надта рукі ірваў. Бо калі гэтага не ўлічваць, то праз кароткі прамежак часу рукі сабе так вырвеш, што і дыхнуць цяжка будзе. Дзядуля бухаў цэпам і было выразна відаць, што такі занятак яму не па душы. Удары біча клаліся ў розныя мясціны і стваралася ўражанне, што малоціць не стары чалавек, а маладзён, якому цэп трапіў у рукі ўпершыню. Тата пасміхваўся і прыспешваў тэмп, а дзед ад гэтага адно – злаваўся».

Адносна збожжа і збажыны, то тата, бясспрэчна, ведаў намнога больш, бо, чаго там здзіўляцца, ён быў прафесійным камбайнерам, якому не адзін год давялося папрацаваць не толькі на родных палетках, але і на абшарах Расіі і Казахстана. Ды і тое, што гадаваўся з трох гадоў без бацькі, таксама далося ў знакі, многаму навучыла ў нялёгкім вясковым жыцці. Ад яго давялося пачуць не толькі шмат разнастайных камбайнерскіх ды малацьбітных гісторый. Але яшчэ і народных павер'яў, прымхаў. Ён у іх, па шчырасці, не надта, каб і верыў, але ніколі

адкрыта і не адмаўляў. Зыходзіў з правіла: калі нікому не шкодзіць, то няхай сабе гавораць людзі, няхай вераць. Галоўнае, каб на шкоду ўсё гэта не сышло.

Ніколі не забуду, як тата вучыў мяне малаціць будучае насеннае збожжа. Яго адкладвалі спецыяльна ў бок. Яно чакала свайго часу. Тыя снапы стараліся лішні раз не варушыць і не перакладваць без прычыны. Насеннае збожжа нават не дасушвалі ля грубкі ці печы. Гаварылі, што яно і само па сабе дойдзе. Старыя людзі не дазвалялі малаціць такія снапы цэпам: «Мой дзед заўсёды так рабіў, то і ўраджаі ў яго былі намнога лепшыя, чым у астатніх вяскоўцаў. Таму на яго ўсемагчымыя зайздроснікі ды абібокі і казалі, што ён варажбіт і заўсёды ведае замоўныя словы, якія дапамагаюць яму з года ў год. А тут, сынок, калі разабрацца, то нічога дзіўнага ці сакрэтнага і не было. Проста выпадала рабіць любую справу з душою, старанна, нічога не парушаючы з ранейшых правілаў-запаветаў. Вось і збожжа на насенне малаціць трэба было ўмеючы, думаючы наперад ні пра тое, як хутчэй абабіць каласы, а пра тое, як іх вясною прыдзецца засяваць у свежыя роллі. Глядзі, як гэта робіцца». Тата ўзяў сноп, вынес яго на дзяружку, якая была пасланая пасярод току ў гумне, узняў над галавою і проста пачаў трэсці. Зерне само па сабе сыпалася, нібы з нейкай парванай кішэні. Патрос крыху гаспадар, потым перавярнуў каласамі ўгару і яшчэ пару разоў трасануў і запэўніў: «Ну, вось і ўсё... Сноп абмалочаны... Нават калі станеш далей яго цапамі абіваць, то амаль нічога не выйграеш... Збожжа добра дайшло ў снапах, таму і сыплецца так адвольна... Таму і не чапаюць насенных снапоў і аберагаюць іх ды правяраюць уважліва, ці не кожны дзень, каб ніякая трасца да зерня не ўбілася... А гэтай саломай потым стараюцца пакрываць стрэхі ў гаспадарчых будынках... Гэта на той выпадак, сынок, калі надта неўраджайны год, галодны ды паморкавы, надасцца, то тады такую салому здымаюць і пачынаюць яе малаціць... І зноў жа, тыя намалочаныя жмені збожжа ідуць не ў млын, а прызначаюцца толькі для сяўбы, бо голад усё дазвання вычышчае ў вясковых закутках... І людзі правільна рабілі, што думалі не пра тое, як жывот набіць з галадухі, а пра тое, як пасеяць нівы, як дачакацца новага ўраджаю ды спадзявацца, што менавіта гэты ўраджай будзе добрым і голад той забудзецца, нібы нейкі страшны сон...».

Ён даў і мне паспрабаваць абмалаціць самастойна сноп збожжа. Я ўжо так трос яго, што тата ажно засмяяўся: «Так і цэпам не абаб'еш, як ты яго вытрас». Сеялі мы тым зернем вясною палову свайго агарода, «каб перамяніць корань», як у нас гаварылі адвеку. Таму ў сваім жыцці я навучыўся і сеяць, і жаць, і малаціць. Шкада, што не ўмудрыўся пераняць ад матулі выпякаць хатні хлеб, пра што заўсёды вельмі шкадую.

Пра такую самую акалічнасць захавалася сведчанне і ў А. Сержпутоўскага. Ён сцвярджаў: «На насенне жыто лепш не малаціць саўсім, а толькі акалаціць і пасеяць, та жыто добрэ зародзіць. Потым той акалот можна малаціць, але не раней, пакуль жыто не пасеяно, то гаспадарка ніколі не будзе без хлеба» [22, с. 99]. Адрозненне ад татавага аповеду заключаецца ў тым, што ранейшыя гаспадары атрасалі (малацілі) жыта на насенне значна больш, чым у пазнейшыя часы, калі прыватнаўласніцкія гаспадаркі імкліва пачалі ліквідавацца. Таму патрыярхальныя вяскоўцы перамалочвалі і акалоты з-пад насеннага збожжа. Тут усё ішло па прынцыпу: «Не мышам жа пакідаць тыя зярняты ў каласах... Лепей іх таксама потым ужыць у сялянскую справу...».

Змалацілі гаспадары збожжа, правеялі, ссыпалі ў бочкі ці ў сусекі і, вядома ж, кожнаму захацелася паспрабаваць смачнага "першага" хлеба, гэта значыць, выпечанага ўжо з новага ўраджаю. Мае землякі слушна сцвярджалі: «На святога Пятра і намалола, і напякла». Яны стараліся змалоць колькі збожжа, каб уганараваць на сялянскім стале жытні бохан, які і сімвалізаваў сабою заможнасць вясковай сям'і. Чамусьці менавіта на гэты аспект, на пах свежага хлеба, звярталі ўвагу многія мае інфарматары. Памятаю, як суседскі дзед Федзя часта мне, распавядаючы пра вайну, гаварыў з нейкім асаблівым шкадаваннем: «Хацелася з тае бойні вярнуцца жывым... Нажаць, намалаціць, намалоць збожжа, каб жонка спякла свежы хлеб, наесціся ўволю, а тады ўжо і паміраць не страшна... Многім гэтага хацелася... Мы ж – вяскоўцы, у нас таму і сны свае, вясковыя: арэм, косім, сеем, жнём, малоцім, мелем, святкуем, як і працуем, па даўняму... Яно нам ніколі не перашкаджала і не перашкаджае... Як кажуць: што засталося, то тое і прыдалося...».

Хараша, удумліва і пранікнёна разважаў чалавек і нельга было яму запярэчыць, бо за ягонымі плячыма быў багаты вопыт: і працоўны, і баявы. І той, і той даўся яму надзвычай цяжка: крывава, з потам.

На гэтую акалічнасць, на непаўторны і незабыўны пах выпечанага хлеба звярталі ўвагу многія пісьменнікі і даследчыкі. Напрыклад, В. Адамчык пісаў: «У хаце стаяла парная гарачыня – на стале і на лавах астывалі накрытыя чыстымі ручнікамі гарачыя боханы хлеба. Ад іх пахла гаркаватаю падпаленаю скарынкаю і кляновым лістом. У хаце, густа папацеўшы, плакалі вокны – яны былі без дубальтаў» [1, с. 11].

Прыгадалася і тое, як мая матуля пякла свойскі хлеб, наш, дамашні. Ёй таксама нялёгка даваўся будзённы наедак. Асацыіраваўся ён заўсёды з нейкім надзвычай таямніча-пахучым прысмакам. Асабліва свежы, калі мама даставала свае бляхі з печы і выкладвала боханы на

стол. Выкладвала не на голыя сталешніцы-дошкі, а на чысты абрус ці спецыяльна для гэтай мэты пасланы ручнік. Па версе пырскала вадзічкай і абавязкова прымаўляла: «Каб асеў... Не ўздуваўся...». Спачатку апырсквала, а потым яшчэ нібы пагладжвала рукою скарынку.

На твары застывала радасная ўсмешка і яна пачынала прыгадваць, пераказваючы мне можа сотні разоў тое, што некалі адбылося (ці адбывалася) у яе сямейным жыцці. Бедная матуля! Чаго ёй толькі не выпадала, а яна не счарсцвела душою, не закіпела нейкай іржою, а засталася спагадлівай да чужога гора і няшчасця, гатова была ў любы момант паспрыяць, прыйсці на дапамогу, падтрымаць у цяжкай жыццёвай сітуацыі.

«...Калі я замуж выйшла, то хлеба ў нас стала хапаць уволю. Твой жа бацька быў камбайнерам і, акрамя грошай, яму яшчэ плацілі і збожжам. Некалькі тон зарабляў за сезон. Свякроў, як убачыла, дык адразу закамандавала, каб я высыпала збожжа ў іхнія сусекі і бочкі. Ды не на тую нарвалася! Яна тады крычыць: выбірайся з мае хаты! А я ў адказ – усё роўна па-вашаму не будзе! Так мы з месяц барукаліся і яна потым прыціхла. Стала казаць па-іншаму: раз у нас жывеш, то хлебам кармі! А я зноў на сваім настаяла: вы два разы хлеб печаце на сям'ю, а я адзін раз! Толькі на такіх умовах!

Засмяялася тады твая баба Вольга, кажа, нехта ж падвучыў! Малайчына, у цябе сям'я заўсёды будзе дагледжаная і накормленая. Мне прыемна было чуць такое, тым болей, што яна пасля гэтых нашых спрэчак стала адносіцца да мяне намнога лепш.

Першы раз самой трэба было хлеб выпякаць, а я ж ніколі раней гэтага не рабіла. Маці мая не вучыла такому. Распытала ў адной з суседак, што да чаго. Тая і гаварыла, каб надта не хвалявалася. Першы раз хлеб мала якой гаспадыні ўдаецца. Але з гэтага не смяюцца, наадварот, стараюцца падвучыць, каб у далейшым усё выходзіла добра.

Іду і думаю – гэта ў добрых, спагадлівых сем'ях, а тут жа ўсе ліхія. Ледзь што не так, то жыцця потым не дадуць. Суседка нагадала, што самае галоўнае, каб добра падышло цеста і каб удала вытапіла печ, бо не будзе моцнага жару, то хлеб не выпечацца. Калі ж надта напаліш, то згарыць усё дазвання! Трэба пастаянна назіраць за тым, што ў печы робіцца.

Я дровы паклала, запаліла. Стараюся спакойна сябе весці, а свякроў з хаты не выходзіць, нібы ў яе спраў іншых няма. То туды тыркнецца, то сюды. Зразумела я, што яна пільна сочыць за тым, як я сябе стану паводзіць, ды што ў мяне з усяго гэтага выйдзе.

Бачу, што дровы ярка палаюць, а мяне ўсю калоціць. Накладваю цеста ў бляхі, перад гэтым іх папраціраўшы салам. Стараюся, каб многа не накласці, бо выпаўзе хлеб з блях і пагарыць. Нарэшце выгарэла, я вуголле паразбівала, акуратненька зграбла яго ў кубку, а бляхі ставіць баюся. Пазіраю на свякроў, а яна – на мяне. Потым бачу – махнула галавою. Тады я ў печ бляхі, закрыла вусце, прычыніла ў коміне бляху і села насупраць на ўслончык. Пасяджу, пасяджу і падбягу да печы, каб зазірнуць, а раптам там гарыць мой хлеб?

Свякроў не вытрымала:

– Не адкрывай часта, бо выстудзіш печ і хлеб не падымецца!

Тут я ўжо спакайней сябе адчула. Раз і яна ў хаце, то не дасць згарэць хлебу, папярэдзіць. Прыгадваю і суседчына: калі хлеб спячэцца, то ён сам, сваім духам, знак падасць, калі яго даставаць трэба. Чую пах свежага-свежага хлеба, ды такі, што ажно ў носе казыча. Тады рашылася адкрыць печ і даставаць бляхі. Я іх на стол дастаю і пераварочваю, як жанчына вучыла. Як толькі перавярну, дык бохан і выпаўзе акуратненька, нібы яго нехта падштурхне. Усе паклала радком, а потым вадзічкай стала апырскваць. Я апырскваю, а свякроў, усміхаючыся, ужо сама падвучвае:

– Гавары за мною: дай, Божа, каб новы ўзышоў і ў печы падышоў!

Я паўтараю, а яна, задаволеная, ужо побач стаіць. Тады чаранком лыжкі адрэзала акрайчык, пацалавала яго і падаю бабе Вользе:

– Паспрабуйце, мама, ды не асуджайце, калі што якое...

Я так асцярожненька падаю акрайчык, а яна мяне пацалавала і заплакала. Горкімі-горкімі слязьмі. Спрабуе нешта сказаць, а не атрымліваецца, бо слёзы перабіваюць. Потым усё ж прабілася выразнае:

– Гэта я хлеб твой, Манька, падсольваю.

Мабыць, і ў яе жыцці ўсялякага было. Так сядзім мы з ёю і плачам: я – з радасці, што хлеб атрымаўся з першага разу, а яна з таго, што прыгадала многае. Потым распытвала, маўляў, хто мяне падвучваў. Я і расказала.

– Тады занясі гэтай суседцы бохан хлеба. Не шкадуй, у цябе цяпер збожжа многа. Людзям за навуку трэба адплочваць дабром, то яны табе заўсёды спрыяць стануць...

Вось адкуль мая "хлебная навука" ішла, сынок. Потым я так ужо налаўчылася пекчы хлеб, што і многіх іншых навучала, сама падказвала, як ды што. Той, першы раз, памятаю да драбніц. А як перайшлі ў сваю хатку, дык там ніякіх праблем не было. Змалоў збожжа і пячы сабе колькі хочаш. Тым болей, што як я ўжо казала, збожжа ў нас заўсёды хапала...

...Імкліва аддаляецца той дзень, калі не стала мамы. Мне не раз ужо давялося пашкадаваць, што я не навучыўся ад яе пекчы хлеб. Была ж такая магчымасць, але не хапіла жыццёвай дальнабачнасці. Думалася, што паспею, няма куды спяшацца, аказалася...

...Мне часта начамі сніцца, як мама, маладая і прыгожая, стаіць ля печы і, хітравата пасміхваючыся, весела падміргвае мне: маўляў, усё добра: хлеб і падыйшоў, і ўдаўся, а таму – зараз паласуемся...» [18, с. 30–33].

Перарваўшыся на аповед пра тое, як выпякаўся хлеб, крыху забыліся пра салому – галоўную тэму нашай кнігі. А тут нічога асаблівага не адбывалася. Калі малацілі, то салому проста зграбалі і адкідвалі ў прыстаронак ці выносілі з гумна і складвалі ў асобны стог. Калі ж нехта з гаспадароў планаваў перакрываць у якой-небудзь будыніне страху, тады салому зноў стараліся пазвязваць у снапы. У такім выглядзе яе потым будзе значна прасцей і лягчэй падаваць на верх будынка. Асобна выбіралі прадаўгаватую салому, цвёрдую, якую меркавалі пусціць на пляценне. Тая ж, якая заставалася ў стозе ці ў прыстаронку, ішла на сечку або на насціл жывёле. Так з веку ў век выкарыстоўвалася салома ў сялянскіх гаспадарках.

# ГАСПАДАРЧАЕ ВЫКАРЫСТАННЕ САЛОМЫ

Салому вяскоўцы выкарыстоўвалі круглы год. Галоўнае, калі яе хапала, то любы з сялян адчуваў сябе больш спакойна, бо можна было, пачнём з самага будзённага, выкруціцца з кормам для жывёлы, а потым ужо і павырабляць задуманае загадзя на сваіх падворках, многае павыплятаць з "жаночага і мужчынскага" прычындалля, без якога цяжка было абыходзіцца пры выкананні розных работ. І, канешне ж, перакрыць напаўгнілыя стрэхі. Салома, атрымлівалася, была самым папулярным, даступным і танным дахавым матэрыялам. Гэта ведалі ўсе. Таму і перакрываць імкнуліся амаль усе самастойна, без нечыяй там дапамогі, «каб потым не адрабляць за такія дзівосы». Іншая справа, што былі заўсёды ў вёсках людзі, якія ўмелі больш трывала крыць стрэхі. Таму да іх і раілі звяртацца, «каб надта не хваляваццa ды потым не бегаць пры кожным дажджы ці ветрыку правяраць, як жа там новая

страха: ці не паздзірала з яе салому, ці не цурчыць дождж, не адшукаўшы для сябе перашкоды, то гаварылі, што дастаткова наняць аднаго майстра, а ўсім сямействам дапамагаць яму; так і не дарага атрымаецца, і спакайней на душы будзе».

Звычайна ўсё вырашаў у сям'і, як і водзіцца, гаспадар (муж, мужчына, чалавек), а ўжо калі яго не было, то гаспадарчыя клопаты клаліся на плечы старых бацькоў, ці, што адбывалася найчасцей, – на жаночыя. Мы ўжо згадвалі пра тое, як яшчэ падчас малацьбы прыходзілася слухаць, што «ўжо нават тады, калі толькі збожжа налівалася і бралася ў колас і сцябло», спрактыкаваныя людзі ў думках адбіралі сабе салому на стрэхі. Так і гаварылі, што насцілаць давядзецца свіней ды кароў то імхом, то якім зеллем, а вось салому – давядзецца зберагаць для задуманага. Адносна малацьбы і звязвання падыходзячай саломы, зноў-жа, у снапы, каб было зручней яе і прыбіраць, і складваць і потым ужо – падаваць на страху, мы згадвалі. Немалаважна падкрэсліць, што любы з гаспадароў за лепшае лічыў назапасіць (адкласці, зберагчы) саломы больш, чым трэба было, «калі застанецца, то невялікая бяда, яе ў якую іншую справу пусцяць, а вось калі саломы якіх снапоў з дзясятак не хопіць, то тады будзеш бадыллем страху падпляталь ці якой гнілой дзіркі закрываць. Ні ў якім разе такога дапусціць не выпадала. Даўно такое было заведзена. Не адно стагоддзе так займаліся нашы продкі. Яны ўжо ведалі, што рабіць і як выходзіць з любога жыццёвага становішча».



*Страху рабілі так, каб яна не працякала*

Некалі мой дзядуля, які вельмі хораша крыў стрэхі (і саломаю, і чаротам, і драніцай), усё распавядаў і павучаў мяне, зусім малога хлапчука. Многае тады ён паказваў і даводзіў, як ды што да чаго мацуецца, каб трывалей сядзела, каб у вецер не сарвалася, не зляцела з парывамі буры, і каб ніколі не працякала зробленая ім страха. Здавалася, што ўсё рабілася надзвычай проста, будзённа, без нейкага там надрыву, адно, каб гаспадары, да якіх ён наймаўся сам ці якія яго наймалі, засталіся задаволенымі ягонай працай. Гэта ад яго, звычайна, чулася: «Табе, чалавечку, трэба добра ці хутчэй?».

Дык вось менавіта дзядуля ўпершыню і давёў мне, што ў ранейшыя гады над тым, каб накрыць хату ці якую іншую будыніну, людзі асабліва не мудрыліся: саломы хапала, то ёю і ратаваліся: «Калі ў першыя пасляваенныя гады жыццё ў нашых мясцінах было надзвычай цяжкае, амаль што беспрасветнае, то тыя, хто вярнуўся з вайны, хто з лясоў павылазілі, будавалі хаціны невялічкія, адно што драўляныя. Надакучыла па зямлянках, па паграбах, па гумнах халоднымі зімамі ды заліўнымі восенямі сядзець-перабівацца. Людзі так за тыя ваенныя гады напакутаваліся, што ўжо проста хацелася выбіцца хоць на якую хацінку, каб у ёй была свая печ (адмысловы паказчык сялянскай заможнасці), ад якой сыходзіла б сухое цяпло і каб не дзьмула ва ўсе дзіркі. Тады адчувалася тое, што людзі сталі жыць, што яны ад вайны пачнуць адвыкаць. Хоць ад такога гора, ад такой бяды, ад такой навалы не проста так і адвыкнуць. За які тыдзень паставяць зрубчык, нешта падобнае на рашотку, каб прымацаваць кроквы, а наверх, то проста наваляць тоўстым слоем саломы і ўсё. Дзе ж ты тых майстроў на ўсіх набярэшся? Ды і мужчын многіх на вайне павыбіла, пакалечыла, давяло да таго, што яны, тыя, якія і ацалелі, і рады былі б нешта рабіць ды няздужалі: то ад хвароб, то ад раненняў, а то і ад празмернай старасці. Саломы той наваляць, не папрыціскаюць, як мае быць, а потым Богу моляцца, каб ветру не было. Калі з які месяц салома паляжыць і вецер яе не растрэпле, не разбэрсае, то яна ўляжацца сама па сабе і будзе ляжаць. Праўда, гэта не гарантыя таго, што яе не пааддзірае падчас моцнай буры. Тады ўжо бегаюць гаспадары ды адно рукамі па баках сябе пляскаюць: як жа, маўляў, так атрымалася, што іх бура гэтак абабрала, адно голыя кроквы, што вялізныя рэбры нейкай пачварнай жывёліны, адсвечаюць. Яно ж і навука на тое. Як крыць стрэхі не такая і простая. У нас усё даволі простае – мудрае. Не аднаму пакаленню давялося з усемагчымымі бедамі ды перашкодамі сутыкнуцца, таму і запавет пасля сябе своеасаблівы пакінулі, каб маладзейшыя пераймалі багаты вопыт ды навучаліся. Атрымліваецца, што і салома не раз людзей выручала. Таму тут галоў-

нае заключаецца не ў тым, каб на страху наваліць як мага болей саломы, а як яе замацаваць трывала, як зрабіць так, каб страха не працякала, не зацякала. Здарыцца такое, то нядоўга тая салома паляжыць і на страсе: згніе, збуцвее, стане вільгаць у сябе набіраць і бяда будзе і сям'і, а калі гэта не хата, а хлеў, напрыклад, то і ўсёй жывёле».

Аказваецца, што там, дзе асабліва былі павыпалены вёскі акупантамі і паліцыянтамі за сувязь з партызанамі, то і на самой справе ў пераважнай большасці выпадкаў ратаваліся пад саламянымі стрэхамі. На Палессі часта даводзілася слухаць пра такія здарэнні: «Якая ўжо там хата... Пару вянкоў якіх з дрэва звяжуць, ды вокны паўстаўляюць... А шкла таго не было дзе дастаць... Таксама ж праблема... Адразу спяшаліся ў такой будыніне печ зляпіць, бо калі яе рабілі, то лічылі, што ўжо ні ў якім выпадку не прападзем... Ад яе і грэліся, і есці ў ёй варылі, калі было што, і спалі на чарэні ўпокат, калі на ўсіх хапала месца... Яшчэ і сварыліся ды біліся паміж сабою, каб дарвацца да таго цёплага чарэна... Паставяць яшчэ нешта падобнае на кроквы, а на іх панавальваюць саломы ды чакаюць, каб хутчэй снег пайшоў, а калі ён пойдзе, то прыцісне салому і тады яе ўжо не раскруціць, не параскідае па наваколлі... Тады ўжо можна было спакойна сядзець... Затое, калі снег пачынаў раставаць, дык самая сапраўдная бяда была... Непрылеглая салома прапускала праз сябе вільгаць... І на такую нязручнасць мала звярталі ўвагі, бо галоўнае было – выжыць! Вось і выжывалі. Вядома, што глядзець на такія хаціны, вуліцы, вёскі было не надта весела, але пра прыгажосць тады не шмат думалі... Стаялі такія будынкі, як разбэрсаныя



*Гаспадыня ля сваёй хаціны*

стагі, з-пад якіх часта было відаць і жэрдкі, і бярвенні... Калі б сённяшняга чалавека ды перанесці ў той час, у тыя ўмовы, то ён бы многага не зразумеў, затое адчуў бы на ўласным карку, што такое было выжываць у тыя гады...

Затое, калі ўбіваліся пажары, то ад такіх будынін нічога не заставалася. Калі сказаць па шчырасці, то іх і тушыць асабліва не кідаліся, бо ведалі марнасць такой задумы. Адна справа, калі ў вёсцы хаты стаялі далёка адна ад другой (што не было заведзена ў палескіх вёсках), а зусім іншае, калі яны ўзводзіліся ўпрытык, за нейкіх сем-восем метраў падворак ад падворка. Вецер з агнём як палыхне, то за лічаныя хвіліны ўсё нагадвае сабою суцэльнае мора агню. Там ужо за лепшае лічылі ратаваць сем'і ды жывёлу, калі яна была, а пра ўсё астатняе можна было і забыць. Усё роўна па-новаму ўсё выпадала адбудоўваць. Але галоўнае, каб самі жывыя пазаставаліся. Яшчэ тады хаты часта вельмі падпальвалі. Было каму гэта рабіць: па лясах лазілі-хаваліся ўсялякія недабіткі, якія па начах вылазілі на свае паляванні. Нешта не так: не аддалі ці не прынеслі, вось і пайшла хаціна дымам. Панапакутаваліся, але салома выручала: і людзям, калі што якое, то спрыяла, а для жывёлы, то, ой, як часта была сапраўдным выратаваннем у галодныя гады, калі не хапала сена, кармоў, калі не было магчымасці неяк атрасацца ад гэтакага страшэннага голаду».

Яшчэ ў 60–70-я гады мінулага стагоддзя на Брэсцкім і Гомельскім Палессі можна было сустрэць па вёсках дзіўныя хаціны, якія адрозніваліся ад іншых тым, што былі пабелены звонку і таму выразна вылучаліся сярод традыцыйных драўляных пабудоў. Спачатку мне, напрыклад, было незразумела, што да чаго, але калі пачаў распытваць, то ўсё звялося да даволі простага ... пераймання. Аказалася, што гэта хаты-“мазанкі”, якія перабраліся на беларускі бок з недалёкай Украіны, дзе такія збудаванні заўсёды былі надзвычай папулярнымі. Як падрабязна распавёў адзін з гаспадароў: «Я сам родам з Украіны... Непадалёку тут і наша вёска... Ажаніўся на вашым баку... Прыйшлі мы наймацца на працу ў мясцовы калгас, ды так і пазаставаліся па тутэйшых сем'ях... Працы тут заўсёды хапала... Людзі добрыя, шчырыя, спагадлівыя... Так і жывем да гэтага часу... А як прыйшлося сваю жонку весці ў асобную хату, то мне цесць даў крыху свайго надзелу пад пляц, а пад хаціну даваў стары хлеў, але мне ўжо закарцела даказаць, што і я гонар маю, і што рукі ў мяне не пагорбленыя абы-як, і што сам змагу змікіціць, як для ўласнае сям'і жытло зрабіць. Падумаў, падумаў і вырашыў, што зраблю такую хатку, якую некалі бачыў у сваіх дзеда з бабай. Паклікаў сяброў з суседніх вёсак, накапалі і навазілі гліны, нарэзалі саломы і да-

вай замешваць гліну з саломай. Усе весела працавалі. Жанчын сваіх таксама навучылі, хто што павінен рабіць. Памеры вывелі і давай сцены выкладваць. Мясцовыя прыходзілі, глядзелі, дзівіліся, што ў іх такога раней ніхто не рабіў, але не жартавалі і не высмейвалі. Добра ў вайну сербанулі людзі, па навакольных лясах ды балотах хаваючыся, таму і не спяшаліся высмейваць. А што тут такога? Галоўнае, каб страха была над галавою, сцены па баках, ды печ пад бокам, а астатняе чалавек і так сабе вытрымае. Вокны мне цесць парабіў. Ён, бачыце, майстравіты на дзіва быў. З адной нагой, а калі за што чапляўся, то і здаровы чалавек яго мог не перагнаць.

А вось страху спачатку хацелі з чароту зрабіць, але, зноў-жа, цесць адгаварыў. Трэба, каб чарот высах ці вымерз, яшчэ на балоце стаяўшы, бо калі сырым накрыць, то потым бяда будзе: ён яшчэ болей вады ў сябе панабярэ, вільгаццю панабрыняе і зацвіце ў цеснай звязцы, а раз такое зробіцца, то страха акажацца і халоднай, і дзіравай дазвання. Вада праз яе, як праз дзіравае рэшата, будзе цурчэць. Таму цесць і сказаў, што накрыем страху саломай, што ён пакліча добрага ўмельцу-майстра, які гэта ўсё зробіць. Калі ж нам не спадабаецца страха з саломы, то мы насушым чароту і перакрыем тады будыніну ім па-новаму. Праўда, некаторыя з вяскоўцаў пацвельваліся з мяне, маўляў, пачакай-пачакай, вось пойдуць дажджы, то размокне і распадзецца твая хата. Вытрымала яна і дажджы, і ветры. Тады давай іншым палохаць: вось стукнуць маразы, дык «нагрэецеся» вы ў сваім будынку.



*Змешаная страха*

Адно цесць падказваў, каб болей печку тапілі: яна цяпло вытрымае і сцены высушыць з сярэдзіны дазвання. Так яно і атрымалася. І не астыла хатка, і не распалася, і цёпла было ды яшчэ светла і ўтульна. Можа ў нечым і былі недахопы, але, па-шчырасці, то мы іх не заўважалі. Вось што значыцца, сапраўдная "мазанка"».

"Мазанкі" зніклі з палескіх пейзажаў, як і іншыя традыцыйныя хаціны, пад ціскам модных катэджаў, загарадных дамоў, віл і г. д. Але ў некаторых выпадках сустракаліся і своеасаблівыя "мадыфікацыі" жылых памяшканняў, адбываліся яны з абавязковым улікам таго, што здзяйснялася ў тагачасным грамадстве. Мясцовыя жыхары, пабываўшы за ўласнае жыццё то ў заробках, то на вайне, то ў палоне, многае бачылі, нешта, пападумаўшы ўволю, і прыстасоўвалі для сваіх жыллёвых будынкаў. Родны дзядзька маёй матулі быў і ў заробках, і паваяваў слаўна, хоць і не вельмі доўга. Тым не меней умудрыўся за паўгода заслужыць чатыры баявыя ордэны. Ён распавядаў мне, што ідэя хаты-"саламянкі" (можна і "мазанкі") узнікла ў Румыніі, куды яго занесла ваенная віхура. Чалавек ад прыроды дапытлівы, цікаўны, майстравіты ды яшчэ з добрай польскай адукацыяй ужо там змікіціў, як будзе будаваць сабе новы дом: «Так і ўбіў сабе ў галаву, што калі ацалею ў той калатэчы, калі дапаможа Бог мне вярнуцца ў родную вёску жывым і здаровым, то стану рабіць хату не з дрэва, як у нас адвеку вялося, а выкарыстоўваючы гліну і салому. Усё запісваў сабе, пры магчымасці, падцікоўваў, а нешта і распытваў у гаспадароў. Тыя, заўважыўшы маю цікаўнасць, ахвотна паказвалі, як ды што, нават нешта падмалёўвалі на маіх ужо лісточках паперы, запрашалі ў свае хаціны. Рабілі, мабыць, гэта для таго, каб пераканаць мяне, што іхнія памяшканні і светлыя, і цёплыя, і сухія, каб не баяўся заняцца раней невядомай мне справай.

Я ж жаніўся ў 1940-м годзе. Атрымліваецца, што перад самай вайной. Спачатку немцы прыйшлі, то ў нас мадзьяры стаялі. Во ўжо хто лютаваў. Ад іх нас нават немцы пару разоў ад усеагульнага вынішчэння выратавалі, а так бы спалілі ўсю вёску дазвання разам з жыхарамі. Людзей ужо ў разоры бульбяныя паклалі, каб нязручна было, калі што якое ўцякаць. Выратаваў чухаўскі солтыс Лодзь, які прывёў нямецкага палкоўніка і той загадаў адпусціць вяскоўцаў. Мы рукі таму немцу цалавалі. Потым мяне ў армію забралі, калі нашы ўжо прыйшлі. Там я на ўсё наглядзеўся, а варыянт з «мазанкай» запаў у душу. Вярнуўся дамоў і адразу пабег на копанкі гліны ў Плянце Мураванай, дзе была раней панская цагельня, каб распытаць, ці можна сабе накапаць вазоў з дзесяць гліны. Ніякай улады там тады не існавала, таму былы вартаўнік, хіхікнуўшы, дадаў, што бяры хоць сто вазоў. Ён мне потым і капаць,

і грузіць гліну дапамагаў. Яму на ягонай "службе" сумна было, а я яму яшчэ і капейку нейкую заплаціў, і самагону пару бутэлек даў. Усе распытвалі: навошта мне столькі гліны ды пяску спатрэбілася? Я ім коратка адказваў: хутка самі ўбачыце. Салому амаль усю ў бацькі свайго забраў, у цесця пару вазоў пазычыў і разгарнуў не такую ўжо і складаную "вытворчасць". Пачалі з жонкай спачатку рэзаць сячкарняй салому на сечку. Навалілі здаравенную гурбу і ўвесь час прыкрывалі яе, каб ветрам не разносіла. А потым мне цюкнула ў галаву, што і суадносіны (гліна, пясок, вада, салома) прыйдзецца змяняць. У румынаў жа не салома ішла ў справу, а курузнае бадылле, а яно больш цвёрдае і больш шчыльнае. І яшчэ адна складанасць узнікла, якая прывяла мяне да хітрага рашэння: людзей запрасіць, нават добра заплаціўшы, не было магчымасці, бо мадзьяры, уцякаючы (недалёка, праўда, яны адбегліся!), нашу вёску спалілі дашчэнту. Кожны таму стараўся сабе нейкае жытло да зімы агараць. Яны б і рады дапамагчы, ды кожны на сваю сям'ю стараўся. Зразумелая справа.

І прыдумаў, як нам з жонкай самім выкруціцца. Вырашыў, што не буду надта спяшацца і расцягну сваё будаўніцтва на два гады. Бацька ад сябе не гнаў, таму спаць было дзе. Тым болей, што і сцены суцэльныя з саламянай "гатоўкі" рабіць не стану. У Германіі давялося пабачыць, як іхнія баўэры рабілі саматужныя блокі, прасушвалі іх і толькі потым ужо клалі раўнюткія сцены. Падумалася: а хіба я дурнейшы. Заранёў зрабіў форму на дзясятак блокаў. Праўда, пагнаўшыся за хуткасцю, парабіў іх вялікаватымі: метр на метр атрымалася. Цяжкавата аднаму траляваць да сцяны. Знізу, то куды не ішло, а зверху, то было і нязручна, небяспечна. Таму на верх сцен прыдумаў меншыя блокі. Замешвалі ўдваіх з жонкай, ды сястра яшчэ мая дапамагала. Там галоўнае добра вымешаць гліну з саломай і сачыць за тым, каб не перабольшваць нейкую з частак. Калі пачалі рабіць блокі, то людзей стаяла ажно на вуліцы, а потым ім стала нецікава, ды і ў кожнага свае справы былі. Блокі клалі сушыцца на сонца і на невысокія адонкі, каб прадзімала з усіх бакоў. Нарабілі блокаў, можа і лішніх, а потым я ўзяўся за фундамент – самую адказную справу. Як яго выведзеш дакладна, то потым і ўся справа пойдзе, нібы пад музыку. А як пачалі першы раз класці, то і страшна было, і не верылася, што атрымаецца такая нязвычная для нашых мясцін справа. На другую весну, то і страху, і печ, і грубу – усё зрабілі. І твой дзед Уладак мне выводзіў. Во ўжо ў каго рукі, але ж, як і не захоча нешта рабіць, то і сілай не прымусіш. Саломай таксама крылі, бо чаротам у нас надта тады не карысталіся. З акалоткаў чалавек такую страху выштукаваў, што ўсе прыходзілі паглядзець. Ён жа не проста салому

накідваў, а мы яму яе наверх у снапах падавалі, а потым падплеціны прасоўвалі і прывязваў іх майстра ўжо не лазовым голлем, а перапаленым дротам. Яго ў нас многа пасля войнаў засталося, то гаспадары ўсё да сваіх патрэб прыстасоўвалі. На самым версе, над саламянай страхою, узнялі і замацаваны дашчаты канёк. Ён жа больш надзейны і куды больш праслужыў, чым саламяны. Калі печ і грубу зрабілі, то пачалі памяшканне абаграваць. Ажно атрымалася, што і не халодная хаціна была. Аказваецца, сцены ў ёй, нібы дыхалі, гэтаму спрыяла салома, умешаная ў гліну. Яна і вільгаць у сябе не ўбірала, і цяпло захоўвала, і паветра заўсёды ў хаце чыстае было.

Яшчэ, каб ты ведаў, на столь, для ўцяплення, я падгледзеў у румынаў, яны клалі спачатку пласт кукурузнага бадылля, а потым засыпалі яго пяском. Таксама атрымлівалася, што столь і дыхала, і цяпло трымала. У нас жа, пры паляках, было строга забаронена на столь цягнуць нешта з вогненебяспечных матэрыялаў. Прыйдзе правяраючы, раскорпае да самых лошак і калі знойдзе нешта недазволенае, то такі штраф улепяць, што ўсім родам будзеш пару гадоў выплочваць. Я рызыкнуў і самастойна, ноччу, каб ніхто не падглядзеў, выслаў столь шчыльным пластом саломы, а потым узяўся засыпаць пяском. Добра атрымалася, надзейна. Нават твой дзед, былы польскі пажарнік, не здагадаўся, а магчыма, што нешта і заўважыў, ды не стаў распаўсюджвацца. Вось, хата ужо амаль семдзесят гадоў стаіць: і не падсела, і не перакасілася, і не працякае. Праўда, саламяную страху гадоў праз сем змяніў на чарапічную (чарапіцу таксама сам рабіў), а потым і на шыферную».



*Камбінаваная страха*

Некаторыя гаварылі адносна таго, што на столь засцілалі салому: «Пасля вайны, як пачалі будаваць першую хату, вылезшы з зямлянкі, то на столь насцілалі свежую салому. А потым яе добра прысыпалі пяском, каб агонь не прапускала. Так нас сусед падвучыў, бо ў старой хаце, то цягалі вялікую колькасць пяску. Палякі надта моцна каралі і людзі баяліся. А сусед сказаў, што яны і даўней, тоігліцай столь зверху забівалі, а потым пяском для канспірацыі прыкрывалі. Яно і не халадней было і столі такі цяжар лягчэй трымаць выпадала. Галоўнае заключалася ў тым, каб ніхто не падказаў. Праўда, і калгасныя ды смельсавецкія пажарнікі былі не такія, як пры Польшчы. Гэтым стакан гарэлкі нальеш, то яны панапішуць, што ў цябе і хата з пяску. Хата і зараз стаіць, і дошкі на столі не счарнелі, не паеў іх шашаль, аднолькавыя. Значыцца, салома і ў такой справе нічога не сапсавала».

Я на ўласныя вочы неаднаразова назіраў, як агорвалі стрэхі ў нашай вёсцы (ды і ў многіх іншых – таксама). Таму выдатна памятаю, як дзед Уладак крыў стрэхі і саломаю, і чаротам, і дранкамі. Ён гэта рабіў цудоўна. Яго многія гаспадары запрашалі, калі дзед не быў у ад'ездзе па сваіх рыбацкіх справах. Мяне неяк ажно заварожвала, як з простай саломы стары раўнютка, шчыльна і трывала ўсё гэта падладжваў. Звычайныя снапы, якія падавалі яму знізу, распускаліся, укладваліся адпаведным слоем, замацоўваліся “опузныком” (доўгімі тонкімі бярозавымі, звычайна, галінамі, а то і самімі маладымі бярозкамі), прасунутым адным сваім канцом у пракручаныя на роўнай адлегласці дзіркі ў верхняй дошцы на шчыце. Праз пэўныя прамежкі, моцна прыціскаючы салому да жэрдкі з рашоткі, прыкручвалі (фіксавалі) лазовым голлем (тонкім, падатлівым, з яго можна было што хочаш вязаць) або дротам, што яшчэ выглядала больш надзейна. З іншага канца будынка ўсё паўтаралася гэтаксама і гэтак жа замацоўвалася. Тое голлечка з гадамі засыхала да такой ступені, што і сякерай яго нельга было пасекчы! Вострая сталёвая сякера і тая шчарбілася аб звычайную лазу!

Падбіваў дзед свой будаўніча-дахавы матэрыял спецыяльна падробленай, абрэзанай уступамі, дошчачкай (“страхуўкай”, “стрыхуўкай”) і пры гэтым пастаянна спяваў, размаўляў, жартаваў, нечаму ажно падсвістваў. Мінулым летам я ў свайго кума Віктара ў вёсцы ўбачыў такую дошчачку і запытаўся, па шчырасці прызнаюся, – правяраючы: «Віця, а што гэта за прычындалле?». Той, нават і не паспрабаваўшы задумацца і не павёўшы сваім брывом, бойка адрэзаў: «Гэтаю штукаю раней авечак да барана гналі!». У мяне ажно дух перахапіла ад арыгінальнага адказу. Давялося нават падхваліць кума: «Ага, толькі той баран быў такі, як і ты, лысы і нягеглы!». Кум ашаломлена вылупіў на мяне вочы. Я дадаў, усё яшчэ страючыся не зарагатаць: «Баран – лысы і вусаты!».

Што з гадамі заставалася ад саламянай страхі, хораша паказаў І. Мележ у рамане "Подых навальніцы": «Міканор адвязаў, ірвануў сівую бярозаву паплеціну. Яна не адразу паддалася, нібы ўрасла ў страху, – ён ірвануў мацней, адарваў, стараючыся не страціць раўнавагі, учапіўшыся другой рукой у страху, штосілы штурхнуў. Паплеціна непаслухмяна хіснулася і пераламалася каля самай Міканоравай рукі, перавярнулася разы два, пасунулася наўкася трохі і легла над краем страхі. Унізе засмяяліся:

– Аге, не хоча!..

Міканор скінуў другую паплеціну, ухапіў яшчэ адну, але тая была старэй, счарнела зусім, – трэснула ледзь. Міканор паспрабаваў адарваць ад моху. Міканор кінуў уніз толькі канец яе. Адарваўшы паплеціны, Міканор рашуча скубянуў чуб абадранай ветрам, пасечанай дажджом саломы на самым версе. Зверху чорная, крохкая, яна ўнізе была бура-рудая, тхнула даўнім пылам, тлеласцю. Дажджы прыбілі яе, спрасавалі, яна аддзіралася неахвотна, непадатна. Міканор скубаў яе жменю за жменяю, люта шпурляў убок – частка яе ляцела ўніз, частка застравала на страсе, асобныя пасмы з радасцю хапаў, нёс вецер.

...Міканор паспрабаваў звязваць: салома была такая тлелая, што ламалася, крышылася, ледзь паспрабаваў скруціць перавясла.

– З яе ўжэ і гною добраго не будзе! – засмяяўся Хоня, беручыся памагаць Міканору» [14, с. 161–162].

Старыя вяскоўцы даволі часта ў сваіх размовах, калі справа датычылася стрэхаў на хатніх ці гаспадарчых будынках, ужывалі самыя смелыя параўнанні. Так ужо вялося ў народзе, што вяскоўцы маглі пасмяяцца і з саміх сябе, нічога не забываючы і нібы падкрэсліваючы, што да такога (да такой ступені) лепей не дапускацца: «Гэта ж у мяне, людцы, так атрымалася, што як ажаніўся і паставіў сваю першую хаціну, то яе мне мой дзед накрыў саломай. Сказаў, што страха такая яго пераживе. Павінен прыгадаць, што не толькі яго, але і бацьку майго перастаяла. Яшчэ гадоў якіх з пару, дык і мяне перасягнула б. Яна ўжо і працякала месцамі. Мы з жонкаю то якія місы, то чарапкі падстаўлялі пад тыя капяжы. Усё гаварылі, што па-новаму страху рабіць трэба. Толькі, выходзіла, што за лета, як напрацуешся, як наірвешся, то і не да страхі было. Потым жа зноў то сяўба, то касавіца, то жніво. І ўсё ж неяк сабраліся. Салому ачысцілі, у снапы павязалі, паплецін я заранёў нарыхтаваў, прывязаў з лазы панасек і прыступілі. Дык ведаеце што: накрыць страху было значна прасцей, лягчэй і хутчэй, чым яе перад гэтым раскрыць. Салома старая дазвання пагніла, збілася ў нейкія камякі, цвёрдыя кублы ды яшчэ і мохам асклізлым парасла. Туды і рукі

ўбіваць не хацелася, гідка было, а давялося. Паплеціны пасохлі, а потым і струхлелі так, што іх і ў руку нельга было ўхапіць. Пакуль паскідаў тое гніллё ды тое смецце, то прасмерднуў, не раўнуючы, як стары вол. Адслужыла тая салома свой век. Нават можна сказаць, што ў многім і пераслужыла. Затое кроквы і жэрдкі цэлымі аказаліся: сухімі ды звонкімі. На іх новай саламянай страхой і перакрылі. Праўда, прастаяла яна гадоў з дзесяць усяго і мы з унукам ужо замянілі яе на шыферную адразу».

Пасмяяцца з іншага – гэта адно, а з самога сябе – умець і адважыцца трэба: «Давяліся мы да таго, братачка, што калі на хляве страху перакрывалі і старую салому пазрывалі, каб пачаць крыць новай, то не знайшлі нічога лепшага, як сарваную каровам ды свінням на падсцілку паўкідаць. Скажу я вам, што лепей бы мы гэтага не рабілі. Каровы ды свінні на свае месцы заходзіць не жадалі, баяліся, мабыць, той пылоты і таго смуроду. Гэта свінні чысціню некалі любілі! Вішчалі не сваімі галасамі ледзьве не да раніцы. Гаспадыня іх пашкадавала і ўжо на золку дзверы насцеж параскрывала, каб па двары палёталі, пакуль той смурод крыху сыдзе. Як бачыце, аказваецца, што нават на гной абы-што пускаць нельга. Вечная наша сквапнасць. Не, каб вывезці куды на балота, то здагадаліся ўвесь хлеў запаскудзіць. Салома на страсе злежваецца і згнівае дазвання. Нічога, акрамя трухі і гнілля з мохам, з яе болей не застаецца».

Яно то і гнілое, і перасохла-струхлелае, але ўсё роўна стаяла да таго часу, пакуль яго не чапалі, пакуль не ўмешваліся ў гэты "стаячы" працэс спецыяльна ці незнарок. У такія моманты здараліся выпадкі і камічныя, і камічна-трагічныя, бо з-за гуллівасці ці недадуманасці магло ўсё скончыцца з куды больш цяжкімі вынікамі: «Раней за малымі мала хто сачыў. Самі гуляліся, самі бегалі, пазбіваўшыся ў кампаніі, калі дарослыя не перлі з сабою на палеткі ці не прымушалі пасвіць жывёлу. Проста адмахваліся: ат, які там памочнік з яго (ці з яе), няхай лепей на падворку лазіць; адно, каб толькі ніякай шкоды не ўчыніў. Па-ўсялякаму папярэджвалі, палохалі, але ж дзеці – ёсць дзеці. Гульні прыдумвалі, а падчас тых гульняў і надараліся ўсемагчымыя недарэчнасці. Аднаго разу суседскі хлапчук, ужо даволі вялікі падлетак, павёў нас з сабою спускацца са страхі. Так і сказаў, што ён гэта пастаянна робіць і таму няма чаго баяцца, бо болей таго, хто адмовіцца, не возьме з сабою гуляцца. Нікому такога не хацелася. Таму з ім падаліся чыста ўсе.

Завёў, дурында, свайго хлява, пріставіў да страхі драбіну і імгненна апынуўся на версе, а адтуль ужо клікаў астатніх, каб падніміліся да яго смялей. Гледзячы, як ён хвацка з'ехаў са страхі, і меншыя таксама



*Мажара, крытая саломай*

загарэліся. Ды тут узнікла закавыка, бо гэта, калі глядзіш знізу, то ўсё здаецца проста, а калі залезеш на верх, то адразу становіцца страшна, ажно калені калоцяцца. Таму ўсяго пару чалавек і радаваліся разам з гаспадаровым сынам. Тут майму брату прыйшло ў галаву, што нам выпадае лепей спускацца з нашага хлява: ён не такі высокі, і ўсе, і большыя, і меншыя, не будуць баяцца. Так і зрабілі: папёрлі да свайго хлява. Там нас і было ўсяго чацвёра. На самой справе, з напаўструхлелай будыніны, у сярэдзіне якой сонна рохкалі разбуджаныя свінні, спускацца, як паказалася, было проста. Палезлі на верх. І недзе ля вільчыка нешта трэснула і мой брат імгненна знік, а яшчэ праз секунду раздаўся ягоны адчайдушны крык: “Ратуйце, бо я плаваю, а свінні – загрызаюць!!!”.

Ніхто не думаў пра тое, што ён крычаў, але ўсе адчувалі, што нешта здарылася. Склізганулі мы ўніз і ... папёрлі ў розныя бакі ад хлява, пакінуўшы ў ім барукацца з свіннямі аднаго брата. Невядома, як бы яно там усё здарыламся, але якраз чорт прынёс нашага дзеда. Той адразу знайшоў рашэнне і выйсце: шырока адчыніў дзверы, выпусціў свіней і выратаваў “загрызаемага тапельца”. Калі б вам давялося на той момант убачыць выратаванага “смельчака”, то вы б выдатна зразумелі, што болей камічнай сцэны вы ніколі не бачылі: у свіным гноі, які сцякаў ручаінкамі, зарумзаны і асіплы ад крыку, той трэсся яшчэ ад страху і, нібы заведзены, паўтараў: “Ой, загрызці хацелі!!! Сажралі б мяне!!!”. Дзед супакойваў унука: “Не, свінні толькі паглядзець на цябе хацелі... Гэтакага смелага і ... дурнога... Цяпер цябе ў канаве трэба з паўгода трымаць, каб ты болей не смярдзеў...”.

У той назвячорак брат атрымаў не толькі ад свіней, дасталося яму і ад дарослых. Заадно добра перапала і дзеду, бо "ратавальнік", калі выпусціў свіней, то забыўся зачыніць дзверцы ў агарод і свінні да самага вечара "палолі" грады, старанна перамешваючы ўсё ўверх нагамі. З таго моманту я запомніў да канца сваіх дзён: спускацца, калі што якое, то можна толькі са свежай страхі ці з добра праверанай. Астатнія варыянты – не падыходзяць».

Выдатны рускі савецкі паэт А. Твардоўскі (а прыводзім мы ягоныя словы таму, што ён паходзіў з этнічных беларусаў Смаленшчыны і ў жыцці любіў паўтараць: «Як у нас, у беларусаў, гавораць...») пісаў адразу ў пасляваенны год: «На гэтым полі дзесятак хацін пад саламянымі, тоўстымі, неаблеглымі стрэхамі, з вытыркнутымі ў бок будучых сенцаў канцамі рашатняка... Я не ведаю будынкаў самотней і непрыглядней хаціны без сенцаў у адкрытым полі» [25, с. 176].



*Лазня*

Своеасаблівы паэтычны позірк Я. Коласа выхапіў з сялянскага жыцця зусім іншыя сцэны, якія перадаюць не столькі гаспадарчае значэнне будынкаў, не столькі іх стан, колькі першаснае ўяўленне пра будынкі, што назаўсёды ўрэзаліся ў памяць з самага ранняга дзяцінства. Якім, атрымліваецца, увайшло, такім назаўсёды і засталося:

Гуменца, крытае саломай,
Ад доўгіх часаў пасівела;
Салома кудламі вісела,
Яе вятры параздзімалі,
А трохі хлопцы пасцягалі,
На стрэху лазячы, бывала, –

Іх гэта забаўка займала.
А пад шчытом на павуціне
Нішчымны колас-сіраціна
Ў зацішку лёгенька гайдаўся;
З якіх ён часаў там трымаўся,
То бог яго святы ўжо знае! [6, с. 12].

Аднак лепей спашлёмся на прафесійных этнографаў, дзякуючы якім многае са старадаўняга ўкладу жыцця нашых продкаў дайшло да сённяшняга часу. Ч. Пяткевіч адзначаў: «Даўней гумны і некаторыя іншыя гаспадарчыя будынкі накрывалі пераважна чаротам (чарот), які скошвалі на замерзлых балацінах (збіваць чарот) рыдлёўкай (заступ). У выніку высыхання балотаў, што выклікала змены, неспрыяльныя для чароту, палешукі вымушаны пераключыцца на салому. З саломы, прыгатаванай на страху, спачатку вяжуць перавяслам два снапкі (дваякі) таўшчынёй да 12 см. І выкладваюць па краі страхі адзін пры адным як застрэшак, часткова надзяваючы на апошнюю лату, якая ў іх хаваецца. Затым насцілаюць салому каласамі ўверх пластам таўшчынёй са здвоеныя снапкі, і з дапамогай нарубчастай дошчачкі, як у валіку для качання бялізны, званай стрыхоўка, раўняюць салому, каб яна размяшчалася ў напрамку зверху ўніз. Супраць кожнай латы кладзецца на саломе бярозавы ці асінавы прут (паплёціна, паплёт) і прывязваецца дубчыкам лазы ці чаромхі, у выніку чаго салома застаецца прымацавана на месцы. Наступны пласт саломы закрывае паплёт, што прыціскае першы рад і г. д.

Як толькі каласы з двух бакоў страхі сыдуцца наверсе, тады бяруць цэлыя снапы саломы, расхіляюць іх і цесна адзін пры адным надзяваюць на канёк, утвараючы так званы грэбень. Названы спосаб, аднак, рэдка выкарыстоўваюць, найчасцей верх закрываюць тоўстым пластам цёртай саломы, прымацоўваючы яе паплёцінамі і лазой, а на сам хрыбецік кладуць з паўметровымі водступамі козьлікі, якія спускаюцца ўніз на ¼ да 1/5 вышыні страхі. Знутры гумна на сярэдзіне плошчы паміж сохамі ад адных варот да другіх выбіваюць з гліны ток, на якім малоцяць. З двух старон ад яго робяць засекі (застаронкі), адгароджаныя сценкай з тоўстых дошак, канцы якіх закладваюць у сохі і ў сцены будынка: у засцяронках складаюць снапы» [16, с. 215].

Сведчанне навукоўца – гэта адно, а тое, што бачыў на ўласныя вочы, у чым прымаў непасрэдны ўдзел, няхай сабе будучы і не надта дарослым, – гэта зусім іншае. Таму падам усё, як мне запомнілася і як гэта рабілася ў нас, калі крылі саломай даволі вялікі, ажно на дзве прасторныя палавіны, хлеў, пра які дзед, жартуючы, сцвярджаў: «Ён у вас,

унучак, намнога здаравейшы за хату. Хата, што, яе са старэнькага хлява перарабілі на хуткую руку, каб у сваё жыллё з айчымавай хаты перабрацца. А гэты самі рабілі: бярвенні з лесу вазілі, сцены клалі і ўсё астатняе. Так што гэты хлеў доўга прастаіць. Пастараемся, накрыем, як мае быць, то аднолькавы будзе і праз пяцьдзесят гадоў».

З татам загадзя з'ездзілі на блізкае балота і там насеклі "опузныку" – тонкіх і доўгіх, па магчымасці то і прамейшых, метры ажно па тры-чатыры, галін. Дробнае голлечка, якое ссякалі, з іх не адкідвалі, а тата яго таксама перабіраў і гаварыў, што гэта "вечныя прывязкі" будуць. Я не надта тады, па шчырасці, уяўляў, як ды што там да чаго, але стараўся дапамагаць, бо, калі б проста так стаяў, то папёр бы, галосячы, дамоў, бо тата такога не пацярпеў бы. Да гэтага дня мне чамусьці падавалася, што лазовыя кусты растуць не надта высокія. Ажно калі заглыбіліся ў амаль непралазную гушчыню, то аказалася, што яны ў вышыню могуць дасягаць і сямі, і васьмі метраў. Таму, што «ўсё ў прыродзе цягнецца да сонца, да ягонага цяпла, а ў такой гушчэчы не было магчымасці лазе кусціцца, заставалася адно – цягнуцца ўгору, які куст выцягваўся вышэй, то той, адпаведна, і панаваў». Нарыхтаванае голле выцягвалі на бераг і складвалі ў акуратную гурбу, каб потым было лягчэй грузіць на воз. У другую, значна меншую, гурбачку таксама ладкавалі драбнейшае голлечка. Працавалі ўдваіх цэлы дзень. Дарэшты стаміліся, бо амаль не адпачывалі, тата і перакурваць умудраўся "на хаду". Асабліва даймала нас тое, што ў балоце ўвогуле не было ветру, нават уявіць было немагчыма, што ён недзе носіцца-свішча. А яшчэ страшней надакучаў гнюс! Здавалася, што пракусваў нават праз вопратку!

Раніцай тата дамовіўся з суседам, калгасным даглядчыкам, адносна коніка і да сняданку, ужо ўтраіх, бо гаспадар жывёліны ўзяўся «дапамагаць», з'ездзілі на балота і ледзьве ўладкавалі на воз усё тое, што мы нарыхтавалі. Дзед потым, калі пабачыў гэтакую гурбу прывезенага, то ажно прысвіснуў, маўляў, тут на паўвёскі паплецін хопіць! Праўда, пахваліў яшчэ і тое, што яны доўгія і не вельмі тоўстыя, а значыць, добра будзе з імі на страсе ўпраўляцца.

Другім этапам нарыхтоўвалі саму салому. Тата прапанаваў дзеду прывезці з калгаснага поля некалькі камбайнавых капніцеляў, але стары рашуча запярэчыў, падкрэсліваючы, што «яна будзе бітая-перабітая і з яе нармальнай страхі не выйдзе; трэба шукаць салому жатую ўручную і тады зусім іншая справа атрымаецца». Тата і тут знайшоў выйсце, даволі нечаканае і арыгінальнае: у Ботава малаціў жыта аднаму старому і прапанаваў таму абмяняцца саломай. Дзед пагадзіўся, бо яму было ўсё роўна, чым падсцілаць сваю жывёлу. Стары гаспадар нават

павязаў яе ў акуратныя снапы, каб услужыць майму тату, які не кінуў яго ў цяжкім становішчы. Саломы было прывезена вазоў пяць, не меней. Склалі яе і накрылі прыцягнутымі з калгасных буртоў цыратамі. Ужо карцела, каб пачалі рабіць страху як мага хутчэй. Дзед толькі пасмейваўся і супакойваў: «На твой век, унучак, усялякай працы хопіць... У жыцці не надта адляжышся... Адно робіш, а другое – прыспявае...».

Нарэшце, надышоў панядзелак, бо дзед увёў сабе з маладосці за правіла пачынаць любую новую справу з пачатку тыдня. Была, праўда, толькі наша сям'я. Спачатку мужчыны прасвідравалі, пазначаныя пад кожную жэрдку, дзірачкі ў верхніх дошках пацыятаў і старанна, яшчэ раз перамераўшы, прыбілі іх на сваё "законнае" месца. Дзед кіраваў справай, а бацька яму пасабляў. Стары пераправерыў, ці супадаюць дзіркі з жэрдкамі рашоткі, і спакойна зазначыў: «Ну, зараз перакурым і пачнём... Няма чаго болей справу зацягваць... І так, каб дні за тры ўправіліся... Хлеў жа, бачыш, які вялікі...».

Дзед стаяў на ніжняй жэрдцы і паказваў тату, куды падаваць яму снапы, а той ужо знізу віламі браў іх пад перавяслы, па-іншаму нельга, бо парассыпаюцца, і акуратна прасоўваў пад самыя рукі старому. Выклаўшы першы саламяны рад недзе метраў на чатыры-пяць у шырыню, дзед паказаў на гурбу паплецін і на зялёныя прывязкі, маўляў, цяпер падай іх. Уставіўшы завостраную з аднаго канца паплеціну ў пракручаную ніжнюю дзірачку, майстра задаволена крэкнуў: «Нібы і была тут заўсёды...». Прыціснуў яе на даўжыню саламянага рада і пачаў было прыкручваць паплеціну да жэрдкі, але тут яго перабіў тата: «А можа, лепей дротам?». Дзед пагадзіўся і патлумачыў, што дротам, на самой справе, будзе і зручней, і выгодней. У некалькіх месцах, старанна зацягнуўшы паплеціны да жэрдкі дротам, майстра задаволена працягнуў: «Цяпер салому ніякі вецер, нават самая моцная бура, не здзярэ... Мы ж паплецінамі станем прыціскаць на кожнай жэрдцы... Так вярней будзе...». Зрабіў гэта і перайшоў на сярэдзіну хлява, каб там пакласці першы рад саломы. Цяпер рабілася тое ж самае, толькі паплеціна канцамі ўжо ўмацоўвалася не ў дошку, а прывязвалася адна да адной. Усіх паплецін у першым раду было пяць. Значыцца, даўжыня хлява была недзе крыху болей за пятнаццаць метраў. Мне думалася тады, што крыць страху – гэта вельмі хутка і лёгка: накідаюць снапоў саломы, паразвязваюць іх і ўсё на тым. Так і агучыў працуючым сваю думку. У адказ дарослыя адно рагатнулі: «То будзеш праз якую гадзіну салому па ўсім наваколлі збіраць, а не, то і ў лес давядзецца збегаць».

Другі рад саломы ўкладвалі, прыкладна, гэтаксама, як і першы. Адрозненне заключалася ў тым, што дзед хвацка пачаў працаваць

страхоўкай. Ён падбіваў, выраўноўваў ёю канцы саломы і пасля такой працэдуры за ім заставалася раўнюткая паверхня. Ажно не верылася, што гэта было зроблена са звычайнай саломы: разбэрсанай і расхвастанай. І зноў разасланы рад моцна прыціскаўся паплецінамі, якія акуратна фіксаваліся паміж сабою. Другі канец паплеціны, якая заставалася з краю, мацаваўся ў такую ж дошку з дзіркамі, што і з левага краю.

Мне не дазвалялі лазіць, пакуль што, на страху, «каб там незнарок не закружылася галава і я не паляцеў потырч з будыніны», а я падносіў халодненькі квас, падграбаў рэшткі саломы, якая заставалася на месцы ўжо забраных снапоў і г. д. Мужчыны ўселіся перакурыць толькі пасля таго, як дзед прыціснуў трэці рад. Пыхкаючы самакруткай, стары прамовіў: «Будзе ажно дзесяць радоў з паплецінамі... Ну, і вільчык... Там яшчэ потым давядзецца пакапацца... Гэта ж аснова любой страхі... Там не паспяшаешся, бо ўся праца сыйдзе на дармоўку...». Бацька маўчаў, а потым, ажывіўшыся, запытаўся: «А дзе ж гэта вы так хораша страху крыць навучыліся? З боку, то вачэй не адарваць, як працуеце. Глядзеў бы і глядзеў...». У адказ дзед паўтарыў сваё ўлюбёнае: «Дай, Божа, усё ўмець, ды не ўсё рабіць». Далей дадаў: «Колькі я іх за свой век перакрыў, то зараз ужо і не злічыш нават... Таму і майстэрства прыйшло ды і засталося са мною... Запамінай, справа не надта хітрая... Што не зразумееш, то пытайся... Яно, як размаўляеш, то і працуецца весялей, а калі бачыш, што некаму цікава, дык удвая...».

За першы дзень, без спёкі, без ветру, ды ў ахвоту, мужчыны амаль накрылі адзін бок. Дзед прымацаваў паплеціны верхняга рада і крыкнуў: «Застаецца вільчык і канёк, потым з табою, зяць, прыдумаем з чаго агораць...». З другога боку працягвалася тое ж самае, толькі што саламяныя снапы даводзілася перацягваць ужо бліжэй да дзеда і потым падаваць іх наверх. Было відаць, што мужчыны ўжо стараюцца не так, як з самага пачатку, але тэмп працы ўсё роўна імкнуліся не губляць. Стары спасылаўся на тое, што ў яго пачынае круціць ногі, а гэта верны паказчык таго, што недзе праз дзень пойдзе дождж, "наступіць негадзіна...".

На самой справе, вяршаліну дзед рабіў у нахлёст: канцы саломы з аднаго боку перасоўваў на другі, а зверху ставіў-расцягваў нераспушчаныя невялікія снапкі і атрымлівалася, што вада павінна была абягаць зверху ўніз, «проста сплываць па шчыльна ўкладзенай страсе, не маючы магчымасці забягаць у нейкія дзіркі». З самага верху салому прыціскалі ўжо не паплецінамі, а даўжэзнымі жэрдкамі. Мы з татам доўга шукалі іх, нават з дапамогай лесніка, у бліжэйшым лесе. Найлепшым варыянтам было б тое, каб іх не сточваць, а прыціснуць суцэльнай.

Толькі паспрабуйце адшукаць жэрдку такой даўжыні. Калі ўсё завяршылі, то было недзе якраз каля паўдня, бо дзед задаволена крэкнуў: «Ніхто і веры не дасць, што мы такую будыніну меней чым за тры дні накрылі... Але ж мы працавалі, не адрываючыся, ды і Алёшка нам дапамагаў...».

У хаце мужчыны за сталом завіхаліся не менш самааддана. Неўзабаве дзед ажно заспяваў сваім прыгожа-непаўторным голасам, незабыўна-ўлюбёную: «Па чароту, па балоту, казак дзеўку валачыў...». Але праца была выканана, цяпер ніякія дажджы новай будыніне былі ўжо не страшныя, ды і жывёле не будзе капаць на галаву, не стане заліваць стойлы. Дзед пайшоў, а мы ўсёй сям'ёй пайшлі яшчэ раз паглядзець на выкананую працу. Тут было чаму радавацца: недзе праз паўгадзіны пагрозліва загрымела і з-за лесу высунулася груvasткая хмара. Тата не вельмі ўцямна прагуў: «Во, заадно і праверыць, ці добра мы салому на страсе ўклалі... А то хваліліся-пахваляліся, а раптам ды...». Нібы не жадаючы слухаць ягоныя словы, узняўся моцны, парывісты вецер. Адразу ўсё нібы застагнала навокал, потым прыпусціў дождж: спорны, буйны, ужо амаль асенні. Спачатку са страхі не капала, але неўзабаве зацурчэлі жэўчыкі-ручайкі, вада імкліва пабегла па загадзя забетанаваным жалабку ўздоўж хлява. Мама ўсё ўспляскала рукамі і прымаўляла: «Каб хоць не цякла... Каб не цякло...». Тата рашуча супакойваў: «Не павінна працякаць... Замачылі з цесцем добра, ажно заспявалі... Сама ж нам падцягвала...».

Прыйшлося мне прымаць удзел і ў "залатванні" саламянай страхі. Здарылася гэта, як заўсёды такое бывае, выпадкова і недарэчна. Я на той раз дапамагаў свайму дзеду ўносіць прывезенае сена ў ягоны хлеў. Там быў невялікі прыстаронак, туды і складвалі часткова корм для каровы, а астатні ладкавалі ў стог, непадалёку ад гаспадарчых будынкаў. Мне даводзілася таптаць тое, што дзед падаваў. Было надта душна і нічога амаль не відаць, бо пад страхою асабліва не разгледзішся. Калі гаспадар падаў усё сена, то па драбіне залез да мяне, прайшоўся па квадрату і зазначыў: «Яшчэ столькі і на зіму карове хопіць... Няма чаго асабліва хваляваццa...». А потым нечага спахапіўся: «Цікава, а на доўга яшчэ маёй страхі хопіць?». З гэтымі словамі не знайшоў нічога іншага, як нізануць віламі з усяго маху ў саламяны дах. Удар аказаўся настолькі "ўдалым", што вілы не проста пранізалі страху, але і выдралі значны кусок прагнілой дазвання саломы. Я зарагатаў: «Во, і вакенца, і паветра свежае даходзіць стане...». Затое дзед не ўзрадаваўся, а неяк ніякавата прамовіў: «Заўтра з самае раніцы прыходзь ды будзем страху запляtаць... Каб хоць старая не паспела заўважыць, бо будзе мне на пазвоннае...».

Відаць, бабуля ўсё ж заўважыла і паспела добра “разагрэць” дзеда, бо калі я да яго прыйшоў, то ён ужо паспеў адабраць салому, звязаўшы яе ў некалькі снапоў на свежыя паплецiны, насек арэшніку і сліўняку, якога было ўдосталь паблізу і, як звычайна, курыў. Паглядваў на страху, нешта абдумваў і пыхкаў самасадам. Мне адразу ж далажыў, што раскрые кавалак страхі (квадратам), бо так будзе зручней уплятаць паплецiны і прыцiскаць салому. Стары палез па драбіне наверх і пачаў раскрываць, скiдваючы тое, што некалі было саломай. Потым я падаваў яму па снапу, а ён, па даўняй завядзёнцы, нешта спяваючы пад нос, завiхаўся.

Калі ўжо справа рушылася да завяршэння, то і я пацiхеньку, каб дзед не пачуў і не забачыў, палез на страху. Сцiшыўся за ягонай спiной і пазiраў на другi бок хлява: быццам бы там можна было ўбачыць нешта незвычайнае. Тым часам, нечакана, ногі саскліэнулі, рукі пацягнуліся і я паехаў па страсе ўнiз. Крычаць не было магчымасці – дзед бы не ўхваліў майго знаходжання на страсе. Ён нечакана крутнуўся і сам усё ўбачыў. Не, каб неяк пастарацца затрымаць, стары, наадварот, захацеў пляснуць мяне з усяго маху слiвовай паплецiнай па азадку. Толькі задуманае не атрымалася: ці то крутнуўся дзед вельмі рэзка, ці то паплецiна за нешта зачапiлася, ці то занадта замахнуўся, але стары сам паляцеў унiз галавою. Я паспеў яшчэ заўважыць, як мiма мяне склiзгануў гаспадар: ягоны ашчэраны рот, вылупленыя вочы, нехуды азадак. Усё гэта мiгнулася і – нечакана прапала. На самым краю страхі мне ўсё ж удалося так ушчаперыцца ў салому, што я не ўпаў, а завiс метры на тры над зямлёю. Дзед стаяў на галаве, уторкнуўшыся ёй у пясок. Азадак пахiстваўся туды-сюды, нiбы раздумваючы: падаць яму ці яшчэ пастаяць менавiта так. Усё значна паскорыла бабуля, якая з нейкай нагоды апынулася на гэты час у хляве (думаю, што яна спецыяльна сачыла з сярэдзiны, каб дзед і тут не ўмудрыўся яе ў нечым падмануць). Выглянуўшы і ўбачыўшы, што муж знаходзiцца ў такiм становiшчы, не знайшла нiчога iншага, як голасна ўскрыкнуць: «І ён, як малое дзiця, са страхі коўзаецца!». Гукнуўшы, трэснула, што мела сiлы, па дзедавым “сядле” нейкiм кiем. Мабыць, тым, пры дапамозе якога заганяла карову вечарамi ў хлеў. Дзед, гiгiкнуўшы, нiбы малады, адразу папёр да калодзежа. Там упёр сваю лысую галаву ў ночвы з вадою, а пасля ўжо пачаў ачмурэла азiрацца. Відаць, яму не адразу даходзiла, дзе ён і што з iм адбылося. Бабуля патрасала кiем ад хлява: «Хадзi сюды, то я табе пакажу, як са страхi коўзацца!».

Калі мы завяршылi сваю справу, то стары пацiху папрасiў у мяне, каб я нiкому асаблiва не распавядаў, што тут адбылося: «Жонка і без цябе ўсiм панараскажа такога, што потым будзе, хоць з хаты выбiрайся».

А. Сержпутоўскі даволі падрабязна распавёў пра тое, як палешукі будавалі свае хлявы і гумны: «Калі сцены ўзведзены, укопваюць у зямлю высокія сохі – слупы з вілападобнай верхавінай. На гэтыя слупы кладуць клаць, ці сволак – кроквіны. Яны вольна ляжаць і на сценах. Потым упоперак да ключоў прывязваюцца бярозавымі пярэвітамі хварасцінамі тоўстыя пруты на адлегласці 2-3 вяршкі адзін ад аднаго. Калі такім чынам касцяк даху гатовы, яго пакрывапюць па краях кулеваю, гэта значыць непамятай саломаю ці чаротам пад стрыхоўку – рыдлёўку, а вышэй накідваюць тоўсты слой саломы, кастрыцы ці віту – вітарніка, гэта значыць скошанай па лёдзе травы. Канёк выкладваюць звязанаю ў снапкі саломаю і прыкладаецца звязанымі папарна накрыж ключыкамі – козламі, якія дасягаюць амаль да краю даху і сваім цяжарам прыціскаюць салому. У хлявах дахі бываюць двухсхільнымі і чатырохсхільнымі» [24, с. 32–33].

З народных прыкмет А. Сержпутоўскі не забыў нагадаць характэрную рысу: «Калі з немалочанага жыта зрабіць дзе-небудзь у гумне кавалак страхі, та гаспадарка заўжды будзе мець хлеб» [22, с. 99].

У гэтага ж даследчыка сярод шматлікіх запісаў ёсць народная казка “Стары бацько”, а ў ёй наступнае сведчанне: «Але ось настаў там велікі голад. Прапаў немаль увесь статак. Пухнуць людзі ад голаду, жыватамі качаютца, – нема за што рук залажыць. Панеслі дзеці старэнькаму бацьку апошні хлеб, а ён да й кажэ ім, каб ены садралі з харом стрэхі да й вымалацілі тую салому. Паслухалі дзеці старэнькаго бацьку, садралі стрэхі да й давай малаціць старую салому. Глядзяць, аж на таку так многа зернят, што хваціць хлеба да новаго ўраджаю. Пытаюць суседзі, адкуль у іх хлеб, а тые й расказалі ім, што гэто іх наўчыў стары бацько, катораго ены хаваюць у пограбе» [23, с. 46].

А вось К. Машынскі сведчыў: «Накрываюць хаты ў лясных вёсках драніцамі, а каб дах на стыках не прапускаў ваду, драніцы з аднаго боку выпускаюцца вышэй за драніцы з другога. Каб дошкі-драніцы не маглі ссунуцца ўніз, іх падпіраюць, як ужо гаварылася, адмысловай дошкай закрылінай (Мазыршчына), а ў Рэчыцкім п. прыбіваюць драўлянымі калочкамі да канцоў кроквеў уздоўж драўлянага карытца (лотак). Часам дах крыюць кароткімі тонкімі драничкамі (дранка), і тады прыбіваюць 2 альбо 3 латакі, а канёк накрываюць карытцам, падобным да латака, павернутым вострым дном уверх (ваўчок). Шчыт (прычолак) у рэчыцкай хаце забіваюць дошкамі.

У палявых вёсках стрэхі крыюць саломай, а часам трыснягом. Вільчык страхі ўмацоўваюць казлінамі. Драўляная або саламяная страха ў Рэчыкім п. завецца крышай; тая частка пакрыцця, што спускаецца за

сцяну – стрэха, вокны – окна, шыбы – абалонкі, каробка, што трымае дзверы, – ушнякі... Ніякіх аздоб паляшуцкая хата не мае, толькі як выключэнне ў заможных сялян на краях страхі над прычолкам прыбіваюцца разьбёная дошчачка, часам на вільчыку хаты з'явіцца бляшаны пеўнік, аднак гэта цалкам новыя з'явы» [12, с. 148].

На маёй памяці ў нашай вёсцы ўжо не накрывалі хаты саломай. Адышло гэта ў гістарычны нябыт і на замену саломе прыйшла драніца, а потым ужо і шыфер. Спачатку маленькі па сваіх памерах, а потым усё большы і большы. Таму часта ў дзядулі проста распытваў пра тое, як рабілі стрэхі даўней. Ад яго і даведаўся, што нават зрабіць акуратна хатнюю страху мог далёка не кожны гаспадар. Накрыць хлеў, гумно, пуню – гэта адно, а жылое памяшканне – зусім іншая справа. Калі вясковец сам не мог гэтага зрабіць, то, звычайна, наймаў пару чалавек. Пару наймаў таму, што стараліся накрываць адначасова страху з двух бакоў. Мала якое магло надвор'е ўсталявацца. Добра, калі ціха і сонца, ні ветру, ні дажджу няма. А калі раптам выплыве хмара, з ветрам ды з навальніцай, тады як быць? Калі з аднаго боку будзе накрыта будыніна, то яе ветрам разбэрсае так, што той страхі не тое, што не пазнаеш, але і не збярэш потым. Таму і наймалі вопытных людзей. Загадзя дамаўляліся адносна таго, што ўвесь падручны і патрэбны матэрыял будзе нарыхтаваны. З боку гаспадара будуць дадатковыя памочнікі, але страху павінны скончыць за два дні. Звычайна так і вялося, бо ўсе ведалі, колькі гэтая справа, прыкладна, займае часу.

Усё ішло так, як і тады, калі накрывалі з аднаго боку. Проста тут ужо на кожным баку быў майстра, а ў яго – свае памочнікі. Адзін мог знаходзіцца побач на страсе, а яшчэ адзін, а то і два – унізе, каб адтуль падаваць снапы з саломай, паплеціны ды і ці мала што іншае. Тыя ж самыя прылады працы, у асноўным тая ж манера выканання. Яшчэ вельмі хораша на новай саламянай страсе глядзеліся маладыя бярэзінкі, звязаныя папарна і перакінутыя недзе на паўметровай адлегласці, пара ад пары, камлькамі ўніз. Гэта рабілася таксама для таго, каб салома хутчэй спрасоўвалася і прылягала на сваё будучае месца. Але абавязкова сачылі майстры і за тым, каб бярэзінкі былі не надта цяжкімі, таму што тады яны самі спрыялі дачаснаму "пралежванню" саломы і з'яўленню дзірак у страсе. Такім чынам, там атрымліваліся перакрыжаваныя ўмацаванні паплецінамі да жэрдак, а зверху яшчэ і "апузнікам" (так у нас называлі тыя бярэзінкі). Маглі ў гэтай якасці выкарыстоўваць і вербалоз (лазу), бо ён надта добра вязаўся. Праўда, ён меў адзін вялікі недахоп: надзвычай хутка высыхаў дазвання і тады быў "лягчэйшы за сена". У такім выпадку весці гаворку пра нейкае там да-

датковае прыцісканне, увогуле не выпадала. А так "апузнік" прылягаў, уціскаўся ў салому і ляжаў там ажно да таго часу, пакуль яго не зрывала, бо ён трухлеў ці скідвалі на ніз, калі па-новаму перакрывалі страху. Звычайна так і гаварылі: «Адзін гной застаўся: і ад саломы, і ад "апузніку", і ад паплецін, нягледзячы на тое, што яны знаходзіліся ў сярэдзіне страхі і з усіх бакоў былі прыкрытыя саломай». Часта дзівіліся: чаму на страсе так урос мох? Найбольш вопытныя і здагадлівыя адразу тлумачылі: «Таму, што салома пачала гніць, а гэты мох, якраз-такі, і прабіваецца на той макраце. Ён не такі, як мох-даўгунец, які выкарыстоўваюць пры канапачанні сцен, а, наадварот, цвёрды, нейкі кусцісты, з дамескам вялікай колькасці пяску (!). Гэта ад яго, калі такую салому пакідаюць потым жывёле на падсцілку, то апошняя не хоча вяртацца назад у хлеў, бо баіцца таго паху. Таму за лепшае лічылі тую салому і той мох вывезці і выкінуць куды-небудзь».

Калі ўжо людзей наймалі крыць страху, то яны стараліся залішне не лайдачыць (не перакурваць, не адпачываць), бо ім за такія паводзіны маглі проста "не даплаціць, сказаць, што дамаўляліся зрабіць за два дні, а вы і ў тры не ўклаліся, нам іншых людзей ля вас давялося трымаць». Ды і калі нешта парушыш у дамове, то потым з іншымі гаспадарамі пачнуць узнікаць усялякія складанасці. Вясковая пагудка працавала надта хутка і спраўна. Самае цікавае, што маглі агаворвацца нават усемагчымыя падрабязнасці, якія, здавалася, не мелі важнага значэння. Толькі гэта на першы погляд, бо абодва бакі зорка сачылі за сваімі "інтарэсамі": адныя жадалі паболей зарабіць, а другія – паменей заплаціць. Гэта ж адвечная справа.

У некаторых выпадках гаспадар дамаўляўся з майстрамі і адносна таго, які вільчык яны будуць яму рабіць. Справа ў тым, што некаторыя работнікі рабілі самі, ні ў кога нічога не пытаючыся і ні пра што іншае не думаючы. А іншыя, мабыць, навучаныя горкім вопытам, наадварот, стараліся ўсё ўдакладняць, каб потым не адказваць на лішнія пытанні і не чуць лішнія абвінавачванні на свой адрас. Праўда, як падаецца, то найбольш частым быў варыянт, калі гаспадар разводзіў рукамі і гаварыў: «Хлопцы, я вас наймаю, мы дамаўляемся аб аплаце і тэрміне, а як ужо ўсё рабіць, даводзіць да ладу, то гэта вы ведаеце лепш за мяне...». Тыя заўсёды, звычайна, стараліся напоўніцу адпрацаваць такі давер з боку гаспадара, каб ён не знайшоў нейкіх прычын для сумненняў у іхняй працы. Нездарма ж і гаварылі часта: «Малайцы, гэтыя людзі! Працуюць, то як для сябе!».

Навучаючы мяне, малога зусім яшчэ ўнука, дзед любіў паўтараць: «Страху зрабіць не праблема. Самае галоўнае заключаецца ў тым, каб

не пакінуць дзірку недзе ў незаўважаным месцы. Дапусціш такое, то і зацякаць стане адразу, але гэта яшчэ паўбяды, а самае сапраўднае гора можа прыйсці тады, калі ўздымецца моцны ветруган. У тую дзірку ўб'ецца такі струмень паветра, што парве ўсё дазвання. Калі ж яшчэ нехта і дзверы "здагадаецца" не зачыніць на тую часіну, то, лічы, што страхі не будзе. Сарве адразу. Як бы яе моцна ні ўмацоўвалі, як бы яе ні прыкручвалі, а супраць ветравай сілы не выстаіць. Не раз і не два даводзілася бачыць разгул неўтаймаванай стыхіі, а яшчэ часцей: чуць пра тое, як яна раскашавала. Як толькі дзірка зеўрае на страсе, то яе неабходна хутка прыкрыць новай саломай і старанна прыкруціць канцы новых трывалых паплецін. Здаецца, што і вецер дзьмуў з іншага боку, і не было яму магчымасці так разгуляцца, а ўсё роўна выдзірала, нібы нейкімі жалезнымі зубамі вынішчала. Добра, калі кроквы ды жэрдкі заставаліся, а то і іх магло паваліць, паламаць, павыкручваць. Тады саламяныя стрэхі і не дзіравыя здзірала так, што толькі смецце ў паветры насілася, а пра неахайных гаспадароў, то і гаварыць не выпадала лішні раз. Некаторыя гаварылі, без асаблівага на тое хвалявання, што, маўляў, яны з саломы страху і рабілі, каб яе не шкада было. Саломы па-новаму накідаць на жэрдкі вялікай складанасці не ўяўляе. Менавіта накідаць, а не акуратна ўкласці, падбіць ды папрывязваць, папрыціскаць перавясламі, а потым яшчэ і "апузнікам" прыладкаваць. Любая справа добрую завершанасць любіць, а не абы з рук».

Некаторыя з вяскоўцаў прыгадвалі здарэнні, калі раскрывала іхнія стрэхі падчас моцнага ветру, буры, навальніцы: «Зносіла так, што нічога з саломы наверсе ўвогуле не заставалася». Іншыя даводзілі, што там самі і былі, у першую чаргу, вінаваты – не даглядзелі, не прасачылі, як мае быць.

Гаспадары маглі замовіць майстроў, каб іх асабліва ніхто не перахапіў, і загадзя, недзе за месяц, а то і за два да пачатку. Яшчэ ж многае залежала і ад таго, якая сезонная занятасць па гаспадарцы насоўвалася на вяскоўцаў. Людзі працы заўсёды ад яе залежалі, а кожны кіраваўся яшчэ і ўласнай занятасцю. Здаралася, што нават за большую, чым звычайна, аплату не жадалі адрывацца: «Не магу, чалавечку, бо касьба пачынаецца... Нельга мне нікуды адлучацца, бо жніво пачалося... Не маю магчымасці зараз прыйсці да цябе, бо, як не круці, а свая праца так ушчаперыла, што і на дзень адарвацца няма магчымасці...».

У Заходняй Беларусі асабліва многа саламяных стрэх было па вёсках, увесь дахавы матэрыял тады быў даволі дарагім, і вяскоўцы звярталіся да спадручных. Праўда, рабілі з саломы, але надта асцерагаліся яе вогненебяспечнасці. Усё зводзілася да таго, што надзвычай

строгім быў усюдыісны пажарны нагляд. Самае дробязнае парушэнне ці адхіленне ад устаноўленых норм жорстка каралася. Старэйшыя пераказвалі, што тады і саломы на страху шкадавалі. Абыходзіліся найменшай колькасцю, каб астатнюю пусціць на кармы, на дадатковую падкормку. Вельмі часта сена не хапала да вясны, таму і выручала салома. На Палессі то яшчэ больш выручалі балоты, дзе заўсёды, у любое надвор'е, акрамя страшэнных залеваў і паводак, можна было нарыхтаваць сена, няхай сабе і не такога высакаякаснага, як звычайна.

Тады і саламяныя стрэхі рабілі не такія капітальныя. Калі змяншалася колькасць саломы, то і паплеціны ўмацоўвалі праз адну жэрдку. Заўсёды спадзяваліся на тое, што "апузінкі" ўтрымаюць усё на месцы. Мой дзядуля пры такіх згадках адно фыркаў і сцвярджаў: «Калі так зробіш, то некалі ды абавязкова вецер, асабліва моцны, парве такую страху. Любая справа любіць надзейнасці і трываласці. А так, то пойдзе ўсё ці добра, ці надзвычай дрэнна».

Бачыць старыя, абамшэлыя саламяныя стрэхі (лепей сказаць тое, што ад іх заставалася на той момант) прыходзілася ў шматлікіх фальклорных экспедыцыях. Асабліва тады, калі шляхі пралягалі праз невялічкія вёсачкі, закінутыя хутары і г. д. Глядзеў на такія збудаванні, на падваліны і стрэхі, на падслепаватыя вокны і збуцвелыя вуглы і неяк пастаянна не адступала думка: «Як толькі нашы продкі выжывалі ў такіх збудаваннях? Як ім прыходзілася трываць і пакутаваць!». І тут прыгадвалася маміна: «Сыночак, галоўнае, каб хатка... Не важна, якая яна... Няхай сабе і малюсенькая, і старэнькая, і падслепаватая... Няхай сабе яе і прадзімала і прамарожвала... Галоўнае, што яна была свая і ты ў ёй была гаспадыняй... Свая хата, свая печ і грубка, а калі гаспадары ўвішныя, то і бяды той не адчуеш... Вайна недалёка яшчэ заставалася, яе жудасныя сляды ўсюды адчуваліся... А што салома на страсе, то гэта і не заўважалася, бо не да прыгажосці тады было...».

ТРАДЫЦЫЙНЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ

# САЛОМА, І СЕЧКАЙ, САЛОМА

Надзвычай часта салома выкарыстоўвалася ў сялянскіх гаспадарках у якасці дадатку да асноўнай ежы для жывёлы – сена. Справа ў тым, што вяскоўцы перамешвалі яе з сенам, але ўсё ж, найчасцей, рэзалі з саломы сечку, выкарыстоўваючы для гэтай справы самаробныя і заводскія сячкарні. Ясна, што нажом сечкі не нарэжаш, таму і прыдумвалі кемлівыя галовы такія прыстасаванні, якія рэзалі-здрабнялі салому, тым самым значна скарачалі час, патрачаны на гэта, і фізічныя намаганні. Потым гэтую сечку запарвалі ў цэбрах гарачаю вадою. Здаралася, што туды ж дадавалі яшчэ і мякіну, далей перамешвалі і неслі каровам ці авечкам або коням (праўда, апошніх сечкай і мякінай стараліся не карміць, бо каню “патрэбна была сіла”, а ад такога корму сілы не дадавалася, таму коням падсыпалі авёс ці прыносілі лепшае, мурожнае, сена). Сечку пастаянна рэзалі ў зімовы перыяд, калі жывёла знаходзілася ў “стойлах”, г. зн. у хлявах і, адпаведна, не выходзіла на пашу. Яшчэ часта адзначалі, што перад тым, як рэзаць

сечку, салому змешвалі з сенам – гэта для таго, «каб жывёла не надта разбіралася ў тым, што ёй падсунулі есці ... некалі дзед падвучваў, што сена, для перамешкі з саломай, неабходна выбіраць мурожнае... салома, яна і ёсць салома, таму і стараліся дадаваць да яе самае лепшае сена... а калі яшчэ якой паўторбы мякіны дададуць гаспадары ды запарацць, то жывёла ажно давіцца... магчыма і ад таго, што пераменьваюць ежу...».

Мой тата, чалавек надзвычай майстравіты, сячкарню зрабіў сам, «каб не плаціць грошы абы за якую ламаку, а то зайдзеш прасіць, а табе пачынаюць прама ў вочы выказваць... не люблю я такога... каб за ўсялякую драбязу, ды выказвалі... тым болей, што я сам магу ўправіцца... для мяне гэта і не такая складаная справа... паглядзеў я ўжо і нават прадумаў, як стану рабіць...». Дзе вечарамі, а дзе раніцамі ўсё нешта скручваў, змазваў, падвострваў, а потым – зладзіў і спецыяльную падстаўку, каб было зручней круціць ручку сячкарні і падаваць па жалабку салому да бліскучых нажоў. З другога боку (ззаду) знаходзілася вялікая дашчатая скрыня, у якую сыпалася сечка. Усё было прадумана старанна. Як на сённяшні дзень, то і з вялікай доляй творчай фантазіі. Задаволены тата, калі ўпершыню прадэманстраваў мне, як працуе ягоная "машына", зазначыў: «За паўгадзіны на тыдзень можна смела нарэзаць сечкі для нашых кароў... Цяпер не трэба да некага хадзіць са сваёй саломай ды там рэзаць яе на сечку... Не люблю я прасіцца... Добра, калі ўсё сваё на падворку маеш...». Ён і іншым хваліўся-паказваў сваю сячкарню. Прыходзілі суседзі, сябры-механізатары і ім падабалася тое, як было выраблена. Прызнавалі і той факт, што гэта неабходная рэч у гаспадарцы.

Памятаю, як гэта адбывалася ў іх з дзедам Уладакам. Мужчыны добра пасядзелі за нашым сталом, быў нейкі прысвятак, а потым гаспадар вырашыў завесці дзеда ў пуню і паказаць свой "навадзел". Адчыніўшы дзверы ў памяшканне, дзе пад самую высокую страху ўсё было заладкавана сенам, тата паказаў рукою ў бок: «Вось яна, мая сячкарня! Новенькая, невялічкая, а нажы выгастрыў, то і малады бярэзнік будзе спакойна рэзаць». Але стары плямкаў нешта сваё: «Ат, знайшоў чым хваліцца... Бачыў я і не такія машыны...». Канешне ж, такія даволі грэзлівыя адносіны і зняважлівыя словы маглі запроста адбіць ахвоту ў любога чалавека дзяліцца сваім поспехам, радасцю. А тату, мабыць, хацелася як мага хутчэй паказаць, як лёгка і нячутна працуе ягоная сячкарня, як яна рэжа салому. Таму, відаць, пачуўшы такое замест ухвалення, ён з усяе сілы злосна крутнуў прыстасаванне! Нават не за ручку, а проста ўхапіўшы за кола. Але гэтага хапіла для таго, каб ужо

праз якое імгненне дзед казлом скакаў па падворку, трымаючыся за ніз жывата і не здолеючы вымавіць ніводнага слова. Аказваецца, яму з усяго маху ў прычыннае месца ляснула ручкай сячкарні. Тое, што многае і ўсялякае бачыў, – гэта адно, а тое, што пры любым механізме абавязкова выпадае захоўваць правілы бяспекі, – гэта другое.



*Бацькоўскі цуд*

...Калі бабуля ўбачыла, як дзед носіцца па падворку ля хлява, то адразу ж рэзюмавала: «Гэты ўжо і тут сабе танцы наладзіў! Нешта скача, але ж не прысвістае і не прыкрыквае! Мала яму ў хаце паскакаць, дык яшчэ трэба і па падворку панасіцца! Трэба, каб людзі пабачылі ды пахвалілі!». А калі даведалася, што прычына зусім у іншым, то “ўпякла” дзеду прама ў вочы: «А ты заўсёды сваім перадам і нізам усё стараешся закрыць! Не ведаеш куды свае прычындалы прыткнуць! Так яго

і цягне, каб людзям на языкі трапіць!». Дзед, у адчаі, адышоўшы крыху ад болю, прысеў на падмурачак ля калодзежа і змрочна зыркаў па баках, нібы шукаючы таго, на кім можна было б смела сагнаць сваю злосць [17, с. 169].

Недзе ўсяго праз нейкі тыдзень да нас пачалі хадзіць суседзі рэзаць сечку. Прыносілі сваю салому і рэзалі, а потым зграбалі ў мяхі і, падзякаваўшы, сыходзілі дамоў. Далей – болей. Некаторымі надвячоркамі, звычайна суботнімі, на двары ўтвараліся і даволі вялікія чэргі. Во ўжо дзе тады было весялосці! Людзі жартавалі, размаўлялі, дзяліліся навінамі, не забываючыся пры гэтым пастаянна эксплуатаваць сячкарню. Падказвалі тату, каб той за такую паслугу грошы з іх браў. А яны і заплаціць не супраць, бо так хутка ўсё робіцца, што нават заводскія машыны саступаюць гэтай. Гаспадар адно – пасміхваўся ў адказ ды спакойна прамаўляў: «Дайце я вам нажы яшчэ падвастру... Тады яна ўвогуле выплёўваць сечку будзе з такой хуткасцю, што вы салому не станеце паспяваць падаваць... У маёй жа сячкарні не адзін нож, не два, як у заводскай, а ажно тры нажы стаіць... Таму і сечка драбнюткая на дзіва атрымліваецца... Самі ж бачыце, што я вам тлумачыць буду...».

Гэта былі такія непаўторныя хвіліны, што мне проста хацелася, каб яны ніколі не заканчваліся, каб тыя вяскоўцы пастаянна знаходзіліся на нашым падворку, ажыўлялі сваімі галасамі ўстаялую цішыню. Падавалася, што ў такіх сітуацыях і заключаўся, сам па сабе, традыцыйны лад жыцця вясковага жыхара. Колькі было дабрыні і спагады, імкненне да дапамогі, узаемавыручкі, падтрымкі. Гэта ж былі чужыя людзі, а не родныя. Да іх можна было прыхінуцца, звярнуцца, зайсці і пасядзець, даведацца пра навіны ці падзяліцца ўласнымі.

Аднаго разу прыйшоў рэзаць сечку татаў сябрук, таксама калгасны механізатар, з якім яны здзейснілі не адзін пасляпрацоўны “подзвіг”. Гэтыя хлопцы з годнасцю насілі па вясковых вуліцах і па наваколлі, з гонарам ды адвагай, “сцяг” уласнага задавальнення. Прыйшоў сам, несучы за плячыма невялічкі абярэмак саломы ў нейкай падранай хатняй посцілцы. Кінуў прынесенае ля парога і зайшоў у хату. Тата тады якраз выконваў важную, але неабходную для любой сялянскай гаспадаркі, “місію” – гнаў самагон. І здаецца мне, што ў іх, верных сябрукоў, усё было дамоўлена загадзя. Галоўнае заключалася ў тым, каб знайсці прычыну і сустрэцца. Так сябрук і плетануў ад сваёй жонкі. У якасці своеасаблівай “маскіроўкі” закінуў за плечы нейкі куль саломы. Маўляў, прайдуся, а заадно ў Мішы і сечкі нарэжу. Хіба ж такое жаданне магло выклікаць у жанчыны нейкае падазрэнне? Мужчыны і ў хлеў тады нават не заходзілі, а адразу ўселіся за стол, заадно назіраючы і за тым, як

спраўна-звонка цурчыць самагонны ручаёк у трохлітровы гляк. Добра яны тады "нарэзалі" і "нарэзаліся". Недзе праз гадзіну ўжо вылі-спявалі, а яшчэ праз кароткі час мама загадала везці "апалы труп" на саначках, цераз увесь стадыён, дахаты "рэзчыка". Калі я перакульваў санкі і здаваў "цела" гаспадыні, то яна адно рукамі ўспляснула: «І дзе ж гэта ён так ужо дапаў?! Глядзець і то не можа! Авохці мне! Трэба ж у хату сунуць! А дзе ж сечка, якую чалавек мой нарэзаў? А дзе ж тая дзяружка? Яна ж амаль што зусім новая...». Сечку я паабяцаў прывезці цётцы наступным рэйсам. Вязу да сённяшняга дня...

Сустракаюцца сведчанні пра тое, як рэзалі сечку па вясковых гаспадарках і ў мастацкай літаратуры. Звернемся да рамана "Чужая бацькаўшчына" В. Адамчыка: «У куце на таку стаяла яшчэ новая з зялёным колам сячкарня – пад ёю ляжала торба нарэзанай разам з канюшынай сечкі.

Малады крутнуў за кола – тупы, даўно не востраны нож пачаў жаваць спрасаваную, што лезла з-пад брыля сячкарні, шчотку саломы.

– Ого, гостры, як у шаўца! – засмяяўся стары, кінуўшы вокам на сячкарню.

– Дзіва што, а хто мне яго навострыць? – зіркнула з-пад хусткі маладзіца, сціскаючы яе абедзвюма рукамі пад падбародкам.

– Давайце папробую, – малады выцягнуў са шчыліны ў сцяне пляскаты без ручкі напільнік...

Імполь, не абзываючыся, налёг пахаю на кола, зашоргаў напільнікам па нажы. У сечку, бліскаючы, зацерушыўся жалезны пылок.

...Імполь папробаваў ногцем нож і крутнуў за ручку кола – на абслізганыя дошкі, на жытнія снапы ў старане востра пырснула жоўтая сечка» [1, с. 16–17].

Не раз і не два выратоўвала саламяная сечка-"дамешуха" вясковых жыхароў. Не давала павывесціся дазвання хатняй жывёле, трымала яе на нагах. Ад гэтага мацнелі сялянскія гаспадаркі, квітнела вясковае жыццё. Праўда, з сечкай, рэзаннем саломы на кармы атрымалася тое ж самае, што і з многім са спрадвечнага быцця – у вёсках амаль не засталося хатняй жывёлы, а раз так, то і адпала патрэба ў сячкарнях, у іхнім вясёлым стуку, у гаманлівым коле жыхароў, якое абавязкова збіралася поруч з "машынай", калі толькі даведваліся, што нехта будзе рэзаць сечку. І прыходзілі не абавязкова для таго, каб нарэзаць самім дадатковых ("падтрымліваючых") кармоў, але і проста для таго, каб пачуць навіны, вясёлыя гісторыі, пабыць сярод людзей, адпачыць душою і целам ад рытму напружанай фізічнай працы, якая заўсёды, ва ўсе стагоддзі, суправаджала вясковых жыхароў.

Шкада, вельмі шкада, але няма таго патрыярхальнага ўкладу жыцця, наперад задуманай і запланаванай фізічнай працы, якая, мабыць, перарывалася ўсяго на пару тыдняў зімою (агульнавядомыя калядныя "вакацыі", калі ўсе жахары толькі і рабілі, што адпачывалі, адыходзячы ад вясенне-летне-восеньскіх прац і заняткаў і рыхтуючыся да чарговага гадавога працоўнага цыкла-працэсу). У гэтым не было нічога дзіўнага, бо так вялося, так ішло спрадвеку. Нешта парушыш, зробіш па-свойму, і потым цяжка будзе аднавіць, расставіць усё на свае месцы (калі ўвогуле такое ўжо будзе магчыма). Шкада таго, што першыя дзіцячыя гульні чамусьці асацыіруюцца (даволі часта) менавіта з ... сечкай: залацістай, бліскучай, кароценькай, якую мы любілі раскладваць па гурбачках, стараючыся адрозніць яе па даўжыні, па колеры, па таўшчыні і потым пахваліцца адзін перад адным, што ў мяне атрымалася лепей ("у нас салома была і таўшчэйшая і прыгажэйшая, таму і сечка выйшла такая, што вачанят ад яе не адарваць"). А хіба можна забыцца на тое, як зімовымі вечарамі матуля вучыла мяне рабіць саламяныя каралі. Складваць-падбіраць іх іменна з саломкі, парэзанай на сечку, нанізваючы на доўгую нітку. З цягам часу нават прыйшло ўменне рабіць такія каралі ў некалькі, а то і ў дзясятак, радоў. Мне было чым займацца, а матулі ўсцешна было назіраць, як яе сын старанна камбінуе з саламянымі кавалачкамі.

# ПЛЯЦЁМ - ВЫПЛЯТАЕМ

Але, здаецца, што самыя светлыя мае ўспаміны, звязаныя з саломай, асацыіруюцца з пляценнем маім татам усемагчымых гаспадарчых прыстасаванняў, прылад, якія заўсёды неабходны былі ў вясковым жыцці, знаходзілі сваё адвечнае выкарыстанне. Людзі не ведалі пра тое, што зусім хутка з'явіцца эмаліраваны посуд (скіроўваю ўвагу на тое, што гэта той посуд, якім карысталіся ў якасці насыпных прыстасаванняў, куды ссыпалі, складвалі разнастайныя матэрыялы, прадметы, збожжа, ягады, садавіну, агародніну і г. д.), а потым яго заменіць усялякая пластмаса. Маўляў, і танна, і не надта шкада, калі сапсуецца ці парвецца. Выкінуў і зусім не шкада. А тады ўсё было па-іншаму, усё вялося зусім не так, як гэта робіцца зараз.

У хацінцы заўсёды гучна іграла радыё, калі яго правялі, – адзіная сувязь з невядомым і агромністым светам, які раскінуўся недзе там: далёка-далёка. Але, атрымліваецца, тады было добра і ў гэтым маленечкім, сваім, сямейным свеце. У непераадольна доўгія восеньскія

і зімовыя вечары, калі здавалася, што ноч наступіла даўным-даўно, а на самой справе, «то яшчэ і куры спаць не клаліся», бавілі час тым, што займаліся рознымі рамёствамі, калі гэтаму спрыяла майстэрства і ўменне гаспадароў (дарослых членаў сям'і). Мама звычайна ці то вышывала, ці то ткала, але я не памятаю такога выпадку, каб яна проста ляжала ці сядзела. Хіба толькі тады, калі ёй вельмі нездаровілася. Тата – таксама нешта то пілаваў, то выпільваў, то загладжваў, то шыў ці выкройваў, а то збіраў нейкія механізмы, якія потым ажывалі і прыносілі многа карысці ў гаспадарцы. Потым былі шматлікія і шматгадзінныя размовы з суседзямі, з аднавяскоўцамі, якія прыходзілі да таты пасядзець вечарамі і заадно ацаніць новы прадстаўлены ім выраб. У ягонай галаве пастаянна мроіліся нейкія планы, задумы, меркаванні. Як падаецца, то такім чынам ён правяраў самога сябе: змагу ці не змагу, здолею ці не здолею? Гэта былі моманты ўласнага самасцвярджэння. Асабліва важным з'яўлялася тое, што ўсё зыходзіла нібы само па сабе, з уласнага розуму, са сваіх разважанняў і меркаванняў, што «даходзіў сваім "клёкам"». Ён ніколі нічога не запазычваў з кніг (часопісаў, газет), прыдумваў і выконваў ("прыводзіў у дзеянне") толькі тое, што недзе некалі бачыў, «верыў уласным вачам». Былі і такія выпадкі, калі ў яго нешта падоўгу не атрымлівалася. Тады ён нерваваўся, кідаў сваё "недаробленае прычындалле", гудзеў, што «нешта прапусціў, нешта не дагледзеў тады і цяпер не можа зразумець, як там ды што...». Але праз кароткі час браўся за працу па-новаму і тады ўжо усё даходзіла да лагічнага завяршэння, бо ён паспяваў да таго моманту ўсё пераасэнсаваць, знаходзіў прычыну, якая тармазіла працоўны працэс.

Аднаго разу ён прынёс і высыпаў перад грубкай даволі вялікую горку вярбовых галінак-пруткоў. Весела ўсміхнуўся і прапанаваў мне яму дапамагаць. Хто ж мог адмовіцца ад такой прапановы? Тата сказаў, што зараз будзем «калоць і вычышчаць гэтае голлейка». Узяў адзін пруцік і ўмела распалавініў яго ўздоўж, потым паабразаў вострым нажом нейкія, прыкметныя толькі яму, няроўнасці, ашкурыў пруцік і адклаў у бок. Маўляў, гэты гатоў. Мне карцела даведацца, што з гэтага ўсяго атрымаецца далей. Падаваў гольку за голькай, слухаў татавы аповеды. А ўсё хацелася пачуць: навошта ж гэта ён ашкурвае і коле гэтыя пруцікі? Тата злітасціваўся і паведаміў, што плануе сплесці маме некалькі саламяных каробак. Рознай велічыні і, вядома ж, рознага прызначэння: і ў ягады хадзіць, фасолю ці боб лушчыць, і насенне ўсялякае ссыпаць. І каб сявенек з пару сваіх заўсёды было пад рукою, ды і так, каб якую драбязу гаспадарчую складваць. Тады яна і пад нагамі валяцца не стане, і знайсці яе будзе проста. Вялікую гурбу тата начысціў таго

матэрыялу, а большую палову пруцікаў не ачышчаў, а толькі параскол-ваў, пазавострыў кончыкі і задаволена працягнуў: «За вечар управіўся, а думаў, што і за некалькі не паспею... Але гэта так хутка справа пайшла, бо ты, сынок, дапамагаў... Удваіх, хочаш ты таго ці не хочаш, а любая справа намнога спарней атрымліваецца... Вось што значыцца кампанія... Ды яшчэ мужчынская... Ты дапамагай, слухай і назірай-вучыся. Каб потым, калі спатрэбіцца, змог і сваіх дзяцей навучыць карыстацца гэтым саламяным рамяством...».



*Саламяная каробка*

Другім вечарам ён прывалок у нашу хацінку некалькі вялізных снапоў саломы. Здавалася, што ўся прастора ў будыніне была завалена пахкай жытняй саломай. Не ўяўлялася нават, як гэта такую колькасць можна будзе ўладкаваць, прывесці да належнага выгляду. Гаспадар адно – задаволена касавурыўся і ўсё старанна акідваў вачыма: «Нічога, што многа, затое будзе з чаго выбіраць. Калі пачнем раскладваць ды абразаць, падчышчаць, то каб і мала не аказалася, тут жа многае не задаволіць мае патрэбы. Салома не ўся пойдзе ў справу, яна толькі на першы погляд быццам бы роўная і гладкая, а станем падганяць, то і здзівішся таму, колькі адкінуў. Зараз пабачыш, як мы яе ладкаваць будзем. На першы погляд толькі падаецца, што ўся салома аднолькавая і яе можна выкарыстоўваць, але гэта памылковая думка. Яшчэ немалаважнае значэнне мае і тое, які выраб плануеш вырабляць. Калі

гэта рэч такая, якую на людзі пастаянна паказваць станеш, то тут трэба добра напнуцца, пастарацца, каб потым іншыя адно языкамі цокалі ад зайздрасці ды не маглі ўпікнуць, што і салома не залацістая, а шэрая, што і не роўненькія шоўчыкі атрымаліся лазовыя, што і каласы неахайна былі абрэзаны і гэтакія разбэрсаныя пасмачкі звісаюць. Людзі ўсё заўважаць. Асабліва тыя, якія самі выдатныя ўмельцы. Іншаму то і так, і так добра, але гэтакі паварот справы, сынок, не для мяне. У мяне сваё бачанне і выкананне ўсяго таго, што даводзіцца рабіць. Калі ўжо абыяк плесці, то навошта тады ўвогуле рукі таміць? Тады ўжо лепей з неачышчанай саломы зляпіць дый годзе. Ды ў такім выпадку ніхто пра цябе добрага слова не прамовіць, не выкажа свайго захаплення тым, што атрымалася...».



*Татаў падарунак*

Мне карцела як мага хутчэй убачыць, як тата стане выплятаць каробачку, якую ён паабяцаў зрабіць менавіта для мяне. Самае галоўнае, што яна засталася цэлай нават да сённяшняга часу і ўсюды суправаджае мяне летам, калі выпадае збіраць каляндру, сушоны кроп, іншае дробнае насеннейка. А бацька нібы і не заўважаў маёй нецярплівасці.

Толькі тлумачыў і тлумачыў, паказваў, як правільна падбіраць салому ў пучкі ("ладненькія і не тоўсценькія, усяго па пяць-шэсць саломінак, бо калі будуць таўсцейшыя, то нязручна стане выплятаць сценкі ці адоначак" (дно)), як раўняць салому па даўжыні, а потым абразаць пустыя каласы, каб ужо заняцца непасрэдна саломай. І абразаць трэба было так, каб саломіны станавіліся роўнымі па даўжыні, каб не тырчэлі хвосцікамі ва ўсе бакі, як мышы з-пад печы. Тады тату давядзецца выконваць двайную працу: браць і ўсё выраўноўваць самому, не спадзеючыся на маю дапамогу.

Аказваецца, што яшчэ і паасобна кожную саломінку неабходна было вылушчыць з верхняга слоя, каб яна заблішчэла, стала адліваць сонечным святлом. Тата паказаў, як гэта робіцца. Здавалася б, нічога хітрага ў гэтым няма: ён заціскаў саломіну намёртва ў адной руцэ, а другой браў і сашморгваў верхні слой. Але мяне адразу папярэдзіў, каб я так не ўздумаў сашморгваць, бо адразу ж парэжу свае рукі. Мне, за лепшае, трэба было знаходзіць, як ухапіцца за тоненькую шкурку і потым пацягнуць за яе. Пацягнеш хутка і рэзка, то яна адразу ж і адарвецца, ад самага кораня да вершалінкі. Калі ж пачнеш корпацца, рабіць не так, як табе паказалі, то праца значна замарудзіцца. Аказалася, што і ў самай простай справе неабходны практычныя навыкі і ўменне.

Адвярнуўшыся і сцішыўшыся, каб тата не заўважыў, я ўсё ж паспрабаваў таксама хвацка шмаргануць саломіну ў руцэ. Зрабіў так і адразу пачуў, як моцна запякло далонь. Адскочыў падалей і зірнуў на свае пальцы: яны былі ў крыві. Вядома ж, зароў ад страху. Думаў, што тата пашкадуе, але ў адказ пачуў: «Я ж цябе прасіў, папярэджваў, а ты ўсё роўна – не паслухаўся. Вось і маеш. Даць бы табе па азадку, але ты і так трасешся. Хадзі да мяне і слухайся ва ўсім, а то зноў што-небудзь прыдумаеш. Супакойся, зараз кроўка твая спыніцца, прысохне і ўсё будзе нармальна. Трэба ж было табе, гарэза, паспрабаваць. На мяне глядзіш, за гэта малайчына, але ж у мяне рукі загрубелыя, на іх цвікі выпрамляць можна, не тое, што салому сашморгваць. Папрацуеш з маё, тады ў гэтым усім і пераканаешся».

Выгаварыўся тата, пагладзіў мяне па галаве і зноў усеўся на свой невялічкі зэдлік, які верай і праўдай служыў яму падчас выканання нейкіх хатніх работ. Узяў сашморгнутыя, ачышчаныя саломінкі, было іх роўна пяць, яшчэ раз уважліва агледзеў, нешта падправіў, выраўнаваў і ўздыхнуў: «Ну што ж, пачнем...». Перагнуў той жгуцік і пачаў сплятаць яго лазовым пруцікам. Мяне ўразіла іншае, што даўжыня перагнутай саломкі была ўсяго сантыметраў пяць, не болей. Заўважыўшы маю няўцямнасць, гаспадар патлумачыў: «Гэта ж пачатак дна, а потым я стану

яго павялічваць, аплятаючы коламі саломы. Дно будзе вось такім», – і тыркнуў пальцам у лісток паперкі, на якім нешта было распісана. Аказваецца, ён любую рэч не толькі ў галаве трымаў, але, перад пачаткам працы, яшчэ і на паперы нешта выпісваў, пазначаў, акрэсліваў. Як цяпер, то разумею, нават вопытны чалавек недзе можа памыліцца, абавязкова прапусціць нейкую дробязь, а калі апамятаецца ці, што ўжо значна горш, заўважыць хіб, то тады яму давядзецца ці выкінуць амаль гатовую рэч, ці ўсё перарабіць з самага пачатку. Таму і пасміхваўся тата, ды на ўсе пытанні адносна свайго “малявання” патлумачваў: «Вы сабе, як хочаце, то так і рабіце, а я ўзяў ужо сабе за завядзёнку, што пазначаю на паперцы ўсе асноўныя памеры і этапы, каб не зблытаць незнарок. Яно то і так у галаве сядзіць, але на паперку зірнеш і табе спакайней становіцца. Вучыся, сынок, запамінай усё, як робіцца, то неўзабаве і ты што-небудзь спляцеш. Цябе то я вучу, а мяне ж ніхто не накіроўваў у такіх справах».

Як цяпер, у сталыя свае гады, то я не перастаю здзіўляцца са свайго таты: ён жа працаваў калгасным механізатарам і ў любое надвор’е, у любы дзень знаходзіўся то на сваім трактары, то на камбайне. Пры гэтым быў на “свежым паветры”, адкрыты і маразам, і завеям, і віхурам-вятрам, і залевам. Ніякіх кабін, нават самых простых, для засцярогі людзей ад праяў надвор’я не папрыдумвалі. Здаралася так, што тата ледзьве ўвальваўся ў хаціну, зусім адубелы ад марозу ці навылёт мокры. Ад стомы і холаду не мог самастойна распрануцца, дапамагалі яму ў гэтым усёй сям’ёю. Перакусіўшы, адразу лез на печ, на гарачую чарэнь. Часам матуля яму і есці туды падавала. Здавалася, што гаспадар ужо не зможа нічога рабіць, але гэта толькі так думалася, бо праз якую гадзіну тата ўжо сядзеў ля печы, курыў-дыміў сваёй самакруткай, што-небудзь рабіў і распавядаў мне сваю чарговую гісторыю. Адкуль толькі браліся сілы і жаданне ў чалавека, каб не паддавацца цяжкім выпрабаванням і рабіць сваё, задуманае. На гэта, мабыць, трэба было не толькі жаданне, але і непахісная сіла волі, гаспадарчага духу, які ніколі не даваў яму расслабіцца.

Так было і з маёй каробачкай: тата паабяцаў і стрымаў сваё слова. Донца на вачах пачынала павялічвацца і ўжо станавілася зразумелым, што зараз будзе. Я прыціскаўся да гаспадара і з радасцю чакаў таго моманту, калі ён пачне выводзіць сценкі. Гэта заўсёды найбольш хвалюючая і адказная хвілінка. Гаспадар закурыў, перамяшаў вуголле ў грубцы. Паказаў свой выраб маме і паціху пасунуўся на зэдлік да стала з паперай. Я трымаў у руках туга сплеценае донца і ўжо ўяўляў, што ў хуткім часе буду гуляцца са сваёй каробачкай. Праўда, тады нават

і не здагадваўся, якая ж яна будзе на выгляд. Думаў, што такая, як і іншыя, – вялікая. Іх я ўжо бачыў у нашай хаціне, у гаспадарцы і мог спакойна адносіцца да такіх прадметаў хатняга ўжытку. А тата задумаў сваё. На самой справе атрымалася так, што каробачку гаспадар завяршыў на трэці дзень. Але работу скончыў зусім незвычайна: узяў і для такой маленечкай пасудзінкі сплёў яшчэ і хвацкую накрывачку. Калі паказаў завершаную работу, то мама і дзед, які, як звычайна, бавіў у нас чарговы вечар, былі ў захапленні. Пра сябе то я нічога і гаварыць не буду, бо я нават спаў з каробачкай недзе ажно дзён з дзесяць, пакуль паспеў да яе прызвычаіцца і яна ўжо стала для мяне нечым будзённым. Але ж гэта потым, недзе ажно праз паўгода, а то і праз год. Спачатку ўсё пайшло па-іншаму і радасці маёй не было канца. Я нават каробачку на вуліцу не выносіў, каб пахваліцца перад суседскімі дзецьмі, бо баяўся, што асабліва старэйшыя, таму яшчэ і больш распушчаныя, што-небудзь з ёю зробяць: папсуюць, замажуць, насыплюць якога пяску ці якой іншай трасцы. Гэта была мая, уласная, каробачка і мая радасць.

Калі ў першы раз мама ўзяла мяне ў лес па чарніцы, то я ўгаварыў яе, каб навязала і мне такую ж ношку, як і сабе, каб абавязкова паклала туды маю каробачку, у якую я стану збіраць ягады. Матуля адно ўсміхнулася і ласкава прамовіла: «Малавата ты, сыночак, хочаш мне дапамагчы... Ты ж у мяне ўжо вялікі... Трэба, каб ты штук пяць такіх каробачак назбіраў... Вось тады гэта будзе сапраўдная дапамога... Тады мне суседкі зайздросціць стануць... А то ўсяго адну... У яе недзе ўсяго літр ягад і ўлезе. Не болей таго... У лесе старацца таксама трэба... Проста так прагуляцца, то занадта непрыгожа будзе для такога вялікага хлопчыка... Калі назбіраеш поўную сваю каробачку, то мы з яе ягады перасыплем у вялікую і пачнеш па-новаму... Ягад у гэтым годзе ў лесе многа... Зімою ўсё гэта спатрэбіцца... Любая ягада, у любым выглядзе, яна ж вылячальная... Насушым чарніц... Паеду ў Пінск, то прадам там і табе абавязкова што-небудзь прыкуплю... Трэба ж аддзячыць сына за тое, што ён мне ва ўсім дапамагае... Ды і хараша ў лесе настолькі, што ажно дух спыняецца... Ты яшчэ ж не быў у ягадах, не ведаеш, дзе і як яны растуць, як іх выпадае збіраць па аднюсенькай, пастаянна нагінацца і разгінацца... За дзень так нашчыруешся, што потым кругі перад вачыма плывуць».

Тую каробачку я бярог (і берагу!) усё сваё жыццё. Быў толькі невялікі перапынак, калі давялося служыць у войску, то не чапаў гэтую саламяную рэч амаль два гады. А так, кожны год, а зараз ужо і месяц, а то і часцей, бо знаходзіцца яна ў маёй гарадской кватэры, трымаю

ў руках даўні падарунак свайго таты. Здаецца, што і гады ўвогуле не паўплывалі на яе: адно, што пацямнела саломка і на дне з'явіліся выразныя сляды гнілі. Недзе, мабыць, раней, калі мяне не было, ці паставілі каробачку ў сырое месца, ці ўсыпалі нешта і не дагледзелі, а яно пагніло і такім чынам паўплывала на захаванасць рэчы. Тым не меней, як аказалася, памяць наша захоўвае ўспаміны не толькі пра людзей, падзеі, але і пра рэчы таксама. Дзякуючы ёй мы здольны вяртацца ў мінулыя гады, аднаўляць тое, што мінулася даўным-даўно і, тым не меней, ажывае, дазваляе будаваць цвёрды лагічны рад у вяртанні да свайго, а то і да чужога, мінулага. Неяк яно і не надта складна гучыць і сфармуляваць усё можна, як "саламяная памяць", "саламяныя ўспаміны", "гісторыі, звязаныя з саломай", "саламянае цеста" (выраз майго дзядулі, якім ён акрэсліваў усё тое, што, на ягоную думку, было "сшыта белымі ніткамі па чорнаму полю, а то і наадварот").

Увогуле тата плёў з саломы многа ўсялякіх каробак. Зразумелая справа, што па форме яны былі аднолькавыя, але затое значна адрозніваліся па памерах. Тэхналогія вырабу была спрадвечная. Адзінае адрозненне, якое мне тады ўдалося ўлавіць, – у рэчах, большых па форме, тата звычайна выкарыстоўваў неашкураныя лазовыя ці вярбовыя пруцікі. Ён мне даводзіў, што там, дзе гэтая рэч у далейшым будзе актыўна выкарыстоўвацца, празмерная прыгажосць не трэба. Значыць, і ашкурваць пруцікі не выпадае, бо гэта адно толькі дарэмна траціць час. Калі гэта будзе сявенька, то яна вельмі хутка запыліцца, загнюсіцца, і адзінае, што гаспадар можа потым зрабіць для яе ачышчэння, – гэта старанна выбіць ці вычысціць якой-небудзь шчоткай з сярэдзіны. А не, то стукне аб калена раз-другі і павесіць каробку ці паставіць да наступнай сяўбы. Тое ж самае адбывалася і з іншымі каробкамі, якія знаходзілі свой ужытак у надворнай гаспадарцы. Іх і ў хату гаспадыні ніколі не ўносілі. Такім прыстасаванням, такому посуду заўсёды знаходзілася месца ў гаспадарчых будынках. Адзінае патрабаванне, якое прад'яўлялася да ўсіх саламяных вырабаў, – іх ніколі нельга было пакідаць на адкрытым месцы, бо пойдзе дождж, моцна намочыць, салома набрыняе і расплывецца. Тады давядзецца плесці нешта новае, не спадзеючыся аднавіць старое, і слухаць усялякія агаворкі, што «выкінула ў двор, каб каробка праветрылася ды ад гразі прачысцілася, а яна ўся і разлезлася, нібы нехта яе з вялікімі намаганнямі ў розныя бакі цягнуўдраў». Язык, як вядома, касцей не мае, а ў сялянскай гаспадарцы заўсёды выпадае быць абачлівым, памяркоўным і акуратным адначасова.

Яшчэ памятаю, што калі тата выводзіў сценкі ў вялікіх каробках, то часта недзе, прыкладна, пасярэдзіне з абодвух бакоў уплятаў, для тры-

валасці, «каб каробка не пераламвалася напалам і не выйшла з ужытку заўчасна», лазовыя кіёчкі-ўмацаванні. Яны маглі быць невялічкімі і прамымі, а маглі – заходзіць пад самае дно і таму мелі форму літары "Г". Усё прадумвалася. Часта таксама ўплятаў такія кіёчкі для таго, каб пазней за іх можна было чапляць вяроўкі ці кавалкі грубай палатніны, якія прызначаліся для нашэння такой каробкі на грудзях ці за плячыма. Калі браць і чапляць проста за салому, то гэта азначала, што "па-жывому" рваць адразу ж саламяную сценку, бо ў ёй выпадала рабіць дзіркі. І няхай сабе яны былі не надта вялікія, тым не менней гэта не спрыяла трываласці рэчы. А калі там былі загадзя прадугледжаныя калочкі ды яшчэ з былымі, абрэзанымі галінкамі, то чапляць вяроўкі ці палатніну было надзвычай зручна. Тут думалася і рабілася ўсё наперад, а не з такім разлікам, што, ат, потым, калі што-якое, папраўлю. Падплятаць на полі здагадваліся толькі няўхлямныя гаспадары, якія і так заўсёды "весялілі" вяскоўцаў сваімі выхадкамі і паводзінамі.

Часта салому перад тым, як ужываць яе пры пляценні, мачылі. Рабілі гэта свядома, бо тады яна набывала пэўную гнуткасць і спрыяла працы майстра. Тата такую салому раскладваў у вялікія ліпавыя ночвы, якія сам жа маме і выдзеўб, а потым заліваў з чыгуна кіпятком. Такая салома не толькі рабілася эластычнай, але таксама набывала медзяны колер. Аказваецца, што часта салому замочвалі не толькі для эластычнасці, але і менавіта для змены колеру. Такі прыём прымянялі, калі выплялі рэчы на продаж. На кірмашах збіралася шмат людзей, якія маглі напоўніцу ацаніць майстэрства вяскоўца і набыць нешта, выробленае ім. Карысталіся попытам такія "медзяныя" вырабы. Іншая справа, што, безумоўна, у першую чаргу глядзелі на кошт. Як бы там не было, але мастацкае аздабленне, нават у самай простай гаспадарчай рэчы, таксама мела станоўчае значэнне. Нехта браў толькі для будзённага выкарыстання, а іншы – яшчэ глядзеў на тое, як рэч была зроблена. Хацелася, каб не толькі рукам было зручна, але каб і вачам было міла глядзець на тое, за што вымушаны быў заплаціць грошы, няхай сабе не такія і вялікія. У вяскоўцаў капейка заўсёды была ў цане. Нават у наваколлі добра ведалі, хто можа проста сплесці, напрыклад, каробку пад ягады, а хто яшчэ і "адштукаваць" яе: упрыгожыць раўнюткімі шнурочкамі пераплятаючых нітак, вывесці вечка з іншага колеру саломы, часта нават завяршыць справу распалавіненай ("расколатай") саломкай, каб самы верх вырабу нагадваў сабою адметную ад іншых "штуку". Тады ўжо ішлі ў "справу" і ўсялякія агаворкі іншых гаспадароў, што і салома не роўная, і ў таго майстра палеткі свае добрыя, то ён і выплятае з цудоўнага матэрыялу, а мы, маўляў, пакутуем са звычайнай сало-

май, таму ў нас і вырабы такія, але для ўласнай гаспадаркі «і такое пойдзе, бо на продаж мы ніколі і нічога не рабілі, тым болей, з саломы».

Усё роўна, якой бы не была неабходнай, а то і не вельмі часта выкарыстоўваемай рэч, гаспадар стараўся зрабіць яе трывалай, а далей ужо думаў пра прыгажосць. На гэта ўплывала ў значнай ступені і тое, як у чалавека было з вольным часам. Хапала яго, то не спяшаўся і задумваў нешта ўдасканаліць ці ўпрыгожыць, а калі падціскала, то рабіў зацята, як найхутчэй, каб адразу ж выплеценую рэч пусціць у справу. І ў каторы ўжо раз даводзіцца канстатаваць: вясковец вяскоўцу ў гэтай справе ніколі не быў роўны. У некага ж ды многае атрымлівалася лепей, а ў іншых, так і гаварылі, «што з ягонай каробкі і бульба вялікая, не тое, што зерне, павысыпаецца: там і салома неабчышчаная, там і лаза абы-якая і ў любы час нарэзаная; з такой рэчы ні толку, ні доўгага веку ў яе, хоць і жадаў бы, то ўсё роўна не будзе...». Канешне, з такімі вырабамі стараліся не вытырквацца на вочы людзям, бо выдатна разумелі, што «іх падымуць на смех, не дадуць пахваліцца тым, што і яны нечага вартыя...».

Часта чулася з боку гаспадынь: «Спляці, ды спляці, ты, мне новую каробку. Колькі можна старой карыстацца? Яна ж і дзіравая, і яе ўжо мышы дазвання пашкуматалі... Жанкі смяюцца, што па дарозе дзе-небудзь з яе дно вываліцца... Так і гавораць, ці не страшна мне ў такую каробку чарніцы сыпаць... Угнуся адно, каб не бачылі, што ў мяне слёзы на вачах нагортваюцца... І гэта пры жывым гаспадары... каб жа не ўмеў, а то ж умееш, але не зробіш, бо табе гэтага зараз не хочацца. Трэба яшчэ, каб пад настрой падпала... Ага, ужо гады тры прашуся, каб выручыў, а ты ўсё ці адмоўчваешся, ці адмахваешся... Мне што, па суседскіх мужчынах ісці? Глядзі, каб потым табе шкадаць не давялося... Зараз, у чарговы раз, на чарніцы пара прыйдзе, а з чым я ў лес падамся? З гэтай, парванай і дзіравай, болей не пайду... Есці ягады любіш, ласуешся імі не меней за малое дзіця, то хоць бы ў гэтым павагу да жонкі праявіў... Колькі ж можна прасіцца, на прамілы Бог, ды ведаць заранёў, што ўсё роўна не пачуеш маёй просьбы, не возьмешся за справу...».

Магчыма, што “просьбы” маглі быць і іншага характару: з праклёнамі, са слязьмі, з крыкамі-галашэннямі. Вясковае жыццё яно было ў многім арыгінальнае і непрадказальнае адначасова. Хіба ж забудзешся на тое, як некалі, у мае дзіцячыя гады, школьная прыбіральшчыца скардзілася сярод жанчын: «Жаночкі, а мой жа дурында і новай каробкі не сплёў, і старую разбіў. Падумайце толькі: папрасілася ж добра, а ён раз'юшыўся і такое ўчыніў. Я ж і падумаць нават не магла, што так рас-

ходзіцца ды, самае галоўнае, што гэтак хутка завядзецца. Не паспела і пары слоў сказаць, а ўжо атрымала напоўніцу». Нехта з жанчын пацікавіўся, ці то проста так, ці то каб падкузьміць: «І як жа гэта ён каробку разбіў? Даўмецца ж трэба. Яе і разламаць не так проста, асабліва калі ўмела сплецена. А тут проста: узяў і разбіў. Гэта ж табе не гліняны гаршчок, які можа ўдрызг разляцецца ад моцнага ўдару. Гэта ж салома...». Тая, што скардзілася і распавяла "чыста ўсю праўду": «Ды мне па спіне як урэзаў, то яна і раляцелася! Толькі пылоцце ды бруд у паветры то з паўгадзіны віселі! Здавалася, што і свету белага не відно! Сонца і тое не прабівалася! Потым да самага вечара ў вачах ад такой пылоты рэзала, а ў носе, то нібы яго хто самога саломай заткнуў, так ужо было не прадыхнуць!». Жанчыны ажно з рогату пакочваліся ад такога "прызнання". Тым болей, што яны выдатна ведалі, як жыве «весела ды галасіста» тая прыбіральшчыца са сваім мужам. У іхняй хаце праз дзень "сабачае вяселле" было: з музыкай, з танцамі і песнямі, і з ... бойкамі, адпаведна.

Даволі доўга тата выштукоўваў (менавіта так, а не іначай!) каробку для збору вішань. Тады ў любой гаспадыні не надта многа было купленага посуду: каструль, вёдраў, балей, ночваў. Усё было саматужнага вырабу: глінянае, драўлянае, саламянае, вядома ж, пастаянна нешта выходзіла са строю. Яго імкнуліся адрамантаваць (падклеіць, падплесці, запаяць), але гэта таксама ненадоўга. Нейкі год-другі пройдзе (а то і зусім – пару тыдняў) і ўсё роўна купляць давядзецца. Таму нярэдка можна было пачуць, як разважалі вяскоўкі паміж сабою: «Зразумелая справа, што нічога вечнага ў гэтым свеце не бывае, тым болей нейкай рэчы. Хацелася б, каб яны даўжэй служылі, каб былі больш даўгавечныя. Толькі ж хочацца аднаго, а робіцца – зусім іншае. Купіць, то не штука, але ж грошы, якія так цяжка дастаюцца, якія потам ды слязьмі зарабляюцца, крывавымі мазалямі ды болем у целе, назад ніхто не addасць і не верне. Таму і нашы дзяды-прадзеды ўсё навучыліся самі вырабляць, што з лазы, што з голля, што з лыка, што з саломы, з гліны ды з дрэва. Здаецца, з усяго, што знаходзілася навокал, нашы продкі запроста маглі вырабіць сабе патрэбную рэч. Звычайная салома, а як яна іх заўсёды выручала. Таму і карысталіся самаробнымі рэчамі доўга, ашчаджаючы іх, сочачы, каб тыя заўчасна не парваліся. Толькі ж у жыцці ўсялякае здаралася. Нічога вечнага не было: зношвалася, рвалася, дзіравілася. Таму, так ці іначай, калі не хацелася, шкада было развітвацца з цяжкасцю сабранымі грашыма (капейкамі няшчаснымі!), тады самі зноў і зноў звярталіся да старадаўніх рамёстваў. Атрымлівалася, што выдатна разумелі вясковыя жыхары, як любая справа, любое ра-

мяство, няхай і не такое складанае, а ўсё роўна патрабуе і старання, і намаганняў, і фізічнай працы».

Памятаю добра, як садзілі на памежным загоне цэлы рад маладых вішанек, бо ж “дапамагаў” тату: ён выкопваў ямкі, сыпаў на ніз гліну, потым – крыху чарназёму, а я трымаў кволае дрэўца, стараючыся з усіх сіл, каб яно не пахілілася. Самае дзіўнае, што прыняліся ўсе саджанцы, ніводны не “закапрызіў”: зазелянелі, пацягнуліся голлейкам да сонца. Самае прыгожае, непаўторнае і цікавае пачалося ўсяго недзе праз пару гадоў, калі дрэўцы пачалі ўбірацца ў сваю вішнёвую сілу і зацвілі. Здавалася, што ўся наша мяжа была густа-густа абліта бялюткім малаком. Пах, водар ад кветачак стаяў такі, што кружылася галава. А колькі шчыравала ля іх пчолак, чмялёў, якія стараліся, як мага хутчэй і старанней сабраць каштоўны для іх кветкавы нектар, што ажно міжволі даводзілася ўбіраць галаву ў плечы, каб каторая незнарок не джгнула. Дарослыя папярэджвалі, каб не слухаўся суседскіх дзяцей і не рваў зялёных ці крыху пачырванелых вішань, бо неўзабаве надыдзе той доўгачаканы час, калі плады паналіваюцца сокам і ажно пачарнеюць ад спеласці. Вось тады і прыспее часіна збіраць ураджай вішань.

Першыя гады збіралі спелыя вішні ў карабачкі для чарніц. Але гэта было даволі нязручна. У такі посуд улазіла ўсяго з вядро пладоў. Як сцвярджала мама: «Толькі гэта, разахвоцішся, а ўжо каробка поўная і трэба несці ў хату высыпаць. Пакуль туды-сюды прасунешся, то за гэты час яшчэ лепей бы каробку назбірала вішань. Ды і ў хаце ў нас няма куды высыпаць. Старыя ночвы з табою, гаспадар, прыстасавалі, а колькі ў іх улезе: адна-дзве каробкі, а далей што рабіць? Вішні ж пераседжваць не стануць і чакаць – таксама. Шпакі ім хутка раду дадуць. Бачыш, што робіцца, амаль на галаву гатовыя садзіцца. Нікога і нічога ўжо гэтыя птушкі не баяцца. Пастарайся, чалавеча, зрабі што-небудзь. Гэта ж не ў лес, як па чарніцы, сунуцца і там недзе лазіць, каб камары ды іншы гнюс нагрыз, а тут жа прама ў сваім агародзе. Не дапусцімся ж мы да таго, каб гэта ўсё задарма прапала. Навошта тады стараліся, садзілі, палівалі, радаваліся першым кветачкам, і першым ягадкам? Неяк жа трэба і з такога становішча ратавацца, а то людзі смяяцца стануць, што ва ўласным садзе ўраджаю рады не далі, не дагледзелі, як мае быць. Іншыя з зайздрасцю пазіраюць, а мы, атрымліваецца, нібыта з празмернай радасці і ўвогуле на ўраджай з табою забыліся. У цябе ж галава надзвычай добра на ўсё гэта мікіціць. Хто-хто, а я ведаю. Падумай, ды зрабі ўжо такую пасудзіну, каб можна было да дзясятка каробак адразу ў яе ўсыпаць. І насіць тады не трэба будзе: паставім на вазок, які ж ты зрабіў. Насыплем, а потым спакойна, не надрываючыся, і завязем».

Здаецца, тата не адразу кінуўся выконваць маміну просьбу-маленне, не таму, што не хацеў, а таму, што, як заўсёды ў яго вадзілася, «усё прадумваў наперад, каб уявіць, нібы ўбачыць, якая павінна была атрымацца на выхадзе рэч, тады ўжо ўсё будзе значна прасцей». У той год, то мы збіралі вішні па-старому: у ночвы і нават сыпалі ў навюткі цабэрак, а потым ужо прадавалі людзям. Затое восенню, калі былі выкананы ўсе сялянскія гаспадарчыя працы, калі і ў калгасе, дзе тата працаваў пастаянна то трактарыстам, то камбайнерам, працы стала значна меней, гаспадар папрасіў мяне ісці разам з ім да гумна і там выбіраць салому для пляцення. Было відаць, што ён ужо ўсё прадумаў і прыдумаў. Бацька так і сказаў: «Вырашыў, сынок, спляту такія карзіны, якія я бачыў у сваёй сястры Любы, калі ездзіў да яе ў госці ў Закарпацце. Гэта будуць своеасаблівыя каробкі, толькі яшчэ і з ручкамі, каб іх зручна было пераносіць, тады і вішні ў іх не патаўкуцца. Будуць ляжаць, цэлыя і непадаўленыя. Не ведаю пакуль што, як мне паўплятаць ручкі, бо тыя карзіны, што я тады бачыў і насіў нават у іх чарэшні, былі сплецены з яловага карэння і таму вылучаліся сваёй трываласцю, а ў нас жа з табою ў распараджэнні звычайная салома, якая асаблівай трываласцю не вылучаецца. Зараз наадбіраем з табою пару снапоў, потым – абчысцім, паабразаем і запарым у карыце. Яна, як папарыцца, то стане мякчэйшай. Памятаеш, як мы табе каробачку рабілі? Вось і тут так станем дзейнічаць. Галоўнае, паўтараюся, каб прыдумаць, як уплесці ручкі. На іх жа потым асноўны цяжар і будзе прыпадаць. Дрэнна зробім, то вырвуцца адразу і ўся наша праца пойдзе на псы, чалавеча. Хіба які каркас і сапраўды выплесці з карэння ці лазовага пруцця, а потым усё ўжо аплесці саломай. Скамбінаваць такім чынам, то, з аднаго боку, нешта незвычайнае атрымаецца, а з другога – выйдзе хвацкая вялікая пасудзіна: і зручная, і трывалая, і многа ў яе ўлазіць будзе».

Салома на той год выдалася доўгая, як тата падкрэсліваў, «валакністая, з яе можна будзе што хочаш сплесці; такая вытрымае і дасць магчымасць давесці ягоную задуму да лагічнага завяршэння». Калі хто не адбіраў саломы для такой справы, як пляценне, то той не ведае, што гэта не надта хуткі занятак: неабходна ж не толькі каласкі да каласкоў складваць, а трэба яшчэ і па даўжыні падабраць і звярнуць увагу на яе таўшчыню. Калі надта тоўстая салома, то такую лепей за ўсё пускаць на страху. Там яе месца, а калі не туды, то на сечку. Там любая салома, акрамя гнілой і разлезлай, смярдзючай і вохкай, пойдзе. Вядома ж, і сапрэлая не пойдзе, бо з яе карысці ніякай не стане. Адно што адкладзеш, але ў справу не выкарыстаеш. Затое калі правільна адабраць, то гэтакая салома, нават яшчэ і неачышчаная, так засвеціцца па-іншаму,

нібы тым самым паказвае, як яна сама разумее, што яе адабралі на карысную справу. Адабралі мы тады добрыя чатыры вялікія снапы, якія тата прынёс у хату. Потым, нібы адумаўшыся, прамовіў: «Трэба было там салому і сашморгваць і паабразаць, але ж прыцемак ужо ўзяўся. У хаце будзем вечарам займацца, то і занятак сабе знойдзем, і на карысць гаспадарчай справе ён пойдзе. Дый весялей працаваць, перад печчу седзячы ці перад грубкай. Тут і радыё нешта гамоніць, і котка дурэе-падскоквае, і табе занятак ля мяне знойдзецца. За вечар пера-бярэм, а потым я пакажу, якую спачатку карзіну плесці стану. Здаецца, што ўжо нават прыдумаў і як ручкі паўплятаю. Нічога, што ў хаце цесна, але затое ўтульна, цёпла і ніхто нам перашкаджаць не будзе».

Размаўляючы ды пасміхваючыся, хвацка карыстаючыся вялікімі "авечымі" нажніцамі ("ножнамі"), тата спачатку паабразаў пустыя каласы ў саломы, якую мы перад гэтым выраўнялі-расклалі вялікаватымі гурбачкамі, а потым узяліся сашморгваць. Адразу ўжо складвалі бліскучыя саломінкі ў ліпавыя ночвы, якія стаялі ля нас. Гаспадар, па-змоўніцку падміргнуўшы вокам, паведаміў: «Зараз мы яе не проста зальём кіпятком, але яшчэ і ў печ запарвацца ночвы ўсунем. Салома ж не цяжкая, таму спачатку ўстаўлю ўсё ў печ, а потым ужо конаўкай паналіваю вады. У печы цёпла, адчуваецца, што раніцай тапілі, таму салома там разыдзецца, набрыняе, стане падатлівай, як самая мяккая гумка». Так і зрабілі. Здавалася б, простая справа, а атрымліваецца, што працавала ўся наша сям'я і ажно да позняй ночы.

Мне чамусьці падалося, што раніцай я прахапіўся вельмі рана. Але гэта толькі падалося, бо калі выскачыў у малы пакойчык, то ўбачыў, што тата ўжо трымае ў сваіх руках вялікі, можна было б сказаць, што і здаравенны, каркас будучага каша. Дно было сплецена, а сценкі ўзняліся ўжо сантыметраў на пяць. Паціху размаўляючы, гаспадар даводзіў, што салома, замочаная і ўпрэлая ў печы, – гэта зусім не тое, што сухая і перастаялая ў полі. Яна гнецца так хвацка, што выкручвай любую фігуру, нават самую складаную, і ўсё атрымаецца. Аказалася, што пакуль я спаў, то бацька паспеў не толькі сплесці аснову і перайсці на бакавіны, але і падрыхтаваць мацаванні для бакавых ручак. Усё складанае, як я потым не раз у сваім жыцці пераконваўся, пачынаецца з простага. На ім і грунтуецца, на ім і засноўваецца. Аказваецца, за такую трывалую аснову ў бакавых сценках каша павінны былі служыць дзве, сантыметраў па трыццаць, гладка ашкураныя і зачышчаныя лазовыя галінкі. Іх трэба было "вянкоў" за пяць-шэсць прымайстраваць у саламяную сценку, а потым зверху заплесці, "пайсці роўным шнурочкам саломы, прыцicкаючы яе ўжо не лазовымі пруцікамі (не вярбовымі), а суворым шпага-

там, выдраным з непатрэбных трактарных калёс. Гэтакага "дабра" тата шмат нарыхтаваў дома. Калі толькі надаралася якая вольная хвіліна, то і выцягваў-вылузваў шпагатавыя ніткі ды змотваў іх у клубкі, якія потым займалі свае месца на паліцах у ягонай самаробнай майстэрні. Здавалася, што там заўсёды можна было адшукаць любую драбнічку, калі б раптам узнікла ў ёй патрэба. Гэтакай рысе характару тата прывучыў тады і мяне. Усё зыходзіць з прынцыпу, што гэта, маўляў, за спіною не насіць: паклаў ці паставіў і толькі запамятай – куды, каб пры нагодзе ўзяць. Не бегаць па суседзях, не шукаць, не майстраваць па-новаму, а ўзяць гатовае.

Мне чамусьці падавалася, што тата і тут зробіць крышку-накрыўку. Я так і запытаўся, калі ён акуратна выгнаў сценкі і паклікаў маму, каб тая паглядзела. Яна ж і сказала, што болей не трэба, бо калі насыплем многа ягад, то кош не вытрымае і парвецца. Тады я і прапанаваў зрабіць крышку. Тата зарагатаў і прамовіў улюбёнае: «Не, сыночак, давай лепей зробім гэрцы, што да тваёй попы дзверцы!». Дарослыя весела засмяяліся, а мне засталося адно – лішніх разоў колькі шмаргануць носам, каб такім манерам засведчыць сваю крыўду. Асабліва капрызіць у такіх выпадках не выпадала, бо калі б паспрабаваў настойваць па-іншаму, то быў бы выдалены за дзверы ў вялікі пакой і ўсё на тым. Сядзі сабе там, шаноўны, раз не разумееш важнасці і адказнасці справы. Праўда, потым тата вярнуўся да маёй парады і спакойна патлумачыў: «Сыночак, а як жа ты вішні будзеш у карзіну сыпаць? Гэта ж табе не чамадан і не сундук з вечкам. Вішня, яна хоць і ягадка, але ж дыхаць таксама любіць. Як і ўсё чыста навокал нас. Таму сплёў я адкрытую карзіну. Зараз пакладзем з табою яе на печ і няхай яна там добра прасушыцца, павыцісне з сябе ўсю вільгаць, якую ўвабрала. Цяпер ужо болей вада ёй не патрэбна».

Потым тата выплеў яшчэ штук з пяць кашоў-каробак, але ўжо не такіх вялікіх, а як ён сам падкрэсліваў: «Вядзёркаў і нават паўвядзёркаў». Відаць, для таго, каб зручней было збіраць у іх вішні. Яно і не дзіва, бо калі даводзілася стаяць падоўгу на драбіне і, выцягнуўшы рукі ўгору ці ўбок, цягнуцца за вішнямі, то гэта таксама значна стамляла. І трэба было мець ужо на поясе нейкую прывязаную пасудзінку, каб менавіта ў яе спачатку збіраць ягады, а потым усё роўна спускацца ўніз і высыпаць у вялікую карзіну. А тут яшчэ атрымалася, што гэтыя "набірушкі" былі саламяныя і нават, калі недзе імі чапляўся ці яны адрываліся, то ўсё роўна ні ў якім разе не разбіваліся, а заставаліся цэлымі. Пацвельваючыся, зрабіў гаспадар і «паўвядзёрку з накрывачкай. Мала гэтага, яшчэ прывязаў яе на сплеценым мамай шнурочку. І атрымлівалася

так, што адкрываеш яе, набіраеш ягад, а потым, калі захочаш, «каб вішні праз верх не рассыпаліся, то шчыльна закрываеш саламяны посуд». Пасля гэтага можна ўжо смела спускацца па драбіне, не баючыся, што нахілішся і тады ягады пасыплюцца на зямлю. Каб такая пасудзіна не вельмі цягнула мяне "да зямлі", тата прыдумаў да яе і хітрае мацаванне, якое ахоплівала не маё тулава, а мацавалася на плячах і таму мне было значна прасцей упраўляцца з "набірушкай" на драбіне, ці нават стоячы на стале, які таксама часта прыносілі і прыстасоўвалі да своеасаблівай пляцоўкі, якую займалі зборшчыкі ягад.

Калі ўпершыню насыпалі вішнямі поўны вялікі кош, то тата з мамай неслі яго ўдваіх. Яно і зразумела: так і зручней, і намнога лягчэй. Задаволеныя былі гаспадары, тым болей, што праз нейкую ўсяго гадзіну да іх і "купцы" з суседняй Дабраслаўкі прыехалі. Пачалі, як заўсёды, таргавацца. Вішні былі спелыя, буйныя, ажно адлівалі не чырванню, а нейкім чарнаватым адценнем, што лішні раз сведчыла пра іхнюю сакавітасць і спеласць, набрыняласць салодкім сокам. Тата сказаў, пыхкаючы самасадам: «Многа за вядро браць не будзем, але менш, чым за тры рублі не аддамо. Самі ж разумееце. Паглядзіце, якія ягады». Дабраслаўцы зрабілі выгляд, што ім дарагавата, але тым не меней не маюць часу, каб лазіць па вёсцы і шукаць, хто там яшчэ прадае вішні. Адзін дзядзька крутнуўся і, гігікнуўшы, прамовіў: «Для мяне задорага! Там мужчына прадае па два рублі вядро, то я лепей вазьму ў яго!». Сказаў, так і папёр з нашага двара. Астатнія спакойна перасыпалі вішні ў свае вёдры і працягвалі здзіўляцца, што, здавалася б, карзіна і не надта вялікая, а ўлезла ў яе ажно чатыры вядры, якія яны ўзялі ды яшчэ і з вядро засталося. Гаспадар прапанаваў забраць і рэшту, бо вішань у нас на продаж болей не заставалася. Толькі для сябе пакінулі пару дрэўцаў неабабранымі.

Дабраслаўцы б забралі і рэшту, але тут прагучаў голас: «А гэта ўжо маё, чалавечку!». Разам з голасам у двор уваліўся той вясковец, які пабег купіць таннейшых ягад. Бацька спакойна прамовіў: «Я гэтую рэшту прадаю ўжо за пяць рублёў. Людзі не бегалі, не соўгаліся, мы з імі спакойна дагаманіліся, а з табою, то нічога добрага не атрымалася». Дабраслаўцы, угнуўшы галовы, стаялі і чакалі развязкі. Прыйшоўшы чмыхнуў сярдзіта і прымірыцельна сказаў: «А за чатыры?». Бацька не паддаваўся: «За чатыры ў мяне і гэтыя людзі забяруць. Не хочаш, то бегай далей, а я цану скідваць не стану». Забраў дзядзька апошнія вішні за пяць рублёў і падаліся дабраслаўцы да свайго воза. Адчувалася, што вясёлая ў іх будзе зваротная дарога, што "дапякуць" яны свайго аднавяскоўца "ўменнем таргавацца".

Неяк незаўважна саламяныя рэчы ўваходзілі ў мой ужытак. Мабыць таму, што ўсе карысталіся такімі прыстасаваннямі і нешта пра іх патлумачвалі, калі ўжо звярталіся з канкрэтным пытаннем. А так атрымлівалася: ёсць рэч, то і ёсць, а з чаго яна, то і галаву сабе не забівалі. Іншая справа, калі нехта з вяскоўцаў выштукоўваў ужо такі саламяны ўзор, што і вачэй ад яго нельга было адарваць, тады зусім іншы паварот у разважаннях і ацэнках гэтага прадмета. Яно і зразумела, да звычайнага, будзённага, можна сказаць, што і да груба-неахайнага, прывыкалі хутка. Маўляў, усё роўна саламяны выраб доўга не праслужыць, дык чаго ўжо над ім залішне завіхацца, распадзецца неўзабаве, згніе і ўсё – закончыцца ягоны саламяны "век". Праўда, такія адносіны да гаспадарчых прадметаў былі характэрны далёка не ўсім вяскоўцам, часта сярод іх сустракаліся і тыя, хто імкнуўся ўсё рабіць трывала, надзейна і, разам з тым, прыгожа, неяк самабытна, адрозна ад многіх. Да такіх людзей таксама прызвычайваліся. Спачатку нібыта дзівіліся: траціць дарма свой вольны час на абы-якія "прыдумасы", калі можна смела пайсці і прасцейшым шляхам. Потым пераставалі асуджальна хістаць галовамі, бо такія суседзі не адмаўляліся ад сваіх задум і ўзялі такія паводзіны сабе за жыццёвае правіла. Так яно і павялося, так яно і засталося.

Не ведаю, калі тата ўпершыню сплёў саламяны гарлачык. Ці то яму нехта падказаў, ці то мама, як звычайна, настойліва прасіла-пераконвала, каб «прыдумаў што-небудзь для любой справы, каб не цягаць за сабою цяжкі эмаліраваны посуд ці даволі нязручны і крохкі гліняны». Магчыма, што гаспадар проста рабіў усё па аналогіі: бачыў гліняны гаршчок, гладыш, макітру, а вырабляў яе з саломы. Галоўнае для яго было: ухапіць форму і памер, а астатняе ўжо падганялася па ходу працы. Увогуле, саламяных гарлачыкаў мне ўвогуле мала даводзілася бачыць у сваім жыцці. Калі ж першы раз, у раннім дзяцінстве, такі выраб трымаў ва ўласных руках, то нават і ацаніць яго па-сапраўднаму яшчэ не мог, не хапала тады ў мяне практычнага (гаспадарчага) вопыту.

А на самой справе надзвычай удала ў таты атрымлівалася выплятаць саламяныя гарлачыкі. Шкада толькі, што да нашых дзён не засталося ў маёй этнаграфічнай калекцыі ніводнага з іх. Але яны заўсёды карысталіся вялікім штодзённым выкарыстаннем-попытам, без іх не абыходзіўся амаль ніводны вясковы дзень. У нечым ды гэтыя рэчы былі патрэбныя. Тут нават у самай асцярожнай гаспадыні гарлачыкі рваліся (разбіваліся, калі былі гліняныя) даволі хутка. Не раз даводзілася чуць, як мама, скрушліва ўздыхнуўшы, даводзіла тату: «Гэты гарлачык, а я да яго так ужо прызвычаілася, нейкія два гады адно

і праслужыў, а ўжо дно выпадае (значыцца, ён ужо і тады іх выплятаў, а я ці не памятаю, ці не бачыў, як гаспадар гэта рабіў)... Такі зручны, да любой амаль што справы прыдатны, і на табе... Можа паглядзі ды неяк падпляцеш... Шкада ж выкідваць... Бакавінкі яшчэ цэлыя, моцныя, надзейныя; здаецца, што на іх і салома колер не змяніла ад старасці... Адно, што дно пасыпалася... Нібы нейкія малюсенькія мышы яго спецыяльна пагрызлі-патачылі... Ведаю, твае рукі ўсё могуць парапаваць... Я прынясу, а ты паглядзі, каб на ўласныя вочы пабачыць, што там здарылася...».

Аднойчы яны нават ледзьве моцна не пасварыліся. Мама прынесла ў хату гарлачык, каб тата ацаніў ягоную разрушальнасць. Гаспадар узяў у рукі, агледзеў з усіх бакоў, калупнуў пальцам донца і спакойна прамовіў: «Што ж ты, жонка, дабіваешся? Ён сваё адслужыў. Атрымліваецца, што ўсё ў жыцці мае свой век. Нават салома і саламяныя рэчы. Нічога не папішаш. Прайшоў ягоны час. Шкадуй – не шкадуй, а гэтым шкадаваннем нічога не зменіш». З гэтымі словамі спакойна ўкінуў гарлач у палаючую печ. Божачка! Што тут пачалося! Матуля ледзьве не з кулакамі кінулася да мужа: «Навошта ты яго ў агонь укінуў?! Я б яго для чаго іншага прыстасавала! Мала ці што ў нашай гаспадарцы ўсялякай драбязы, якую можна было б і ў напаўпадраны гарлачык складваць? За адну хвіліну такую рэч спапяліў! Думаць трэба, што робіш!». Тата павёў сябе на дзіва спакойна, нават неяк лянотна пацягнуўся і бомкнуў: «Не бойся, адбярэм з сынам саломкі, выпарым яе ў печы і зраблю табе новы гарлачык. Калі не будзеш сварыцца, то і некалькі адразу. Знайшла з-за чаго сварыцца. Ды так хутка завялася, не тое, што мой трактарны матор».

Праўда, матуля і тут паказала свой характар: катэгарычна зазначыла: «Ты толькі гаворыш хутка і паліш, не задумваючыся і не параіўшыся. А новае рабіць станеш праз год, а то і праз паўтара. Ведаю я цябе. Ці ж першы раз такое здараецца ў нашым жыцці. Колькі разоў ты мяне падводзіў. Усё абяцаў, а мне даводзілася кожны дзень напамінаць, упрошваць, каб паслухаўся, ды выручыў. Іншыя мужчыны, то сказалі і тут жа зрабілі, а ты ў мяне не такі. У цябе папапросішся, пакуль дойдзе да тваёй галавы. Ужо колькі гадоў з табою разам жывём, а да твайго такога нораву прыстасавацца не магу. У каго ты такую рысу перахапіў?».

Якраз-такі ў гэтым выпадку ўсё атрымалася даволі хутка, бо тата, прыхапіўшы мяне з сабою, пайшоў у гумно, дзе ў прыстаронку ў яго была акуратна складзена салома, а па кутах стаяла markedрознае гаспадарчае прычындалле. Гаспадар часта называў яго “сезонным”. Маўляў, лета ці вясну адпрацавала і зноў да будучага сезона трэба схаваць, каб

потым не рыцца і не шукаць па розных месцах. А так заўсёды ўсё і навідавоку, і пад рукамі. Папярэдзіў, што выбіраць будзем салому мяненькую, доўгую, не пабітую. Паказаў, у якім месцы ляжыць салома з нашага палетка, якую яны з дзедам Уладакам малацілі ўручную. Неўзабаве ў нас было пару вялізных снапоў саломы. Тата, пасмейваючыся, пацвярджаў, што набярэм паболей, каб можна было выплесці некалькі гарлачыкаў. Атрымліваецца, што паабяцаў, дык выпадае і слова трымаць, а то зноў "атрымаем на арэхі". Прынеслі ў хату і ледзьве не завалілі ўсю маленькую хацінку. Мама, праўда, нічога на гэта не сказала. Моўчкі прынесла ночвы і пачалі парадкаваць з гаспадаром салому ў іх. Тата, каб паболей улезла, зверху прыкладваў яшчэ гусенічныя металічныя прэнты, залілі вадою салому і паставілі ў печ. Так трэба было паўтарыць некалькі разоў запар. Праз пару гадзін тата дастаў ночвы і мне давялося ўсклікнуць ад здзіўлення: салома была не жоўта-сонечная, а васкова-карычневатая. Калі яе выкладвалі, то яна не шалясцела, як звычайна, а неяк пакорліва клалася і клалася саломінка да саломінкі. Тата папярэдзіў, што такую салому добра пускаць у справу амаль што адразу, даўшы ёй крыху сцекчыся, каб пазбавіцца ад празмернай вільгаці.

Такую салому і чысціць было намнога прасцей, бо яна страціла сваю "калючасць" і можна было смела сашморгваць верхні слой. З гаспадаром заселі за шчырую працу. Я ўжо ведаў, як падбіраць саломку па даўжыні, па колькі сцяблінак складваць у пучкі. Таму цярпліва чакаў, калі тата скажа падаць новую «порцыю». Пачаў гаспадар, як вадзілася, з донца. Нават нічога не маляваў, а рабіў ужо "на вока". Ведаў, што да чаго, таму ні ў чым і не сумняваўся. Нават не паспеў расказаць мне, як звычайна, чарговую гісторыю, а ўжо задаволена пакручваў перад сваімі вачыма донца, якое пры цьмяным восеньскім святле ўсё роўна адсвечвала васковым колерам. Мне карцела даведацца: адкуль у яго ўменне выплятаць гарлачыкі? Па-нашаму іх называлі традыцыйна – "збанкі". Тата, не спяшаючыся, закурыў, а потым ужо, пачынаючы вывадзіць акружнасць, пачаў гаварыць. Аказалася, што яго вучылі не родныя бацькі ці дзед. Першы з іх памёр, калі тату было ўсяго тры гады, а другі не ўмеў увогуле плесці з саломы нават самыя грубыя рэчы і прадметы. Пашанцавала яму на шчаслівыя сустрэчы з рукастымі вяскоўцамі, з якімі даводзілася ў самым раннім дзяцінстве пасвіць кароў і авечак. З адным такім, старэнькім дзедам, тата тады вельмі пасябраваў. Стары жыў адзін, нікога ў яго з родных не было, то апекаваўся маім татам, які таксама гадаваўся сіратою. Той дзядулька ўмеў амаль усё на белым свеце зрабіць сваімі рукамі. Працяглы час яны знаходзіліся

разам, то там вопытны ды спрактыкаваны чалавек і вучыў дапытлівага хлапчука ўсяму таму, што ўмеў сам. І за матэрыяламі далёка бегаць не даводзілася, яны заўсёды былі побач, пад рукою: лаза-вербалоз, елка ці сасна, бяроза ці дуб, ліпа ці крушына, а то салома, чарот, сытнёг. Адно – не лянуйся. З тых часін тата і лапці мог сплесці на розныя лады з заплюшчанымі вачыма, і плаў на сеткі, і align рознае хатняе прычындалле. Нешта перахапляў адразу, а нешта даводзілася перапытваць, дадаткова ўглядацца, слухаць усемагчымыя тлумачэнні, каб потым не абмішурыцца, бо далёка не ўсе з вяскоўцаў адносіліся спагадліва і ласкава нават да сіраты.

Першы гарлачык стары сплёў тату з сырой яшчэ саломы, папрасіўшы сноп саломы ў вяскоўца, які ў нечым быў яму вінен. Прычына знайшлася даволі сур'ёзная. Пасвілі яны тады кароў у лесе і, выбіўшыся на вялікую паляну, дзед заўважыў, што там процьма салодкіх і саспелых ужо дазвання суніц. Спачатку проста так ласаваліся, а потым дзед і прыдумаў, што спляце гарлачык, а малы пастушок назбірае сабе ягад дамоў. Посуду ж тады, як сёння, шклянога ці пластмасавага, не было ўвогуле і даводзілася выкручвацца ўсім падручным. Добра, што той хутаранец выручыў, не адмовіў у саломе і даў невялікі снапок. Усім тады адразу знайшлася праца: каровы, наеўшыся, ляжалі, дзед выплятаў гарлачык, а малы памочнік уважліва сачыў за тым, як гэта робіцца, ды паспяваў яшчэ задаваць шматлікія пытанні. Усяго за нейкую гадзінку спрактыкаваныя рукі старога спялі пасудзінку. Няхай сабе яна была і не надта падагнаная, і калолася, бо салому не сашморгвалі, і не вельмі трывалая на выгляд. Толькі тут было галоўнае іншае: цяпер суніцы смела можна было збіраць у гарлачык, не баючыся, што як у шапцы ці ў прыполе яны проста пачавяцца і дамоў іх тады не данясеш, бо гэта атрымаецца нейкае месіва. А так пастушок ганарліва крочыў за каровамі дамоў, прыціскаючы да грудзей гарлачык са спелымі суніцамі. Шчодрае на ягады тады было лета. Не адзін і не два разы насіў ягады малы дамоў, радуючы матулю і маленькую сваю сястрычку.

Тата гаварыў, што з першага разу зразумеў, што да чаго, але ўсё роўна абавязкова трэба займацца любой справай пастаянна, з невялікімі ўсяго перапынкамі, каб навыкі яе не забываліся, а трывала сядзелі ў галаве і "трымаліся ў руках". Потым ужо, калі прыйшоў з войску, ажаніўся і адчуў цягу да ўсяго саматужнага, пачынаў нешта ўдасканальваць, узмацняць, перайначваць у саламяным промысле. Рабілася ўсё няспешна, удумліва, з параўнаннем ранейшых (і сваіх, і чужых) вырабаў. Тады ж зразумеў, як правільна змяняць саламяны колер, як зрабіць саламяны "век" даўжэйшым і многае іншае. Гэта толькі на першы

погляд тут усё так проста і някідка, а калі пачнеш паглыбляцца ў справу, то гэтулькі ўсялякіх перашкод ды складанасцей, што адразу ж за галаву ўхопішся. Неяк падумаў і вырашыў замяніць лазовыя ці вярбовыя гольκі-дубчыкі, якімі мацавалася салома, на шпагатавыя ніткі, што давала дадатковую надзейнасць і трываласць простай, здавалася б, рэчы.

Ягоныя гарлачыкі разыходзіліся, найперш, сярод родных і знаёмых, якім тата дарыў свае вырабы. У вёсцы заўсёды так вялося, што ты нешта падаруеш чалавеку, а ён аддзячыць потым нечым іншым. Спрадвечная традыцыя, якая прадугледжвала павагу адзін да аднаго, навучыла цаніць любую працу, любы занятак ці промысел, ва ўсім гэтым бачыць практычную і гаспадарчую запатрабаванасць. І ў той раз тата сплёў не адзін гарлачык, а недзе каля пяці штук. І ўсе яны былі "рознакаліберныя" (ягонае трапнае вызначэнне), бо ўбіралі ў сябе ад літра і недзе ажно да шасці ці сямі. Мама, радасная і вясёлая, не ведала, як ёй быць. Свяцілася ад задавальнення, нібы малое дзіця, і ўсё прыдумвала: у які гарлачык і што яна стане збіраць. Выставіла свой навюткі саламяны посуд на вялікую паліцу ў сенцах, абачліва прераварнуўшы яго пры гэтым уверх дном. Ведала гаспадыня, што рабіла: у такім становішчы гарлачы з сярэдзіны не будуць пыліцца, не стануць усялякія павучкі плесці ў іх свае цянёты. Цяпер ёй можна было быць спакойнай у гэтым плане і не адварочвацца ад суседак, якія таксама любілі пахваліцца сваімі новымі прыладамі і рэчамі. Праўда, усё дзівілася, маўляў, а што ж я буду збіраць у самы вялікі гарлач? Гэта ж такі посуд, які і за паўдня цяжка будзе напоўніць нават самай увішнай гаспадыні.

Неяк прыйшоўшы позна з працы, замёрзлы і прамоклы на восеньскім студзёным дажджы, тата, лежачы са мною на гарачай чарэні і ўглядваючыся ды ўслухоўваючыся ў тое, як пры даволі цьмяным святле керасінавай лямпы мне прыходзіцца чытаць ("бэкаць"), каб пагаварыць са мною ды распытаць, як там ідуць мае школьныя справы, сказаў: «Ведаеш што, сыночак, а ў нас жа засталася яшчэ тая распараная салома... Многа мы тады яе напарылі, то каб не давялося яе выкідваць, я выплету табе таксама гарлачык... Памятаеш, тады распавядаў, як мне такую штуку зрабіў мой стары хаўруснік дзед, з якім мы каровы пасвілі некалі... Тая паляна, дзе мы тады збіралі суніцы, не зарасла... Нядаўна там быў, бо ездзіў па дровы аднаму вяскоўцу... Сунічніку там – мора... А раз так, то і ягад, адпаведна, кожнае лета бывае многа... Пакажу табе тую паляну і будзеш ты туды за суніцамі гойсаць... Пахучыя і непаўторныя яны на смак... Назбіраеш поўны гарлачык і дамоў прынясеш... Усіх нас пачастуеш: і мяне, і маму, і малодшага твайго брацікa... Мы толькі тую салому над чыгуном з кіпятком патрываем і яе

можна смела пускаць у справу... Болей запарваць яе не варта... Абавязкова зраблю, не сумнявайся...».

Стрымаў тата сваё слова: сплёў мне гарлачык. Цудоўны ўзор саламянага паходжання. Неяк асабліва ўрачыста ўручыў мне яго, прамовіўшы пры гэтым: «На, сыночак, ведаю, што ты яго не раз і не два менавіта суніцамі ляснымі напоўніш... Захоўвай яго, берагай, то не глядзі, што салома, а і яна ўсё роўна доўга служыць... Памяць табе будзе...». Гаварыў так, нібыта прадчуваў, што не надта доўгі зямны шлях яму быў адведзены ў ягоным жыцці. А я, і сапраўды, дзясяткі разоў прыносіў дамоў суніцы менавіта ў тым гарлачыку. Іншая справа, што калі ягад было вельмі многа і была ахвота назбіраць іх болей, то высыпаў першы гарлачык у саламяную каробку (таксама спецыяльна для мяне сплеценую, і ўлазіла ў яе, як зараз памятаю, дзевяць літраў), а збіраць працягваў зноў у гарлачык, імкнучыся напоўніць яго і ў чарговы раз.

А хіба можна забыць той непаўторны лясны пах і адметны смак суніц, асабліва, калі мама насыпала іх у вялікую місу і залівала смятанай? Я старанна аберагаў свой гарлачык, ашчаджаў яго, але ўсё роўна ён у мяне знік (дакладней, прапаў). Здарылася гэта тады, калі я служыў у войску і ажно паўтара гады не быў дома. Усім "запраўляў" тады мой малодшы брат, якому не так балела за старыя гаспадарчыя прадметы і рэчы, ён іх трушчыў, ламаў і, вызначыўшы, што болей яны ўжо не прыдатныя ў далейшым ужытку, спальваў ці проста – выкідваў. Так ён паступіў і з маім саламяным "сябрам" – гарлачыкам.

Даводзілася слухаць татаву з дзедам размову адносна саламянага "брыля" – капелюша. Так у нас іх называлі адвеку. Толькі вось плялі на ўсю вёску адзін ці два чалавекі. Болей таго, каб бясплатна не тыражаваць свае вырабы, яны пагаджаліся рабіць "брылі" толькі за грошы. Не тое, што землякі былі надзвычай сквапныя. Не, у іх проста амаль ніколі не было грошай. Нават самай мізэрнай сумы і той не ставала. Нашы мужчыны, седзячы вечарам за сталом, перакусваючы і выпіваючы, завялі нечакана гаворку пра гэтыя капелюшы. Пачаў дзед, які Вялікую Айчынную вайну закончыў баямі з японцамі і, адпаведна, там бачыў, што мясцовыя жыхары насілі на галовах вялізныя галаўныя ўборы, якія закрывалі не толькі іхнія галовы, але і плечы таксама. Дзед сцвярджаў, што самая вялікая спёка ў такім галаўным уборы пераносіцца вельмі лёгка. Тата дадаў, што і ён у Азербайджане назіраў за тым, як мужчыны хаваліся ў полі ці па садах, працуючы пад такімі "брылямі". Таму запэўніў свайго цесця, што неўзабаве і той будзе мець такі капялюш, толькі трэба прыходзіць і дапамагаць, бо працы стане многа: салому давядзецца не проста зачышчаць, але яшчэ і расколваць уздоўж, каб

лягчэй было вырабіць сапраўдную рэч, якая будзе падобна на фабрычную, але атрымаецца намнога мацнейшай і фасонісцей за апошнюю. Дамова была імі добра запіта і прыкушана і прыходзілася толькі чакаць пачатку справы.

Плялі першы (пробны) “брыль” зімовымі вечарамі, даўжэзнымі, як п’яная песня. Праўда, толькі ў буднія дні, бо ў суботу і нядзелю дзед быў пастаянна заняты на паляванні. Гэтую прыхільнасць у сваім жыцці ён ніколі і ні на што не прамяняў. Самае складанае ва ўсёй справе заключалася, як аказалася, у расколванні саломы. Яшчэ з таўсцейшага канца сцябла то ўсё ішло нармальна, а вось недзе, пачынаючы з сярэдзіны, салома не вытрымлівала і проста рвалася. Вынаходлівы тата і тут хутка знайшоў выйсце: салому выпадае калоць да таго месца, дзе яна звужаецца, а гэты кавалак адразаць, бо іначай і за год не нарыхтуем сабе падыходзячага матэрыялу. Так справа пайшла значна хутчэй, спарней і, самае галоўнае, што цяпер салома вытрымлівала і не рвалася. Мне карцела іншае: пабачыць, як тата стане плесці “брыль”. Астатнія ягоныя вырабы я бачыў, нават крыху пасабляў, дапамагаючы тым, што ці падаваў нешта, ці падтрымліваў. А тут жа зусім новы выраб будзе: нечуваны і нябачаны мною раней. Бацька пацвельваўся, яго падтрымліваў дзед, тады мне нічога не засталося, як прыгразіць, што про-



*Юнак у саламяным капелюшы*

ста пайду спаць і няхай яны са сваім "брылём" сядзяць самі. За мяне адразу ж уступілася матуля і прыкрыкнула на старэйшых, каб не дражнілі малога. Тыя ўжо пагадзіліся з такім паваротам справы і паабяцалі, што "брыль" будуць мераць на маёй галаве і калі я пайду спаць, то ўся справа адразу ж стане.

Не памятаю ўжо, з чаго тата пачаў плесці, але здаецца, што з самага верху, каб потым паступова апускацца да нізу, пры гэтым пашыраючы да пэўнай ступені ўсю акругласць капелюша. Аказалася, што і тут узнікла чарговая перашкода: расколатая салома добра клалася радочак за радочкам, але калі майстра пачынаў яе "сшываць", то яна адразу ж прагіналася і на месцах прагінаў утвараліся прыкметныя дзірачкі. Дзед не бачыў у гэтым ніякага хіба, наадварот, яму падабалася, што будзе мноства такіх дзірачак і праз іх свабодна стане гуляць паветра. Значыцца, галава ніколі не спацее. Але тата рашуча не пагадзіўся з такім паваротам і адрэзаў, што ніколі не быў прыхільнікам усемагчымых хібаў і недаробкаў – калі рабіць, то рабіць сумленна і акуратна, а не абы з рук. Стары на гэтакія словы "закапыліў" губу. Гаспадар заціх, а затым усклікнуў: «А я вазьму і памяняю манеру пляцення. Стану плесці так, як рабіў зімовыя маты на вокны і дзверы: пераймаючы радок з радком, то гэтыя дзірачкі, безумоўна, адразу ж і пазакрываюцца. Атрымаецца так, што адзін радок будзе страхаваць другі. Вось і ўсё, а мы тут галовы ламалі. Аказваецца, усё можа выйсці і талкова, і надзейна. Ды і мяняць нічога асабліва не давядзецца».

Справа прасоўвалася надта марудна. Мужчыны так ужо накурылі ў хацінцы, што давялося ў печы адчыняць засланку, каб той дым і смурод ад самасаду хоць трохі праняло. За кожным колцам праплеценай саломы тата ўважліва аглядаў свой выраб, нешта мармытаў і ў чарговы раз прыкладваў зробленае да маёй галавы. Абяцаў жа, што прымерваць стане менавіта на мне. Так і рабіў. Дзед чакаў свайго часу. Нарэшце бацька працягнуў амаль гатовы "брыль" яму: «Прымерце на сваёй лысіне... каб не быў ён замалым, бо сынава галава – гэта адно, а ваша – зусім іншая...». Гаспадар у тую зіму выплеў усім саламяныя капелюшы, нават матулю не абмінуў. Тая ўсё працівілася: «Людзі смяяцца стануць... Ды і нязвычны ён для мяне... Мне лепей хусцінка падыходзіць... А яго ветрам лёгка з галавы сарве... Не паспееш і вокам міргнуць, як саламяны ўбор уздымецца вышэй за аблокі...». Вядома ж, кожны мае права на ўласную думку і на яе агучванне.

Я дык доўга насіў свой "брылёк", выклікаючы тым самым непадробную зайздрасць ва ўсіх дзяцей з нашай вуліцы. Ён і сапраўды добра засцерагаў галаву ад гарачага сонца. Калі мама брала мяне палоць

калгасныя буракі, то я і тады не разлучаўся з татавым падарункам. Гаспадыня ніводнага разу свайго капелюша так і не надзела. Павагаўшыся, занесла яго ў школьны этнаграфічны музейчык, куды яго ўзялі з вялікім задавальненнем. Тата свой "брыль" утапіў недзе на канале, калі плаваў у чоўне з настаўкай у руках. Нечакана ўзняўся працяглы парыў ветру, "брыль" завіхурыўся разам з прыдарожным пылам і знік назаўсёды. Нават невядома, ці яго забрала вада, ці недзе дагніў ён свой кароткі век на калгасных палетках. Найбольш арыгінальна развітваўся са сваім саламяным галаўным уборам дзед Уладак. Ён сунуўся на луг касіць дзялянку травы. Не надта яму туды хацелася кіраваць, але ж нечым зімою карміць кароўку выпадала. Таму хацеў не хацеў, а вымушаны быў закінуць касу на плячо і кіраваць да шматлікай мужчынскай грамады, якая некалькі дзён запар вірaвала на тым лузе. Ішоў важна, у новым "брылі" на лысай галаве. Праходзячы міма каго-небудзь і стараючыся звярнуць на сябе ўвагу, моцна пакашліваў. Мужчыны віталіся, але надоўга не затрымліваліся, бо ведалі дзеда з ягонай завядзёнкай адрывацца ад любога занятку, адно каб толькі ўволю нагаварыцца. Старому хацелася заўсёды быць у цэнтры ўвагі, а тут... Бацька ж яго падвучваў, каб ён, ідучы ў поле ці на луг, падвязваў пад падбародкам спецыяльны шнурок, які гаспадар старанна ўплёў у саламяны выраб. Дзед гэта, вядома ж, праігнараваў. Таму "брыль" лёгка саслізнуў з галавы і ўзвіўся ў неба. Стары пачаў крычаць, быццам бы ад ягонага крыку капялюш вярнуўся б назад. Сведкі гэтай сцэны на розныя галасы падказвалі яму магчымае выйсце. Найбольш часта гучала парада: збегаць дамоў, узяць паляўнічую стрэльбу і потым, прыбегшы на луг, збіць "брыль" трапным стрэлам на зямлю. Разгублены дзед пагойсаў туды-сюды і, змрочны, развёўшы рукамі, паплёўся да сваёй палоскі.

Тата плёў "брылі" яшчэ не адзін раз. Памятаю, як да яго прыйшоў загадчык мясцовага клуба адпачынку і на праміл Бог прасіў, каб ён выплеў два дзясяткі аднолькавых па форме (толькі розных па памеры) "картузоў". Так і сказаў. Дамовіліся, што госць заплоціць за саламяныя вырабы грашыма. Стукнулі па руках. Той чалавек паставіў умову: трэба сплесці "картузы" за тыдзень, бо далей чакалася нейкае буйное мерапрыемства мясцовай мастацкай самадзейнасці. Бацька загнуў сваё: адзін "картуз" будзе каштаваць паўтара рубля. Матуля потым дзівілася: «Няўжо заплаціць такія вялікія грошы? Гэта ж у маёй маці пенсія сем рублёў усяго, а тут... Лічы, што дармовыя грошы...». Тата не пагадзіўся: «Каму дармовыя, а мне давядзецца па тры "картузы" за вечар выплятаць, каб тэрмін не парушыць ды дамову нашу не сарваць».

Аказваецца, і сапраўды тады ў нашым вялізным клубе праходзіў ці не абласны конкурс самадзейных артыстаў. Мужчынская частка мясцовага фальклорнага калектыву фарсіла ў фасоністых татавых вырабах. Яны хораша глядзеліся і моцна трымаліся на чубатых галовах выступаючых, бо тата ўсім парабіў "страхоўку" – той самы шнурочак, якім выпадала падвязваць "картуз" пад падбародкам. Выступаючыя не паўтарылі дзедаву памылку. Таму нават падчас віхурыстай "полькі" ні адзін з "картузоў" не сарваўся.

Давялося пабыць разам з татам на раённым конкурсе лепшых майстроў традыцыйных народных рамёстваў, які праводзіўся ў г. п. Лагішын. Здаецца, што і зараз адчуваю тое хваляванне, тую радасць, якія навалідіся пры аглядзе вазоў, машын, спецыяльных прыстасаванняў, на якіх былі выстаўлены і вывешаны лепшыя ўзоры, што выйшлі з-пад майстравітых рук палешукоў. Бацьку тады ўручылі ганаровую грамату і грашовую прэмію, якраз-такі за тое, што ён прадставіў на выставу калекцыю сваіх саламяных вырабаў. Памятаю, як адна жанчына – прыгожая, паўнацелая, зайздросна гаварыла: «Пашанцавала, чалавеча, тваёй жонцы... З такім посудам на любую працу ісці весела і не сорамна... А мой, то і дроў насячэ такіх, што і ў печ не ўлазяць... Я час падбяру і спецыяльна ў тваё Чухава дастануся, каб купіць у цябе некалькі саламяных каробак... Яны ж пад чарніцы ды і пад іншыя ягады самая незаменная рэч... Чакай, чалавеча, мяне ў госці...». Не прыпомню, каб болей сустракаўся я з той жанчынай, тым болей – на нашым падворку... Магчыма, што ёй проста прыглянуліся тады татавы вырабы, яна не вытрымала і пахваліла рукастага вяскоўца, а потым, як водзіцца звычайна, закруціла-завіравала яе жыццё і не атрымалася стрымаць гарэзліва дадзенае слова.

Неяк павялося ў вяскоўцаў, што яны нават ведалі, у каго на палетках ці агародах (заспеў я яшчэ пэўную адсутнасць усеагульнай калектывізацыі на палескіх землях) расла-буяла збажына, салома ад якой падыходзіла найбольш для таго ці іншага вырабу. Сцвярджалі аднагалосна, што любой саломай можна толькі стрэхі крыць, на сечку яе пускаць ды насцілаць жывёле. Але ў такіх выпадках не пагаджаліся майстры (яны асабліва!), што накрыць хату можна любой саломай: «Ага, вазьмі толькі з высокага месца салому, то накрыеш ты ёю. Як бы не так! Яна ж там будзе заўсёды перасушаная і невысокая, а раз невысокая (нядоўгая), то папакутуеш на страсе. Яе і пад апоўзіны нельга добра запусціць, і спланаваць не выпадае, бо, зноў-жа, яна з-пад рук высыпаецца. Нават старанна перабіраць такую салому не надта выгодная справа, бо з некалькіх снапоў навыбіраеш крыху, а астатняя не падыходзіла. У даў-

нейшыя гады часта мяняліся саломай. Па-align знаму пагаджаліся, але знаходзілі выйсце. Вясковае жыццё да многага прызвычайвала. Суседзі амаль заўсёды гатовы былі прыйсці на дапамогу адзін аднаму. Так і пацвярджалі, што ля роднага чалавека не надта пажывішся, а да чужога з любой бяды можна прыходзіць. Салому асабліва падбіралі жытнюю. Яна найбольш трывалая з усіх відаў, а для накрыцця стрэхаў лепшай не знойдзеш».

Аднойчы старая суседка распавяла пра тое, што ў гады яе маленства людзі ў старцы «па салому ездзілі...». Аказваецца, што такая з'ява на самой справе мела месца ў сялянскім жыцці. І тут не толькі гаворка вялася пра непрадказальныя сітуацыі, напрыклад, пра пажар, які сквапна зжыраў усё на сваім шляху. Тады пацярпелы гаспадар запрагаў коніка ў воз і ехаў па навакольных вёсках, дзе, патлумачваючы, што ў яго здарылася, спадзяваўся на людское спачуванне. Больш-менш добра было там, дзе чалавека ведалі і было вядома, што ён сапраўды пацярпеў, а вось там, дзе ён ад'язджаўся на значную адлегласць, запроста магла чакаць і няўдача. Вяскоўцы, спачуваючы шчырым, сумленным людзям, заўсёды памяталі яшчэ і пра тое, што пад маркай пацярпелых запроста маглі ездзіць самыя звычайныя абібокі, якія на такіх дзеяннях мелі сваю ўласную выгоду.

Такую сцэну знаходзім ва ўспамінах М. Хведаровіча (“З пражытых год”). Пісьменнік апісаў тое, як яны з бацькам ездзілі старцаваць менавіта для таго, каб сабраць саломы для накрыцця новай хаціны, тэрмінова ўзведзенай на месцы згарэлай: «Але прайшла тройца, а потым і спас, а стаяў толькі голенькі зруб. Страхі ўсё яшчэ не было. Калі паставілі кроквы, дык выявілася, што крыць страху няма чым. У той год мы ездзілі з бацькам збіраць на пагарэльцаў. Раней мы прасілі, што хто дасць, а на гэты раз паехалі прасіць кулі на страху. Быў сонечны нядзельны дзянёк. На прызбах сядзелі па-святочнаму апранутыя людзі. Абышлі ўсю вёску Аргелаўшчыну. Бацька забягаў у кожны двор, і мне на возе чуліся ягоныя нясмелыя словы:

– Падайце, калі ласка, на пагарэльцаў. Калі можна, дайце хоць кулёк саломы на страху...

Мінулі апошні двор, а на возе ляжаў толькі адзін кулёк. Было крыўдна і балюча глядзець на разгубленага бацьку, які з роспачы выкінуў той куль у рэчку, горасна праказаўшы:

– Жабрачы хлеб – сабачы...» [21, с. 495].

Не раз прыходзілася слухаць жыццёвыя гісторыі пра надзвычай цяжкія часіны. Здаралася і такое, што калі прыспяваў ліхі час, то па абмалочаную салому хадзілі ў старцы (“у жабракі”) па суседзях, аднавя-

скоўцах ды па суседніх населеных пунктах, але часта даводзілася чуць яшчэ і пра тое, што нехта канкрэтны не ездзіў возам, а насіў акалоткі за плячыма. Так за пару дзясяткаў разоў і нанасіў сабе на новую страху, якую і пакрыў да маразоў тым, што яму людзі надавалі.

Здаралася, што адмоўную ролю адыгрываў і летні неўраджай збажыны, бо там, дзе не ўрадзіла, напрыклад, жыта, то там жа яшчэ і дазвання выгарала пад сонцам салома. Таму ўсе разлікі на новы ўраджай у гаспадара, які збіраўся накрыць свежай саломай хату і ўлезці ў яе на зіму, не спраўджваліся. Не выпадала нічога іншага, як ехаць у своеасаблівае "палюддзе", спадзеючыся, што такім чынам неяк удасцца выправіць становішча.

Да гэтага ўсё прыгадваліся выпадкі, звязаныя з практычным выкарыстаннем саломы ў гаспадарчых мэтах, у сялянскім ужытку, але ж з ёй было і тое, што магло закончыцца трагічна. Пазней матуля расказала, што здарылася. Аказалася, што мяне, якому яшчэ не было і года ад нараджэння, адпаведна, і хадзіць не мог, яна, ідучы палоць у агарод грады, здагадалася пасадзіць у саламяную каробку і падацца з ёй да месца працы. Сама пачала палоць радкі, а я гуляўся з нейкімі цацкамі ў каробцы. Матуля акінецца, усміхнецца, забачыўшы, як сынок нешта сам сабе "вукае", і працуе далей. Адбярэцца крокаў на дзесяць, потым перанясе каробку бліжэй да сябе. Усё было добра да таго часу, пакуль я не зацікаваіўся зялёнымі стручкамі фасолі, якія віселі прама над галавою. Малыя ўсё пазнаюць не на зрок, а на смак. Так адбылося і тут. Я наеўся ўволю зеляніны і пачаў плакаць. Матуля падскочыла хутка, але калі ўбачыла, ад чаго я заплакаў, то збялела са страху і пачала галасіць. Не знайшла нічога іншага, як бегчы са мною на руках да свайго бацькі, у якога заўсёды, у любых сітуацыях, шукала паратунку. Пашанцавала, бо дзед сядзеў у хаце. Да таго часу ягоны ўнук ужо быў увесь зялёны. Мабыць, хутка дзейнічала моцнае атручванне. Чалавек ён быў рашучы і адчайны. Хутка ацаніўшы сітуацыю, пераапрануўся і прамовіў: «Ты, дачушка, бяжы шукай якога коніка (пра машыну тады ў вёсцы і гаворкі не было), а я з унукам на руках памкнуся да Пагост-Загародскага... Там жа бальніца... Галоўнае, каб паспеў дабегчы... А там, то ўжо дакладна дапамогуць... Давай: ты туды, а я – хуценька падамся да ўрачоў...».

Матуля дагнала дзеда, які са мною на руках, умудраўся не ісці, а бегчы, ля самога ўжо мястэчка. А гэта ж не многа і не мала – амаль пяць кіламетраў! Вопытныя людзі, якім часта, як гаварылі, даводзілася "даставаць пацыентаў з таго свету", дапамаглі і тут. Праўда, потым, калі ўсё самае страшнае засталося ў мінулым, участковы ўрач сказаў дзеду,

што калі б ён прамарудзіў на нейкія паўгадзіны ці на гадзіну, то нічога б зрабіць з хворым ужо не змаглі.

Злашчасную каробку (хоць, калі разабрацца, то ў чым была вінавата саламяная рэч) матуля болей ніколі не выкарыстоўвала. Яна так і вісела ў гумне на сцяне: чарнеючы, пакрываючыся павуцінай, трухлеючы. Кінуўшы на яе вокам, гаспадыня злосна прамаўляла: «З-за цябе ледзьве сына не пазбавілася! Так і вісі! Болей ні ў якую справу не вазьму, але і выкідваць заўчасна не стану, каб нагадвала і мне самой: да чаго можа прывесці звычайная чалавечая няўважлівасць. На імгненне забудзешся і яно можа абярнуцца вялікай бядой!».

ТРАДЫЦЫЙНЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Падводзячы вынікі пад нашымі разважаннямі адносна традыцый саломапляцення (саламянага промыслу, праўда, не сустракаецца ў такім вызначэнні і таму мы ўводзім яго ці не ўпершыню), зробім выснову, што ў кемлівасці нашым продкам адмаўляць не выпадала ні ў якім разе. Так ужо атрымлівалася, што яны ўсё ўмелі рабіць (вырабляць) сваімі рукамі і ўсім гэтым напоўніцу карысталіся, за рэдкім хіба што выключэннем. Можна толькі захапляцца ці здзіўляцца, як са звычайнай саломы яны выраблялі лёгкія і трывалыя, надзейныя і (даволі-такі!) даўгавечныя прадметы з хатняга ўжытку. Тут галоўным, самым верным і часта правяраемым часам, быў прынцып: «Глядзі і вучыся, пераймай сам і потым ужо навучай і іншага». Маглі сказаць продкі і больш сурова, прыгадваючы мінулае: «Гора ўсяму навучыць». А назіраючы за тым, як няўмелыя яшчэ рукі браліся за новую справу, звычайна супакойвалі: «Лёгка толькі танцаваць ды і то ад печы!». Добра было, калі за тым, чым займаліся старэйшыя, пільна наглядалі маладзейшыя.

Закрануўшы гэтую “саламяную” тэму, павінны абавязкова звярнуць увагу яшчэ і на тую акалічнасць, што салома была не самай першай у пераліку, напрыклад, дахавага матэрыялу. Тут неабходна прыгадаць і тое, што продкі прыкрывалі сваё жыллё (сваю галаву) усім тым, што не прапускала вільгаці, што дапамагала ім стварыць хоць нейкі жыллёвы камфорт. Яны часта любілі паўтараць: «А што ўжо там за бяда? Паставіў-скідаў хацінку, накідаў на страху саломы, збіў печ-глінянку і ўсё на тым. Не цячэ, не дзьме, на чарэну плечы сагрэеш, супраць любой непагадзі выстаіш...».

Як аказалася на самой справе, то звычайная салома даволі часта выручала продкаў, давала ім магчымасць перавесці дух ад жыццёвых нягод, замяніць дарагое на таннае, даўгавечнае на не такое трывалае. Галоўнае заключалася зусім у іншым: гэты матэрыял амаль заўсёды быў пад рукамі. Праўда, часамі здаралася і такое, што не надта радзіла жыта, збажына, але ж затое – салома была заўсёды! Кемлівыя гаспадары меркавалі ўсё наперад, як яны будуць рабіць нешта новае, як пачнуць і як закончаць будыніну, а раз закончаць, то гэта асацыіравалася са страхой, з тым самым саламяным дахам над галавою. Здавалася б, няма чаму здзіўляцца, але гэта толькі на першы погляд, бо здзіўляцца, якраз-такі, і ёсць чаму: практычнасці, майстэрству, кемлівасці нашых далёкіх папярэднікаў, якія з усяго знаходзілі сваю выгоду.

Гэтая кніга спачатку задумвалася як невялікі навукова-папулярны артыкул пра выкарыстанне саломы ў гаспадарчым ужытку (нават не пра традыцыйнае саломапляценне), але з часам, падбіраючы, сістэматызуючы, аналізуючы шматлікія прыклады, парудзелыя архіўныя паперы, фотаздымкі, мы загарэліся ідэяй паказаць паступовае развіццё гэтай справы. І можна сказаць, што да самага яе знікнення. Маем на ўвазе накрыццё стрэх, выплятанне гаспадарчых прылад працы (посуду і іншых прадметаў ужытку), рэзання саломы на сечку (што таксама ўжо амаль нідзе ў вёсках не практыкуецца). Застаецца, больш-менш, выплятанне “брылёў” ды саламяных гарлачыкаў ці каробачак для разнастайных этнаграфічных выстаў. І поступ гэты быў не імклівы, не адначасовы, а даволі працяглы. У нашым разуменні расцягнуўся ён недзе на дзясяткі тысяч гадоў. Адным словам, як з’явіліся толькі першыя людзі на беларускіх землях, то сталі яны актыўна асвойваць ужыванне саломы ў гаспадарчых мэтах, да чаго іх прымушала не прага нейкага ўзбагачэння, а звычайная жыццёвая неабходнасць. Усё ж цікава было разглядаць тое, як развіваліся традыцыі саломапляцення (найперш, саломанакрыцця) яшчэ ў тыя, сівыя стагоддзі, як з цягам часу ўсё ўдасканальвалася, мадэрнізавалася, як на гэта ўплывалі пэўныя сацыяльныя зрухі ў тагачасным грамадстве.

Здавалася б, складанасцей у працы над кнігай ніякіх не будзе. Але гэта толькі на першы погляд, бо нават тыя з этнографаў, якія пакінулі свае сведчанні, напрыклад, пра працэс накрыцця саломай стрэх, распавядалі пра тое, што ім самім даводзілася ўбачыць, ці як ім даводзілася прымаць непасрэдны ўдзел у працоўным працэсе. У іх няма аналізу, затое ёсць цікавейшыя падрабязнасці (рэгіянальныя асаблівасці-адрозненні) з гэтага промыслу. Згадвалі нават пра тое, што далёка не ўсе надзвычай умелыя майстры імкнуліся падзяліцца сакрэтамі і навыкамі свайго майстэрства. Хочаш – глядзі, паспееш заўважыць – добра, а не, то і другі раз для цябе канкрэтна нічога паўтараць не станем. Пераборлівы быў народ, асабліва сярод старэйшага пакалення, якім нельга было і слова насуперак сказаць, і пасмяяцца з іх не выпадала. У выніку такіх паводзін многае з таямніц гэтага занятку так і сышло ў іншы свет разам са сваімі ганарыстымі носьбітамі.

Не ўсе, вядома ж, валодалі навыкамі працы з саломай у аднолькавай ступені. Але ж гэта сама глыбінная логіка жыцця: нехта засвойвае і выконвае ўсё значна лепей, чым робіць гэта іншы. Тут выпадала не зайздросціць, а імкнуцца дагнаць, дагнаць без зла. Без чорнай зайздрасці, а зрабіць так, каб потым майстра сваёй справы пры ўсіх пахваліў, зраўнаваў з сабой. Змяняліся часы, змяняўся грамадскі лад, які, як вядома, заўсёды ўносіць значныя карэктывы ў любы занятак, справу, промысел.

Канешне, безумоўна, час і абставіны патрабуюць свайго: кардынальных змен не толькі ў грамадскім ладзе, але і ў гаспадарчым побыце таксама. Нікуды не падзенешся ад тых імклівых рашэнняў і дзеянняў, бо патрыярхальныя асновы, так ці іначай, вымушаны змяняцца. І як бы не было шкада нечага з аджыўшага, мінулага, старадаўняга, яно ўсё роўна адыдзе на задні план (яшчэ добра калі так), а то і ўвогуле знікне, расплывецца за смугою часу. Так атрымалася і з выкарыстаннем саломы ў гаспадарчым ужытку вяскоўцаў. Цяпер ужо нават знайсці некалькі будынкаў (за выключэннем музеяў), крытых саломай, на ўсёй тэрыторыі Беларусі амаль немагчыма. Ды і то, калі пашанцуе даследчыку, то акажацца, што тыя будынкі ўжо выведзены з актыўнага гаспадарчага карыстання і проста дажываюць свой незайздросны век: урастаюць у зямлю, дагніваюць, згараюць, зносяцца з-за сваёй непатрэбнасці.

Неяк зусім непрыкметна атрымалася, што з задумы невялікага артыкула сфарміравалася цэлая кніга. Цікава будзе з ёй азнаёміцца дапытліваму чытачу, асабліва прадстаўнікам маладога пакалення, якія многага з апісанага не толькі не бачылі на ўласныя вочы, але нават і не чулі пра тое, як іхнія далёкія продкі ўмелі выкарыстоўваць салому (і тут

ужо не мае вялікай розніцы – жытняй, пшанічнай, аўсянай, ячнай), прыстасоўваць яе для сваіх патрэб.

Чамусьці так падаецца, што калі чалавеку становіцца сумна, маркотна, яго агортваюць успаміны пра мінуўшчыну, няхай сабе і не такую далёкую, уласна перажытую, з'яўляюцца ў снах і ў думках, нібы наяве, паўстаюць мілыя вобразы і сярод іх, безумоўна, звычайная залацістая салома, саломка, саломінка.

# СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. *Адамчык, В.* Выбраныя творы: у 2 т. Т. 1. Чужая бацькаўшчына: Раман, апавяданні (аўт. прадмовы М. Тычына) / В. Адамчык. – Мінск: Маст. літ., 1983. – 397 с.

2. Беларускі фальклор. Энцыклапедыя: у 2 т. Т. 1. – Мінск: Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2005. – 765 с.

3. *Гордин, М. А.* Жизнь Ивана Крылова / М. А. Гордин. – М.: Книга, 1985. – 282 с.

4. Замовы / уклад. Г. Барташэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 597 с.

5. *Караткевіч, У.* Збор твораў: у 8 т. Т. 6. Хрыстос прызямліўся ў Гародні: раман / У. Караткевіч. – Мінск: Маст. літ., 1990. – 494 с.

6. *Колас, Я.* Збор твораў: у 14 т. Т. 1. Вершы 1898–1907 / Я. Колас. – Мінск: Маст. літ., 1972. – 562 с.

7. *Колас, Я.* Збор твораў: у 14 т. Т. 6. Паэмы "Новая зямля" і "Сымон-музыка" / Я. Колас. – Мінск: Маст. літ., 1974. – 624 с.

8. *Купала, Я.* Поўны збор твораў: у 9 т. Т. 2. Вершы, пераклады 1908–1910 / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1996. – 342 с.

9. *Купала, Я.* Поўны збор твораў: у 9 т. Т. 3. Вершы, пераклады 1911–1914 / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1997. – 342 с.

10. *Купала, Я.* Поўны збор твораў: у 9 т. Т. 4. Вершы, пераклады 1915–1929 / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1997. – 446 с.

11. Легенды і паданні / склад.: М. Я. Грынблат і А. І. Гурскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983. – 544 с.

12. *Машынскі, К.* Усходняе Палессе / К. Машынскі; уклад., прадм., камент. У. Васілевіча; пер. Л. Салавей. – Мінск: Беларус. навука. 2010. – 528 с.

13. *Мележ, І.* Людзі на балоце / І. Мележ: Раман з "Палескай хронікі" / Прадм. Г. Шупенькі. – Мінск: Маст. літ., 1995. – 400 с.

14. *Мележ, І.* Подых навальніцы / І. Мележ: Раман з "Палескай хронікі". – Мінск: Маст. літ., 1995. – 509 с.

15. Навуковыя працы кафедры грамадскіх дысцыплін і права УА "БДЭУ". Вып. 3. – Чарнігаў: Всесвіт, 2015. – 500 с.

16. Народная культура Беларусі: энцыкл. давед. / пад агул. рэд. В. С. Цітова; маст. І. І. Бокі, У. М. Жук. – Мінск: БелСЭ, 2002. – 432 с.

17. *Ненадавец, А. М.* Бацькоўская хата / А. М. Ненадавец. – Чарнігаў: Всесвіт, 2015. – 248 с.

18. *Ненадавец, А. М.* Чухава. Фальклорна-этнаграфічны нарыс / А. М. Ненадавец, Я. А. Ненадавец. – Чарнігаў: Всесвіт, 2013. – 270 с.

19. *Ненадавец, Я. А.,* "Жужнела пчолка, жужнела..." / Я. А. Ненадавец, *А. М. Ненадавец.* – Мінск: Беларус. навука, 2020. – 255 с.

20. *Пяткевіч, Ч.* Рэчыцкае Палессе / Ч. Пяткевіч; уклад., прадм. У. Васілевіча; пер. з пол. Л. Салавей і У. Васілевіча. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2004. – 672 с.

21. Пяцьдзесят чатыры дарогі. Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў /склад. і падрыхт. тэкстаў Я. Казекі. – Мінск: Рэдакцыя маст. літ. – 1963. – 351 с.

22. *Сержпутоўскі, А. К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – 301 с.

23. *Сержпутоўскі, А. К.* Казкі і апавяданні беларусаў Слуцкага павета / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 2000. – 270 с.

24. *Сержпутоўскі, А. К.* Палешукі-беларусы: этнаграфічны нарыс / А. К. Сержпутоўскі; пер. з рус. і камент. С. Грунтова, падрыхт. тэксту, іл. і пасясл. А. Лысенкі. – Мінск: Беларус. навука, 2017. – 173 с.

25. *Турков, А. М.* Александр Твардовский / А. М. Турков. – М.: Молодая гвардия, 2010. – 408 с.

26. Этнаграфія Беларусі: энцыкл. / Беларус. Сав. Энцыкл.; рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 575 с.

27. *Яленская, Э.* "Нарадзілася я на Палессі...": фальклорна-этнаграфічная спадчына / Э. Яленская; склад., прадм., пер. з пол. У. Васілевіча. – Мінск: Беларус. навука, 2019. – 374 с.

# ЗМЕСТ


Да чытача ........ 5

Засталося ў памяці ........ 15

Жыта – яно вечнае ........ 102

Страшлівая заломка ........ 134

"Жну я, пажынаю..." ........ 141

Прымхлівасць на жніве ........ 148

Жніўныя песні ........ 155

Малацьба збожжа ........ 176

Гаспадарчае выкарыстанне саломы ........ 195

Салома, і сечкай, салома ........ 220

Пляцём-выплятаем ........ 226

Заключэнне ........ 255

Спіс выкарыстаных крыніц ........ 259

Навукова-папулярнае выданне

*Традыцыйны лад жыцця*

**Ненадавец** Аляксей Міхайлавіч,
**Ненадавец** Ягор Аляксеевіч

**ЗАЛАЦІСТЫЯ САЛОМКІ СНАПКІ**

12+

Рэдактар *М. С. Макрыцкая*
Мастацкі рэдактар *Д. А. Комлеў*
Тэхнічны рэдактар *М. В. Савіцкая*
Камп'ютарная вёрстка *Н. І. Кашуба*

Падпісана да друку 01.09.2021. Фармат 60×84 1/16.
Папера мелаваная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 15,35.
Ул.-выд. арк. 15,2. Тыраж 300 экз. Заказ 962.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі дом «Беларуская навука».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/18 ад 02.08.2013.
Вул. Ф. Скарыны, 40, 220141, г. Мінск.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Транстэкс».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/37 ад 29.01.2014.
Вул. Чапаева, 5, 220034, г. Мінск.

ТРАДЫЦЫЙНЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ

## Папярэднія выданні серыі




**Жужнела пчолка, жужнела...»** / Я. А. Ненадавец, А. М. Ненадавец. – Мінск: Беларуская навука, 2020. – 255 с. : іл.

Кніга прысвечана гісторыі бортніцтва, узнікненню і развіццю рамачнага пчалярства ў Беларусі. Разглядаюцца і аналізуюцца працы папярэдніх даследчыкаў гэтага старажытнага промыслу. Падкрэсліваецца, што ў народным асяроддзі пчаляры часта асацыіраваліся з ведаючымі людзьмі, здольнымі да чараўніцтва. Выкарыстоўваюцца шматлікія вуснапаэтычныя і літаратурныя творы, у якіх закранаюцца розныя аспекты ўзнятай тэмы.

Прызначаецца ўсім, хто цікавіцца таямніцамі духоўнай і матэрыяльнай спадчыны беларускага народа.

## Папярэднія выданні серыі

ТРАДЫЦЫЙНЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ




**Лавіся, рыбка, вялікая і малая** / А. М. Ненадавец, Я. А. Ненадавец. – Мінск: Беларуская навука, 2020. – 287 с. : іл.

У кнізе распавядаецца пра рыбалоўства на тэрыторыі беларускіх земляў, пачынаючы ад сівых стагоддзяў і заканчваючы нашымі днямі. Аўтары аналізуюць шматлікія гістарычныя і архіўныя звесткі, у якіх згадвалася, якую рыбу, колькі і дзе лавілі, якія вадаёмы асабліва славіліся багаццем рыбных запасаў. Акцэнтуецца ўвага на тым, якіх абрадаў і прымхаў трымаліся рыбакі ў будзённым жыцці ці пры выкананні сваіх непасрэдных службовых абавязкаў. Падкрэсліваецца, што ў класічнай беларускай літаратуры таксама даволі поўна адлюстраваны працэс рыбалоўства.

Адрасуецца аматарам рыбалоўчай справы, прыхільнікам гісторыі народных промыслаў, даследчыкам, студэнтам і школьнікам, якія бачаць у мінулым найбагацейшую скарбонку духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей нашага народа.



**НЕНАДАВЕЦ Аляксей Міхайлавіч** — вядомы міфолаг, фалькларыст, краязнавец, літаратуразнавец. Доктар філалагічных навук, прафесар. Найбольш вядомыя кнігі: «Святло таямнічага вогнішча», «Каму пакланяліся продкі», «За смугою міфа», «Выявы міфалагічнага выраю», «Сілаю слова. Чорная і белая магія», «Нарысы беларускай міфалогіі», «У. Караткевіч. Прырода, фальклор і творца», «Сіла праклённага слова», «Легенды старых млыноў» і інш. Аўтар шматлікіх навуковых і навуковапапулярных артыкулаў і публікацый.



**НЕНАДАВЕЦ Ягор Аляксеевіч** — малодшы навуковы супрацоўнік аддзела народазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. Фалькларыст, народазнавец. Кірункі навуковых інтарэсаў: народныя промыслы, вусна-паэтычная творчасць беларусаў. Аўтар дзесяці навуковых артыкулаў. Суаўтар манаграфій: «Чухава. Фальклорнаэтнаграфічны нарыс» (2013), «Нашы спеўныя землякі» (2017), «Спеўная вёска Чухава» (2018), «Жужнела пчолка, жужнела...», «Лавіся, рыбка, вялікая і малая» (2020).

ISBN 978-985-08-2765-4
9 789850 827654

А. М. Ненадавец,
Я. А. Ненадавец

# Залацістыя саломкі снапкі